# Мікола Вяршынін




# ДАКРЫТЫКАВАЎСЯ

## (Сатыра і гумар)

### Выбраныя творы



Мікалай Пятровіч Вяршынін нарадзіўся 20 мая 1940 года ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці. Бацькі яго загінулі ў пачатку вайны. Выхоўваўся ў цёткі, затым — у дзіцячым доме. Рос і вучыўся таксама ў Пухавіцкім і ў Мінскім раёнах. Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта і факультэт парттасактыву, аддзяленне сацыялогіі універсітэта марксізму-ленінізму. Працаваў на розных інжынерна-тэхнічных пасадах на падшыпнікавым заводзе, інжынерам-тэхнолагам станкабудаўнічага завода, інжынерам-канструктарам электратэхнічнага завода, старшым інжынерам трактарнага завода, вядучым інжынерам навукова-вытворчага аб'яднання "ПРАГРЭС". У асноўным яго вытворчая дзейнасць — на трох буйных прадпрыемствах сталіцы, а працоўны стаж — каля 46 гадоў. У каго бывае больш?

Пісаць і друкавацца пачаў пад час службы ў пагранвойсках. Але большы поспех займеў, калі абраў родную мову і любімы жанр — сатыру і гумар. Выдаў больш за дзесятак уласных зборнікаў — і на роднай мове, і ў перакладзе на рускую.
Яго творы ўвайшлі ў дваццаць два калектыўныя зборнікі сатырычнай паэзіі і прозы. Кіраваў літаратурнымі аб'яднаннямі пры рэдакцыях заводскай, абласной і рэспубліканскай газет, працаваў літкансультантам розных выданняў. Зараз — літкансультант газеты "Наша жыццё".

Адрэдагаваў некалькі паэтычных кніжак маладых аўтараў. Актыўна і творча працуе, рэгулярна публікуецца ў друку, часта выступае ў працоўных ды іншых калектывах з чытаннем сваіх твораў.

Мікола ВЯРШЫНІН

# ДАКРЫТЫКАВАЎСЯ

## (Сатыра і гумар)
## Выбраныя творы



Выдавецтва УП «Тэхнапрынт»
Мінск
2003

УДК 882.6-8
ББК 84(4Беи)
В37

**Вяршынін М.**

В37 Выбраныя творы (сатыра і гумар). / Мікола Вяршынін. — Мн.: УП «Тэхнапрынт», 2003. — 526 с., іл.

ISBN 985-464-519-3

Кніга выбранных твораў выдомага паэта, сатырыка-гумарыста Міколы Вяршыніна — плён яго шматгадовай творчай працы. У зборнік уключаны лепшыя напісаныя на працягу дзесяцігоддзяў, а таксама новыя, апошняга часу вершы, сатырычная проза, яшчэ і мемуары. Байкі, фельетоны, гумарэскі, мініяцюры, каламбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы — такі шырокі жанравы дыяпазон. Тэматычны дыяпазон таксама даволі шырокі: праблемы сённяшняга дня, вытворчасць, каханне, сям'я, побыт, адпачынак, антыалкагольная тэматыка, роздум над творчасцю і многае іншае. Асобным раздзелам — вершы, прысвечаныя аўтару старэйшымі і малодшымі таварышамі па пяру і людзьмі самых розных прафесій — прыхільнікамі яго творчасці ў розныя ... багаты жыццёвы вопыт дапамагаюць паэту



# ЖЫЦЦЯ
# КРУТЫЯ ПАВАРОТЫ

*Байкі, фельетоны, гумарэскі, мініяцюры, каламбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы*



# Мыш пад венікам

Было заўсёды ў хаце шчасце,
Ды не абыдзе часам зло.
Мыш нечакана завялася,
І тут пайшло.

Цягала цукар, крупы, сала,
А не знайсці нідзе нары.
Шпалеры ўсе пашкуматала —
Ну хоць памры.

І пачаліся тут пакуты:
Хоць пастка моцная была
І сыпаў гаспадар атруты —
Не меней зла.

Так справа і стаіць на месцы.
Жыццё ж у Мышы — любата.
І гаспадар тады, нарэшце,
Завёў Ката.

А Кот лянівай быў пароды,
Сям'я ўся мучылася з ім:
Еў толькі і драмаў заўсёды
У кутку сваім.

А Мыш пад венікам сядзела
І пасміхалася з яго.
З-пад носу ўсё цягала смела
У Ката таго.

Гаспадару мецъ давялося
Двайны і клопат, і расход.
І венік ён тады са злосці
Пусціў у ход.

Хвастаў Ката ён злева, справа,
Што пераводзіў харч дарма.

А Мыш спужалася расправы —
Уцякла сама.

* * *

Яшчэ такіх выпадкаў многа,
А трэба ўсё рабіць прасцей,
І чым трымаць Ката благога,
Махаць лепш венікам часцей.



## Бык ва ўладзе

Як толькі Бык заняў пасаду,
Парадак свой ва ўсім завёў:
Дзе прымяняў усю ўладу,
А дзе не ўжываў правоў.

Аднойчы Конь араў палетак,
Зрабіў даўжэйшай баразну.
І Бык за грэх нязначны гэты
Яму ўкінуў, як каню.

А Певень ледзьве не загінуў,
Бо перарваў бычыны сон.
Бык капытом яго падкінуў,
Каб больш не кукарэкаў ён.

Была зусім бяскрыўднай Кошка;
З Быком не гаворы да трох:
Памяўкала аднойчы трошкі,
І Бык падняў яе на рог.

А вось Казёл стаптаў нямала
Ў гародзе град — і не зірнуў,
Свіння ўсё поле раскапала,
Баран — вароты развярнуў.

І хоць рабі ўсё там нанова —
Зрабілі гаспадарцы зло.
А Бык ім толькі... даў вымову,
Бо правіла ў яго было:

Каго люблю і з кім сябрую,
Я тым усе грахі дарую.
Нялюбых жа сатру з дарогі,
Бо маю капыты і рогі.



# «Прынцыповы» вартаўнік

Спрадвеку склад харчовы
Сабака вартаваў,
І рослы, і здаровы,
Але крадзёж бываў.

То зграбна затрымае,
Рве злодзея за бок,
То кепскі выгляд мае,
Бо злодзей спрытна ўцёк.

Каб разгадаць загадку,
Спыталі ў нейкі час:
— Скажы, у чым справа, братка?
Той даў такі адказ:

— Практычны маю звычай,
І прынцып гэткі мой:
Я тых рву, хто здабычай
Не дзеліцца са мной.

Хто ж дасць і мне затраўку,
Тых кратаць не хачу,
Калі мне зручна — гаўкну,
А калі не — змаўчу.



# Размова з-за куста

Сеў Заяц за кустом сабе,
А міма Воўк бяжыць.
Касы і кажа: — Дай рубель,
Калі ты хочаш жыць!

Здзівіўся Шэры: — Што з табой!
А Заяц: — Дай рубель!
Інакш хадзем за куст на бой,
Там будзе горш табе.

Пайшлі за куст. Мінут праз пяць
Адтуль ледзь выпаўз Воўк.
Шыбнуў рубель ды ну ўцякаць,
Зубамі толькі шчоўк!

Вось ля куста сеў Зайка зноў.
Глядзіць — Мядзведзь брыдзе.
— Давай рубель без лішніх слоў,
А то за куст хадзем!

Мядзведзь раз'юшан: — Дам разгон,
Нахабнік ты такі!
Праз пяць хвілін ледзь выпаўз ён
Ды чухае бакі.

Аддаў рубель, пайшоў хутчэй
Далей ад той бяды.
А тут бяжыць Ліса яшчэ.
— Гэй, рыжая, сюды!

Давай рубель ды прэч дамоў,
А то пайшлі за куст.
Там галава зляціць далоў,
Касцей пачуеш хруст.

— Ну, што з рублём, вось тры — якраз
(Каб згінуў ты хоць дзе), —

Ліса заўважыла ў свой час:
Леў за кустом сядзеў.



## Кіраўнічы Казёл

Дырэктарам маслазавода
Казёл, усім на дзіва, стаў.
Яго казліная прырода
Была прычынай кепскіх спраў.

Там Конь галоўны быў канструктар —
Ён грывай трос і ў справах рос.
І вырашаў пытанні хутка,
Работы воз упарта вёз.

Гусак — тэхнолаг. Ён паважны,
Разумны, добры, дзелавы.
У працу кідаўся адважна,
Быў плён з талковай галавы.

Сабака — той з усімі ў згодзе,
Забеспячэнец, а не госць.
Шукаў, вынюхваў і знаходзіў,
Чаго няма і дзе што ёсць.

Казёл — і злы, і нават хіжы —
Сам меў заступніка — Быка.
Настырна, паступова выжыў
Каня, Сабаку, Гусака.

Бо абыходзіўся сурова,
Да іх чапляўся часцяком:
То нізавошта дасць вымову,
То дэпрэміруе цішком.

Адных Казлоў цяпер шануе:
«Разумнікаў не трэба мне!
Аднапляменнікаў вазьму я —
Самому будзе спакайней».

Відаць, вы зразумелі самі:
Казлу лепш кіраваць Казламі.



# Незвычайны юбілей

Была ў лясной канторы завядзёнка:
Калі пра юбілей ішла гамонка,
То кожны нёс з сабою пачастункі
І хто якія можа падарункі.

І вось пранеслася аднойчы чутка,
Што і ў Лісы дзень нараджэння хутка.
Тут Леў сабраў шырокую нараду —
Ён быў заўсёды гэткім святам рады.

— Сябры! Ліса ў нас — лесу ветэранка.
Хай Вожык яблыкі цягае зранку,
Ваверка — па кашу арэхаў і грыбоў,
Дзік — жалуды з-пад дзесяці дубоў.

Мядзведзь — тры бочкі мёду.
А прызначым
І Салаўю адказную задачу:
Спявак сярод лясного ён народу
Хай праспявае юбілярцы оду...

На юбілеі Леў сказаў прамову,
І рыжую хваліў ён адмыслова!
І дзіва! Той навушніцы-Лісіцы
Паднеслі... залатыя завушніцы.

А Салавей, спявак мясцовы і паэт,
Здзівіў цудоўнай одай цэлы свет.
Была ў той одзе прыгажосць і сіла,
Што Ліска нават і слязу пусціла.

Чаму ж Лісе была такая ўвага
І ўсім незразумелая павага?
Хоць меркаванняў тут было багата,
Галоўнае ж — даводзіўся Лісе Леў сватам.

# Асёл і навука

З работы звольніў Слон Каня.
Ў таго спыталі: — Ты штодня
Без адпачынку спіну гнуў,
Заўсёды цяжкі воз цягнуў,
І хоць мінула маладосць,
Але ў цябе шчэ сіла ёсць.
Чаму ж не зладзіў са Сланом?
— Я працаваў заўжды ў ахвоту,
Але прыняў Слон на работу
Асла, у якога ёсць дыплом.
Што ж можна пра Асла сказаць?
Што ўсе заўважыць могуць самі:
Дзе трэба розумам узяць,
Ён толькі варухне вушамі.
***
Карысць вучонасці вядома,
Сэнс зразумейце гэтых слоў:
Ніхто з нас не супроць дыпломаў,
Ды толькі мы супроць Аслоў!



## Вучоны Кіт

Вучоны Кіт у інстытуце водным
Работай навуковай кіраваў.
З работнікамі не бываў лагодным
І зранку ўсім заданні раздаваў:

— Ты, Акунёк, састаў вады даследуй,
А Камбала — пра грунт мне звесткі дай.
Ты, Скумбрыйка, раслінны свет уведай,
Сяледчык — колькі солі, нагадай.

З'яўляўшыся на працу раз у месяц,
У акіян надоўга Кіт знікаў.
Адсутнічаў ён на рабочым месцы
(Яго ніхто, дарэчы, не шукаў).

А Рыбкі працавалі без утомы,
Стараннасцю здзіўляючы сваёй.
А вынік працы быў усім вядомы:
Пісаў Кіт дысертацыю па ёй.

І розныя яны выгоды мелі,
І розны да работы быў настрой.
Бо Рыбкі толькі водарасці елі,
Кіт ласаваўся чорнаю ікрой.

## Аб зручнасцях жыцця

На лесанарыхтоўках
Дырэктар быў Асёл,
Заўгасам Ліс быў лоўкі,
Вазіў бярвенні Вол.

Хоць пятым колам Ліс той
У гэтым возе быў,
Але ва ўсіх дачыста
Вядомасць ён набыў.

Любіла ўсё начальства,
Што быў паслушны ім,
Што сам даволі часта
Рабіў паслугі ўсім.

Аслу патрэбна ўранку
Дзяцей завесці ў сад —
Вядзе Ліс аж да ганку
У садзік Аслянят.

А Воўк? Асла ён любіць,
Зайчацінку ў саку —
Усіх Зайцоў Ліс губіць,
Каб дагадзіць Ваўку.

Галоўным інжынерам
Конь працаваў тады —
Авёс яму без меры
Ліс выдаваў заўжды.

Каму расчэша грыву
Ці траўку, дзічыну
Ён прынясе ліслівa —
Не ў працы ж гнуць спіну.

Вітаецца за лапу
Начальства з Лісам тым,
І прэміі ў зарплату
Яму, а не другім.

А Вол цягаў бярвенні,
Адзін выконваў план,
І ўпіраўся вельмі,
І быў ён без заган.

Дзялянка ж ад канторы
Далёкаю была,
Начальства, як на гора,
Не ведала Вала.

Яго не сустракала,
І славы не дало,
Капыт не паціскала,
І прэмій не было.

* * *

Для тых, хто хоча жыць зручней,
Заўжды, як правіла, важней,
Не працаваць больш ды цяжэй,
А да начальства быць бліжэй.

## Без віны вінаватыя

У Льва стары Сабака жыў.
Ён Льву служыў,
Са Львом дружыў,
На даручэннях — Заяц быў,
І Леў абодвух іх любіў.

Ды раптам прагнявіўся ён,
Сабаку з Зайцам выгнаў вон.
Пачалі бедаваць яны, —
Ніхто не ведаў з іх віны.

І Заяц вельмі сумны стаў,
Ён у Сабакі запытаў:
— Нічога я не зразумеў.
Вось ты служыў, што сілы меў,
За што ж цябе прагнаў наш Леў?

Ты састарэў,
Ці захварэў?
Сабака сумна адказаў:
— Я быў на месяц забрахаў,
А Леў падумаў — на яго...

Мой лёс не лепшы ад твайго,
Чым ты, касы, не дагадзіў?
Заўжды ж на дыбачках хадзіў,

Леў для цябе быў дабрадзей...
— На Льва я скоса паглядзеў.

## Вераб'іны ўклад

Слон разам з шэрым Вераб'ём
Улетку будавалі дом.
Сваё заданне кожны меў,
А кіраваў будоўляй Леў.

Вось год мінуў. Леў пажадаў
Зрабіць у іх праверку спраў:
Якую частку ўсіх работ
З іх кожны выканаў за год.

Перш Верабей даклад зрабіў:
— Я крыць страху павінен быў,
Валок саломіну ўвесь год,
І зараз шчэ баліць жывот,

Увесь знямогся, пашарэў...
— Ты малайчына, — хваліць Леў. —
А зараз, Слон, давай адказ,
Што ты зрабіў за гэты час?

Слон кажа: — Год я спіну гнуў,
Гару бярвенняў прыцягнуў.
Здзівіўся Леў: — Вось ну і ну!
Гару? Чаму ўсяго адну?

Табой не задаволен я,
Вось паглядзі на Вераб'я:
Даўжэй саломінка, чым ён,
Але цягнуў яе шмат дзён.

Нічога больш не гавары,
Ты нацягаць мог тры гары.

А Верабей Ільву: — Мана!
Не гнецца ж спіна ў Слана.

Здараецца: ты лынды бі,
А, каб пашану мець, зрабі
Хоць вераб'іны ў справу ўклад
Ды размалюй як след даклад.

## Дакрытыкаваўся

Пайшлі ў рэдакцыю «Лясной газеты»
Сігналы пра мядзведзевы сакрэты:
Што ён і хабар браў, і распусціўся,
Да розных злоўжыванняў дакаціўся.

Каб высветліць, чаму Мядзведзь такі стаў,
Паслалі Вожыка-фельетаніста,
Бо ён спасціг вяршынь крытычнай славы
І лоўка разбіраў такія спарвы.

Праз хуткі час ён там правёў работу
І нарабіў Мядзведзю шмат турботаў,
Раскрыўшы непрыстойны твар ягоны,
Аб чым і напісаў у фельетоне.

Мядзведзь звяроў пакрыўдзіў, і нямала,
І брань любіў, што дрэнна дзе ляжала.
З Лісой круціў раманы ён паціху
І нават падбіраўся да Бабрыхі.

Гаворкі шмат было ў лясным народзе,
Ды Зубр у тым быў з Вожыкам не згодзен:
— Што крытыку навёў ты — малайчына,
Ды крытыкуеш надта не па чыну.

І што ў Мядзведзя там не ўсё ў парадку,
Ты мне павінен далажыць спачатку.

Я сам бы асабіста ўсё праверыў
І неабходныя прыняў бы меры.

Кіраўніка такога нам ты збэсціў!
Сарокі ўжо па ўсім разнеслі лесе.
Аб тым пляткараць Дзятлы і Ваверкі,
І нават у Зайцоў так шмат гаворкі.

За парушэнні, што былі ў Мядзведзя,
На першы раз яго мы папярэдзім.
А каб не быў ты сам занадта колкі,
Лепш напалову састрыжы іголкі!

* * *

Бывае так да часу, да пары
Там, дзе кіруюць цвёрдалобыя Зубры.

## Даклад і лад

Квартал імкліва праляцеў,
Узяў разбег і новы,
І на даклад паклікаў Леў
Мядзведзя тэрмінова.

Сабраўся хуценька Мядзеведзь,
Падрыхтаваў паперы.
Пашкробся лапаю ледзь-ледзь,
Зайшоў нясмела ў дзверы.

У кабінеце Шэф, як пан.
Мядзведзь аж схамянуўся,
Ды... зачапіўся за дыван
І раптам спатыкнуўся.

Леў падазрона паглядзеў:
— Ай-яй, як непрыгожа!
Калі набраўся ты і дзе?
Стаяць ужо не можаш.

— Ды не, працую я ўсе дні,
Навошта мне прыгоды?
Нічога ў рот не браў ані,
Апроч вядзерца мёду.

А пра пітво — і не пытай!
Ды распаўзлася чутка:
Мядзведзь — п'янюга і гультай,
І... звольніўся ён хутка.

* * *

Каб быў заўсёды ў працы лад,
З бядой каб не спаткацца,
Ідзеш да шэфа на даклад —
Не трэба спатыкацца.

## Зязюля і Дрозд

Зязюля прыляцела да Дразда,
Прысела спрытна ля гнязда
І нахіліла хітра так галоўку
Ды пачала дурманіць лоўка.

Сказала: — Любы дружа Драздзік,
Зірні на мой прыгожы хвосцік.
Жыць паасобку вельмі дрэнна,
А разам будзе лепш нам, пэўна.

Раз-два яму пракукавала —
І да сябе Дразда як прыкавала.
Змяніў жыццёвы свой кірунак
І атрымаў Зязюльчын падарунак.

Яна сказала, ледзь падняўшы вечка:
— Дару табе сваё яечка!
І выйшла так, што Дрозд павінны
Сам гадаваць Зязюльчынага сына.

Бо разам жыць не захацела
І ў лес далёкі паляцела.
Шмат у яе такіх Драздоў,
Што млеюць ад Зязюльчыных хвастоў.



## Салавей і Груганы

Жыў у гаі зялёным Салавей,
Мелодыі выводзіў адмыслова.
Было ад іх у лесе весялей,
І ён высвістваў кожны раз нанова.

Але жылі ў гаі і Груганы,
А ім ад зайздрасці ажно карцела:
Нярэдка дружна каркалі яны,
Бо Салаўя перакрычаць хацелі.

— Ты вылучыцца хочаш сярод нас,
Падумаеш, які знайшоўся здольны!
Цярпеў Салоўка здзекі доўгі час,
Ды не сцярпеў: — Хіба не птах я вольны?

Я ведаю: не хочацца вам, не,
Каб тут спявалі Салаўі. Даволі!
Перакрычаць вы можаце мяне,
Пераспяваць — прабачце, аніколі!





# Пра Мух і пра Зуброў

Прасілася на працу неяк Муха.
У аддзеле кадраў Зубр сустрэў яе.
— Што за душой ты маеш, цакатуха?
Ты пакажы нам здольнасці свае.

Мо, ёсць дыплом ці вопыт, можа, сіла,
А да станка хацела б ты ці не?
Тут Муха кажа: — Я б вас папрасіла
Ўлічыць, што хабаток ёсць у мяне.

— Так, так, дык кажаш, Муха, хобат маеш?
Такія кадры — золата для нас.
Работу неблагую атрымаеш.
Грузіць дэталі будзеш нейкі час,

А потым мы паглядзім, мо й павысім,
Як справы пойдуць у цябе на лад.
За працу толькі ты як след бярыся,
Дамо някепскі мы табе аклад.

Праходзіць час, а праца ані з месца,
Пагрузка не кранаецца зусім.
Хоць Муха шчыра працаваць бярэцца,
Але ж, вядома, колькі ў Мухі сіл.

Тут вырашылі Муху зацікавіць
Матэрыяльна: можа, будзе плён.
Ды не пайшлі, вядома, лепей справы,
Хоць пасля гэтага прайшло шмат дзён.

Уздзейнічаць надумалі на Муху
Маральна і сабралі тут жа сход.
Але не ўбачылі ў працы зрухаў
Праз дзень і месяц, нават і праз год.

* * *

Там справа дрэнь, дзе месцы пазаймаюць
У аддзеле кадраў волаты-Зубры,

А Муху... на пагрузку пасылаюць
Бывае й так. Да часу, да пары.

## Ліса і Кураня

Ліса злавіла Кураня.
Яго панесла ў лес яна,
Адчуўшы ўжо прыемны смак.
Яно ж Лісе сказала так:

— Ці шмат карысці, глянь, з мяне?
Ты будзь, Лісіца, разумней:
Пусці мяне на ўсе бакі,
А прыйдуць за мяне бацькі.

Яны таўсцей, ды і тлусцей,
Ты стрэнеш з імі і гасцей.
Уся лісіная радня
Іх будзе есці аж да дня.

Ліса паслухала тых слоў,
Пусціла Кураня дамоў.
Яно ж, адбегшы крыху ўбок,
Са смехам кінулася ў скок:

— Ліса дурная, вось мой дом,
Ты ж, пэўна, думаеш хвастом.
Няма бацькоў маіх. Ура!
Я ж выйшаў з інкубатара.

* * *

Не год вядома і не два:
Як на плячах ёсць галава,
Дык з ёй не прападзеш заўжды,
Бо выйсце з кожнай ёсць бяды.

## Бык і Месяц

Наеўся неяк Бык дурной травы
І быццам зразумеў свае правы.
На Месяц злосна ён кідаўся,
А неба плашч
плашчом тарэадора здаўся.
Але, як ні скакаў і ні стараўся,
Да Месяца рагоў
ён так і не дабраўся.
І ўрэшце так, здурнеўшы, раззлаваўся —
З апошняй сілы скочыў,
ды сарваўся.
У яміну зваліўся ён, нябога,
І сам сабе зламаў з разгону рогі.

* * *

Заўсёды ўмей свой гнеў перамагчы,
На Месяц здуру
не скачы.

## Мураш і Слон

Мураш лічыў сябе
дужэйшым за Слана.
Той не падыме груза, як ён сам.
Мураш падыме Мураша —
вядома ўсім здаўна,
Куды з ім сілай мерацца Сланам!
І вось рашыў саманадзейна, што пара
Уперціся і камень тут звярнуць.
Ад тупату Слана
каменьчык скінуўся з бугра,
І не паспеў Мураш
ні ўверх, ні ўніз зірнуць...

* * *

Не пераацані свае ты сілы,
Глядзі, каб каменем цябе не раздушыла.

# Ахвяры гультайства

У лесе дзень працоўны быў,
Работа рухалася ўмела.
І кожны нешта там рабіў,
Варона ж на суку сядзела.

Паблізу Заяц шустра бег
І дакараць пачаў Варону:
— Не працаваць — вялікі грэх,
Мы круцімся ўсе без прыгону.

Варона здзекліва ў адказ
З вяршыні дрэва так сказала:
— Бо многа дурняў сярод вас,
Разумных жа, як я, ёсць мала.

Падумаў Заяц: — Дык нашто
Мне больш за ўсіх старацца?
Пад куст уверх лёг жыватом:
— Хай іншым застаецца праца.

Бяжыць Ліса: — Чаму ляжыш?
Работа ў лесе ўсіх чакае.
— Дык прыклад пакажы ўсім ты ж,
Калі разумная такая.

Ліса прылегла на траву:
— Прагулаў мне чаго баяцца?
Не лепш, не горш за ўсіх жыву,
Ці ж я дурнейшая за Зайца?

Тут паляўнічыя ішлі,
Што пастраляць заўжды любілі.
Здабычу лёгкую знайшлі —
Лісу і Зайца ўраз забілі.

Варона сведкаю была,
На гэта зверху пазірала.

— Лес не пазбаўлены ад зла,
Калі тут ёлупняў нямала.

Кар, без мазгоў жа трэба быць,
Каб так загінуць вось ганебна.
Бо, каб нічога не рабіць,
Сядзець высока вам патрэбна!



## Лес і прагрэс

Сабраўся ў лесе форум вельмі важны,
З'езд жыхароў — і Птушак, і Звяроў.
— Сяброўства і адзінства мы пакажам,
Каб потым доўга не збірацца зноў.

Да кожнага патрэбна нам давесці:
Харчуйцеся пладамі і травой.
Адзін другога не павінны есці,
Драпежнікі заплацяць галавой.

Тут Воўк завыў: — Ды без Ласёў мне здохнуць!
Ліса: — Я есці ўсмак Зайцоў люблю!
Мядзведзь: — Мне ад адной маліны ссохнуць!
Каршун: — Прачыстку Птушак я раблю!

А Вожык, хоць і сам Лісы баіцца,
Сказаў: — Я не магу не есці Змей.
Змяя, што скурай яркаю іскрыцца,
Шыпела: — Як мне не глытаць Мышэй?

Слабейшыя — у роспачы і гудзе
Гвалт узнялі — і Птушкі, і Звяры:
— За дэмакратыю змагацца будзем,
Даволі ўжо, цярпелі да пары!

Аднак жа час дыктуе перамены,
І рэзалюцыю аб згодзе прынялі.
Ніхто не мог чакаць яе адмены.
Якія ж потым вынікі былі?

Воўк за Ласямі кінуўся імкліва,
Ліса Зайцоў душыла ў хмызняку.
Мядзведзь задраў Казулю — і не дзіва.
Рысь скочыла на карак Барсуку.

***

Які ў жыцці,
                    такі і ў байцы сэнс:
Тут — лес.
          Які ў ім можа быць прагрэс?

# Ганарысты Мухамор

Вось вырас Мухамор, высока змог узняцца.
Чырвоны ўвесь, у белых плямках быў на шапцы.
І здзекавацца стаў над іншымі Грыбамі:
— Убраннем я магу хваліцца перад вамі.

Лісічка — рыжая, Грузд чорны ёсць і белы.
А Баравік — такі нязграбны і няўмелы.
А Падасінавік стаіць як быццам моцна,
Але на ўсіх на вас глядзець мне нават млосна.

Вы ўсе павінны мной заўсёды захапляцца.
Высокі я, прыгожы, і медалі на шапцы.
Пераўзысці мяне ніводнага ў вас шанца.
Ні ў чым не зможаце са мною вы змагацца.

Астатнія Грыбы паслухалі, сказалі:
— Сусед, а што ў цябе? Атруты — той нямала.
Самаўлюбёнасць, пахвальба — вось гэтага дык многа!
Хто ж звяжацца з табой — працягне ўмомант ногі.

Цябе заўважыць хто — капне нагой, забудзе.
А нас жа любяць і збіраюць вечна людзі.
— Ды што вы, я відзён здалеку і адразу.
Настоі ёсць з мяне і лекавыя мазі.

Есць хворы Лось мяне, збіраюць і Бабулі
Ліпучку вырабляць, каб Мухі ўсе паснулі.
Грыбы яму ў адказ: — Нам не кажы пра лекі.
Яны, калі і ёсць, дык толькі для калекі.

Не сябар нам ты, вораг нават і для Мух.
Сыдзі адсюль хутчэй, каб з нас не выйшаў дух.
А шапачка твая — вядома ўсім — падманка.
Дый сам ты, хоць і Грыб, — не лепшы за паганку.

* * *

Калі б то пра грыбы —
пісаць было б не варта.
Ды абы-хто між нас
імкнецца ўверх упарта.

## Свае — свайму

У лесе кожны дзікі звер
Каб не хадзіў пануры,
Рашылі жыхары: — Цяпер
Збудуем Дом культуры.

Бярвенне, дошкі ёсць у нас,
Цэмент патрэбен вельмі.
Дастанем — і ў рабочы час
У лапы возьмем кельмы.

На працу кожны можа стаць
У строй рабочы недзе.
А вось цэмент хутчэй дастаць
Давай пашлём Мядзведзя.

Паехаў той і доўга быў,
Як быццам справу рухаў.
Аднак нічога не прабіў,
Няма ніякіх зрухаў.

— Усё, што трэба, я рабіў,
Настырнасці меў многа:
Ламаў сталы і морды біў —
Не памагло нічога.

...Што ж, сіла не дапамагла —
Мо хітрасць дапаможа.
Ліса вось спрытнаю была,
Уладзіць справу зможа.

Але вярнулася яна
З пустымі ўсё ж рукамі.
— Я шчыравала ноч да дня,
Вы зразумейце самі.

Я хітрава, як магла,
Ды дзе знайсці мне выйсце?
Сябе начальству аддала,
Ды не было карысці.

... І сілай, хітрасцю не ўзяць,
А план «гарыць» — хоць рэжце.
І вырашылі ўсе паслаць
Асла яны, нарэшце.

Той падарункаў не вазіў,
Вярнуўся сам шчасліва.
Вагон цэменту адгрузіў
Асёл, усім на дзіва.

— Звяртаўся я да іх на «ты»,
Кантакт мы добры мелі.
Бо там сядзяць мае браты —
Мяне і зразумелі.

## Мядзведзь у камандзіроўцы

Калісьці ў лясніцтве пайшлі дрэнна справы.
Паслалі Мядзведзя ў камандзіроўку.
Лічылі, што ён энергічны, рухавы
І ўсё там праверне і хутка, і лоўка.

А спраў і пытанняў сабралася мноства,
Мядзведзь жа патыліцу нават не чухаў.
З Лісіцамі рыжымі вёў ён знаёмства,
Гуляў дні і ночы і піў медавуху.

Дайшло да таго, што прыйшла тэлеграма:
«Хутчэй забірайце адгэтуль Мядзведзя,
Бо ён прападзе тут ці позна, ці рана.
Няхай за яго больш руплівы прыедзе».

І тут вось Бабра тэрмінова паслалі
Мядзведзю гультайскаму на дапамогу.
Маленькі Бабёр там сябе не зняславіў,
Работы зрабіў за дваіх вельмі многа.

Яшчэ да таго ж, хоць шукаў доўга недзе,
У родны свой лес ён прывёз і Мядзведзя.

* * *

Калі не чакаць ад Мядзведзя дабра,
Чаму не пасляць бы адразу Бабра?



# Каза-Карова

Каза прыйшла да старшыні
І кажа: — Выдай мне даведкі,
Што не Каза я — сам зірні —
Карова я, ёсць нават сведкі.

Той не сцярпеў — зарагатаў:
— Відаць, жывёла ачумела.
Няўжо я дрэнна бачыць стаў,
Ці ты жартуеш так няўмела?

— А што? Шэсць літраў усяго
Цяпер Кароў тваіх надоі.
І я даю не менш таго:
Тры літры з тлустасцю двайною.

— Яно-то так, дык што рабіць,
Паправіць як такія справы?
— Карове, каб Каравай быць,
Не абы што патрэбна — травы.

Пасуць іх з намі ўсю пару
У лазняках, а што там есці?
Нам дык прасцей: грызём кару
Або лісток ухопім дзесьці.

Так што даведку мне давай,
Бо малака зусім не дам я!
Тут Козы іншыя з хлява
Прыскочылі: — І нам таксама!

Вось старшыню Казёл сустрэў
І падступае гэтак злосна:
— Ты што зрабіў? Я захварэў,
Ад гэтых жартачак аж млосна!

Бач, Коз з Каровамі зраўняў,
Яны вялікі гонар маюць
І мне як быццам не радня,
Гаспадаром і не ўспрымаюць.

Нашто ў цябе і галава?
Патрэбны справы, а не словы.
Даведак колькі ні давай,
З Казы не зробіш ты Каровы!

# Конкурс

Аб'яўлен быў у лесе конкурс песні.
— У хор прымаюць! — чутку тут разнеслі.
Зляцеліся Сініцы, і Стрыжы,
І Вераб'і, і Галкі, і Чыжы.

Вароны каркалі і зграяю ляталі,
Сарокі, як трашчоткі, стракаталі,
І Зяблік прыляцеў туды, і Драч.
Журы ўзначаліў сам Крумкач.

На конкурс прыляцеў здалёк Салоўка.
Крумкач пракаркаў: — Быццам ты і лоўкі,
Але зусім няважны выгляд маеш.
Паслухаем, ці хораша спяваеш.

А ці высокага ты варты звання —
Закрытае рашыць галасаванне.
Калі падымуць за цябе хвасты —
У хор тады прыняты будзеш ты.

Спявалі ўсе, камісія сачыла,
У хор «славутых» птушак залічыла,
Хоць як хто песню ні спяваў сваю,
Была адмова толькі Салаўю.

— У хор да нас зусім не падыходзіш:
Званчэй за ўсіх ты песенькі выводзіш.
У спевах тваіх мала прастаты,
Бяда, што надта галасісты ты...

# Пралічылася

Бабёр заляцаўся да Ліскі,
А сам быў даволі рахманы.
Яна ж да яго — ані блізка,
Круціла хвастом для падману.

Хоць часам дазволіць пагладзіць,
Але нос высока трымае.
Бабёр ёй ніяк не паддадзіць,
І поспеху ўсё ён не мае.

Сяброўкам Ліса расказала:
— Бабёр той зусім непрыкметны.
Карысці з яго вельмі мала:
Нязграбны ён, шэры і бедны.

А футра ў мяне — вось зірніце:
Найлепшае, сама па часе.
Уся я хаджу ў аксаміце,
І шмат яшчэ ёсць у запасе.

Якія ў мяне кавалеры!
І Воўк, і Мядзведзь замуж просяць.
Кахаюць мяне ўсе без меры
І мне падарункі прыносяць...

Падзеі імчалі тым часам.
Бабёр жонку з дзеткамі мае.
Дырэктарам стаў леспрамгаса,
А Ліска сабе ўсё гуляе...

Ды толькі гады ўжо не тыя,
І футра даўно ўжо знасілася!
А дзе кавалеры былыя?
Так, Лісанька, ты пралічылася...

## Сваё месца

Баран збег ад Авечак, Бараноў —
Заўжды і ганарысты быў, і ўпарты.
Таму пайшоў у статак да Кароў —
Лічыў, што лепшага ён лёсу варты.

З Каровамі быў толькі пару дзён.
Яны ніякай дружбы з ім не мелі,
Бо мыкалі, ды толькі бэкаў ён,
І Барана зусім не разумелі.

Пасля да Коней кінуўся Баран,
З Каровамі не мог больш сустракацца.
Ды Коні распазналі той падман:
Не ўмеў Баран іржаць, не мог брыкацца.

Хацеў сярод Свіней затым пажыць,
Але яго сустрэлі хвараві̇та:
Не рохкае і ў брудзе не ляжыць,
І не пусцілі да свайго карыта.

Вярнуўся ў свой авечы статак зноў,
Паспакайнеў і больш не задаецца.
Бо той, хто нарадзіўся Бараном,
Заўсёды Бараном і застанецца.



## Ахвяра характару

Двару патрэбен вартаўнік,
Каб добры меў і зрок, і слых.
Раптоўна злодзей каб не ўзнік,
Каб не пускаў у дом чужых.

Дварнягу кормяць ад душы,
І лашчыць жа яго сям'я.
Дык лепш вартуй, мацней брашы.
Ёсць будка цёплая свая.

Звычайна і бывае так,
Ды гэты быў зусім дурны.
Пасліць, пасля наесца ўсмак —
Гаспадара рве за штаны.

І з часам усё больш дурэў:
Ганяў свіней, ганяў курэй.
Палохаў нават і дзяцей,
Кусаць гаспадароў хацеў.

А гаспадар што ні рабіў,
Усё было наадварот.
Ён псіну гэтую прыбіў,
Са злосці выкінуў за плот.

* * *

Калі дурны — умер свой псіх,
Не кідайся хоць на сваіх.

## Вераб'інае каханне

Ляцелі птахі да мяне на госці —
Сямейка Вераб'ёў, з-за іх не спаў.
А ім было хоць падзяўбці чагосьці,
І я што меў — ім клаў і падсыпаў.

Ды раптам я заўважыў: што за ліха,
Бо да абодвух іх даўно прывык.
А прылятае толькі Вераб'іха,
А гаспадар яе як быццам знік.

Яна, вядома, дужа сумавала
Ад іх сямейных вельмі цяжкіх спраў.

І мне было тут клопатаў нямала,
Бо я за іх сям'ю перажываў.

Пасля зірнуў — зляцеліся, як з неба,
Буркуюць на балконе на маім.
Ды толькі гамана — не так, як трэба,
У кожнага гаворка аб сваім.

Яна шчабеча: — Ты знайшоў другую,
Кахала ж, ды жыццё маё змусціў.
І думаў ты, што я адна звякую.
Нягоднік, шэльма, здраднік, ціў-ціў-ціў!

А ён сядзеў засмучана і ціха,
Віноўна апусціўшы галаву.
Апраўдваўся ледзь-ледзь прад Вераб'іхай,
Маўляў: — Прабач ты мне, ціву-ціву!

Палётала яна, паціху змоўкла,
І знікла злосць у сэрцы і ў крыві.
І сустракаю разам іх я зноўку,
І ёсць маленькія ў сям'і іх Вераб'і.

* * *

Каб моцная была заўжды сям'я,
Не будзь падобным да такога Вераб'я.



# Канцэрт

Галодны Воўк пабег на паляванне
І неўзабаве Зайца напаткаў.
— Вось, — кажа, — будзе добрае сняданне.
Падняў за вушы: — Я цябе шукаў!

Ад страху Заяц з шэрага стаў белым,
У пашчу Воўка лезці не хацеў.
— Паслухай, Воўча, я спяваю ўмела,
Яшчэ й танцую хвацка для гасцей.

Цябе пацешыць я хачу, аж млею.
Апошні свой канцэрт дам у жыцці.
Старацца буду, пакажу, што ўмею,
Пасля мяркуй: ці з'еш, ці адпусці.

Падумаў Воўк, згадзіўся: вось праява!
Але нікуды Заяц не ўцячэ.
Той на пянёк ускочыў вельмі жвава,
Пачаў спяваць, скакаць, крычаць яшчэ.

Паблізу паляўнічы там праходзіў,
Пачуў ён шум і зняў ружжо з пляча.
Такога век не бачыў у прыродзе:
Танцуе Заяц. Воўк — за гледача.

Прыцэліўся тут хутка паляўнічы,
Спусціў раптоўна ўзведзены курок.
Драпежніка хацеў умомант знішчыць,
Ды прамахнуўся. Шаснуў Воўк убок.

Тут спала ўся з Ваўка саманадзейнасць:
— На чорта мне такая самадзейнасць!

# Таўстаскурая Свіння

Як толькі Гусі сталі есці,
Прыйшла суседская Свіння.
Зямлю капала лычам дзесьці,
Ды прыцяглася, як штодня.

Гусей нахабна расштурхала,
А ёй што есці — усё адно.
Было самім тым Гускам мала,
А ўжо відно карыта дно.

Паела ўсё, што перапала,
Парохкала, затым лягла.
А Гусі бок яе шчыпалі —
Віноўніцы такога зла.

Але стараліся дарэмна,
Хоць ёсць для помсты шмат падстаў.
Ёй не балюча, а прыемна,
Як быццам нехта казытаў.

«Калі свайго я дамагуся,
Мяне ніштo ўжо не кране.
Шчыпайце ўсе — я не баюся,
Бо скура тоўстая ў мяне».



# Сабака і Казёл

У вёсцы калісьці была справа гэта.
Казёл і Сабака сядзелі ў хляве там.
Калі пацямнела і шум наўкол змоўк,
Зусім нечакана забег у хлеў Воўк.

Пачуцці другія — і стому, і холад
Адразу ў яго перамог моцны голад.
Воўк пашчу разявіў, пачаў развражаць,
З каго б лепш вячэру яму распачаць.

Хоць Воўк быў стары і худы, небарака,
Але напалохаўся вельмі Сабака.
У самы куток ён ад страху залез
І думаў, што Воўк уцячэ хутка ў лес.

Забэкаў Казёл, на ўвесь хлеў закрычаў.
Сабака ж Казла раптам лаяць пачаў:
— Ну што ты тут бэкаеш? Будзь разумнейшы.
Пан Воўк добра ведае, хто з нас смачнейшы.

Казла Воўк з'еў хутка і нават са смакам,
Але памыліўся ў разліках Сабака.
Воўк, з'еўшы Казла, не пабег сабе ў лес,
Але адпачыць ён пад дзверы палез.

А ўранку Воўк вырашыў падмацавацца.
Сабака ліслівa пачаў выскаляцца:
— Пан Воўк, даражэнькі мой, я вас прашу!
— Казлом павячэраў, табой закушу!

* * *

Заўсёды ў Ваўка апетыт — ого-го!
Ён з'есць і Казу, што ўскарміла яго.

## Зайцава натура

Па лесе Заяц паскакаў
І раптам двух Ваўкоў спаткаў.
Ваўкі пабеглі наўздагон,
Ад страху знепрытомнеў ён.

А два Ваўкі паміж сабой
Смяротны завязалі бой:
Дзяліць жа Зайца на дваіх
Не згодзен быў ніводны з іх.

І вось, калі спалох прайшоў,
Касы ачухаўся і ўстаў.
Убачыў мёртвых двух Ваўкоў
І на ўсю моц зарагатаў:

— Дык вось што я тут нарабіў!
Адзін — Звяругаў двух забіў.
Урок належны змог ім даць:
На Зайца страшна нападаць!

* * *

На жаль, такіх вось «малайцоў»
Ёсць шмат не толькі між Зайцоў.

## Ліса і Певень

Ліса была галоднай, пэўна.
Пракралася ў сяло нясмела.
Але, калі злавіла Пеўня,
Пазабаўляцца захацела.

— Бяжым навыперадкі, — кажа, —
Даўно з табой пабегаць мару.
І хто з нас большы спрыт пакажа,
Прыдумае другому кару.

Мінула некалькі імгненняў,
Лісіца Пеўня перагнала,
І пер'я шмат з задавальненнем
З яго хваста павырывала.

— Пабеглі зноў да той вунь горкі,
Ды зараз я прайграць не раю,
Бо лёс твой будзе вельмі горкі:
Я пер'е ўсё павыдзіраю.

Напяўся Певень — не да жартаў —
І перагнаў Лісу, на шчасце.
— Ідзі ў хлеў, — кажа, — на расплату,
Такое свята ў нас не часта.

А сам услед за ёй пакрочыў,
Пятлю Лісе накінуў лоўка.
У той на лоб палезлі вочы:
— Мяне задушыш ты вяроўкай?

— Не, я да здзекаў не ахвочы,
Ды зараз не ўцячэш нікуды.
З пятлі вылазь сама, як хочаш, —
Хоць мой хлеў, а падпальваць буду.
* * *
Канец нядобры, як і мэты
Нахабнікаў і прайдзісветаў.

## Пра сваё і за сваё

Варона на суку сядзела,
І вось зламаўся гэты сук.
Яна падняцца не паспела
І вобземлю раптоўна — грук!

Спазнала гукаперайманне
За свой працяглы вельмі век.

Спачатку гаўкала старанна,
Бы над сабой адчула здзек.

А потым мяўкала адчайна,
Ды гэта не дапамагло.
Тады, як хуліган звычайны,
Загнула маты — во было!

Нарэшце, каркнула, як трэба, —
Тут і прапаў пякучы боль.
І паднялася ўраз пад неба,
Дык здагадайся, у чым жа соль!

Няцяжка зразумець высновы:
Чужое лепш не выбірай.
І думай ты на роднай мове,
На роднай мове й размаўляй.

## Наша жыццё

Быў сталінізм, застой, перабудова.
Жылі ў вайну. Даўно няма вайны.
І кожны кіраўнік рабіў нанова,
І кожны абяцаў нам рай зямны.

Такія светлыя былі ў нас мэты!
Ідэяй забяспечвалі спакой.
Багатыя на танкі і ракеты —
Цяпер стаім з працягнутай рукой.

Хоць самі ўдосталь вельмі рэдка елі,
З Амерыкай трымалі парытэт.
Паўсвета апрануць, карміць хацелі,
Узброіць мы імкнуліся ўвесь свет.

І завалілі так святую справу —
Брыдзем у свету ўсяго ў хвасце.

Каб разваліць магутную дзяржаву —
Відаць, патрэбна ўмець і захацець.

І не змаглі як след за працу ўзяцца,
Не ўгледзелі, што так змяніўся час.
Нам не ўдалося перабудавацца,
І рынак шчэрыць зубы ўжо на нас.

Народны Фронт, Саветы і Урады
Казалі, што няма шляхоў назад.
Дапамагчы былі як быццам рады,
Ды тармазіў ранейшы апарат.

Стваралася нямала новых партый,
«Вядучая» ж ідзе ўжо ў забыццё.
На лепшае нам спадзявацца варта,
Ды хутка пагаршаецца жыццё.

Зігзагамі ішлі мы, а не прама,
Але не спахапіліся раней.
Да той перабудовы быў край ямы,
А з ёю — апынуліся на дне.

Адбыўся ў жыцці ў нас зрух вялікі,
Мы дажылі да «слаўнае» пары.
І хутка так у госці будзем клікаць:
— Я запрашаю вас... на сухары.

А лёс у нас такі, як у Радзімы,
Ды трэба ратаваць агульны дом.
Калі вайну ў свой час перажылі мы,
Як-небудзь рынак мы перажывём.

(Між тым засела думка ў галаве:
А што як рынак нас перажыве?)

# Незалежнасць

Як за незалежнасць мы змагаліся
Праз дзесяцігоддзі і вякі!
Ды нягоды скрозь перажывалі ўсе,
Ў ход пускалі зброю й кулакі.

Лезлі адусюль да нас захопнікі,
І на скрыжаванні ўсіх дарог
Край мой часцяком слязьмі быў поўненькі,
Ды трымаўся ўсё ж народ, як мог.

І задумы бачылі падманныя,
Жорсткасць, лютасць ворагаў усіх.
Хоць спакойныя, ды не рахманыя —
І наскокі адбівалі іх.

У Вялікім княстве ж уладарылі,
Што Літоўскім звалася тады.
Толькі аб сваёй дзяржаве марылі,
Як стаім на свеце, мы заўжды.

У Саюзе братнім нас запэўнілі,
Быццам незалежны ўжо наш край.
Толькі гэта выйшла бруднай пенаю,
Бокам вылез нам савецкі «рай».

Хоць надзеі добрыя даўно былі,
Спадзяваліся, аднак, дарма.
Прыпаўзла бяда ад нас з Чарнобыля —
Вінаватых быццам бы няма.

Толькі ўсё ж пакуль што не загінулі,
Ды разлікі — толькі на сябе,
Бо ранейшыя сябры нас кінулі —
Кожны пад сябе цяпер грабе.

Калупаемся, як быццам гномікі,
Гномы ж тыя — ў казках, што там ім!

У развале наша эканоміка,
Кланяцца цяпер патрэбна ўсім.

Мо дамовы, пагадненні розныя
Прывядуць да вельмі важных змен...
У паездкі едзем мы сур'ёзныя
У Францыю, Германію, Бахрэйн.

Дзеячы нібыта ёсць і сталыя,
Нетры ёсць, нямала моцных рук,
Ды чаму ж мы гэткія адсталыя,
І калі ў жыцці надыдзе зрух?

Думае народ наш — і палітыкі,
Што нярэдка варты востра́й крытыкі.
Хоць падзьмула раптам нейкай свежасцю,
Што рабіць нам з гэтай незалежнасцю?



## Сённяшні дзень

Краіна завіхаецца,
У рынак уціскаецца —
Такі кругаварот.
Ды з «поспехамі» нашымі,
А тэмпы чарапашыны —
Іх хопіць на сто год.

Нічога не купляем вось,
Пакупка ў доме — рэдкі госць,
Даношваем, што ў хаце ёсць,
І падаем на дно.
А як жа сем'ям маладым?
Развеяліся мары ў дым,
Прасцягу не відно.

Праблем залішне маем мы,
Дзяцей не нараджаем мы —
Усё наадварот.
Малыя нашы рублікі,
Старэе ўся Рэспубліка
І меншае народ.

Надзеі не збываюцца,
А дабрабыт зніжаецца —
Горш, чым пасля вайны.
Тады мы спадзяваліся,
Паволі падымаліся,
І лепшыя йшлі дні.

Аб'явяць больш мінімум,
Ды тут падкінуць «міну» нам
Вытворцы, гандляры.
Імгненна душаць цэнамі
І зноў нас рабяць беднымі —
Так гінем да пары.

Затраты, кажуць, большыя,
Не заціскайце грошы вы,
Іначай за мяжу
Тавары хутка павязём
І дэфіцытам загрызём —
Хоць сядзьце на дзяжу.

...Душою неспакойныя,
Худыя мы і стройныя
Ад гэтага жыцця.
Наўкол такая каламуць!
Дай Бог нам ног не працягнуць,
Пазбегнуць забыцця.



## Што рабіць?

Жыццё ідзе, і час ляціць шматзменна,
Падзеямі цікавымі бяжыць,
Шматколерна мяняецца імгненна,
Дык як нам у краіне нашай жыць?

Дзяржаўны сектар падае імкліва,
Падаткамі заціснуты даўно.
Калгасны ж — у даўгах у нас, на дзіва,
І выйсця ўжо нікому не відно.

А фермераў — мізерная праслойка,
Не дапамога ім ідзе, а ўціск.
Камерцыя працуе вельмі бойка,
Краіну цягне ці то ўверх, ці ўніз.

Мы хочам, каб быў хлеб і каб да хлеба.
Хто зможа нам кірунак паказаць?
Ёсць у жыллі вялікая патрэба,
А дзе мільёны на кватэры ўзяць?

Прыватызацыя ідзе павольна,
Яе як быццам нават і няма.
Дык як жа ўвойдзем мы ў свет, у вольны,
Калі старанні ўсе ідуць дарма?

Завалы б разабраць усе дачыста,
І на адказным гэтым рубяжы
Сярод сваіх шукаць эканамістаў
Ці клікаць самых лепшых з-за мяжы.

Краіна самых новых тэхналогій,
Навукі найвышэйшай і ідэй,
Заводаў слаўных, рук руплівых многіх
Павінна ўперад крочыць — і смялей!

За новыя рэформы трэба брацца,
Каб багацейшымі былі наш дом і стол.

Або самім як след нам разабрацца,
Ці запрасіць варага на прастол.

## Кааператывы

Зусім не рэдкія ў жыцці
І новыя матывы.
Вось, як грыбы, пайшлі расці
Ў нас кааператывы.

Будуюць, шыюць, кормяць нас,
Наладжваюць абслугу.
І шырспажыў, лячэнне ў час —
Усё, з чым вельмі туга.

Хто гучна закрычаў «ура!»,
Хто кінуў вокліч грозны.
Але ўжо надышла пара
Пагаварыць сур'ёзна.

Прыватныя харчавікі
Рэкламы не шкадуюць.
А дзе іх свінні і быкі?
Жывёлу ж не гадуюць.

Каб не рабілася ўсё горш,
Не абдзіралі лоўка,
Карміць павінна нас усё ж
Дзяржаўная сталоўка.

Туды ж славутыя ўрачы —
Даход шукаць старанна.
У платных клініках лячыць
Не хочуць вельмі танна.

Куды з лячэннем гэтым пруць,
Дзе чэрпаюць натхненне?

А на лячэнне век бяруць
З зарплаты адлічэнні.

Для нас, вядома, гэта — муць —
Іх сквапныя памкненні.
А грошы самі не растуць —
Дык з нашае кішэні.

Каапeратараў дзвіз:
Бяры, нічым не грэбуй!
Хадзі за грошы — вось сюрпрыз —
Ты нават па патрэбе.

Будуйце, шыйце ў добры час,
Майструйце, рамантуйце.
Не абірайце толькі нас,
Сябе — і ўсіх шкадуйце.

Тады залічым у актыў
Мы кожны каапeратыў.

## Цэны

Штодзень усюды перамены.
Іду, любуюся на цэны.
Ды дзе карысць ад любавання?
Купляць зусім няма жадання.

Але прыдбаў бы штось, вядома,
Бо небагата часта дома.
У чым найпершая патрэба?
Мы не абыдземся без хлеба.

Падумаеш — на мяса ласы,
Не шкодзяць нават і каўбасы.
Гародніна і садавіна
Быць на стале заўжды павінны.

Ляжаць былыя дэфіцыты,
І падыход да іх адкрыты.
Ды ўсё такое дарагое —
Не ўзяць ні тое, ні другое.

У нашых крамах зрух карэнны —
Кусаюцца адчайна цэны.
Пякуць і ціснуць цяжкім прасам:
Вось кілька — даражэй за мяса.

Не шкодзіла б купіць, дарэчы,
І неабходныя нам рэчы.
Што важнае ўзяць — не параіш,
Бо грошай век не назбіраеш.

І дробных рэчаў кошт вялікі,
Адразу кідайся ў разлікі.
Трусы ды майкі і шкарпэткі —
Нялёгка скарб набудзеш гэткі.

Ні нарадзіцца, ні жаніцца,
Мінулы час нам толькі сніцца.
Праблема нават пахавацца —
Хоць бессмяротным заставацца!




А хтось не спіць і дні, і ночы,
Падняць зноў цэны рэзка хоча.
І на сабе спазнаць мы рады
Саветаў «клопаты» і ўрада.

Віткі інфляцыі ўсё ўюцца,
А цэны скачуць, не здаюцца.
Ды ёсць яшчэ на хлеб і квас.
Улады думаюць пра нас...

# Маладыя камерсанты

Мы бачылі кіёскаў масу,
Што без прымерачных і касы.
А ў іх усіх — шаноўны рад
Здаровых хлопцаў і дзяўчат.

Кіёскі звалі мы «камкамі»,
Што гандлявалі шустра з намі,
Ліквідавалі дэфіцыт,
Паказвалі належны спрыт.

Харчы і рэчы, спірт і транты —
Усё дастануць камерсанты.
Ты толькі кучу грошай май
І для сябе іх не трымай.

А лепш даляраў май дзве жмені —
Перасыпай у іх кішэні.
Тавараў якасць не глядзі,
Узяў, што ўсунулі, ды йдзі.

Аднак жа хлопцы-малайцы —
То не ранейшыя купцы.
У тых вялікі клопат быў,
У гэтых — хапануць абы.

Кіёскі тыя разагналі,
Ды камерсанты не драмалі.
У магазінах і дамах
Зноў немалы ўзялі размах.

Купілі дзесьці, перавезлі,
У нашы кашалькі залезлі.
І ўсё ім сходзіць тут дарма,
Бо спекуляцыі — няма.

У бізнес скачуць, нібы коні,
І іх ніколі не загоніш

Ні за станок і ні за плуг,
Маўляў, не зробіце з нас слуг.

Сябе гаспадарамі лічаць,
Наш дабрабыт не павялічаць,
Абкрадваюць сябе саміх...
Шкада мне гэтых маладых!
І што, скажыце, будзе з іх?




## Пра выдаткі на падаткі

Яшчэ такога не было.
Як дрэннае насланне,
На фонд зарплаты налягло
Падаткаабкладанне.

Падаткаў столькі — проста жах!
Зарплата йдзе з задышкай.

Вось адлічэнні на сацстрах —
Працэнтаў сорак з лішкам.

Як быццам міма ўсё цячэ,
Ад нас бяжыць адчайна.
Працэнтаў васемнаццаць шчэ —
Падатак надзвычайны.

Чамусьці робіцца ўсё горш,
Скрозь — змрочныя адбіткі.
Працэнтаў трыццаць да таго ж —
Падатак на прыбыткі.

Павевы ёсць тут новыя
Па лініі адметнай.
На вартасць дадатковую —
Дай дваццаць пяць працэнтаў.

З грашыма вольнасці не май
І курс трымай прыкметны.
І пяць працэнтаў выдзяляй
У фонд пазабюджэтны.

Яшчэ замнога будзе змен,
І мер нямала прымуць.
У фонд рэгулявання цэн
Працэнты тры адымуць.

Адзін працэнт яшчэ бяруць,
Каб паляпшаць дарогі,
І на занятасць столькі ж пруць,
Бо беспрацоўных многа.

Як след бы гэта скарыстаць!
Ды лепш нам не жывецца.
І вельмі хочацца спытаць:
— Дзе ж гэта ўсё дзяецца?

# Як вучыцца і лячыцца

Вось часу нашага хваробы!
І іх ужо даволі шмат.
Уводзяць плату за вучобу —
Хто паступае, той не рад.

Калі з грашмі дадуць вам рукі
Завод, калгас, або бацькі,
Тады вас абмінуць і мукі —
Здавайце хоць на «траякі».

Інакш вам будзе свет нямілы —
Выдатніку не паступіць.
Каб не прабіліся дэбілы —
Бо кроў у жылах будзе стыць.

Імгнена час усё ж імчыцца!
Глядзіш — сваё бярэ і ўзрост.
Цяпер праблема і лячыцца
Прад намі стала на ўвесь рост.

А дзе дастаць, скажыце, лекі?
Шукай усюды, а не стой.
У камерцыйныя аптэкі
Шыбуем шпаркаю хадой.

Я сам хварэў, дык быў не рады —
Хваробы розныя знайшлі.
Упёр на лекі два аклады,
Хоць толк быў ад таго малы.

Калі ж у тым не будзе сэнсу —
Нашто пустое нам малоць —
Дык лепш пайду да экстрасэнса:
Не будзе рэзаць і калоць.

Глядзім далей. Як кліч прыроды,
Раджаюць жа, як ні круці.

Дык платныя ўжо ўводзяць роды:
Як хочаш зручнасці — плаці.

Такія бачым катаклізмы,
Усюды цяжкасці — бяда!
І хоць няма капіталізму,
На кожным кроку — плату дай.

І як такога нам пазбыцца?
Калі падумаць — проста здзек.
Так ні вучыцца, ні лячыцца
Не зможа бедны чалавек.

Да інстытутаў мы — з даверам,
А да бальніц — і што казаць!
Ды гэта вось — не тыя сферы,
Дзе трэба прыватызаваць.

Чакаюць нас такія стрэсы,
Што цяжка будзе і стрываць,
Калі багатыя балбесы
Ўжо будуць намі кіраваць.

## Як мільёншчыкам я стаў

Час вясёлы — невясёлы
Быў раней, меў свой размах.
Гарады тады і сёлы
На малых жылі грашах.

Мець мільённыя прыбыткі
Мог завод або калгас.
Дзеля ўласнага ж ужытку
Не было тых сум у нас.

А валодаць тым мільёнам
Чалавек мог толькі ў сне.

Бо даход той — незаконны,
Значыць, кара не міне.

І на сто рублёў жылі мы —
Скажам, не як каралі,
Ды не йшлі ўсё ж святы міма,
Грошы ў нас заўжды былі.

Новы час дыктуе змены —
Больш заробку не прасі!
Зарабляць шмат сталі ўсе мы —
Хоць мяшок з сабой насі.

Весяліся, люд працоўны!
Што капейкі і рублі?
Нам налічваюць мільёны —
Збыцца нашы сны змаглі.

Ды раскоша ўжо і сала,
Каўбаса — не па грашах.
Недаступнай рыба стала,
Цэны б'юць нам па зубах.

Мэбля, вопратка, абутак —
Павышэнне на чарзе.
І ва ўсіх на тварах смутак,
Бо інфляцыя грызе.

Адыходжу ад адчаю
Я з палучкі дзень, другі,
А пасля зноў пазычаю,
Так растуць мае даўгі.

Ды не ўсе ж бядуюць, мусіць,
У суровы гэты час.
«Новых» рускіх, беларусаў —
Іх замала сярод нас.

А далей што будзе з намі?
Мы ледзь ходзім, ледзь стаім.
І з падранымі штанамі —
Я з мільёнам са сваім.



## Горш не будзе

Цяжка нашай Беларусі,
А жыццё ледзь-ледзь ідзе.
У такой мы сёння скрусе —
Горш не будзе нам нідзе.

Палячу ў далёкі Космас,
Хоць у Афрыку пайду —
Абміну сваю я млоснасць,
Лепшае жыццё найду.

Тая Афрыка — край званы,
Што раней была «ў хвасце».
Малпы там ядуць бананы,
А на дрэвах хлеб расце.

Ці ў Амерыку, Канаду,
Аўстралійскі цёплы край
Паімчу не па загаду —
Кажуць, там — ну проста рай.

І жывуць так добра людзі,
І багатых вельмі шмат.
Нам усюды горш не будзе,
Не захочацца назад.

Толькі думка ёсць такая,
Думка сумная мая:
Дзе і хто мяне чакае
І каму патрэбен я?

Голас сэрца ўсюды чутны,
Ува мне гучыць штодня:
Тут — народ мой шматпакутны,
Як і ўся мая радня.

На каго свой край пакіну,
Каб пусцела і зямля?
Уратуе хто краіну,
Хто ўсё зрушыць, як не я?

Падтрымаем працай важкай
Мы Радзіму ў гэты час!
А жывём настолькі цяжка,
Што не будзе горш і ў нас.

Беларусь лёс не пакіне:
Ёсць гісторыя свая.
Раз народ мой не загіне —
Значыць, выжыву і я.

# Пра рэлігію

І ў дваццатых, і ў трыццатых,
І ў гадах пяцідзесятых
Бушавалі партакраты,
Каб рэлігію знішчаць.
Бо адцягвала ж увагу
Ад надзённай самай прагі
Новае жыццё пачаць.

Так папоў, ксяндзоў «любілі» —
Так любілі, што пабілі:
— Колькі іх яшчэ цярпець?
А цярпелі ж бабкі, маці.
Хто тады мог падтрымаць іх?
Гэта цяжка зразумець.

Дзе ў нас помнікі культуры?
Малявалі іх з натуры,
Што ў нас ёсць, апроч халтуры,
Цуд — будынкі нашы дзе?
Паўзрывалі, разламалі,
Цэрквы скрозь паруйнавалі,
Быў прастор тады бядзе.

Будавалі ж нашы продкі,
А народ збіраў сам сродкі
Па капейцы, па рублю.
Каб святлелі нашы душы
І спакой ніхто не рушыў,
Каб казалі ўсе: — Люблю!

Як падзьмула новым часам,
Апынуліся сам-насам
З часам тыя дзеячы.
Папаўзла ў душу трывога,
Дружна верыць сталі ў Бога,
Каб свой страх перамагчы.

У царкву, нібы авечкі,
Ціха ходзяць, ставяць свечкі
На ахвяр сваіх памін.
Замаліць грахі імкнуцца,
У паклонах нізка гнуцца —
Ёсць на гэта шмат прычын.

Памянялі афарбоўку,
Бо да ўлады лезуць зноўку,
Ім патрэбен тут і Бог.
Што ім новыя законы?
Бо яны — хамелеоны,
Маюць многа рук і ног.

Ёсць хамелеоны ў лесе,
Пры сваім там інтарэсе —
З гэтымі б не ладзілі.
Гэтыя свайму народу
Нарабілі столькі шкоды!
Тыя ж — хоць не гадзілі.



# Мінімалка, мінімалка...

Мінімальная зарплата,
Ад цябе нямала зла.
І чаго ў жыцці ты варта,
Да чаго ты давяла?

Хто цябе прыдумаў палка
У нялёгкі гэты час?
Мінімалка, мінімалка,
Чым каштоўна ты для нас?

Хто прыдумаў гэты выраз
І каму выгода ёсць?
Мо даход наш значна вырас
І жыццёвы ўзровень рос?

Мінімалку падымаюць,
Дык не радасць, а бяда.
Ад таго што людзі маюць?
Грошы быццам бы вада.

Мо бюджэтнікам паможа,
Хто на пенсіі — і ім...
Дык не стане болей збожжа
І тавараў нам усім.

А рабочым, інжынерам
І калгаснікам — чым лепш?
Абяцанкам часта верым,
А пражыць — ледзь пражывеш.

Не паспеюць крыху большай
Нам зарплату налічыць,
Цэны — скок! І меней грошай,
Кашалёк худы пішчыць.

Аб'яўлялі б мараторый
Хоць на месяцы на тры:

Хто што хоча, тое творыць,
Цэны гоняць без пары
(Хто ж? Вытворцы, гандляры).

Ды і што нам тыя грошы,
Хоць мільёны, хоць рублі!
Спажывецкі цягне кошык —
Дык старайся, зарабі.

Сумяшчэннем мо займайся:
Ці грузі, ці мо вартуй.
За заробак ты трымайся,
А інакш — мякіну жуй.

Нам не трэба абяцанкі,
Кошт мы ведам грашам.
Адмяніце мінімалку,
Больш зарплаты дайце нам.

Новыя шукайце формы —
Хто ва ўладзе, ў галаве.
Будзе ўперад рух, рэформы —
Зажывём, як свет жыве.

## Пенсіі

Старэчых клопатаў нямала,
Аж нават краю не відно,
Бо пенсіі ўсе падраўнялі,
Усім дадуць амаль адно.

Хто працаваў старанна, шчыра,
А хто — зусім наадварот.
Стаж у адных — гады чатыры,
У іншых — цэлых сорак год.

Хто на высокай быў пасадзе,
Хто — і зусім на радавой.

Адзін з фізічнай працай ладзіў,
Другі — шурупіў галавой...

Калі раней рублёў сто дваццаць
Давалі ці сто трыццаць два,
Дык мог пенсіянер трымацца,
І не балела галава.

А сёння пенсія такая —
Галечу як перамагчы?
Нам гэтай пенсіі хапае,
Каб толькі ногі валачы.

Жаданні ж у старэйшых — дробязь:
Працягнем неяк, хоць верць-круць.
І супакойваецца боязь:
Своечасова хоць даюць.

На пенсію такую сходзіш
Раз, два — у краму, на базар.
Што найтаннейшае знаходзіш,
Найнеабходнейшы тавар.

Не разгуляйся, еш у меру,
Адзення, рэчаў не купляй.
І як пражыць пенсіянеру?
Чакай, што Божа прыме ў рай.

Працуе чалавек, пацее,
І да ўсяго ўжо ён гатоў.
Дзяржава мо пабагацее,
Не хутка — дык праз шмат гадоў?



# Пакаранне за старанне

Завод гібеў — не тыя словы!
І не было належных мер.
Тады туды талковы новы
Прыйшоў галоўны інжынер.

Выкараняць пачаў прычыны,
Чаму завод зусім адстаў.
Падняў спачатку дысцыпліну —
Ніхто не сноўдаўся без спраў.

Узняў ён дрэвaапрацоўку —
Там столькі плошчы і станкоў!
А мэблю робяць для сталоўкі,
Аконных рам шмат і сталоў.

І механічны цэх нядоўга,
Але з напругай падымаў.
Паставіў там усіх на ногі —
Праблем з вытворчасцю няма.

Прыйшоўшы на завод, адразу
Шляхі ў прагрэс шукаць пачаў.
На шматмільённыя заказы
Дамовы ўсюды заключаў.

Сказаў работнікам: — На страты
Ніколі згоды не дадзім.
І падыму ўдвая зарплату
Я праз паўгода вам усім.

Наўкол — настрой, ва ўсіх — натхненне,
Галоўны інжынер — герой.
Дырэктар з незадавальненнем
Паклікаў позняю парой.

— Ты што прыліп тут, як кароста?
Звальняйся — дзесяць дзён даём.

— За што і як, і гэтак проста?
— Не хочаш проста — будзе гром!

Боль галаўны, адны турботы:
Дырэктар некага знайшоў.
Загад быў: «За развал работы».
Галоўны нехаця пайшоў.

І праўда: сябра ўзяў дырэктар,
Хоць той — не спец, а балбатун.
І зноў ідзе работа з крэктам,
І зноў — развал, бяздзейнасць, тлум...

Хто ў працы ходзіць коса-крыва —
Падзякі мае за «старанне».
А вось за ініцыятыву
Нярэдка будзе пакаранне.

## Сучасны партрэт

Квадратныя плечы,
Шырокі і твар,
Багатыя рэчы,
Каштоўны тавар.

І модны абутак,
Аб'ёмны пінжак.
Хіба бачыць смутак,
Хто ходзіць вось так?

Кароткая стрыжка,
Суровы пагляд.
Стос грошай, як кніжка,
Даляраў зашмат.

І сотавы мае,
Як звон, тэлефон,

Бо сувязь трымае
Шмат з кім часта ён.

Вылазіць вось з «Вольва»,
Прытым не адзін.
Паходкаю вольнай
Ідзе ў магазін.

Купляе найлепшы
Каньяк, сервелат
І торт даражэйшы,
Яшчэ — чакаляд.

Шыкоўныя дамы
У машыне сядзяць —
Не жонкі, не мамы,
З пагардай глядзяць.

... Артыст ці спартсмен,
Што дамогся удач,
Хто ён?
                    Бізнесмен,
Сучасны фірмач.



# Маланка і гром

Мужык, адпачыўшы да ранку,
Хацеў гаспадаркай заняцца.
Глядзіць: шаравая маланка
Ўляцела і кружыць на хаце.

Не ведаў мужчына той страху:
— Што носішся, як на гулянцы?
Схапіў качаргу — і з размаху
Як лясне на гэтай маланцы!

Страшэнны тут выбух пачуўся,
Нібы нехта стрэльнуў з гарматы.
Хто позна спаў — хутка прачнуўся,
І — ні мужыка, ані хаты.

* * *

Кідацца — без сэнсу, без ладу
Калі з качаргой — ды на ўладу,
Ва ўладзе — магутная сіла,
Глядзі, каб цябе не скасіла!



# Лёс ананімшчыка

Пісаў Зюзюкін вельмі многа,
Ва ўсе інстанцыі падрад.
Яго душэўная трывога
Вяла не ўперад, а назад.

Страчыў удала, без затрымкі,
Слаў скаргі ўсюды зноў і зноў.
Канечне, толькі ананімкі,
І шмат каму псаваў ён кроў.

Але змяніўся подых часу,
Ды не на жарты, а ўсур'ёз.
І ананімак брудных масу
На сметнік ветрам ён аднёс.

Зюзюкін, праўда, не здаваўся,
Яму рахманым век не стаць,
Бо звычка дрэнная — бяда ўся,
І... на сябе пачаў пісаць:

«Зюзюкін — шэльма, гад паўзучы,
Ён напаскудзіў шмат каму.
Калі ж ужо яго правучаць?
Пара мазгі ўпраўляць яму!»

Вось так, без значных варыяцый
Сябе самога лупцаваў.
І вынік той ганебнай працы
Сабе самому пасылаў.

Пасля чытаў з задавальненнем:
— Вось як яму я, чорту, даў!
На першы час было прыемна,
Затым адчулася брыда.

Забыўся, што ён сам жа піша,
І перайшла ў шаленства злосць:

— Каб дух з таго паганца выйшаў,
Што здзек мне творыць. Хто ён ёсць?

Каб я сустрэў яго, падлюгу,
На горкі яблык збіў бы ўраз!
Вось так хрыпіць, крычыць з натугай,
Раве Зюзюкін Апанас.

Не разумее, як жыць гэтак, —
Не ўкладваецца ў галаве.
Калі працягнецца далей так —
Са свету сам сябе зжыве.

## Сустрэча з бомжам

Вось стаю і п'ю я піва.
Не хачу нічога больш.
Хтосьці йдзе тут коса-крыва.
Заўважаю: гэта — бомж.

Мо жыццё правёў бурліва.
Што сказаць яму магу?
Акуратны ён, на дзіва,
Чаравікі ж — ні ў дугу.

Папрасіў ён цыгарэту,
Я яму і піва даў.
І ў яго спытаў пры гэтым:
— Што, даўно забамжаваў?

— Не, — сказаў ён, — я — мужчына,
Толькі што адкуль мне ўзяць?
А бамжую па прычыне,
Што нялёгка расказаць.

Узначальваў я вытворчасць
І гарэў, нібы агонь.

І да працы быў ахвочы,
Справы ўсе цягнуў, як конь.

Фірма знікла, як і ўзнікла,
Спапялела, быццам дым.
Шум стаяў наўкол вялікі:
Мы ляжым, а не стаім.

Кіраўніцтва — за мяжою,
Грошы — з імі, як заўжды.
І адзін застаўся ўжо я,
І прыпішуць мне гады.

Ёсць і дача, і машына,
І кватэра нават ёсць.
Толькі ўсё не без прычыны
Не маё: я — быццам госць.

Госць зусім там нечаканы.
Папярэдзілі: — Знікай!
І хоць быў ты нам аддады,
Лепшай долі не шукай.

І жыццё пайшло такое —
Доўга думаў нездарма.
І не маю я спакою:
Ці то ёсць я, ці — няма.

— А ці еў ты хоць скарынак?
Адказаў мне сумна ён:
— Вось пайду цяпер на рынак.
Я пайшоў збіраць кардон...



## Дыягназ

Вось надышоў апошні ўздых.
Дыягназ розны ў нас усіх:
Інфаркт, інсульт
І язва, рак
Жыццё бяруць у небарак.
Тэхнічны шкодзіць нам прагрэс —
Здараецца нервовы стрэс.
Ад нерваў — і хваробаў шмат
Выстройваецца ў доўгі рад...
А на вянках і камянях,
Як прачытаеш, — проста жах!
Напісана з усіх бакоў:
Ад дзетак, цешчы, сваякоў,
Адміністрацыі яшчэ,
Ад прафсаюза — аж пячэ...
Ад супрацоўнікаў сваіх
І ад суседзяў ад усіх...
А чалавека ўжо няма.
Прычыны дзе? Шукаць дарма.
Чаму сканаў,
Дыягназ дзе:
Ці ад хвароб,
Ці ад людзей?

## Майстры развалу

На фабрыцы слаўнай былі дружбакі
Высокага рангу — кіраўнікі.
Ніколі яны не бывалі ў журбе,
Пра фабрыку «дбалі», а больш — пра сябе.

Выгоды свае не прагледзець абы.
Кватэры і дачы раслі, як грыбы.
Цягнулі рублі, як вадзіцу з крыніц,
А родная фабрыка падала ніц.

Убачылі раптам, што справам там — край.
Дык, значыцца, хутка манаткі збірай.
Куды б паляцець ім, як восам на мёд?
І нераплылі на суседні завод.

Пасады ўсе важныя там занялі
І выгляд рабілі, што ў працы былі.
Але стала бачна — «худнее» завод,
І стаў як участак ён недзе праз год.

Па змове агульнай калегі-дзялкі
Найлепшыя хутка прадалі станкі.
Спрытнюгі сарваць кучы грошай змаглі,
Ды больш іх на ўласныя ўклады ляглі.

І лепшыя кадры завод разгубляў,
Яны разышліся ад брыдкіх тых спраў,
Бо плана няма і зарплаты няма,
Каму ж па душы працаваць задарма?

Гамоняць у цэху вось два сябрукі.
— Начальнікаў многа, а толк з іх які?
Яны ўжо гатовы ўцячы і ад нас,
Збягуць на будоўлю буйнейшую ўраз.

Адзін вёў расповяд, адказ даў другі:
— Апісваюць шэльмы-вароны кругі.
Не будзе карысці ад хеўры такой.
Прапала будоўля! — махнуў ён рукой.

* * *

Змагаецца шмат хто за план і за вал,
А іншыя з радасцю робяць развал.
Ім хочацца жыць багацей, весялей.
Усё расцягаюць — і бегма далей!

## Брат па разліку

Была ў праўленні цішыня,
Ішлі спакойна справы.
Ды раптам бачыць старшыня —
Зайшла Марыля жвава.

— Старшынька, родны, што рабіць?
Бяда ў мяне такая:
Кароўка знікла — як мне быць?
Другі ўжо дзень шукаю.

— Э, не бядуй, ідзі дамоў,
Дарма сябе трывожыш.
Другую, лепшую дамо,
Калі знайсці не зможаш.

— Дапамагчы табе я рад —
Мы ж колькі год знаёмы!
Ну, як сама і як твой брат —
Той, што ў райвыканкоме?

Ды я-то што? Здароўе ёсць,
Работа нас мацуе.
Брат жа ў раёне рэдкі госць,
Даўно там не працуе.

Зірнуў сурова старшыня:
— Чуць не хачу пра тое!
Ды што ты мелеш мне паўдня
Пра ўсё сваё пустое?

Карову воўк, напэўна, з'еў —
Сама ж і вінавата.
Пляваць я на яе хацеў,
Начхаць хачу й на брата!

Марыля кажа:
— Многа дзён

Не бачым брата ў доме.
Усё змянілася, і ён
Ужо ў аблвыканкоме.

— Эге, Марыля, пачакай!
Люблю цябе, як матку.
Сваю кароўку не шукай,
Бяры любую ў статку.

Такім, як ты, цаны няма,
Шаную вельмі брата.
Ты даражэй мне, чым кума,
Заходзь заўсёды ў хату.



## Ва ўладзе Смаўжа

На гэтым заводзе вядомы найбольш
Буйны кіраўнік той па прозвішчы Смоўж.
Высокай пасады даўно дасягнуў,
Адметную лінію гне, як і гнуў.

Аматар праводзіць нарады заўжды,
Ды што прапануе на іх праз гады?

Усіх азадачыць (не ведае, чым!),
Упарты як бык, а стаіць на сваім.

Яго гарызонтаў зусім не відаць.
Галоўнае — іншым работы задаць.
І скінуць адказнасць на тых, хто ніжэй.
За тое не возьмецца век, што цяжэй.

Ідзе па заводзе і нюхае ўсіх,
Учуць вельмі хоча, чым пахне ад іх.
Глядзіць дысцыпліну, нібы вартавы,
І вечна качае свае ён правы.

І выгляд стварае, што ён — працаўнік,
Хоць толькі ўказанні даваць сам прывык.
Высокае крэсла заняў нездарма.
А ў крэсле як быццам ён ёсць — і няма.

Ганяе паветра пусты балбатун,
Характар паказвае, у выніку — тлум.
Але не асмелься пярэчыць яму,
Пад дых з усёй сілы ён дасць хоць каму.

Клянецца: — Рабоце сябе аддаю! —
І волю дыктуе дурную сваю.
У нервы ўразаецца людзям, як нож,
І з кожным днём справы не лепей, а горш.

Куды ўсе глядзяць і чакаюць чаго?
Ці пойдзе ён сам, ці прагоняць яго?
І хоць прападзі, хоць страляйся з ружжа,
Калі ты ва ўладзе такога Смаўжа.

# Перастаноўка

Намеснік дырэктара вельмі магутны
І целам, і духам быў — проста герой.
Але неўзабаве, як звон, стала чутна,
Што траціць павагу, губляе настрой.

Правоў вельмі многа ж улада давала,
Размах меў шырокі, не ведаў мяжы.
Зрабіць так і гэтак заўжды мог нямала,
Дзяліў сам кватэры, даваў гаражы...

Вось стала вядома: зляцеў ён з пасады —
Аферы рабіліся з розных бакоў.
Сябрам дагадзіць, як звычайна, быў рады,
Баяўся пакрыўдзіць усіх сваякоў.

У самым галоўным была і бяда ўся —
Праз прызму уласнай выгоды глядзеў.
Закона, распуснік, зусім не баяўся,
Круціў, як хацеў, і начхаў на людзей.

Калі б нехта іншы, то збег бы далёка,
Пачаў бы другую работу шукаць.
А гэты — ён што — не міргнуў нават вокам
І вырашыў зручнай часіны чакаць:

— Звальняцца нашто? Пасяджу лепей ціха
На меншай пасадзе — у тым мой сакрэт.
Пасля, як забудуцца ганьба і ліха,
Зноў буду намеснікам — стану як след.

Начальства мяне, спадзяюся, падыме:
Былі ж на банкетах, пілі там не квас.
Сядзеў за сталом я заўжды разам з імі
У ранейшы, бясхмарны такі, слаўны час...

Падсобная ёсць на сяле гаспадарка
(Завод мае комплекс вялікі там свой).

Дзялок зразумеў: будзе чарка і шкварка,
Намеснік дырэктара ўжо ён на ёй.

Рабочыя супраць былі, як вядома,
Але што ты зробіш, раз мае «руку».
І там адчувае сябе ўжо як дома —
Драпежны шчупак трапіў зноў у раку.

Я не за яго, а за справу баюся.
І вельмі баюся, што той прахіндзей
Наробіць такое — усе будуць у скрусе:
Пацягне за ногі бычкоў і свіней.

## Ханыга

Здаўна ён начальнікам недзе там быў
І грошы прасіць пастаянна любіў.
Зарплата ў яго немалая была,
Але не паказваў з яе ні рубля.

Збіраюцца разам хоць што адзначаць —
Шукае людзей, у каго б пазычаць.
Газету ці пачак купіць цыгарэт —
Імкнецца, каб сябар падаў ці сусед.

Калі ж у сталоўку абедаць ідзе,
Дык ныкае, грошай дастаць як і дзе.
Аддаць не спяшаецца тыя даўгі:
Забудзецца нехта, пазычыць другі.

Прывыклі знаёмыя ўсе да таго.
Не могуць яны зразумець аднаго:
Куды ён палучку пускае сваю?
Адказвае: — Жоначцы ўсё аддаю.

— Пакінь хоць на піва сабе, на віно! —
Былыя сябры гаварылі даўно.

Не слухае, бы не даходзіць зусім.
Паставілі крыж забыцця ўсе на ім.

І вось хуткаплынна мінулі гады,
І усё разгадалася раптам тады:
Займеў ён машыну, катаецца ўжо —
Не проста машыну, але з гаражом.

І дача ў яго ў лесе стала, як звон.
Багацця туды нацягаў кучу ён.
Ханыжнічаў гэты куркуль нездарма.
Усё быццам ёсць.
А пашаны — няма.

## Як лячыцца я хадзіў

Прыхварэў я, як на гора:
Хоць у цёплым і хадзіў,
Забалела нешта горла —
Пэўна, недзе застудзіў.

Не звярнуў на гэта ўвагі,
Думаў — заўтра ўсё міне.
Дык няма да ежы цягі,
Страўнік мучыць стаў мяне.

Мне спакой ужо не сніцца,
Дзень мінае, як прывід.
Застраляла ў паясніцу —
Быццам бы радыкуліт.

Вось я ў клініку пакрочыў —
Не працуе наш урач.
А другі прымаць не хоча:
— Пацыентаў столькі, бач!

Толькі ўсё ж я не скарыўся:
— Падлячыце горла мне!

Ды між тым прагаварыўся,
Што «страляе» і ў спіне.

Той падскочыў аж пад неба:
— Я-то вам дзеля чаго?
Тут неўрапатолаг трэба,
Дык ідзіце да яго!

Што ж, далей накіраваўся:
Трэба верыць урачам.
Ды што страўнік сапсаваўся,
Неяк вырвалася там.

І другі мне доктар кажа:
— Многа дрэнных тут прыкмет.
Вам зайсці найболей важна
Ў інфекцыйны кабінет.

Я пайшоў — і зноў па кругу
Пасылалі ўсе мяне.
А самому вельмі туга,
Будзе толк які ці не?

Быў я нават у адчаі
Ад такіх нядобрых спраў.
Да галоўнага ўрача я —
Не сцярпеў — пашыбаваў.

Разабраўся той на месцы,
Што я надта ў іх уліп,
І дыягназ даў нарэшце:
Тры мае хваробы — грып.

Змарнаваўся я, на дзіва,
І зрабіўся сам як цень:
Тры дні ў клініку хадзіў я,
А на два дні — бюлетэнь.

То адны прыпішуць лекі,
То — другія, як назло,
Нібы нейкі я калека,
Так са мной век не было.

Накупляў таблетак многа,
Піць іх нельга без нуды.
Лепш узяў бы я такога,
Чым лячыліся дзяды.

Шмат прыняў народных сродкаў:
З кветак, траў настой піў я.
Па рэцэптах нашых продкаў
Здаравей стаў удвая.

Пахадзіў — змог павучыцца,
Давялося зразумець:
Часам, каб ісці лячыцца,
Нам здароўе трэба мець.



# Прыгоды камандзіраванага

Начальнікам забеспячэння
Ён у Мыцішчах працаваў.
Паехаў вось па прызначэнні
Для вырашэння важных спраў.

У абласны падаўся горад.
Камандзіроўка на шмат дзён.
Не радасць — праца, проста гора.
Паслалі быццам на праклён.

Аднак жа выканаў заданне,
Усё аформіў там як след.
Сваіх калег перад расстаннем
Паклікаў дружна на абед.

Абед цягнуўся аж да ночы
(На самалёт жа ёсць білет),
Бо выпіць кожны быў ахвочы,
А чарачка закрыла свет.

У позні час нядобра стала,
Пасля занудзіла яго.
Чакае прыкрасцей нямала.
Як выйсці з нумара свайго?

Гасцініца — не дом наш родны,
Яе абгадзіць не даюць.
І прабівае пот халодны:
Прыборка трэба, хоць верць-круць.

Анучу нейкую намацаў
(Святло, вядома, не ўключаў).
Дыван працёр разоў мо дваццаць,
Ад страху стомлена маўчаў.

І праз акно анучу кінуў.
Пасля і сон яго спаткаў

Устаўшы, цэлую гадзіну
Свае штаны бядак шукаў.

А іх няма — бясследна зніклі,
Бо выкінуты ўжо яны.
Калегі ж да яго прывыклі,
Збіраюць грошы на штаны.

Забеспячэнская кагорта
Кішэні патрасла свае.
Купіць змаглі, ды толькі... шорты,
На болей — грошай не стае.

Да самалёта ён дабраўся,
У Маскву імкліва прыляцеў.
Чакае дом, а там — сям'я ўся,
Але выла зіць не хацеў.




Ідзе па горадзе бамбіза:
Штанцы ў дзве пядзі — сам не рад.
І разявак натоўп паблізу,
Наўкол жа — месяц лістапад.

Зайшоў у нейкую кантору,
Ў Мыцішчы звоніць сябрукам:
— Хутчэй прыедзьце — я ўжо хворы,
Без грошай не вярнуся сам.

На ногі нешта прыхапіце —
Бяда мяне сустрэла зноў.
Ды і з мяне, прашу, не кпіце,
Бо я, прабачце, без штаноў...

* * *

Дык напівацца так на чорта,
Каб апранаць увосень шорты!

## Споведзь дармаеда

Іду аднойчы ў магазін
Харчамі запасацца.
Там падыходзіць тып адзін:
— Браток! Рублёў сто дваццаць...

— Не, лішніх грошыкаў няма.
— Тады дай цыгарэту!
— І зноў жа просіш ты дарма:
Я не куру ад лета.

— Хоць, колькі часу, ты б сказаў:
Стаю — і невядома...
— Ты што ж, гадзінніка не ўзяў?
— Ёсць паламаны дома.

Штось не шанцуе, як назло! —
І ён махнуў рукою.
— Якое сёння ў нас чысло?
Я адказаў, якое.

Пасля пытаю: — Хто ты сам,
Чаму такі няўдалы?

— Э, гаманіць шмат можна нам,
Такіх, як я, нямала.

Жыву, не ведаю бяды,
Прасаўшчыком працую:
Нагамі вось туды-сюды
Асфальт штодзень прасую.

Надыдзе час — я ў гастраном,
А потым — да піўбара.
Заскочу і ў суседні дом —
Там сябрукоў ёсць пара.

Знайду, як выпіць, — я такі,
Вясёлае натуры.
Сябры нальюць ці сваякі,
Дзе-небудзь падхалтуру.

Нашто шмат клопату і спраў?
Я не такі зануда.
Раней нідзе не працаваў
І зараз вось не буду.

І закруціла, загуло,
Жыццё бяжыць, віруе.
Абы няблага мне было,
А дурань хай шчыруе...

Тых, хто без справы ды ў гульбе,
Пара спытаць, нарэшце:
— А што каб нехта за цябе
Пачаў бы піць і есці?

# Няўдалая будоўля

Узводзілі хлебазавод —
Нялёгкая задача.
І не адзін, вядома, год,
І надышоў час здачы.

Усё камісія глядзіць,
Прыдзірліва прымае.
І добра зроблена, наўздзіў,
Заўваг яна не мае.

Вось першы ўвесь прайшлі паверх —
Адзначылі, як трэба.
Пасля хацелі йсці наверх
І пах панюхаць хлеба.

Другі паверх закрыт зусім,
Дзе лесвіца — не бачна.
Шукалі — выбіліся з сіл,
Няма — усё адназначна.

Прараб тут свой адказ знайшоў:
— Рабілі дзірку ў столі,
Затым забыліся, нашто, —
Замазалі паволі.

Загад камісіі такі:
— Сцяну дзяўбіце збоку
І лесвіцу вы, лайдакі,
Вядзіце ўверх высока.

Завод нарэшце давялі —
Распараджэнне глаўка.
І сталі ўсе чакаць, калі
Хлеб пойдзе да прылаўка.

Чыгунка побач, як назло, —
У шуме ўсе і ў гудзе.

А меркаванне ў іх было —
Бліжэй разгрузка будзе.

Муку з вагонаў браць бліжэй —
Лічылі зручным месца.
А выпякаць хлеб — найцяжэй:
Не падыходзіць цеста,

Бо рэйкі ходзяць так і сяк,
Зямля наўкол трасецца.
Хлебазавод той даўся ў знак,
Другі ўжо ў іншым месцы.

А ў гэтым што?
Таварны склад.
Мільёны грошай плачуць.
... Хто ходзіць перадам назад —
Мазгі не перайначыць.

## Валакіта

Задумалі вадаправод —
Работа энергічная:
Ваду правесці на завод,
Пітную і тэхнічную.

Работу гэтую падняць —
Даўжэзная дыстанцыя.
Праект патрэбна ж узгадняць,
Біць ногі па інстанцыях.

Электрасеткі візу даць
Павінны, як належыць ім.
Мінгаз тут не ўбаку, відаць,
Днём не абыдзешся адным.

І цепласеткі разам з тым
Яшчэ наведаем не раз.

Водаканал заеў зусім:
Як трубы там ляжаць у вас?

Нас транспартны аддзел давёў,
Будаўнікі-мантажнікі.
Туды мы ходзім зноў і зноў,
А справы ўсё — няважныя.

Усюды правілы свае,
Звычайна кожны хмурыцца.
ДАІ дазволу не дае:
— Мы не закрыем вуліцу!

І тэлефонны вузел шмат
Паперамі займаецца.
Прапаў энергіі зарад —
Праект жа не ўзгадняецца.

Але прабілі ўсё ж сяк-так,
Аддзел раскопак візу даў.
А бегатня далася ў знак.
Ад мітусні хто выгадаў?

Праклалі мы вадаправод
За месяц дружнай працаю.
А афармлялі цэлы год.
Вось дык арганізацыя!

Дзе валакітчык, бюракрат —
Не распазнаем зблізку мы,
Бо ён заўжды прыкрыцца рад
Паперкамі і візамі.

# Пра прэміі

Рамонт дарогі мы вядзем
Па плане вельмі строга.
Каланізацыю кладзем —
Работы вельмі многа.

Дарогу ўбралі мы ў асфальт,
Прытым своечасова.
Ёсць прэмія, і кожны рад,
Працуем адмыслова.

Пасля асфальт нам паламаць
Сказалі неўзабаве.
Трубу там трэба пракладаць —
Кароткі тэрмін справе.




Зрабілі ўсё як найхутчэй,
І прэмія ў кішэні.
Ды новы тут загад яшчэ —
Зрабіць трубы замену.

Ламалі дружна ўсе дзяўбём,
Мяняем спрытна, спраўна.
І прэмію ў кішэнь кладзем
За перавыкананне.

Праз месяц зноў загад даюць
Яшчэ трубу пракласці,
І хлопцы ўшчэнт асфальт дзяўбуць,
Аж пот ім вочы засціць.

Ды будзе прэмія, аднак,
А гэта многа значыць.
А людзі ходзяць абы-як
І праз канавы скачуць.

І вось вядома стала нам:
Без прэмій, без акладу
Застаўся наш начальнік сам —
Пазбавілі пасады.

## Што скажаш...

Здараецца, мяняеш ты работу —
З ахвотаю ці нават без ахвоты.
Начальнік новы там цябе прымае,
Пытанняў многа пры знаёмстве мае.

— Які разрад, прафесія якая?
Нам важна ведаць, хто чаго шукае.
Для дбайных ёсць заўжды прастор вялікі,
Каб не выкідваць толькі чыкі-брыкі.

Скажыце шчыра: п'еце ці не п'еце?
П'янтосы ў нас заўсёды на прыкмеце...
Што адказаць яму на тыя словы?
Сказаць, што п'еш, — адразу і адмова.

Тады імгненна ўзнікнуць падазрэнні,
Што непрыемныя былі здарэнні.
Каб нечакана не прыйшлі паперы,
Што зелля часта ты ўжываў без меры.

Сказаць — не п'еш — дык хто табе паверыць?
Прывык жа кожны па сабе ўсіх мерыць.
Дык, значыць, маніш. Нельга спадзявацца
Ні ў чым — ані ў адносінах, ні ў працы.

Сказаць — не п'еш — не варта вельмі зычна,
Бо горшая яшчэ ёсць акалічнасць:
Начальніка ты гэтым устрывожыш —
Калі не п'еш, то больш ужо не можаш.

Закідваў, пэўна, ты раней замнога,
Крывой была, хутчэй за ўсё, дарога.
А можа, і хвароба ўжо скруціла,
І не хваліся, што ў цябе ёсць сіла.

«Сябе ў рабоце гэтак не праславіш, —
Начальнік думае. — І мне, бач, не праставіш».
З усіх бакоў ты будзеш жалю варты,
Калі прыняць не зможаш часам кварту.

Які з такога толк, які работнік?
На бюлетэнь пайсці, відаць, ахвотнік.
Сарвеш не раз ты на рабоце змену,
І трэба загадзя шукаць замену.

— Ці п'еш? —
з трывогай зноў ён запытае.
Скажы: — Работа — справа ў нас святая.
Дзе трэба і з кім трэба —
я магу!
А ўвогуле —
здароўе берагу.

## План і падман

Штогод здаём металалом,
Што выканаць не проста.
За год мы дзесяць тон даём,
А план наш — дзевяноста.

І немагчыма больш знайсці,
Куды з тым планам дзецца?
Нам кажуць: — Трэба вам расці.
Шукайце, вы ж — не дзеці.

А дзецьмі быць куды прасцей —
Цягаюць, што не трэба.
У полі ж лом той не расце,
Не падае ён з неба.

Але — на пошукі хутчэй!
З дэпо мы крадзем рэйкі
І арматуру вось яшчэ
З будоўлі цягнем нейкай.

Раз удалося, два і тры —
Пагналі нас ганебна.
Усюды сталі з той пары
Вартаўнікі са стрэльбай.

— Зніміце план, бо ён — падман,
Куды йдзе ў нас майстэрства?
— Не можам зняць, бо гэты план
Зацверджан міністэрствам.

Пайшло далей. І церпіць дом,
І родная кватэра:
Цягаем з дому ўсё, здаём
Без сораму і меры.

Хто халадзільнік прывалок,
Хто — розныя каструлі,

Тапор, напілак і замок,
І што маглі — цягнулі.

Ажно курыў з падэшваў дым —
Пакажам гарт рабочы!
А заваліЛі мы між тым
Асноўны план, вытворчы.

І не пазбегнуць нам заган
І промахаў, бясспрэчна,
Калі даецца часам план
Бяздумна, недарэчна.

## Скарга жыльца

Не люблю сваю кватэру —
Лепш не мець такіх турбот,
Бо ў ёй паруся праз меру,
Як у лазні, цэлы год.

Мой паверх высокі самы,
Да таго ж — паўднёвы бок.
Прыпякае зверху прама,
З вокнаў жа — у любы куток.

Не знайду сабе я месца
Ад такой гарачыні.
Лак на мэблі ўвесь псуецца,
Выгараюць дываны.

Не сябрую я ўжо з сонцам,
Хай яно хоць прападзе!
Бо пячэ ўвесь дзень бясконца,
Не схаваецца нідзе.

Вось зацягваю фіранкі.
Пад ваду б — дык цёплы душ.

Так і млею аж да ранку,
На рабоце ж я нядуж.

Добра толькі ў навальніцу —
Лёгка дыхаю тады.
І ўсё лета дождж мне сніцца,
Што ратуе ад бяды.

Не канчаюцца нягоды.
Ну а ўзімку — горш яшчэ:
Трыццаць градусаў заўсёды,
Радыятар аж пячэ.

І не ўлежаць мне на ложку,
Хоць на вуліцу бяжы.
Цяжка дыхаю патрошку,
Быццам я ўжо і няжыў.

Жылкантора ўсё жартуе
(Я хадзіў туды не раз):
Кажуць: — Так адрамантуем —
Маразілка будзе ў вас!

І марока вось такая,
Мусіць, доўга не міне.
Зараз я абмен шукаю:
Падкажыце адрас мне!

## Як падрад пайшоў назад

Вось слесары ўзялі падрад —
Сантэхніку наладзіць,
Каб не пісалі скаргаў шмат,
Канфлікты ўсе загладзіць.

Далі ім некалькі дамоў.
Рабілі ўсё рупліва.

Рамантавалі зноў і зноў,
Стараліся на дзіва.

Каб кожны кран, і унітаз,
І ванны выгляд мелі.
І правяралі кожны раз,
Перараблялі ўмела.

Адзіны клопат быў у іх —
Хоць ганьбы хто не даў бы.
Мянялі ўдвух за шасцярых
Вінты, пракладкі, шайбы.

Папрокаў, скаргаў больш няма,
Хоць слесараў тых — двое.
І зараблялі нездарма
Як след яны абое.

На дзіва дбайнымі былі,
Працуючы да поту.
Ва ўсім парадак навялі —
Паменшала работы.

Цяпер за спраўнасцю глядзі
Без лішняе турботы
І прафілактыку вядзі,
Адказваеш за што ты.

Начальству — быццам дрэнны знак:
Раз не працуюць многа,
То нешта, значыцца, не так,
Спытаць з іх трэба строга.

Ліквідавалі той падрад
Без важнае прычыны,
Бо нехта жыць яшчэ не рад
Без збоеў, штурмаўшчыны.

## «Зарабіў»

Ён перш спазніўся на работу,
Што часцяком рабіў з ахвотай.

Затым цікавіўся газетай,
Над ёю падрамаў пры гэтым.

Аддаў шмат часу і гамонцы.
Званіў сябрам, а потым — жонцы.

Вось знік кудысьці без прычыны —
Абед цягнуўся дзве гадзіны.

Ды не ў сталоўцы быў, а недзе,
У магазін як быццам ездзіў.

Пасоваўся з дзвярэй у дзверы,
Паперакладваў стос паперы.

Тут трапіўся красворд цікавы —
І зноў убок адсунуў справы.

Сеў за рабочы стол нарэшце,
Не працаваць пачаў, а есці.

Пацешыў многіх анекдотам,
Чым разагнаў сваю дрымоту.

Міргнуў, як змоўшчык, сакратарцы,
Прыклаў да вуснаў хітра пальцы.

Шапнуў штосьці аднаму, другому
І збег раней за ўсіх дадому.

Пасля нядоўгае дарогі
Задзёр ён на канапе ногі.

Але начальства не драмала
І грошыкі з яго ўтрымала

За дзень, праведзены без ладу, —
І з прагрэсіўкі, і з акладу.

## Няўдалая біяграфія

Гісторыя мая не простая:
З маленства рваўся на прастор.
Але не ўдаўся нават ростам я,
А родам з вёскі П'яны Бор.

Перацярпеў ужо нямала я
І прыніжэнняў, і няўдач.
І прозвішча маё няўдалае:
Сівухін я — ну хоць ты плач!

Працую шмат гадоў заліўшчыкам,
Не рад прафесіі цяпер,
Бо ў завуголлі кожны свішча вам,
Што «заліваю» за каўнер.

Дык не ганюся за гарэлкаю:
Здароўе — дрэнь, баліць жывот.
Іду дамоў, бывае, з грэлкаю,
Тут паставы: — Дыхні мне ў рот!

Хачу пра выпіўку забыцца я,
А супраць дома — гастраном,
І выцвярэзнік, а міліцыя
П'яных прыводзіць кожным днём.

Хоць крывалапым быў ад роду я,
Не спачуваюць мне нідзе.
Хаджу такой хадой заўсёды я,
Што кажуць: — Вунь п'янтос ідзе!

Жыве сяброў нямала ў Вінніцы —
Суседзі ведаюць даўно.
У водпуск еду — выпіць мыляцца:
— Відаць, паехаў па віно!

Яшчэ — радня мая ўся з Горлаўкі —
Мясцовасць слаўная даўно:
Не з чаркі п'юць — з вялікай конаўкі,
Пакуль не ўбачаць з горла дно.

Мяне ўсе дражняць: — Сябар Віннікаў!
Хоць не Гарэлачнікаў — я...
Ад п'янства чоршта сумных вынікаў:
Хто «загудзе» —
сястра —
свіння.

Дакуль цярпець жа буду мукі я?
Так болей нельга — не маню.
Вазьму бутэльку хутка ў рукі я —
І ўсіх п'янтосаў разганю!

## Бракаробы

Машыну дзесьці выраблялі.
Каваль Антось выконваў вось.
Ціт мудраваў над каленвалам,
А токар Клім выточваў штось.

Недакаваў Антось пакоўку,
Недарабіў Ціт каленвал.
Недатачыў Клім загатоўку.
А як збіралі? На аўрал.

Усе прыклалі рукі недзе,
А план патрэбен, план — закон.
Начальнік АТК не ўгледзеў,
Бо хоча прэмію і ён.

Пайшла машына выкручаста
(Сяк-так сабраная была).
Ды... развалілася на часткі,
Да прахадной не дабрыла.
* * *
То быў не проста дрэнны знак,
Бо дзе халтура, там і брак.

## Несуны

Працавалі на заводзе
Дружна даўнія сябры.
І былі заўсёды ў згодзе,
Разам кралі да пары.

Жмут цвікоў сабе дахаты
Ўзяў Алесь — кішэняй трос.
А Лявон больш зухаваты —
Скрынку цэлую занёс.

Вось Алесь сцягнуў напілак —
Дома пусціць ён у ход.
А Лявон — мяшэчак мыла,
Мыць бялізну цэлы год.

Трэба мець Алесю дошкі —
Штукі дзве дамоў завёз.
А Лявон не браў патрошку —
Змог украсці цэлы воз.

Трэба лямпачкі Алесю —
У кішэнь хутчэй грабе.
І Лявон жыве не ў лесе —
Тры дзесяткі ўзяў сабе.

Фарбу нёс Алесь ледзь бачна
І ад страху нават змок.

А Лявон станок наждачны
На плячах дамоў валок.

Затрымалі іх раптоўна —
Кожны плакаць быў гатоў:
Атрымаў Алесь умоўна,
Сеў Лявон на шмат гадоў.

Доўгім будзе іх чаканне,
Каб сустрэцца весялей.
Шле Лявонка спачуванні,
А Алесь — пасылкі шле.

## На сваю галаву

Калі зрабіў прагул спачатку,
Яго ўсчувалі для парадку.
Але казаў, што выпадкова,
Гульбу пакінуць даў ён слова.

Пасля паехаў на вяселле —
Тры дні цягнулася пахмелле,
Аж галава была ўся ў гудзе,
Ды кляўся ўсё, што больш не будзе.

Праз нейкі час — сам не ў гуморы
І выгляд мае, быццам хворы.
Не выйшаў пару дзён на працу,
А бюлетэню скуль жа ўзяцца?

Бо не хварэў — бадзяўся недзе.
Мо на бліны да цешчы ездзіў
Ці весяліўся з сябрукамі,
Дарогу мераў там рукамі.

Калі ў калгас яго паслалі,
Не зарабіў працоўнай славы.

Не браў ён прыклад з іншых шэфаў,
Дамоў цішком на тыдзень з'ехаў.

Афармілі камандзіроўку —
Зрабіў і тут ён выбрык лоўкі.
Дзе знік — нікому невядома.
Знайшоўся, як звычайна, дома.

А неяк быў у адпачынку —
Сустрэў цікавую жанчынку,
І зоркі з ёй лічыў на небе,
Працягваў водпуск больш, чым трэба.

Калі ж прагулы падлічылі,
Дык з лёту апусціў ён крылы
На смех курам — не толькі людзям:
На той год водпуску не будзе.

## Заводскія метамарфозы

Хоць той завод сучасны,
Найноўшы акурат,
Ды ўбачыць можна часта
Праяў там дзіўных шмат.

Напружана рабочы
Працуе на станку:
Калі ўключыць захоча,
Дык кнопка — убаку.

Вышэй другая потым,
А трэцяя — ніжэй.
А зменшыць абароты
Яму яшчэ цяжэй.

Нагне рычаг нагою,
Ды падае дэталь.

Каб выключыць, другою
Ён цісне на педаль.

Рукамі і нагамі
Размерана, у такт,
Як завадны, махае
Ён цэлы дзень вось так.

Хоць сам таго не хоча,
А скача ўсё, бядак.
Тут ні пры чым рабочы,
Станок той даўся ў знак.

Прагрэс у нас высокі,
Ды ўцям таго не ўзяў
Канструктар, што для скокаў
Станок сканструяваў.

## Бытавыя каляіны

Жывуць Кастусь з Валодзем па-суседску:
І дом у іх адзін, адзін пад'езд.
Нярэдка гаманілі не па-кепску,
Збіраліся, як на вясёлы з'езд:

Зайшоў Валодзя раз пазычыць грошы,
Кастусь адказвае яму: — Ў мяне няма.
Павер мне, дарагі і мой харошы,
Што спадзяванні меліся дарма.

Той кажа: — Сябар я ў цябе адзіны,
І лінію адну з табою гнём,
Выдатны на руцэ ў цябе гадзіннік —
Давай яго прадам, і мы прап'ём.

Кастусь дае адмову: — Ну і шэльма!
Свой на руцэ сам маеш, вось дзівак!

Валодзя кажа: — Мой-та ён — не вельмі.
А твой жа кожны купіць проста так.

Кастусь аддаў. Валодзя вельмі хутка
Віна дзве пляшкі цэлыя прынёс.
Гадзіна праляцела, як мінутка,
І ў кожнага быў у «чарніле» нос.

Назаўтра прэ сусед, як імяніннік:
— Дай тысячу. Хмяліцца палячу.
Кастусь пытае: — Твой жа дзе гадзіннік?
— Ужо прадаў, прапіў, ды больш хачу!

— Дык без мяне набраўся, ну, ты здатны!
Разбушаваўся ў гэты час Кастусь.
Валодзя кажа: — Во ў цябе выдатны
Будзільнік. А загнаць мне — не прымус.

Кастусь тут раззлаваўся не на жарты:
— Будзільнік, халадзільнік, што яшчэ?
Прадаць кватэру за гарэлкі кварту?
Хай гарляком тваім віно цячэ!

Валодзеву паклікаў ён кабету —
Размова доўгай з вэрхалам была.
А вось хто з іх каго зжыве са свету —
Ніхто.
Абы пазбавіцца ад зла.

Сказаў Кастусь: — Калі ён зойдзе ў госці,
Разбэсціцца ў кватэры, дзе жыву,
Няхай жа за свае баіцца косці
І за сваю дурную галаву!

## Жыцця крутыя павароты

Не захацелася чакання,
Лічылі, што расстанне — зло.
Іх, маладых, у ЗАГС каханне
Пасля сустрэчы прывяло.

Спявала ў сэрцах шчасце звонка:
Умовы ёсць, жыццё —
камфорт.
Ды хутка маладая жонка
Рашыла з'ездзіць на курорт,

Хоць замарыцца не паспела
І не цягнула цяжкі воз.
А муж пусціў на поўдзень смела,
Сам на вакзал яе завёз.

Праз нейкі час і ён паехаў
Яе праведаць: што і як.
Сустрэўся. Стала не да смеху,
Бо поруч з ёй ішоў юнак.

Пытае муж: — У чым тут справа,
Ты ехала дзеля чаго?
Яна ў адказ сказала жвава:
— А што? Кахаю я яго!

І быў развод. Усё ён кінуў,
З сабой нічога не забраў.
З яе вачэй надоўга згінуў,
Бо не чакаў ужо дабра.

...Быў новы муж яе суровы,
Хоць вельмі многа абяцаў.
Не зжыўся й першы з жонкай новай,
І кожны з іх займеў дзіця...

І вось сустрэліся. Ну, радасць!
Усё ж раней была сям'я.
Яна сказала: — Развялася!
І ён гукнуў: — Развёўся я!

Сышліся зноў. Прыйшлі да згоды,
Хоць прамінула шмат гадоў.
Ды не канчаліся прыгоды,
І цяжкаю была любоў.

Без цешчы ўсё ж не абышліся,
Жылі, як і спачатку, з ёй.
І беды ад яе былі ўсе,
Бо паказала нораў свой.

Дачцы падтаквала, вядома,
Яму ж рабілі ўсё назло.
Былі заўжды згрызоты дома,
І толькі ладу не было.

Не выйсці з дому і ні ў госці,
Рубель на піва век не ўзяць,
Ні запрасіць дамоў кагосьці
Не мог ніколі муж і зяць.

Вось так бязмэтна час цягнуўся,
І марна йшоў за годам год.
Ды надакучыла яму ўсё,
І быў, нарэшце, зноў развод...

Нашто прызнанні і ўздыханні?
Хай будзе іх на дзень хоць сто!
Калі разбілася каханне —
Яго не склеіць нізашто.

# Крытыка

Сымона моцна лае брыгадзір:
— На ўсю брыгаду ты гультай адзін.
І да таго ж п'янтос пракляты ў нас,
Ледзь на нагах стаіш ты кожны раз.

Заўсёды хоць закусвай ад цябе.
Няўжо зусім сумленне не шкрабе?
Сабакі нюхаюць, і выгляд твой свіны,
Калі пад плотам ты ляжыш п'яны.

Рашуча запярэчыў тут Сымон:
— А з кім я піў, скажы мне, столькі дзён?
Закусваў кількай, еў і агуркі,
Дык я — п'янтос, а ты — святы такі?

І хто хваліў мой моцны самагон?
Вось пра цябе ўсе скажуць: — Гэта ён!
Адзін бы не адужаў столькі я,
Калі б не ты — кампанія мая.

За бок цябе ў канаве я трымаў,
Абодвух нас бульдозер падымаў.
Ды ад людзей хавалі нас кусты.
Хто б папракаў мяне, але не ты!

Гарэлку пампаваць прывык даўно,
Пакуль у пляшцы не пабачыш дно.
А мне бліжэй, вядома, да бяды,
Бо ты — таўстун, а я — малы, худы.

Тут брыгадзір ад крытыкі аж змок,
Палаяўся і праз хвіліну ўцёк —
Відаць, туды, дзе ёсць другі Сымон
І дзе цурчыць мацнейшы самагон.

## «Вясёлыя» дзяўчаты

Што нам будні, што нам святы?
Лепш спытайце ў прасцякоў:
Мы — вясёлыя дзяўчаты,
Дайце радасць і спакой.

Кажуць — трэба людзям праца —
Папрацуе хай бядак.
Нас жа цягне забаўляцца,
Ды не проста, не за так.

Шмат мужоў не любяць жонак,
Ёсць даволі халастых.
І без лішніх там гамонак
Любім гэтых, любім тых.

Іншаземцы вабяць болей,
З нашых многа нам не ўзяць.
Тыя ж спрытныя даволі
І шыкуюць — што казаць!

А папрокі — нам не ўрокі,
Бо шкадуем мы мужчын.
Шлях да сэрцаў недалёкі,
Шлях наш просты і адзін.

Падарункі, грошы, рэчы —
Дзе іх роста так дастаць?
Не турбуйцеся, дарэчы,
Зможам жонкамі мы стаць.

Як сваё ўсё адгуляем,
Станем сціплымі тады.
А пакуль усіх прымаем,
Не прайшлі яшчэ гады.

Не збівайце нам імпэту,
Нас не кінуць малайцы.

Можам мы ўзяць і патэнты,
І падаткі заплаціць.

Называюць брыдкім словам
Маралісты часта нас,
Дык сцярпець усё гатовы —
Весялей жывём за вас.

А затое не ў прыгоне,
Кожны шлях шукае сам.
Не пытайцеся пра гонар:
Грошы — нам, а гонар — вам!



# Навука іншым

Навуковы інстытут,
Ён жа — і даследчы,
Быў усім вядомы тут
І займаўся нечым.

Меў нямала карпусоў,
Штат прытым вялікі.
Браўся часта ён за ўсё,
Быццам вёў разлікі.

Не кіпеў працоўны гарт,
Прынцып быў двоякі:
Распрацовак вельмі шмат,
Вынікаў — ніякіх.

Узнімаліся ўвесь час
Розныя праблемы.
А ў фінале — кожны раз
Не раскрыюць тэмы.

Навукоўцы, як грыбы,
Выраслі ў званнях.
Дзень праседзець ім абы —
Пэўна ж, без прызвання.

Нехта сноўдаўся без спраў,
Іншыя — драмалі.
Іх ніхто не правяраў,
Проста так трымалі.

Ды нарэшце ўсё ж дайшло
Да інстанцый важных:
Скарчавалі тое зло
І другіх не дражняць.

Распусцілі НДІ
(Там завод пасля стаў),

Бо дзяржаву ён «даіў»,
І развёў гультайства.

## Крыўда

Распавядае Анатоль:
— Даўно душэўны цісне боль.
Паклікалі мяне сябры —
Гуляў да позняе пары.

Начаставалі, як назло
(Сваіх жа грошай не было).
Пайшоў ад іх у позні час,
Ды па дарозе: — Просім вас!

Завезлі хутка ў райаддзел:
— Тут адпачнеце як нідзе!
А побач — шмат такіх, як я,
Як быццам родная сям'я.

І пачалі нас разбіраць,
З каго якія штрафы браць.
Хто дзе працуе, кім прытым,
Усё было цікава ім.

Спыталі і мяне праз шум.
— Я — на заводзе «Будмаштлум».
— Не рады мы такім «гасцям»,
Такія не патрэбны нам.

Мне паддалі нагой пад зад,
І я пайшоў дамоў, назад.
А крыўда чорная грызе:
Працую я, браточкі, дзе?

Жыццё ... ну проста — каламуць,
Даўно зарплату не даюць.

Мне ні паесці, ні папіць,
Не змог і штраф свой заплаціць.

Двухжыльны я штодзень, як конь,
Не йдуць жа грошыкі ў далонь.
Міліцыі навошта я?
І жонка выгане свая.

А думка горкая шкрабе:
Шчэ засталося б і сабе,
Каб над сабой не бачыў глум
Я на заводзе «Будмаштлум».

* * *

Але ў міліцыі не «спалі»
І шраф пасля мне ўсё ж прыслалі,
Хоць і зарплата не расце,
Бо, як раней, з ёй мы «ў хвасце».

Калі ж, чакаем, пойдзе рост,
І адпадзе паганы «хвост»?

## Свой чалавек

Старшыня ішоў дадому,
толькі глянуў ён убок —
Над Хвядосаваю хатай
аж пад ноч курыць дымок.
— Што ж ён робіць гэтак позна,
а казаў, што захварэў...
Старшыня пастукаў грозна,
аж Хвядос ад страху сеў.
Пазавешваны ўсе вокны,
пляшкі выстраены ў рад,
І пускае слёзы-кроплі
самагонны аппарат.
— Во, папаўся! Зараз шэльма,
кара болей не міне.

Ціснеш «сінюю», нягоднік,
пачакай жа ты ў мяне!
А Хвядос падскочыў жвава,
Жонцы скоса падміргнуў,
Тая спрытненька падбегла:
— Выпі чарачку адну!
Старшыня тут абурыўся:
— Не прыйшоў я выпіваць.
Ды ці гнаць хоць ты умееш?
Што ж, магу пакаштаваць.
Ну, калі ўжо дам я ганьбу,
то тады ў мяне глядзі!
А Хвядос на жонку гыркнуў:
— Ты гурок хутчэй кладзі!
Старшыня аж папярхнуўся,
а Хвядос: — Ну, як пяршак?
— Ды яшчэ не разабраўся,
налівай яшчэ, раз так.
Кхе, кхе, кхе, вось моцу мае,
з ног зваліла б і быка.
Ну і майстар ты, зазначу,
спрактыкована рука.
Не за тое вас я лаю,
што вы гоніце ўвесь час,
А за тое, што нярэдка
самагонка ў вас як квас.
Хоць сабе і людзям шкодзіш,
правіла такое тут:
Раз дабро ўжо пераводзіш,
выдай якасны прадукт.
Не магу на вас злавацца,
я ж вам свой з усіх бакоў.
Ці не час нам пазбаўляцца
ад такіх кіраўнікоў?



# Дабро бывае небяспечным

Я сэрца перад тым раскрыю,
Душу шырока расчыню,
Хто косці мне не перамые,
Хто мае ласку, дабрыню.

І сам такі характар маю:
Слабых, нямоглых — так люблю!
Сяброў, таварышаў прымаю,
Каму магу — дабро раблю.

Прыемна быць такім, канешне,
Ды бойся прынцыпу свайго:
Дабро бывае небяспечным,
Пацерпіш часам з-за яго.

Вось аднаму — дапамагаю,
Прыношу рэчы і харчы.
Якую ж я падзяку маю?
Псіхуе ўрэшце і крычыць:

— Ды ад цябе няма карысці,
Ты мне нічога не даваў.
Прапала шмат чаго калісьці,
Не раз мяне абрабаваў!..

А там пустыя толькі сцены,
Што возьмеш — можна хіба даць.
А сам жа — дзядзька даваенны,
Шкада яго мне пакідаць.

Другому дапамог з ахвотай —
У справах важных зразумець:
З жытлом, жаніцьбаю, работай:
З усім, што трэба вельмі ўмець.

А той, пагардаю спавіты,
Высока надта нос задзёр:

— Вы што? Я сам — таленавіты,
Знаходжу ўсюды свой прастор!

Яшчэ адзін — быў сябар даўні,
Як многа я яму зрабіў!
Не ўгледзеўшы, які паганы,
Што ледзь мяне не загубіў,

Бо слабасці мае ўсе ведаў,
І прасачыў мой кожны крок.
А каб пазбавіцца ад бедаў,
«Сябры» такія — нам урок.

Са мной хто — згодзен, хто — не згодзен,
Паддзене нехта пад рабро.
Але ў мяне — свой курс паводзін,
І — буду ўсё ж рабіць дабро!

## Дзялок

Мінула шмат ад тых падзей,
Ды памяць ёсць яшчэ ў людзей.
Я толькі прозвішча змяніў,
Але нікольkі не зманіў.

...Мар'ямаў той спусціўся з гор
І выбраў Мінск за свой бугор.
У філармоніі шмат спраў —
Уладзіўся і кіраваў.

Празаік прыйдзе ці паэт
І хоча твор пусціць у свет.
Мар'ямаў цягне да пары:
— Мяне ў сааўтары бяры!

Самому ж рыфма — цёмны лес,
Аднак у творцы ўпарта лез.

Ці кампазітар песню нёс —
Мар'ямаў важна пальцам трос:

— Мяне — у сааўтары хутчэй,
Інакш знікай з маіх вачэй!
Усе згаджаліся, хоць той
У нотах быў — ні ў зуб нагой.

Затое ўвесь рэпертуар
Лічыў за ўласны свой тавар.
На ўсіх афішах вось тады
Яго імя было заўжды.

...Мар'ямаў той спусціўся з гор
І сам зрабіўся як бугор.
Начальству пастаўляць дзяўчат —
Сваіх артыстак быў ён рад.



Пікнік, ці лазня, ці банкет —
Усюды быў ён, не сакрэт.
Патрабаваць затым пачаў
«Заслужанага дзеяча».

І што ж? Прысвоілі яму,
Бо дагадзіў ён шмат каму.

Пасля якіхсьці важных змен
Растаў, як цень у ясны дзень.

Падаўся на другі прастор —
Відаць, бліжэй да родных гор.
Пакінуў памяць пра сябе
І тых, хто ўсё сабе грабе.

## Кемлівасць

Аднойчы бацька раздурэў
І нізавошта сына ўзгрэў.
Хоць ён набраўся дап'яна,
Ды захацеў яшчэ віна.

— Схадзі, вазьмі, я больш прыму!
А сын адказвае яму:
— Купіць няцяжка — загадай,
Ды не забудзься, грошы дай.

Са злосці бацька забурчэў:
— Нягоднік, згінь з маіх вачэй!
За грошы кожны ўзяць мастак,
А ты дастань мне проста так...

Чакаў ён некалькі гадзін,
Прыйшоў, нарэшце, з пляшкай сын.
Але чамусьці без віна,
Зусім пустой была яна.

Ад суму продак затрымцеў:
— Пажартаваць ты захацеў?
Дык спіну падстаўляй сваю,
Бо зараз я цябе прыб'ю!

— Але за што мяне ўжо біць?
І дурань можа з поўнай піць.

Не пагражай мне, лепей стой:
Ты выпіць паспрабуй з пустой!

Татуля сцішыўся адразу,
Ніяк не змог знайсці адказу.

* * *

Хто дужы, ды дурны — лютуе,
Разумных кемлівасць ратуе.



## «Святая» грэшніца

У маладосці так гуляла!
Быў кавалерам кожны госць.
І памяняла іх нямала,
Раз выгляд мае — хлопцы ёсць.

Ні перад кім жа не ўстаяла.
— Каханне — што? Гуляю я!
Нашто трымацца мне трывала?
І пачакае ўжо сям'я.

Ды так у выпіўку ўцяглася,
Што без яе — амаль ні дня.
Дзівілася з таго радня ўся,
Куляла чарачкі да дна.

Хоць бюлетэнь, хоць водпуск мае,
А як прачуе — будзе збор,
Дык на гульбу свой курс трымае,
Ёй не лячэнне трэба — двор.

Сябе бясконца ахмурыла,
І быў не чуцен сэрца крык.

Яшчэ адчайна і курыла,
Як забулдыга той, мужык.

А потым бачыць — пастарэла,
Мінае хутка маладосць.
І перастроілася ўмела,
І выйшла замуж — дурні ёсць.

Цяпер такая незачэпа!
Не падыдзі — свяцей святых.
Хто ведаў — хай забудзе лепей,
Далёка кінула ўсіх іх.

Табачны дым здалёк даходзіць,
Гарэлкі пах — такі смурод!
І нават піва вельмі шкодзіць.
Такая ўжо не першы год.

Знаёмы я з жанчынай тою —
Цяпер замудрай, не «крутой»...
Калі ты хочаш быць святою,
Дык — нарадзілася б святой.



# Курортныя прыгоды

Мы зляцеліся, як птахі,
У паўднёвы цёплы край,
Адпачыць як след, з размахам,
Кажуць: — Поўдзень — проста рай.

Так спяшаліся — аж змоклі...
Размясцілі, як змаглі:
У адных — на сонца вокны,
У другіх — супроць скалы.

Побач з домам плешча мора,
Аж свяжэе галава.
Толькі хмарна, як на гора,
Дождж на дзень то раз, то два.

Злосць бярэ і крыўдна вельмі,
Нават сумна ад таго.
Бог разгневаўся, напэўна,
Хоць здымі з-за хмар яго.

Вось пажыў бы крыху з намі,
Ды дзянёк бы — сам памок.
Як паклацаў бы зубамі,
Дык, напэўна б, дапамог.

Пра курорт шмат пляж раскажа,
Найважней на поўдні ён.
Ды пяску няма на пляжы,
Толькі галька і бетон.

Прэм на пляж мы зранку прама,
Захапіць там лежакі.
Ды ляжаць ужо там дамы,
Побач — мажныя дзядзькі.

Надвячоркамі — прычыны!
Для сустрэч нагоды ёсць:

У буфет ідуць мужчыны —
Там жаданы кожны госць.

Вечар — чым яшчэ заняцца?
Зараз жару паддадзім!
І шыбуем мы на танцы —
З-пад падэшваў пыл і дым.

Мы танцуем без натугі,
Добра грае гарманіст.
Ды адны там бугі-вугі,
Разам з імі толькі твіст.

На халеру ім лячэнне,
Бо найбольш — здаравякі.
Пакахацца — ёсць імкненне,
Зыркаюць на ўсе бакі.

Бушаваць — не ўсім дарэчы,
Што глынуць, старэйшым — квас.
А вось тут адзін старэча
Расцягнуўся сярод нас.

А мужык — пасаду мае
І не ўлазіць у штаны.
Ён — таўстун, яна — худая,
Падраўняюцца яны?

Скачуць, быццам гліну месяць,
Надатпітку — радасць ёсць.
З'едуць, стрэнуцца праз месяц —
Раздраконіліся вось!

Не даведаюцца сем'і,
Што блудзілі тут яны...
Як гуляем часта ўсе мы,
Часам бэсцімся адны.

А жанчыны — нас шукайце
І адных не адпускайце.
Не пускаць нам трэба й вас —
Сцеражэ нядобры час.

Чорт звядзе нарэдка ў блуд —
Ну, пацерпіце пакут!
Што мужчыны, што жанчыны,
Для гульбы — адны прычыны.

Кошка, кот — аднак жа зноў
Мы вяртаемся дамоў.
Як глядзець нам дома ў вочы?
Як хто зможа.
Як захоча.

## Аб прафесійных звычках і характарах

Распараджаецца па-своему кожны часам,
Не ўсе, вядома, спосабам адным.
Сёй-той паблытае гарэлку з квасам:
Пажарны і пячнік нап'юцца «ў дым».

Шавец «у сцельку» набярэцца зранку,
Рыбак, як жаба, «квакне» ў трыснягу.
Шафёр «пад мухай» скруціцца «ў баранку»,
А конюх аж сагнецца «ў дугу».

П'е страхагент, страхуючыся трошкі,
Абходчык — «у дрызіну» на хаду.
Нарэжацца цясляр нарэшце «ў дошку»,
А вадалаз «аддасць канцы» ў ваду.

П'е слесар да адключкі, да ікоты.
Як певень, кукарэкае артыст.
У самыя шырокія вароты
Не пройдзе захмялелы футбаліст.

Хабарнік дапіваецца «да ручкі»,
А злодзей абкрадае ўласны дом.
Ілгун сваёй хлуснёю ўсіх замучыць,
Лайдак засне — знямогся за сталом.

Пакуль паперкі ў вачах заскачуць,
Гатовы піць зацяты бюракрат.
А падхалім ад радасці аж плача:
Начальніка спаіць заўжды ён рад.

...Не ўсе, вядома, п'юць і не заўсёды,
Хто ж п'е — знаходзіць шмат зачэпак і прычын,
Бо п'янюкі — яны адной пароды:
Ўсе роўныя, фінал у іх адзін.

## Грані сяброўства

Жыццё няпростае такое —
Не абысціся без сяброў.
Без іх у нас няма спакою.
Мы сябру кажам: — Будзь здароў!

А што такое ёсць сяброўства,
Хто за каго аддасць душу?
Застолле — гэта вельмі проста:
Не просіць ён, я не прашу.

Рабіць карысць мне не прыспешу,
І пра сябе я не крычу.
Сваю бяду ўсім не навешу,
А дапамогі ўсё ж хачу.

Сяброўства — гэта як прызванне:
Свой чалавек ты ці не свой.
Прыйшло сябрам выпрабаванне
Прыгожай жонкаю маёй.

З іх кожны стаў як бы артыстам
І думаў — поспех не міне.
Прад ёю слаліся ўсе лістам,
Не заўважаючы мяне.

Такога не чакаў спрадвеку,
Мне не хапала гэткіх спраў!
І я, адчуўшы небяспеку,
Усіх сяброў тых разагнаў.

І тут жа новых стала многа,
Бо добры сам, жыву без зла.
Але раптоўная знямога
Мяне ў бальніцу прывяла.

Хай блізкі б хто пабыў са мною!
Тэлефаную ўсім сябрам.
Вось прыйдуць, думаю, гурмою,
І я вясёлы стану сам.

Усе так шчыра спачуваюць!
Я лепшых слоў не чуў нідзе.
А дні ідуць, а дні мінаюць —
Ніхто адведваць не ідзе.

І я змяніў каманду тую
З няўдалай гэтае пары.
І не стагну, не лемантую,
Бо знойдуцца яшчэ сябры.

А здрадзяць — што ж, тады няўдача,
Ды без такіх якраз лягчэй.
Сябры пакінуць — я не плачу,
Заводжу новых найхутчэй.

Сябры з табой — душа спявае,
Любая рана не баліць.
Бяда тады, калі, бывае,
Няма з кім радасць падзяліць.

# Маналог бюракрата

Пытанне важнае у нас,
І вырашаць яго ўжо час,
Але не рэзка і не груба:
Падняць яго, паставіць рубам.

На небывалай вышыні
Ўсё лепш відаць, як ні зірні.
І завастрыць на ім увагу,
Каб заслужыць сабе павагу.

Пытанне трэба «абкатаць» —
Не з пальца нам яго смактаць.
Затым прааналізаваць,
Як трэба арганізаваць.

Разбіць па пунктах зноў і зноў,
Праверыць потым сто разоў,
І разглядзець з усіх бакоў —
Пытанне не для прасцякоў.

Патрэбна ўсё абмеркаваць,
Што лішняе — забракаваць.
Яшчэ і правентыляваць,
Памылак розных мінаваць,

Па костачках іх разабраць,
Хоць часу многа і патраць.
Перalапаціць бы як след,
Ці шмат станоўчых там прыкмет.

Зрабіць належныя высновы,
Заключныя сказаць нам словы,
Што шмат карысці ад таго,
Пасля зацвердзіць бы яго,

І адпаведнае рашэнне
Прыняць і з сэнсам, і значэннем.

І напісаць бы пратакол,
Тады — начальніку на стол.

А копію — на сцену кнопкай,
І ў канцы —
паставіць кропку.

## З'явы бытавыя

Вось здараюцца праявы!
У кватэры, на бяду,
Сталі дрэнь раптоўна справы:
З кранаў не суняць ваду.

Закручу іх што ёсць сілы —
Па-ранейшаму цячэ.
Свет зрабіўся мне нямілы:
Паплыве сусед яшчэ!

Ёсць жа домакіраўніцтва,
Найхутчэй званю туды.
— Мне сантэхніка прышліце,
І ратуйце ад бяды!

Інжынер ласкава кажа:
— Не гаруйце без прычын.
Прыйдзе, скруціць, звінціць, змажа,
А чакайце ў шэсць гадзін.

Знікла прыкрая турбота,
Вось парадак будзе ў нас.
І спакойна на работу
Я пайшоў. Вярнуўся ў час.

Ды не зрушылася справа,
А запіска — тут як тут:
«Быў. Пайшоў. Сантэхнік Слава.
Дзве гадзіны, пяць мінут».

Вось мядзведжая паслуга!
І навошта гэта мне?
Зноў званю, крычу з натугай:
— Слесар прыйдзе, а ці не?

— Ён жа быў.
                    — Дык я ж на працы,
А пад вечар сам чакаў.
— Заўтра будзе ў вас займацца,
Іншых быць не можа спраў.

Пачаліся абяцанкі,
Ды ад іх мне не лягчэй...
Адпрасіўся нават зранку,
А вада цячэ, цячэ...

— Не прыйшоў?
                    Што ж, пакараем,
Зрэжам прэмію яго!
Не відно канца і краю,
Дык сантэхнік для чаго?

Лепш такіх паслуг не браў бы...
Выйсце сам знайшоў-такі:
Падбіраў пракладкі, шайбы,
Краны, гайкі, трайнікі.

І цяпер я не журуся —
Сам спыніць магу ваду.
Трохі болей налаўчуся —
І ў сантэхнікі пайду!

## Аб наклейках і слупах

Я цэлы свет наклічу сведак,
Ну што я дрэннага зрабіў?
Прадстаўлю сотню вам даведак,
Што я зусім цвярозым быў.

Гарачыня — аж невыносна,
Я ехаў сёння не адзін.
Быў з сябрам я. Нам стала млосна,
І я забег у магазін.

І хіба можна тут здзівіцца?
Вады бутэльку я купіў,
А на наклейцы — від сталіцы,
Вось гэтую ваду і піў.

З таварышам даўно сябрую,
Жыць без яго я не прывык,
Вады бутэльку зноў бяру я,
Глядзіць з яе упарты бык.



Пот прабіваць нас стаў да ніткі,
Няёмка стала й сябруку,
Узяў і ён бутэль напітку,
З чырвоным перцам на баку.

Сіл у сабе адчуў я многа.
Машына узяла разбег.
Ды нечакана мне дарогу
Слуп тэлеграфны перабег.

Другі бяжыць — крукі як рогі,
І ў правадах нудотны спеў.
Пабег і трэці, ды дарогі
Ён перабегчы не паспеў.

Слуп сам пад колы мне папаўся,
І з-за яго ў мяне — прастой.
Дык хай бы з месца не зрываўся:
Не знаеш правіл руху — стой.

## Няўдалы кветкалюб

Многа слаўных ёсць дзяўчат.
На спатканні йсці я рад.
Толькі ўдачы мне няма,
І хаджу я ўсё дарма.

Вось пайшоў я першы раз,
Ды прабавіў лішні час.
Кветкі доўга я шукаў
І каханай не спаткаў.

Іншым разам я як след
Добры ёй сабраў букет.
А яна задёрла нос:
— Кветкі жоўтыя прынёс!

Што за жарты, як на злосць?
Кветак лепшых многа ёсць.
Хай бяда мяне міне,
Мусіць, хочаш здрадзіць мне?

Ёй рамонкі я насіў
І лілеі ўзяць прасіў.
Васількоў аж цэлы куст
Быў таксама не пад густ.

Колькі ж можна так хадзіць,
Як каханай дагадзіць?
Мо не есці мне, не спаць,
Кветкі з Месяца дастаць?

Ад таго я злосны стаў,
Ружы дзікія дастаў:
З-за цябе няма мне ўдач —
Пакаліся і паплач!

... Для кахання ўсё раблю,
Кветак болей не люблю.
І жыву я сумна так,
Кветканосец — халасцяк.



Калегі студэнцкіх гадоў па Мінскаму аўтамеханічнаму тэхнікуму

## Забабоны

Хоць глядзеў за ёй умела,
Берагчы сябе прасіў,
Жонка раптам захварэла,
Занядужыла зусім.

Рэдка ў клініку хадзіла,
Лекі нехаця піла.
І шукала, дзе ёсць сіла,
Што пазбавіла б ад зла.

— Прывязі ад дзеда, — кажа, —
Загаворанай вады.
Для здароўя гэта важна,
Ачуняю я тады.

— Гэта выдумка твая ўся —
Забабоны, і не больш.
На навуку спадзявайся.
Жонка правіць: — Зніме боль!

Я за трыста кіламетраў
Мусіў ехаць па ваду.
Так адлегласць сумна мераў,
Зведаў клопат і нуду.

Пляшку дзед прынёс з вадзіцай,
І над ёю пашаптаў.
Мармытаў мне, як лячыцца,
І пра грошы запытаў.

Паддічыў свае я страты —
Час, і грошы, і бензін.
А вярнуўшыся дахаты,
Сам рашыў лячыць, адзін.

І навошта мне марока,
Толк які і вынік дзе?
Не паеду так далёка,
Хай той дзед хоць прападзе!

Выхадны — я еду рана
На машыне да сяброў.
А вады вазьму з-пад крана,
Адпачну — і будзь здароў.

Жонку родную запэўніў,
Што ваду дае ўсё дзед.
Плён дало мае «лячэнне» —
Перад ёй адкрыўся свет.

Кажа: — Лепей мне, як бачна,
Хай ваду п'е ўся сям'я.
Адказаў я ёй шматзначна:
— Лекарам тваім быў я!

## Нечаканая сустрэча

Змітрок начальніку сказаў:
— Я заўтра буду на нарадзе.
На цэлы дзень там хопіць спраў,
Дык не чакайце ўжо ў брыгадзе.

Начальнік згодна паглядзеў:
— Што ж, добра. Важна, каб я ведаў.
І я не буду цэлы дзень —
На канферэнцыю паеду.

Не на нарадзе быў Змітрок —
Падаўся па грыбы з сябрамі.
Ішлі ўсе там непадалёк,
І перагукваліся самі.

Калі не падаваў хто гук,
— Крычаў: — Агу! — другі тым часам.
— Уга! — у адказ гукаў сябрук
Фальцэтам ці магутным басам.

— Вось грыб дык грыб, сказаць хачу, —
Пачаў Змітрок. — Такі грыбны лес!
— Уга! — знаёмае пачуў,
І з-за куста начальнік вылез.

Зрабіў насустрач Змітру крок,
Схаваў за спіну кош з грыбамі.
— Што ў лесе ты згубіў, Змітрок?
— Ды я... хацеў сустрэцца з вамі.

— Няхай бы лепш я стрэў ваўка!
Тут не такія трэба ўдачы.
Дык я цябе не сустракаў,
І ты мяне прытым не бачыў.

Змітрок кіўнуў і знік, як цень,
А прыкрасці было нямала.
Хоць прагулялі цэлы дзень,
Грыбы калом у горле сталі.

## Добры сродак

Ну і хто б каму паверыў —
Падзівіліся б усе —
Што не ўлезе жонка ў дзверы,
Што яе так разнясе.

Стала ёмкаю і гладкай,
Есць без меры, без мяжы.
І нашто ёй фіззарадка?
Пра яе і не кажы.

У мяне адна турбота:
Чым жа тут дапамагу?
Людзі бегаюць да поту —
Я таксама пабягу.

Кожны вечар пасля працы
Звычку я сабе завёў:
Хутка пераапранацца,
І — прабежка зноў і зноў.

Жонка крывіцца, вядома,
І бурчыць сабе пад нос:
— Ты куды сыходзіш з дому?
— Як — «куды»? Бягу на крос!

І пайшло! Знайшла прычыну:
— Забурліла, пэўна, кроў?
Хоць ва ўзросце ўжо мужчына,
А каханку, бач, знайшоў!

Я таксама — не разява.
Не чакай, не прамаўчу.
Раз пайшла такая справа,
Аднаго больш не пушчу.

І пабеглі. Я — наперад,
А яна — за мной, як цень.
Кіламетры кожны мераў,
Так — заўсёды, дзень у дзень.

Мы па спорце з ёй калегі,
Быў настрой вясёлы мой:
За табой калісьці бегаў —
Зараз бегай ты за мной!

Не дарэмна час свой бавіў,
Перайначыў жонку я:
І ад рэўнасці пазбавіў,
І схуднела ўдвая.

## Доля гультая

Ідзе запрашэнне ад бацькі:
— Прыедзь, сынку, сена накосіш.
Пара гаспадаркай заняцца,
І мяса ж кумпяк добры просіш.

Працуй сам, не будзь дармаедам,
Парэзаць яшчэ трэба дровы.
А той у адказ: — Не прыеду.
Здаецца мне, я нездаровы.

Пісьмо бацька зноў піша ў горад
Далёкаму роднаму сыну:
— Калю парсюка, дык не гора.
Прыедзь і вазьмі свежаніну.

І швайка заточана востра,
І ёсць чам смаліць — калі ласка.
Прыедуць браты твае, сёстры,
І ты паспяшайся, Міхаська.

А вось пісьмо бацьку ад сына:
— Начальнік я, вельмі заняты.
Шмат часу займае й машына,
Я аўтааматар заўзяты.

Вы ўжо без мяне закаліце,
Са смакам з'ямо ўсё мы ўзімку.
А мне «задні мост» лепш пакіньце,
«Паддон» шчэ, — намёк на грудзінку.

Зноў бацька свой ліст піша сыну:
— Даўно парсюка разабралі.
Табе я не многа пакінуў,
У кубел паклаў вельмі мала.

Выкручвацца добры ты майстар,
Ды справу прайграў вось якую!
Ты можаш узяць за гультайства
«Кардан» і «трубу выхлапную».

## Скарга пацыента

Прашу ў вас, доктар, прабачэння.
Я тут праходзіў курс лячэння.
Мне шкодзяць гэтакія справы,
Ўсё горш і горш мае йдуць справы.

Вы прапісалі мне дыету,
Яна зжыве мяне са свету.
Па хлебе і па малаку
Ног хутка не паваллаку.

Вось здарыўся выпадак гэткі:
Пайшоў учора да суседкі.
Ласкавы, добры я зрабіўся,
А вось чаго прыйшоў — забыўся.

Суседка ўся аж расцвіла,
Мяне ж дыета падвяла.
Бо страціў я былую сілу,
Суседка нават мне няміла.

А вось калі б я выпіў чарку
Ды з'еў з паўкілаграма шкварку,
Тады б, відаць, я не забыўся,
Чаго к суседцы прыблудзіўся.

## Дык ці варта гасцяваць?

Весяліцца ёсць жаданне,
Як жаданню дагадзіць?
Ёсць адказы на пытанне,
Як у госці нам хадзіць.

Першы нам рэцэпт даецца,
Ведаць хочаце — дык вось:
У аптэках прадаецца
Вугаль, што заўсёды ёсць.

Больш таблетак вы вазьміце,
Бо цвярозасць ён дае.
Перад выпіўкай прыміце
І не раз — у час яе...

Алмагел вы ўзяць павінны:
Дзве-тры лыжкі трэба браць
І праз кожных паўгадзіны
Тую дзею паўтараць...

Ці талерку кашы з'есці —
Грэцкай, маннай ці з аўса.
Хоць пасля і многа п'ецца,
П'янка выветрыцца ўся...

Можна вотруб'я пшаніцы
З кіпенем развесці шмат.
І не будзе чарак лішніх,
А пасля — хоць да дзяўчат.

Быццам добрыя парады,
Хай чытае люд увесь.
Мы паслухаць бы іх рады,
Ды які ж у гэтым сэнс?

Ем я вугаль дробным шротам —
Ап'яненне, бач, міне.
Цэлы вечар з чорным ротам,
Зубы чорныя ў мяне...

Алмагел глытаю лыжкай —
Закусь потым не ідзе.
Выпіваю я з задышкай —
Не інакш як быць бядзе...

Кашы з'еш хоць тры талеркі,
Проста прыступам адным,
А калі кульнеш без меркі —
Усё роўна быць п'яным...

Едзь па вотруб'е ў вёску
Як дурны, яго купляй.
А пасля смакчы, як соску:
Ты цвярозы — радасць май!..

Не даходзіць, праўда, штосьці:
Святкаваць — не святкаваць...
Дык ісці ці варта ў госці,
Раз баішся выпіваць?

...Не хачу быць век цвярозым,
Не хачу быць век п'яным.
Мець хачу цвярозы розум,
Каб прыемным быць усім!

## Пра машыну

Растлумачце мне прычыну,
Не магу я зразумець:
Што за зручнасці з машынай,
Для чаго мне колы мець?

Здасць матор ці стрэльнуць шыны —
Думкі тут не аб гульбе,
І не ты ўжо на машыне,
А машына на табе.

Ды не ўсе ж яе і маюць,
Шмат каму яна — міраж...
Купіш — клопаты праймаюць:
Дзе і як набыць гараж?

Ёсць гараж — ізноў жа гора:
Хоць ты выкруціўся ледзь,
Па машыну едзь за горад,
І адтуль у горад едзь.

Марна траціш столькі часу —
Хоць, браточкі, галасі!
А, падумаўшы сам-насам,
Лепш бы ехаў на таксі.

Што яшчэ бывае часта —
Так прыцісне — хоць гукай:
Вось спатрэбяцца запчасткі —
Не дастанеш, не шукай.

Выхадны — у госці людзі,
У тэатр або кіно.
Ты ж рамонт праводзіць будзеш —
Там і краю не відно.

І жыццё ўсё з той прычыны
Перавернецца ўверх дном:
Твой гараж — дом адпачынку,
Лазня, цэх і гастраном.

Я машыны не трымаю,
І таму сам вельмі рад:
Часу вольнага шмат маю
Для сяброў і для дзяўчат.
І не трэба нават блат!

## Спатканне і кошка



Дрэнным лічыцца ў народзе
Кошку чорную сустрэць,
Толькі з гэтым я не згодзен:
Кошку змог я сябрам мець.

І магу адкрыць прычыну:
Справа ў тым, што ў нейкі час
Закахаўся я ў дзяўчыну,
Як бывае першы раз.

А жыве зусім пад бокам,
Цераз некалькі двароў,
І не трэба йсці далёка,
Каб сказаць ёй пару слоў.

Толькі ўсё не вельмі проста,
Бо гуляе па двары
Там з цяля сабака ростам,
Дужы, злосны, хоць стары.

Ад яго няма дзе дзецца:
Як на двор ні зазірну,
Угрызнуць мяне імкнецца
Ці парваць калашыну.

Шмат бяды тады я зведаў,
Нарабіў сабака зла,
Ды, на шчасце, у суседа
Кошка чорная была.

Я прыдумаў пакаранне
І змагу перамагчы!
На наступнае спатканне
Крочу з кошкай на плячы.

Адчыняю браму трошкі,
Тут сабачы брэх, грызня,
Я ж пускаю ўперад кошку —
Пачалася валтузня.

Я ж таго не бачу нібы,
Ды спяшаюся яшчэ,
Сам тым часам стук у шыбу:
— Выйдзі, любая, хутчэй!

І калі спатканне маю,
Ёсць свой спосаб і сакрэт:
У адной руцэ трымаю
Кошку, а ў другой — букет.



# Пра суседак

Да кожнае падзеі сведкі —
Заўжды дасціпныя суседкі.
Ім клопат ёсць да нашых спраў:
І як хто лёг, і як хто ўстаў.

Хто што купіў, і хто што з'еў,
Хто з кім які інтэрас меў,
І хто злаваў, і сябраваў,
І хто каго пацалаваў...

Сядзяць на лаўцы гуртам цёткі,
Збіраюць і разносяць плёткі,
Нібы работы ў іх няма:
Работа зробіцца сама...

Ім рупны клопат невядомы:
Ніводнай клумбы на двары,
Адна трава расце ля дому,
І тая сохне без пары.

Між іншым, больш было б парадку,
Каб не мянташыць языком,
Узялі рыдлёўкі для зарадкі —
І самі б выйгралі, і дом.





Пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Ручайкі»
пры рэдакцыі газеты «Наша жыццё».
Літкансультант — Мікола Вяршынін (у цэнтры).
Выступае Васіль Лешчанка. 2003 год.

# Закаханы сатырык-гумарыст

Я шчаслівай часінай
Стрэў цябе ў жыцці.
Мара ты — не дзяўчына,
Лепшай век не знайсці.

Стук тваіх чаравічкаў
Чутны ў сэрцы маім,
Трапяткіх, невялічкіх,
Як удзячны я ім!

Ты ляціш па паветры
Як натхненне, як сон!
А сукенка на ветры —
Нібы той парасон.

А дзявочыя вочы
Губяць волю маю,
Зробяць, што толькі хочуць,
Супраць іх не ўстаю.

Вусны — казка прыроды
І гараць, быццам жар,
Падымаюць заўсёды
Ў маім сэрцы пажар.

Дзіўны голас чаруе,
Паланіць кожны гук.
Прападу я, згару я
Ад салодкіх тых мук.

Ці то радасць сягоння,
Ці спаткаў я тугу?
Эх, здаюся ў палон я,
Без цябе не магу.

Думкі ўвесь дзень ад ранку
Пра цябе зноў і зноў.
Прысвячу табе байку
За такую любоў!



## Дачныя прыгоды

Што патрэбна нам на дачы?
Гэта сад і агарод,
То — нялёгкія задачы,
Часта ўсё наадварот.

Кабачкі і патысоны
Садзім, побач — гарбузы.
Апыленне разам гоніць,
Дзе што ёсць — шукай, глядзі.

Тут ідзе перараджэнне,
Як пладам тым рады даць?
Дык з чаго рабіць варэнне,
Што на семкі пакідаць?..

Дрэўцаў саджанцы купляем
На базары ці то з рук,
А пасля турботы маем,
Надыходзіць дрэнны зрух.

Бабка кажа нам скрозь слёзы:
— Вось прыдбала вішань я —
Увесну выраслі... бярозы,
Доля бедная мая!

У другой — бяды нямала:
— Накупляла многа сліў
І найлепшага чакала —
Сад... чаромхаю зацвіў.

Трэці кажа: — Да знямогі
Я садзіў на дачы сад.
Там натыркаў дрэўцаў многа,
Быў таму бясконца рад.

А вясна мне паказала,
Што ў бяду раптоўна ўлез.
Сада быццам бы не стала:
Дзікіх дрэваў — цэлы лес.

Хто ж быў госць такі нязваны,
Што нашкодзіў так тады?
Падказалі мне: — Сяляне
Амалоджваюць сады...

Шмат што красці звычку маюць
Хоць чужыя, хоць свае.
І бамжы, бічы шманаюць —
Дача ім даход дае.

Стрэльбу заўтра я купляю,
Жорсткі бой зладзюгам дам.
Завяду сабак я зграю,
Ці... кусацца буду сам!

# Лысы, лысы, валасаты...

Лысы, лысы, валасаты,
Хоць цвярозы, хоць паддаты,
Гаспадар ты ці то госць —
Ад прычоскі гонар ёсць.

Ці чарнявы, ці бялявы,
Ты шатэн або бландзін,
А як рыжы сам і жвавы,
То лічы, што ты — адзін.

А цікавяць жа прычоскі,
Скажам так, не без прычын
Ці то з горада, ці з вёскі
Несур'ёзных тых жанчын.

Палюбоўніца ці жонка
Любіць не за валасы,
А падай даляраў гронкі —
І не трэба ёй красы.

А калі ты нежанаты,
І ў сваты цябе вядуць,
Лысы ты, не валасаты —
У сабе ж упэўнен будзь.

Лысым жа хапае лоску,
І не трэба ім расчоска.
Зручнасці жыццё зрабіла:
Многа меней траціць мыла.

А як ты мужчына лысы —
Ведай сам свае абрысы.
А які ў цябе ўжо твар,
Выдавай, як свой тавар.

Лепшым будзь, чым валасаты,
Для мужчын усіх будзь братам.

А жанчынам дагадзі,
Як кароль між іх хадзі.

А жанчыне каб уладзіць —
Хай па лысіне пагладзіць
І прылашчыцца, як трэба, —
Страсць узніме вас пад неба...

Валасатым і патлатым,
Што і твару не відаць, —
Шмат лягчэй ім стаць жанатым,
Больш бы розуму дадаць.

Вось гаворыць нам рэклама:
— Паратунак вам даём,
І, каб быць прыемным дамам,
Прапануем наш ласьён!

Лысым вам, не валасатым —
Гэта радасць прынясе.
Стане кожны ўраз кудлатым —
Пакахаюць вас усе.

Ды рэкламе той не веру,
Раз парода ёсць свая.
Лысым многа больш даверу,
Бо сур'ёзней удвая.

А нашто такая тэма,
І чаму пішу я вам?
Палысеем ледзь не ўсе мы,
Хутка лысым буду сам.

# Вылечыла

Калісьці добрая сям'я —
Была традыцыя свая —
Каб мінаваў яе разлад
І справы ўсе ішлі на лад.

Ды ўрэшце ўсё ж не выйшла так,
Пайшло ўсё неперакасяк,
Бо муж у дружбе з пляшкай жыў,
Хваробу страўніка нажыў.

Ганяў ён па кватэры ўсіх,
Зрабіўся сам як быццам псіх,
Ён піць хацеў, ды ўжо не мог,
Але смактаў заўжды за трох.

Кабету распач узяла —
Тут недалёка і да зла.
— Я напушчу на злыдня мор,
Мне дапаможа мухамор.

Набрала ў лесе тых грыбоў,
Іх наварыла зноў і зноў.
Сабрала з іх цягучы сок.
— Цяпер трымайся, мужычок!

Жыцця не мела з-за цябе,
Мяне сумленне не шкрабе,
Няхай жа мне даруе Бог
За тое, што ты жыць не змог.

Каб значных не было прыкмет,
Яна ў сняданак і абед
І на вячэру — кап ды кап!
— Глытай тых кропель, божы раб.

Нічога ў стравах не відаць,
Не буду гэта пакідаць,

Малыя дозы — добра так!
Працягнеш ногі ты, бядак.

Мінае месяц, паўтара —
Пайшла хвароба са двара.
Шалёны ў мужа знік агонь,
Ён здаравенны стаў, як конь.

Пасля праведаў, што было,
І даў адказ на тое зло:
— Ты не крыві ад злосці рот,
Бо выйдзе ўсё наадварот.

...Яна з ім весела жыве.
Яму пітво — ні ў галаве.
Спяваюць песні на ўвесь двор.
Іх грыб любімы — мухамор.

## Пагулялі

Ветра цёплыя павевы
Асвяжаюць зноў і зноў.
Сярод вёскі чутны спевы
На адным з яе двароў.

Там жанчын сядзіць багата,
Ды чамусьці без мужчын.
Не вяселле і не свята —
Спусташылі магазін.

— Што яны гудуць з прываламі,
З песнямі найвеснімі?
Падказалі: — Цётка Валя
Атрымала пенсію.

— Хіба ж важная прычына,
Каб ваўсю галякаваць?

З паўсяла прыйшлі жанчыны,
Каб рублі папрапіваць?

— Дык купілі ж падарунак —
Пагуляць нагода ёсць.
А з яе ўжо — пачастунак,
Хто прыйшоў — жаданы госць.

Дзядзька Саша, муж той Валі,
Сеў за хатай на бугор.
— Ты чаму, — яго спыталі, —
Не пайшоў на родны двор?

— Хай сядзяць сабе там самі,
Я на гэта не гляджу,
Бо найлепей з мужыкамі
Іншым разам пасяджу...

А назаўтра ціха-ціха,
Не гужуюць з песнямі.
І збяруцца зноў пакрыху
Пры чарговай пенсіі.

## Я — і барада мая

Мой узрост за многіх меншы,
З модай я ў нагу іду.
І каб быў за ўсіх маднейшы,
Адпусціў я бараду.

Вось гуляю і шыкую,
Хвацкі выгляд у мяне.
За прычоску, ды такую,
Будзе гонар мне ці не?

Ды зрабілася жахліва:
Пазнаюць мяне не ўсе.

Хто ж і ведаў — што за дзіва! —
Абыходзяць пакрысе.

Як у госці я прыехаў,
Запыталі: — Ты ці не?
А пасля было шмат смеху:
Падмянілі мо мяне?



Неяк скочыў у машыну —
Кашальком адчайна трос.
А шафёр той без прычыны
У міліцыю падвёз.

Выпусцілі, бо прасіўся,
І са скуры нават лез.

Кажуць: — Хлопча, пагаліся
Ці збягай хутчэй у лес!

Пачалася неяк бойка.
Сам не ведаю, чаму
Нехта крыкнуў: — Стукні лоўка
Барадатаму таму!

А каханая дзяўчына
Мне сказала: — Не прыйду.
Цалавацца немагчыма,
Маладзейшага знайду!

...Я галюся ўжо заўсёды,
Бо была адна нуда,
І ва ўсіх маіх прыгодах
Вінавата барада.

## Змікіціў

Мікіта быў характарам вясёлы,
Вялікі майстар алкагольных спраў.
Таму не сумаваў амаль ніколі,
Штодзень ён немалую чарку браў.

Аднойчы ён да жонкі прычапіўся:
— Бач, галава трашчыць, адна бяда.
А сёння і не піў, і не напіўся,
Дык грошыкаў на пляшачку мне дай.

А жонка тут жа залемантавала:
— З табою вечна вэрхал, а не мір.
Табе, п'янюк, заўжды гарэлкі мала.
Калі ўжо ты пяройдзеш на кефір?

А той упёрся ўраз, як бык шалёны:
— Ты ж ведаеш, як выпіць я люблю.

Рабі, што кажуць, я — не твой прыгонны,
Іначай нешта я з сабой зраблю.

Пасля пайшоў у сенцы, скочыў лоўка,
Для самагубства трэба што, узяў.
І закруціў вакол сябе вяроўку,
Ды гэтак акуратна падвязаў.

Змікіціў ён: — Каб мінавалі мукі,
Аблегчу сам свой лёс, пакуль жыву.
Вяроўку — не на шыю, а пад рукі,
Схіліў набок, як мёртвы, галаву.

А жонка выйшла ў сенцы — вось дык дзіва!
Павешаны, убачыла, мужык.
Загаласіла на ўвесь двор жахліва,
І ўсе яе пачулі страшны крык.

Якія ж можна ёй прыняць тут меры,
Як давядзецца жыць ёй без яго?
Шукаць пабегла міліцыянера,
Каб разабраўся, што дзеля чаго.

Суседка Ганна, спрытная кабета,
Прачула пра сямейны той скандал.
Падумала: — Я скарыстаю гэта.
Палезла да суседзяў у падвал.

Жыве праз хату — гэтак недалёка,
Выносіць з кубла сала, кумпякі.
А гаспадар як невідушчым вокам
Глядзіць: — Мы з жонкай — вось дык прастакі!

Сказаў: — Кладзі назад маё ты сала,
Хай гэты страшны грэх цябе міне,
Бо ва ўдавы маёй дзяцей нямала,
Хто ж будзе ўсіх карміць іх без мяне?

А на яе напала раптам млоснасць,
Бо за крадзёж затрымана яна.
Са страху нават страціла прытомнасць,
Упала, праляжала да цямна.

З двара прыходзіць жонка з участковым,
Ён нож бярэ — вяроўку разразаць.
І думае Мікіта бесталковы:
— Ды дзе мне паратунак тут узяць?

Як упаду — зламлю, напэўна ногі,
Высакавата трохі я павіс.
Дык учапіўся за таго з трывогі,
І грымнуліся разам дружна ўніз.

Не скончылася тым у іх бяда ўся,
Нагнаў усім выпадак той тугу.
Мікіта — сам ён цэленькі застаўся,
А міліцыянер — зламаў нагу.

За «жартачкі» быў у Мікіты смутак,
З бутэлькамі ўжо больш не сябраваў.
Бо загрымеў аж на пятнаццаць сутак,
Ды рады, што турмы хоць мінаваў.



## Трыццацігадовы халасцяк

Не райце толькі, людцы, мне жаніцца,
Бо для дзяўчат немалады ўжо я.
Не падабаюцца і маладзіцы,
Усё ж аднаму прывольней удвая.

Апранут я, як бачыце, няблага,
Аб гаспадарцы дбаць не трэба мне.
І да кахання я не маю прагі:
Не грэбуюць дзяўчаты мною, не.

Але усё цяжэй мне год ад году,
І кідаюся ўжо ва ўсе бакі.
Мне не даюць знаёмыя праходу,
Не адстаюць ад іх і сваякі.

Як толькі хто спаткаецца са мною,
Дык іншых слоў не маюць да мяне,
Хоць з імі і не бачыўся даўно я:
— Адказвай: ажаніўся ўжо ці не?

Што адказаць магу на тыя словы,
Як павярнуць падзей злавесны ход?
І лічаць, што я хлопец неталковы,
Калі не ажаніўся ў столькі год.

І кпяць сябры часамі непрыстойна:
— Ты б не перабіраў нявест, браток.
Табе не ажаніцца самастойна,
Калі мінуў трыццаты ўжо гадок.

Ажэнішся ж пад старасць — дзе тут дзецца,
Калі у маладосці не сумеў —
І будуць за табою бегаць дзеці —
За бацькам, ці за дзедам — зразумей!

Даволі!

Згодзен.

Як жа прыступіцца?

А мо і лепш, як ёсць сям'я свая.
Дык што, вы ўсё ж мне раіце жаніцца?
Тады бягу шукаць нявесту я!



## Як я аднойчы быў жанатым

Таварыш мой, пытаеш ты,
Чаму дасюль я халасты.
А я аднойчы жонку меў,
Аб тым вядома толькі мне.

Прыйшлі мы, памятаю, у ЗАГС,
Там запісалі хутка нас.
А жонка — мара, ад такой
З нас кожны страціў бы спакой.

Але як выйшаў за парог,
Я на нагах стаяць не мог.

Апанаваў раптоўна жах,
Пачаў я вянуць на вачах.

Браточкі, што я нарабіў?
Ды я ж, як вецер, вольны быў.
Куды, бывала, захачу,
Туды, як птушка, палячу.

Цяпер ужо не паляціш,
Як кажуць, будзе гладзь ды ціш,
Бо звяжа крылы мне сям'я.
Ды кім жа стаў нарэшце я?

І як ужо мне зараз быць,
Што з гэтай жонкаю рабіць?
І не зміріцца мне. Чаму ж
Не кавалер я больш, а муж?

Халодны пот мяне прабіў,
Пачаў будзільнік звон,
І я бясконца рады быў,
Што гэта —
                    толькі сон!



# Мне б такога жаніха...

Вельмі б моцна пакахала
Жаніха такога,
Каб гадоў было не мала
І не вельмі многа.

Не хачу, каб быў прыгожы,
Мне найлепш — высокі.
На руках насіць ён зможа,
Са мной пойдзе ў скокі.

Хай зусім не выпівае,
Будзе сам вясёлы,
За работай паспявае,
А за мною — болей.

І не трэба мне, каб ён
Меў сваю машыну —
Разлучацца на шмат дзён
Не шукаў прычыны.

Каб не быў раўнівы дужа —
Думаю я гэтак.
Каб былі ўсе думкі ў мужа
Пра сям'ю, пра дзетак.

Хай жыве ў маёй кватэры —
Спакайнейшай буду:
Разгуляўшыся без меры,
Не ўцячэ нікуды.

Вось які мне трэба хлопец,
Возьме — не здзіўлюся.
А як смеласці не хопіць —
Я на ім жанюся!



# Як паклёпнік пацярпеў

Быў не ў ладах Мацей з суседам,
Яго спрадвеку не любіў.
Адны брыдоты толькі ведаў,
Заўсёды прыкрасці рабіў.

Суседу ўсё было вядома —
У вёсцы кожнага відаць.
Таму і вырашыў свядома
Урок Мацею добры даць.

Пад вечар вынес буталь з хаты
І ў агародзе закапаў.
Мацей туляўся ваўкавата,
І выглядаў, і ноч не спаў.

Назаўтра міліцыянеры
Знянацку з вобыскам прыйшлі.
Яны стараліся без меры,
Дасталі б, здэцца, з-пад зямлі.

Адкаркавалі — не, не пахне.
Дык што ж наліта там тады?
І кубак поўны ён як трахне —
Скрывіўся нават... ад вады.

Але змаўчаў. Падаў другому.
І той таксама смела п'е.
І зноў жа што? Вада, вядома!
Бо паху, моцы не дае.

Суседа словамі прынерлі:
— Чаго, скажы, наліў сюды?
— А вой, ды цешча вось памерла,
Не ведаць лепш такой бяды!

У іншых плачуць, стогнуць, ныюць.
У нас жа, каб спакойна спаць,

Калі нябожчыка памыюць,
Ваду належыць закапаць.

І тут ахоўнікаў парадку
Скруціла раптам — проста жах,
Аж паваліліся на градку,
Іх тузаць стала на вачах.

Пасля пайшлі і да Мацея!
— Пляткар, нягоднік, шэльма ён!
А той над бутлем сам пацее
І цісне мутны самагон.

Цяпер не будзе доўга шкодзіць.
Хто што шукае — той знаходзіць.

## Пахваліў

Каб адшукаць крыніцу сіл,
Пажыць належным чынам,
Да сябра прыкаціў Васіль
У вёску ў адпачынак.

Гуляе тыдзень ён і два,
А гаспадар частуе.
Занята думкай галава,
Гульбу як скончыць тую.

«Адпрэчыць нельга — будзе злосць,
Дык пахвалю па-свойму».
— Ды ты, Васіль, цудоўны госць,
Так не скажу другому.

Вось я — калі дзесь у гасцях,
Праз два-тры дні сумую.
Ну а ў цябе такі размах,
Што суму я не чую.

Са смакам п'еш, як след ясі
І да ўсяго ахвочы.
Не адпушчу, і не прасі!
Васіль тут аж падскочыў:

— А ты — выдатны гаспадар,
Злаваў бы іншы недзе.
Пайду і тэлеграму дам:
Сям'я ўся хай прыедзе!

## «Вытворчае» каханне

Вось паклікаў нейк начальнік:
— Набірай шпарчэйшы ход!
Даставай дзесь дробных гаек,
Бо спыняецца завод.

А шмат з кім я быў у згодзе,
Меў агульных многа спраў.
І на радыёзаводзе
Гайкі выпісаў, забраў.

У кардонную каробку
Акуратна ўпакаваў.
Ды на тым не ставіў кропку,
А каханку сустракаў...

Бо прызначана спатканне,
Дзень жа ўжо на схіле быў.
А ў душы кіпіць каханне,
Любай я б усё зрабіў.

І каля бібліятэкі
Ёй насустрач я ішоў.
— Што за торт маленькі гэткі? —
Кажа. — Большы не знайшоў?

— То — не торт, прабач, а гайкі.
Сам жа чырванню гару.
А яна: — Ад небаракі
Абы-што я не бяру.

Стрэць такое можна рэдка.
Ну, дадумаўся, дзівак!
Дзе цукеркі і дзе кветкі?
Да дзяўчат не ходзяць так.

— Выбачай, — кажу, — шчырую,
Бо я — дбайны працаўнік.
Лепш пачуцці падарую —
Да цябе даўно прывык.

Быў і смех, былі і слёзы,
І папрокі, і любоў.
Праз дажджы і праз марозы
Сустракаліся мы зноў.

І тарты нярэдка елі,
І каньяк пілі мы ўсмак.
Нараджаць дзяцей паспелі,
Не разлучымся ніяк!



# Закаханы шахматыст

Ты — мая каралева,
Ну а я — твой кароль.
Шах то справа, то злева...
Як хвалюецца кроў!

Аб усім бы забыўся,
Толькі б побач была,
Я ладдзёю б зрабіўся,
Ты б па моры плыла.

Хай бы сон той мой збыўся:
Быў у джунглях твой дом —
Я ў джунглях зрабіўся б
Тваім верным сланом.

Біўся б я на турніры
Супраць дзесяцерых,
За цябе, скажу шчыра,
Абгуляў бы усіх.

Заўжды п'яны я быццам,
І гару я агнём,
Не магу прыступіцца,
Хоць рабі ход канём.

Не кароль я, а пешка
Перад сінню вачэй,
Ад твае ад усмешкі
Я не сплю шмат начэй.

І не маю я веры,
Нейкі сум у вачах;
Ледзь ступлю я наперад,
Атрымоўваю шах.

Я спакою не маю,
Шлях закрыт мне назад...

Я карону здымаю —
Гэта значыць, мне мат.



## Любоўныя прыгоды

Калі пайшоў я ў парк аднойчы,
Дзяўчыну добрую спаткаў.
Фігурка, вусны, бровы, вочы —
Такіх яшчэ не сустракаў.

Скранулася ў сэрцы штосьці:
Вось каб яе заваяваў!
І запрасіў тады ж у госці,
Яе як след пачаставаў.

Віно лілося ў нас ракою,
І пацалункі, шмат размоў.
Ключы ў дзярах — і што ж такое?
І пра любошчы словы зноў.

Я прадчуваю асалоду,
Хачу адчуць раптоўна страсць.

У нас з дзяўчынай гэтай згода,
І сэрца мне яна аддасць.

А раніцою я прачнуўся
І сумаваў не без прычын.
Ляжаў.
Устаў.
І азірнуўся:
Няма дзяўчыны,
Я — адзін.

Нашто віна прыняў я лішку?
Хто зможа мне дапамагчы?
І ўвогуле тут справа — крышка.
Нашто ў дзярах былі ключы?

А дзень рабочы, дзень вялізны,
І толькі там заўважыў я,
Што, хоць апранут, — без бялізны,
У каханне падвяла гульня.

Я сходу ўзяў разгон вялікі,
Залішне бушавала кроў.
У розныя ўлез чаравікі,
Прытым абодва — без шнуркоў.

За дзень я нахадзіўся столькі —
Не менш за скакуна-каня.
І хтось адзін заўважыў толькі,
Што ў чаравіках розных я.

Не шмат цярпеў ад той няўдачы,
Хоць быў відаць з усіх бакоў.
І нехта шчэ адзін убачыў,
Што чаравікі — без шнуркоў.

Прыгоды тыя мінавалі,
Не перайшло ўсё гэта ў зло.

Я сустракаў дзяўчат нямала,
Ды больш такога не было.

Калі ты хочаш заляцацца —
Знай абавязкі і правы.
Не трэба лішне напівацца,
Губляць не варта галавы.



## Святлафоры

Святлафоры, святлафоры,
Як я вас не палюбіў!
Бо ад вас мне толькі гора,
Шмат я часу загубіў.

Вось спяшаюся на працу,
Ды, хоць спраў неўправарот,
Трэба ўсюды затрымацца:
Святлафор глядзіць мне ў рот.

Ці з работы еду ў зморы,
Адпачыць бы як хутчэй,
Ды паўсюды святлафоры,
Пехатой ісці лягчэй.

Тут вадзіцелі злуюцца,
Пасажыраў злосны хор:
— Што за прыкрасць, гляньце, людцы,
Што ні крок, то святлафор!

Нека ехаў на спатканне —
Аж карціць імчаць шпарчэй.
Святлафор развёў каханне —
Радасць знікла ўжо з вачэй.

Я сышоў, стаю, смуткую,
Што ж мне, думаю, рабіць?
Ды дзяўчыну стрэў такую,
Што не змог не палюбіць.

Пазнаёміліся гэтак,
Па дарозе нам было.
І ўжо зараз маем дзетак
Святлафорам тым назло.

Святлафоры, святлафоры,
Як цяпер я ўдзячны вам!
Каб былі мы ўсе ў гуморы,
Падміргніце часам нам!

## Ажаніўся — замуж выйшаў

Толькі стрэў пад густ дзяўчыну —
Не цягнуў я доўга час.
Быў ва ўзросце ўжо хлапчына,
Пажаніўся з ёй якраз.

А яна ж і выгляд мела,
Не гублялася нідзе.
З ёй пайшоў у ЗАГС я смела,
Думаў — шчасце ў дом ідзе.

Як мінуў мядовы месяц,
Бачу рэзкі паварот.
Штось не тое, мне здаецца,
Часта ўсё наадварот.

Гатаваць вячэру трэба.
— Пойдзем, — кажа, — у рэстаран.
З'еш інакш кавалак хлеба,
Ці гатуй, бо ты ж — не пан.

Мыць падлогу без прынукі
Не пачне — тут шум і гам.
— Што, баляць, — пытаю, — рукі?
Стогне: — Цяжка, мый ты сам!

Цыраваць прашу шкарпэткі —
Адкідае іх назад.
Нос уткне яна ў газеткі,
Пашырае кругагляд.

А бялізну мыць — дык гора,
Ёй пра гэта не згадай.
— Біркі сам прышый, — гаворыць, —
Занясі і ў пральню здай.

Прасаваць штаны, кашулі
Не прымушу я ніяк.

Жонка ные: — Дзе вы чулі,
Каб жанчыну мучыць так?

— Дык нашто, — пытаю, — жонка,
Каб ёй толькі загараць?
А яна шчабеча звонка:
— Каб зарплату забіраць!

Гонар май, што я з табою,
І кахай мяне адну.
Сагравай заўжды любоўю,
Сам рабі ўсё — і шануй.

...Галава і рукі ў гудзе,
І падумаў я між тым:
Ведаў бы, што гэтак будзе, —
Заставаўся б халастым!

## Замуж выйшла — вось марока

Пажаніліся — злуём мы
Дзень увесь ад ранку.
Ты каго прывёў дадому —
Жонку ці служанку?

Каб жывот свой хоць растрэсці,
Сам памый падлогу.
Ды штодзень сядзіш ты ў крэсле,
Вывучаеш ёгаў.

І забыўся, дзе сталоўка,
Бо цяпер стаў панам:
— Мне гатуй вячэру, жонка,
Лепш, чым рэстараны.

Навявае вечар смутак,
Людзі ўсе паснулі.

Ды збіраю ў велькі скрутак
Я твае кашулі.

Аж пакрылі рукі раны,
Каўняры тру, мыю.
Бо лянуешся, каханы,
Добра вымыць шыю.

За зарплату папракаеш —
Я ж у чым павінна?
Хіба дзвесце, што ты маеш,
Грошы для мужчыны?

На другіх жанчын часамі
Каб не заглядацца,
Прыгажосць сваю таксама
Мушу шанаваць я.

Загараю, крэм купляю,
Гэткія турботы!
Нават часу мала маю
Для ўсёй той работы.

Ты ж бурчыш, надзьмуўшы губы,
І няма ў нас згоды.
Як не зменішся, мой любы,
Дойдзе да разводу!



# Як хадзіў я па грыбы

Раз пайшоў я па грыбы,
Час прабавіць мне абы.
Захапіў з сабою кош.
Дома быць мне для чаго ж?

Бо ні жонкі, ні дзяцей,
Можна ў лес хадзіць часцей.
Мо знайду баравікі,
Можа, рыжык там які.

Сыраежачку ў бары
Не мінай, у кош бяры.
Вось набраў грыбоў я шмат
І вяртаюся назад.

Ды зірнуў: сярод ігліц
Сыраежачка стаіць.
Постаць стройная яе,
Хустачка на галаве,

Шчочкі чырванню гараць,
І не змог я устаяць.
Тут адразу я абмяк,
Вось, сябры, бывае як.

Паланіла удвая
Сыраежачка мая.
Не пайшоў бы я ў грыбы —
Халастым бы й зараз быў.

# Мой метад

Прыдбаў нарэшце я машыну —
Паезджу сам, пакуль жывы.
Пасля з прыемнай той прычыны
Пайшоў здаваць і на правы.

І медкамісію праходзіў:
Як сэрца, слых і як мой зрок?
І адхіленняў не знаходзіў,
Ды толькі ціск рабіў падскок.

Урач мне не дае даведкі —
Турботам краю не відно.
Дык я ж не п'ю — ёсць нават сведкі,
А ціск турбуе ўжо даўно.

Дык як жа збіць яго, хто скажа,
Як урача мне падманіць?
Бо той праходзіць, хто «падмажа».
А можа, лёс лепш не дражніць?

І падказаў мне сябар выйсце:
— Віна бутэльку спаражні,
Бо так было са мной калісьці,
Затым да доктара гані!

І я купіў «чарніла» пляшку —
Перш чым заходзіць, асушыў.
Дасць Бог, не будзе тут прамашкі,
Паход удала б завяршыў!

Лаўровы ліст без асалоды
Я пажаваў, наколькі змог —
Так, каб ад віннага смуроду
Мой доктар не зваліўся з ног.

А ён у момант ціск праверыў:
— Выдатна з гэтае пары!
Ну, браце, усё прыйшло до меры,
І смела ў рукі руль бяры.

Відаць, узяўся ты за розум:
Прыйшоў вось першы раз цвярозым.

# Прагнасць падвяла

Бывае ж часам гэткі сон!
Заснуў аднойчы моцна дзед.
Бабуля думала, што ён
Навек пакінуў белы свет.

Яго аплакала яна,
Збіраючы ў апошні шлях.
— Вой, засталася я адна!
І слёзы бліснулі ў вачах.

Ды не стагнала ад тугі:
— Усе калісьці будзем там.
Касцюм на дзеду дарагі,
Дык лепей я яго прадам.

Ужо ляжыць на лаве дзед,
Убраны толькі ў рызманы.
— Не трэба й гэта на той свет! —
Яе турбуюць і яны.

— Стары ідзе не ў госці, не,
Яго не варта апранаць.
А застануцца транты мне —
І буду дзеда памінаць.

Застаўся бедны дзед, як бач,
Пад прасцінаю ў бялізне.
Зайшлі суседзі — бабка ў плач:
— Куды ж ідзеш ты ад мяне?

Тут дзед нагнаў на бабку страх,
Падняў сівую бараду:
— Куды ж мне ў майцы і трусах?
Хіба ў футбол гуляць пайду!

## «Пасватаў»

Мы гулялі дружна недзе
Пры вясёлай гамане.
З намі быў мой сябар Эдзя,
Ён сядзеў каля мяне.

Побач з ім была дзяўчына.
Добры выгляд у яе —
Пазнаёміцца прычына,
Думкі выказаць свае.

Ён спакойны і не дробны,
Ды такая ж і яна.
Да яе ён так падобны
І — адзін, яна — адна.



Не інакш як быць мне сватам.
Я штурхаю Эдзю ў бок:
— Да яе зрабі падкаты,
Заляцайся з ёй, браток!

Эдзік толькі нос падвесіў,
Бы не чуе ён мяне.
На яго я цісну прэсам:
— Пры, удача не міне!

Эдзік дзіка пазірае:
— Не хачу і не магу.
Я ж свайго не пакідаю:
— Што, цягнуць на ланцугу?

Сябар здзіўлены быў дужа:
— Ну, ад смеху я памру!
Што ж ты сватаеш мне, дружа,
Родную маю сястру?

## «Вясёлыя» эцюды

«Героі» вясёлых сюжэтаў —
Цаніцелі розных «букетаў».
Што з імі бывае пры гэтым —
Пра тое не пішуць санетаў.

У горле то цісне, то рэжа.
Патрапіў на «Белую вежу».
Прыклаўся там трошачкі з гора —
І ўбачыў «Вячэрнія зоры».

А воддаль стаяў «Стары замак».
Узяў да яго ён напрамак.
Сустрэчным мужчынам і дамам
Махаў ён прызыўна «Агдамам».

З сабою, нібыта сяброўку,
Паспеў прыхапіць і «Зуброўку».
Каб сэрца не стукала хвора,
Рашыў падлячыцца «Кагорам».

А каб пачуццё не памерла,
Прадэгуставаў ён і «Мерла».
Стрымацца не змог ад чарльстону,
Як пробу зняў з «Узбекістону».

Цудоўнай была ўся прырода,
Хмяліў «Абрыкосавы водар».
Знайшоў потым «Папараць-кветку»,
Якой захапляўся нярэдка.

Зямны шар круціўся на восі,
Цвіла «Залатая восень».
Ад радасці нават прысвіснуў,
«Асенні букет» ён прыціснуў.

І скочыў у «Вілію» смела —
Натхніла яго «Ізабела».
Такое не часта прысніцца —
Руку падала «Чараўніца».

Тады паблукаў ён па лесе,
Прысеў на хвілінку з «Алесяй».
Сваю паказаў там закваску,
Пасля пацярпеў і «Фяцяску».

Затым ён сядзеў у дружыне,
Як бы ў «Алазанскай даліне».
Ды быў ненадзейным ратунак:
Прыслаў выцвярэзнік рахунак.

Прайшлі мімаходзь усе «цуды»,
І сумнымі сталі «эцюды».



# Прыгоды дачніка

Дачу ў прыгарадзе маю:
Ёсць гарод, шмат яблынь, груш.
Для работы там трымаю
Саламяны капялюш.

Дачу ўлетку рамантую,
Парыць — хоць ты лезь пад душ.
І ад спёкі тут ратуе
Саламяны капялюш.

Паглядзець узімку дачу
Просіць жонка: — З'ездзі, муж!
І задаў тады задачу
Саламяны капялюш.

З'ездзіў я, ды зноў дахаты,
Шлях няблізкі, дык пайду ж.
Замест шапкі зухавата
Начапіў я капялюш.

Тут віхура, холад дзікі,
Не было шчэ гэткіх сцюж.
Каб згарэў ты разам з дзіркай,
Саламяны капялюш.

Хутка ўжо чыгунка будзе,
Дык варочацца чаму ж?
Ды калі ж убачаць людзі,
Прасмяюць мой капялюш.

Скінуць нельга з той прычыны —
Лысы, змерзну, дый нядуж.
Так стаяў я з паўгадзіны,
Праклінаў свой капялюш.

Што ж, вярнуўся, бо нялоўка
Галаву студзіць сваю ж.

І са злосці ўзяў раддлёўку,
Закапаў свой капялюш!

## Памыліўся

Я сябрую з чалавекам
(Пруць пачуцці аж праз край)
З дзіўным прозвішчам Папека,
З імем слаўным Мікалай.

Ён, скажу, ва ўсім геройскі,
З ім прыемна гаманіць.
І не хітры, добры, свойскі,
Думак светлых не спыніць.

Неяк кажа мне з натхненнем:
— Стрэцца зноў прычына ёсць:
У дачкі дзень нараджэння —
Будзеш самы лепшы госць.

Дзён праз дзесяць ёй — семнаццаць,
Павіншуем жа як след.
Тут ад тостаў не стрымацца,
А гасцей наедзе — свет!

Што ж, да свята ёсць імкненне,
Падарункі я знайшоў.
Дзе ж канкрэтна запрашэнне?
Сябру я званю дамоў.

Падымае трубку жонка.
Я шукаю падыход:
— Дык дзе свята і гамонка?
У дачушкі ж — сорак год!

Тая кажа: — Што за здзекі?
Беражэм мы гонар свой.

Ёсць дачка ў майго Папекі,
Ды семнаццаць толькі ёй.

Бо самому ж — сорак восем,
Што казалі вам не раз.
Абы што малоць не просім,
Тыя жарты — не для нас.

...За сталом сядзім мы разам.
Ён смяецца: — Ну дзівак!
Балбатаў тады «пад газам»?
Адказаў я сумна: — Так!

## Адпачынак на турбазе

Папаўнеў я штось адразу,
Трэба скінуць лішні груз.
Я падаўся на турбазу —
Даў пуцёўку прафсаюз.

Там харчы — дыета нібы,
Не раскормяць дужа нас:
То катлета, а то — рыба,
Каша манная штораз.

Як захочаш чым заняцца,
То заўсёды там адно:
Раз ці два на тыдзень — танцы,
Часам — рванае кіно.

Ёсць і сонейка, і мора,
А настрой наш — як калі:
Пырскаў дожджык, як на гора,
Хвалі з нафтаю былі.

Зручнасць, скажам, на здзіўленне:
Пляж — нібыта дзікі пляж.

Толькі галька і каменне,
Як ты зможаш, так і ляж.

Дзён праз колькі — ажыўленне,
Аж гудзе наўкол народ.
Нам паддалі ўраз натхнення,
Мы сабраліся ў паход.

Рэчмяшкі ўзялі за плечы,
Дружна зрушыліся ўсе,
А пасля стаў нехта енчыць
І стамляцца пакрысе.

Паказалася стаянка,
Цягнем дровы на касцёр.
Вельмі слаўная палянка,
Для прывалу тут прастор.

Вось зварылі дамы нашы
Суп такі — не ўзяць у рот,
А яшчэ спалілі кашу —
Падцягнула ўсім жывот.

Хлопцы скемілі нарэшце,
Згаладалі, як ваўкі:
— Гэй, дзяўчаты, мяса рэжце!
Згатавалі шашлыкі...

Частаваліся з дарогі,
Пазглядалі на жанчын.
Заляцанні, жарты, рогат
Па прычыне, без прычын.

А назаўтра — зноў на базу,
Як нічога не было.
Па-ранейшаму адразу
Ціха, сумна ўсё пайшло.

Крыху ўсё ж дайшло да толку:
Скінуў лішнюю вагу,
А цяпер худы настолькі —
Па скачках браць прыз магу.

Зараз водпуск зноў чакаю,
Бо трымаюся ледзь-ледзь.
Санаторый вось шукаю,
Каб хоць трохі папаўнець.



# Пацярпеў

Калі прыйшла карова ў вечар з пашы,
Дык трэба падаіць яе было.
А гаспадыня — лёс яе прапашчы —
Узяла ды захварэла, як назло.

І паглядала жаласна і слёзна —
У яе душы замоўклі салаўі.
Настойліва так просіць і сур'ёзна:
— Схадзі ты сам, кароўку падаі...

Пад бабу прыадзеўся ён, нябога:
Спадніца, хустка і фартук яшчэ.
«Калі мне памаліцца і на Бога,
Дык ад мяне кароўка не ўцячэ».

Узяў вядро і хутка ў хлеў пакрочыў,
Падлазіць, каб як трэба падаіць.
Яна ж не хоча напускаць на вочы,
Нагой брыкае, роўна не стаіць.

Як ні хадзіў, ні лазіў быццам лоўка,
А стукне — ад вядра не бачны след.
Тады знайшоў ён моцную вяроўку,
І прывязаў нагу яе як след.

Брыкаецца другою, як падлезе,
Вядро ляціць далёка, хоць ты плач.
Другую прывязаў ён, як жалеззем:
— Дасі ўжо малака мне, ты прабач.

Палез з вядром, даіць імкнецца з гартам,
Вядро стаіць няўпэўнена між ног.
Яна ж хвастом у твар — дурныя жарты,
І вытрымаць ён гэтага не мог.

І гаспадарчы поспех меў найменшы,
Аж узмакрэў ад гэтых цяжкіх спраў.
І са штаноў ён выцягнуў раменьчык
Ды хвост каровін зверху падвязаў.

А жонка ўсё ж прыйшла — такі ўжо нораў,
Прытым сям'я і клопаты адны.
Прывязана за ногі й хвост карова,
Ён бегае — і падаюць штаны.

Заенчыла яна і застагнала:
— Няўжо ты ад мяне зусім адвык?
Ці ўжо табе любімай жонкі мала?
Дык бачыш, што надумаў, подлы бык!

Калі праведаюць пра гэта людзі,
То будзе ганьба і табе, і мне.
А ведаеш ты, што за гэта судзяць?
Праседзіш да канца жыцця ў турме.

І ляманту было на ўсю там хату
Увесь вечар, ноч шумела давідна.
Наслухаўся знявагі ён багата.
За што?
І што падумала яна?



## Выпівакі-дружбакі

У пятніцу пасля работы
Валодзя доўга гужаваў.
Нагужаваўшыся ў ахвоту,
Паўночы з жонкай бушаваў.

Яна ж назаўтра зачыніла
Кватэру аж на два замкі.
Ключы забрала: — Будзеш, мілы,
Цвярозенькі, раз ты такі!

Валодзя кідаўся па хаце,
Валеру, сябру, пазваніў.
— Адзін я дома, чым заняцца?
Няма пахмелкі, каб я згніў!

— Я прынясу, — гукнуў Валера, —
Намнога болей, чым сто грам.
— Але ж замкнёныя ў нас дзверы!
— Я праз акно табе падам.

У краму скокну хутка, лоўка,
Цябе ўратую, мне павер.
А ты давай спускай вяроўку,
Не страшны восьмы твой паверх.

Спусціў пластмасавую пляшку
Валодзя на вяроўцы ўніз,
Каб не разбіць. Каб без прамашкі.
Валера вінны корак грыз.

І пераліў. Заткнуў: — Ну, віра!
Павольна пляшка ўверх паўзе.
Валера радуецца шчыра,
Яго сумленне не грызе.

Секунды слаба пралятаюць.
Спыніўся сіні «варанок».
Сяржанты вылезлі, пытаюць:
— Што вытвараеш ты, браток?

— Ды я, — адказвае Валера, —
Лячу вось сябра, хворы ён.
Напрацаваўся, бач, без меры,
Прастуджаны ўжо колькі дзён.

А ходзім мы, як між сябрамі,
Праз дзеры, вокны, як хачу.
Калі ж прастудзіцеся самі,
Вас гэтаксама палячу.

А тыя як зарагаталі,
Яго не сталі і ўсчуваць.
І ні аб чым больш не пыталі:
Патрэбна ж сябра ратаваць.



## Вясёлая трагедыя

Катаклізмаў шмат прыродных —
Сеюць гора, сеюць смерць.
Над зямлёю нашай роднай,
На бяду, пранёсся смерч.

...Я схадзіў паціху ў краму
Узяць харчоў на пару дзён.
І дамоў шыбую прама.
Дом жа што? Паблізу ён.

Вось іду я па алейцы,
Дрэў, кустоў нярэдкі рад.
Там зламаў галіну вецер:
Мо быў дождж, магчыма — град.

А галіна ж цяжкая,
Што ніхто і не сагне.
Лёс такі хай не спаткае,
Каб упала на мяне.

Толькі гэтак я падумаў,
Як пачуўся моцны трэск.
Столькі ветру, столькі шуму,
Што напружыўся я ўвесь.

Я зірнуў уверх — о Божа! —
Дрэва зломлена, ляціць.
І мяне ж знявечыць можа:
Два ствалы — уцячы карціць.

Ногі ж быццам бы прымкнуты,
Як налітыя свінцом.
Вочы я закрыў з пакутай:
Ну, бывай, мой родны дом!

У вачах пазелянела,
Шыю я сагнуў сваю.
А пасля гладжу нясмела:
Я — пад дрэвам,
ды — стаю.

І мяне не зачапіла
Ні ствалом, ні галіной.
Сілы вылезці хапіла
Мне з лістоты —
сам не свой.

Смерч прайшоў, як і з'явіўся,
Праляцеў, як наляцеў.
Думкі сумныя былі ўсе,
Хоць пасля павесялеў.

Ну, праскочыла бяда ўся!
Я нібы шалёны стаў:

Усміхнуўся, засмяяўся,
Як дзікун, зарагатаў.

Лёсам ледзьве не распяты,
Я стаяў хвілін мо пяць.
А затым пайшоў дахаты
Уратаванне адзначаць.

Пашукаў у шафе недзе,
Што хаваў там пакрысе.
І знайшоў бутэльку «Брэндзі»,
І за стол грунтоўна сеў.

Тут увальваецца жонка,
З ёй да трох не гавары.
Голас моцны, вельмі звонкі:
— Што, гужуеш без пары?

Дык і я ўжо расхадзіўся:
— Не кугакай, не кукуй!
Я другі раз нарадзіўся.
Ты сядай, са мной святкуй.

Дрэва бачыла ля дома?
Я ледзь вылез з-пад яго.
А ці рада ты?
— Вядома!
Паднясу табе ўсяго.

Мой міленькі, даражэнькі!
Напаўняй келішак свой.
Сёння будзь ты хоць п'яненькі,
Бо не стала я ўдавой.

І не лай мяне, дурную,
Не хачу «качаць правы».
Я за ўсё табе дарую,
Толькі быў бы ты жывы!..

Пачалі тады гулянку
І забыліся пра зло.
Мілаваліся да ранку,
І —
наноў жыццё пайшло.



## «Алфавітнае» каханне

А, Б, В, Г, Д —
вось дык дэкальтэ!
Е і Ё, Ж, З —
я — не шымпанзе.
І, К, Л, М, Н —
ты — каля мяне.
О, П, Р, С, Т —
ноччу — «каратэ».

У, Ф, Х, Ц, Ч —
гамана цячэ.
Ы ды Э, Ю, Я —
вось у нас сям'я.
Засталося Шэ —
тут «ля фам шэршэ».
Стаўлю мяккі знак:
Я — мужык-мастак!



Мікола Вяршынін + Ніна Шэнец

## Што бывае ў сорак год

Час ляціць. Гады як крылы,
І жывеш не без прыгод.
Маладым усе лічылі,
Азірнешся — сорак год.

Пасылаць мяне не варта
Ў магазін ці ў агарод.
Адмаўляюся упарта:
Я ж стары ўжо — сорак год.

Зноў жа возьмем на рабоце:
Маладых — неўправарот.
Я ж спакойны і не ў поце,
Цяжкавата ў сорак год.

А сустрэнецца дзяўчына —
Тут шукаеш падыход.
Падысці, бач, ёсць прычына:
Малады ж я ў сорак год.

А калі ж угледзіць жонка —
Робіш рэзкі паварот:
Будзе грозная гамонка...
Не гульнеш у сорак год.

З маладзейшымі — за брата,
І старыя — свой народ,
І сяброў наўкол багата —
Вось што значыць сорак год!

Калі трэба — маладжуся,
Калі не — наадварот.
Як самому лепш — гляджу ўсё,
Вельмі зручна ў сорак год.

Толькі што вы ні кажыце,
Мчаць гады, як карагод.
Ад узросту не бяжыце:
Лепш за ўсё — у сорак год!

## Дзелавы доктар

На прыём прыйшоў мужчына:
— Я раптоўна захварэў.
Доктар — зірк! У чым прычына?
Здаравенны ж, быццам леў.

Ды на выгляд. А хістаўся,
Перагарам моцна прэ.
Дзе ён гэтак вось набраўся?
Ад таго ўсё ж не памрэ.

— Я як доктар гонар маю
І такім, як ты, не рад.
П'янюкоў я не прымаю,
Бо сапраўдных хворых шмат.

Стогне той: — Мяне ўратуйце,
Бо сканаю хутка ў вас
У лячэбнай каламуці.
Доктар кажа: — У добры час!

Каб былі ў лячэнні зрухі,
А інакш — дамоў ляці,
Каб смурод я твой не нюхаў —
Мне за шкоднасць заплаці.

І не будзе ў нас парадку,
Як цябе не патрасу.
— Колькі ж трэба вам?
— Дзесятку.
— Дык я ў момант прынясу!

... Дробных грошыкаў нёс жменьку —
Назбіраў дзесь абы-як.
Доктару ўклаў у кішэньку:
— Вам на торт ці на каньяк.

— Добранька!
Што ты «пад газам» —
Я цябе не асуджу,
І лячэнне дам адразу:
Распранайся!
Пагляджу.



## Нашто мне рай!

Па жыцці адчайна крочыш,
А пасля глядзіш — і край.
І пара заплюшчыць вочы.
Каб спытаў хто сярод ночы:
— Ці ты ў рай, ці ў пекла хочаш?
Я б сказаў: — Нашто мне рай!

Жыў я проста, небагата,
І было не часта свята,
Толькі шмат надзённых спраў.
Сябраваў і часам біўся,
І не часта я маліўся,
Чарку браў, жанчын кахаў.

Жыў не свята, не бязбожна
І не краў, а браў, што можна,
Хто ж адкіне ад сябе?
На людзей не зыркаў строга,
Не пакрыўдзіў сам нікога,
А звяруг біў па ілбе.

Дык хіба ж у рай мне можна,
Хоць туды імкнецца кожны?
Грэшнік я, як ні глядзі.
Ды і што рабіць там буду?
Звычкі ўсе свае забуду:
Нюхай кветачкі, сядзі.

Ну а ў пекле проста вельмі:
Папякуся на патэльні,
Пасяджу крыху ў смале.
Адыду пасля ад болю
І сябе я задаволю,
Звычкі ўспомню ўсе свае.

Адшукаю недзе пляшку,
Каб было не вельмі цяжка.
Чэрці скажуць: — Во жыве!
Патанцую і прысвісну,
Дзесьці грэшніцу прыцісну —
Прасвятлее ў галаве.

Дык прыкінь, магутны Божа:
Награшыў я многа, можа.
Заслужыў, дык пакарай.

А жыву я так, як людзі.
На тым свеце будзь што будзе!
Пры жыцці мне дайце рай.

## Гультайскі лёс

Аднойчы трое гультаёў
Ляжалі ў садзе лежма.
Ды голад так ужо давёў —
Аж мроілася ежа.

Стаялі дрэвы рад у рад,
Наўкол шумела лета.
І садавіны рознай шмат
Буяла ў садзе гэтым.

Адзін гультай паўдня праспаў:
— Мне галадна, хоць рэжце.
Няхай бы яблык сам упаў
Так проста ў рот нарэшце!

Другі паважны быў, бы гусь,
Гультай зусім адпеты:
— І не лянуешся чамусь
Ты гаварыць пра гэта!

Такі быў трэці абібок —
І слухаць ленаваўся.
Улёгся на другі ён бок
І нават не азваўся.

Ляжалі — ногі дагары,
Лянівыя без меры.
Так усе трое без пары
У садзе тым памерлі.

# Кабарнасць

Я жонку нездарма,
Нібы юнак, кахаю.
Калі яе няма,
Сумую і ўздыхаю.

Чароўная яна,
А позірк кліча ўдалеч.
Глядзеў бы давідна,
Жаніўся вельмі ўдала.

А выйсці пагуляць
З ёй проста немагчыма.
Услед усе глядзяць,
Не пройдуць хлопцы міма.

Аднойчы ехаў я
Далекавата недзе.
Адзіная мая
Ідзе з другім — угледзеў.

Павеяла зімой.
Ці дойдзе да расстання?
Вярнуўся я дамоў
І задаю пытанне:

— Магчыма, да мяне
Пахаладала сэрца?
Адказвае, што не,
Прытым яшчэ смяецца.

— Але я ж бачыў сам,
Таму няма сумнення.
— Не вер сваім вачам,
А вер майму сумленню!

Цябе люблю ўвесь час,
Ды веры даць не хочаш.

Убачыш іншы раз,
Дык лепш заплюшчы вочы!

## Прыгоды купальшчыка

Ну й спякотнае ў нас лета!
Не купацца — проста смех.
Абвясцілі нам пры гэтым,
Што цяпер купацца — грэх.

І агульная трывога,
Не інакш, як быць бядзе:
Шкодных палачак замнога
Пазнаходзілі ў вадзе.

Спёка, стома — вось бяда ўся!
Працаваў я і пацеў.
І на возера падаўся —
Так купацца захацеў.

Бог жа з ёй, з дызентэрыяй!
Я ў бальніцы — рэдкі госць.
І зусім жа не стары я.
І пакуль здароўе ёсць.

А на возеры — бязлюддзе,
Там людзей амаль няма.
Я паплыў. Ну, будзь што будзе,
І прыехаў нездарма.

Бы мяне на свята везлі —
У вады здароўе браць.
А каб палачкі не ўлезлі —
Лепш, падумаў, не ныраць.

Ды не вытрымаў спакусы,
Хоць трымаўся да пары.

І нырнуць сябе прымусіў —
Раз, пасля і два, і тры...

Моўлю жонцы шчыра, прама:
— Тут хвароба можа быць.
Налівай мне дзвесце грамаў,
Каб мікробы ўсе забіць.

— Не памрэш, ты — не калека.
Паддячу, і будзеш рад.
Наліла дамашніх «лекаў»
Грамаў, можа пяцьдзесят.

Ад такой мізэрнай дозы
Выйдзе ўсё наадварот,
Бо да страўніка не дойдзе,
Запаскудзіш толькі рот.

На ўсялякі шчэ выпадак
Я прыняў гарачы душ.
Змыў мікробаў — і парадак,
Не зрабіўся я нядуж.

Спёка, холад, дождж — заўсёды
І праз даўнія гады
Не баюся я прыроды,
З ёй я вечна малады!

## Прыгоды маладога бацькі

Мы з жонкаю дзіця чакалі,
Яна — дачку, а сына — я.
Таму спрачаліся нямала,
Якою мае быць сям'я.

І жонка вось ужо ў раддоме,
Перажываю за яе.

І не да жартаў мне, вядома:
Каго ж, як кажуць, Бог дае?

Праз дзень, не маючы спакою,
Іду ў раддом — якраз пара.
— Віншую шчыра вас з дачкою! —
З парога кажа медсястра.




А я ўсміхнуўся кіславата:
Канешне, лепш бы сын хай быў.
Але, пакуль дайшоў да хаты,
Дачку завочна палюбіў.

Ну што ж, яно, бадай, спакойней,
А то з гарэзнікам — бяда.
Прытым жыццё — яно такое,
Што будзе й сын гады праз два.

Назаўтра ў радасным настроі
Зноў у раддом шыбую я.
Не двое ж нас ужо, а трое.
— Як жонка, як дачка мая?

Сястра ўзняла ў здзіўленні вочы:
— Жартуеце, грамадзянін?
У вас жа нарадзіўся хлопчык,
Здаровы і цудоўны сын!

— Дык што ж у вас тут за пацеха,
А дзе ж дачка, скажыце мне?
— Мы пра дачку сказалі смехам.
Вам мала сына? — Што вы, не!

За недарэчны жарт дарую,
А сам бягу ўжо ў магазін.
Каньяк з шампанскім там бяру я
Для свята светлага — радзін.

А маладым бацькам параю,
Каб не спрачаліся яны.
Найлепш, як ёсць — даўно ўжо маю —
У сям'і і дочкі, і сыны!

## Немужчынскія турботы

Хто не гоніцца за модай?
Тут мужчыны не адны.
Адхапіў я неяк сходу
Вельмі модныя штаны.

І стараўся недарэмна,
Задаволіў густ я свой:
Колер светлы і прыемны —
І з тканіны плашчавой.

Вось зрабіў пакупку лоўка!
Выйшла ўсё наадварот,
Бо падраў сваю абноўку,
Зачапіўшыся за дрот.

Выкінуць шкада, вядома, —
Панасіў нядоўга я,
Зацыруе, думаў, дома
Жонка родная мая.

Тая стрэла без ахвоты,
Наганяе мне тугу:
— Надта тонкая работа,
Так не ўмею, не магу.

Я дугою выгнаў шыю —
І ў майстэрню як хутчэй.
А краўчыха: — Я не шыю
Плашчаных тканін яшчэ.

... Што мне лішнія дакукі?
Недарэчы ўсіх прасіць.
І нашто ў мяне ёсць рукі —
Для гультайства ці красы?

І зраблю ўсё хутка, ціха,
Ганьбы ўжо сабе не дам.
Я — і жонка, і майстрыха,
Зацырую лепей сам.

Я танюткую іголку
І пад колер нітку ўзяў.
Ледзь прыкметнаю праколкай
Роўненька зацыраваў.

Груз работы не навісне
Над удалым малайцом.
А жыццё калі прыцісне —
Станеш нават і краўцом.

# Што бывае ў пяцьдзесят

Час імклівы, хуткаплынны,
Шмат знаходак, многа страт.
Не лічыў я дні, хвіліны,
Вось ужо і пяцьдзесят.

Гэта быццам незаўважна:
Ёсць бадзёрасці зарад.
А прыгледзішся, дык важна,
Бо не трыццаць — пяцьдзесят.

Паважаюць не рабоце
Усе дачыста акурат,
Бо стараюся і ў поце,
Хоць нялёгка ў пяцьдзесят.

У сям'і я маладжуся,
Перад жонкай бегаць рад.
Сам раблю і сам гляджу ўсё,
Што мне значыць пяцьдзесят?

Нараджэнне ці вяселле —
Я і кум, і сябар, сват.
Не адмоўлюся ад зелля —
Усё магу я ў пяцьдзесят.

Смела кінуся і ў скокі,
І спяваць магу падрад
Добрым голасам высокім —
Весялюся ў пяцьдзесят.

Уступаюць часам месца,
Ды ці сяду я? Наўрад.
— Я старэйшы? Вам здаецца,
Бо мне толькі пяцьдзесят.

А сустрэну маладую,
Дык ні ўперад, ні назад.
Пра гады свае шкадую:
Як ні кінь, а пяцьдзесят.

...Адзвінелі вёсны, леты,
Кліча восень у свой сад.
Сэрца звонкае пры гэтым,
Жыць цікава ў пяцьдзесят!

## А прычым прычоска тут?

Вось шуміць, гудзе вяселле,
І ракой ліецца зелле,
І бушуе маладосць,
У настроі кожны госць.

Больш за ўсіх гамоніць лысы,
Невысокі, белабрысы —
Мужычок сярэдніх год,
Хоць вадзі з ім карагод.

Добра чарку выпівае,
І падскоквае, спявае,
І раскажа анекдот —
Аж глядзяць яму ўсе ў рот.

Запыталі ў маладога:
— Дзе, скажы, знайшоў такога?
Ён, напэўна, твой сваяк.
— Невядомы мне дзівак!

І цікавяцца кабеты:
— Дык адкуль жа чыжык гэты?
Пэўна, з боку маладой?
— Не, ніякі мне не свой!..

Ні сусед і не знаёмы,
А гуляе ж вось, як дома, —
Без ніякіх там правоў.
Сам прыйшоў ці хто прывёў?

Позна.
Змрок над хатай вісне.
Нехта ўбачыў:
лысы цісне
У глыбіні глухой двара
Жоначку... гаспадара.

Той угледзеў, раскумекаў:
— Што ты робіш, недарэка?
Прэч адсюль, бо ўраз прыб'ю
Я за жоначку маю!

Лысы быццам прахапіўся:
— Вой, прабачце, я напіўся.
Пераблытаў сп'яну штосьць,
І мая ж тут недзе ёсць.

— Што ж сваю ты не чапаеш,
А чужую спакушаеш?
Лысы конь, будзь разумней!
Ці з чужуй табе смачней?..

З той пары нярэдка кажуць,
А ў народзе скажуць — звяжуць,
Што ад лысых скрозь — нуда,
Часта нават і бяда.

А жанчын за кошак маюць
І лісліві ход трымаюць.
Па характары — каты
І распушваюць хвасты.

Ёсць адна з даўнейшых версій:
Лысым век ты не даверся.

Навядуць на вочы муць,
Нават жонку адбяруць.

Як жа ім абараняцца,
Каб з нягодамі не знацца
І сябе не растварыць?
Партыю сваю стварыць!

Ёсць жа партыя ў нас піва —
І ніхто не бачыць дзіва.
А як будзе да таго ж
Лысых партыя — не горш.

Самай масаваю будзе,
Стануць перці валам людзі.
Можа лысіна з'яднаць,
Валасатым — не здагнаць!

Валасатыя ж — усе,
Быццам бы ва ўсёй красе.
А вось лысыя — у крэдыт,
Лысых — проста дэфіцыт!

## Зарок

Працую я даўно ў ахове —
Пост важны, і не просты пост.
А сам — і дужы, і здаровы,
І пад два метры маю рост.

Не выпіваю — нельга гэта,
На свята ж чарачку бяру.
Але ёсць дрэнная прыкмета —
Што цэлы дзень смалю, куру.

Пілуе жонка, лае часта:
— Ды ад цябе — наўкол смурод.

Знайшоў у цыгарэтах шчасце,
Усё паганіш дымам рот.

І бедаў ад таго нямала:
Так шкодзіць сэрцу, галаве,
І лёгкім, страўніку — навала.
Хто курыць — век свой не жыве.

Я зразумеў. Хачу змагацца.
Якое ж выйце мне знайсці?
Ды як за розум тут узяцца,
Ад звычкі дрэннай адысці?

Не маю я ў курэнні меркі,
І як сябе перамагчы?
Хто раіць: — Лепш купляй цукеркі,
Курыць захочацца — смакчы.

Другі сказаў: — Не будзь разявай,
Ты выпі лепш і закусі.
А трэці мовіць: — Выпі кавы,
А закурыць — і не прасі.

Чацвёрты мне шапнуў «па блату»
(З ім маю многа розных спраў):
— Курыць захочаш — лайся матам,
Каб пра цыгаркі забываў.

І думку я прыняў такую,
Сам вельмі рады ад таго.
Сяджу ў дзяжурцы і цікую,
Каб хто не вынес бы чаго.

І сцерагу я ўсё заўзята,
Курыць жа цягне — не ў дугу!
І ўсё навокал крыю матам,
Крычу, наколькі я магу.

Чаго ад бомжаў чуў я часта,
Ад жонкі нават, ад сяброў,
Ад алкашоў і ад начальства,
І ўрэшце я, як бык, зароў.

Увальваецца тут начальнік:
— Скажы мне, дысцыпліна дзе ж?
Расчырванеўся сам, як чайнік:
— Чаму равеш і маты гнеш?

— Я ледзь ад дыму не загінуў,
Курэнне кінуць даў зарок.
Начальнік кажа: — Вось прычына!
Зрабіў вялікі ты падскок.

Выдурвацца табе даволі.
Ды ты — шчанюк, ды ты — слабак.
Патрэбна толькі сіла волі.
Хто ж адвыкае проста так?

Не думаўшы, не заракайся.
На, цэлы пачак мой бяры.
Ды толькі лепш не мацюкайся.
Менш хочаш жыць — куры, куры.

## Браканьеры

Пайшло ў раёне браканьерства,
Бо кожны з дубальтоўкай лез.
Страляць паказвалі майстэрства,
Дзічыну траціў хутка лес.

Начальства ў страху — усе пацелі:
Прыроду ж трэба ратаваць.
Злачынцаў захапіць хацелі —
Такога нельга больш трываць.

Сабралі егераў брыгаду,
Быў з імі міліцыянер.
— Ну, давядзём усё да ладу,
Канец нахабнікам цяпер!

Брыгада сноўдала па лесе,
Знайшла забітага лася.
Пад снег быў закапаны ўвесь ён,
Садрана чыста скура ўся.




А збоку кішкі закапаны,
Няма паўбока, галавы.
І хвост, нарэшце, адарваны.
Магутны звер — а нежывы.

Навеяла ўсё гэта смутак.
Каб злыдняў затрымаць змаглі!
Дзяжурылі аж трое сутак,
Касцёр здалёку развялі.

І браканьераў затрымалі.
Вось цягне санкі нейкі дзед.
І азіраецца памалу.
Брыгада крочыць след у след.

Дзед выняў нож, адрэзаў ляжку,
На санкі хутка пагрузіў.
Цягнуць было даволі цяжка —
Але ж не раз ужо вазіў.

Тут егеры напалі лоўка:
— Ну, дзед, папаўся нам ужо!
Страляеш трапна з дубальтоўкі.
Прызнайся: дзе тваё ружжо?

— Э, што вы, хлопцы, гэтак строга,
Благога век я не рабіў.
— Ды не прыдурвайся, нябога:
Ты ж, чорт стары, лася забіў.

— Не, вы дарэмна так сурова,
Бо я — не майстар дрэнных спраў.
То ж здохла у мяне карова,
Дык я яе тут прыхаваў.

Ветэрынар сказаў, на ліха,
Каб я кароўку закапаў.
Я ў лес яе завёз паціху,
Калі той вельмі моцна спаў.

Прыйду ды адвалю кавалак,
Свайму сабаку навару.
Той любіць есці, і нямала,
Вось гэта я яму і пру.

Мой Шарык хвосцікам махае,
Калі яму наедак дам.
Як праз гадзіну не здыхае,
Дык налуплюся я і сам.

Ды атрымалася прамашка:
Ніяк уцяміць не магу,
Дзе дзелася другая ляжка,
І хто ж украў яе, нагу?

Брыгаду ўсю ўзяла задышка,
Нібы аслеплі, як краты.
Ім вываротваць стала кішкі,
Замучылі іх жываты.

— Ну, дзед паганы, што зрабіў ты!
Мы думалі, што гэта — лось.
Здыхляцінаю мы набіты,
За трое сутак — язва ёсць.

Дзед усміхнуўся хітравата:
— Не варта на мяне пляваць.
Я тут ні ў чым не вінаваты:
Саміх вас трэба вартаваць!

## Жыццё забеспячэнца

Каго куды штурхае лёс!
Жывеш, як лепш здаецца.
Імкнецца іншы да нябёс,
Я ж стаў забеспячэнцам.

Але не кожны можа мець
Прафесію такую.
Бо вельмі многа трэба ўмець,
Што зведаў на вяку я.

Умець прасіць, умець даваць,
Раз трэба для работы.
Купляць, збываць і прадаваць —
З ахвотай, без ахвоты.

Паднесці сувенір падчас
Кіруючай жанчыне,
Падняць келішак, і не раз,
З калегам па прычыне.

У час аформіць дакумент —
Патраціш не гадзіну.
Каб пагрузіць свой груз як след,
Яшчэ падставіш спіну.

Камандзіроўкі — зноў не мёд,
Бяжыць жыццё на колах.
Забеспячэнскі наш народ
Не сумаваў ніколі.

Мы едзем «выбіць» дэфіцыт —
Куды каго закінуць.
І паказаць там трэба спрыт,
Пайсці на штурм гасцініц.

А зручнасці былыя дзе ж?
Пра дом забудзься зноўку.
Або харчы сухія еш,
Або бяжы ў сталоўку.

Ты, як найбольш зрабіць, глядзі,
А ў вольны вечар нейкі
Ці пагуляць хоць з кім ідзі,
Ці помні пра сямейку.

Нажыў я лысіну даўно,
Працуе кепска страўнік.
Нягодам краю не відно —
Абы хваліў начальнік!

Не гаспадар я і не госць
Як дома, так і ўсюды.
Але, пакуль шчэ сіла ёсць,
Забеспячэнцам буду!

## Калючая ружа

Я быў зачарованы дужа
У свае маладыя гады:
Найлепшаю кветкаю — ружай
Здавалася ты мне тады.

І сам жа я быў не асотам,
Не, хлопец я быў — ого-го!
Сачыў за табою употай.
Мяне пакахай аднаго!

Табе ўрэшце кінуўся ў ногі,
А ты падала мне руку.
Усіх расштурхаўшы з дарогі,
Цябе я схапіў на скаку.

Жыццё закружыла віхурна.
Я ў госці — ты дома сядзіш.
Вось я паглядаю пахмурна,
Ты ж весела вельмі глядзіш.

Сяброў клічу поўную хату,
Сямейны трымаю свой руль.
— Рыхтуй, — кажу, — стол нам багаты.
Ты з крыкам: — Шыбуйце адсюль!

Салёныя стравы люблю я.
Ты — горкія. Вось паварот!
І ўвогуле, што ні раблю я,
Ты ўсё робіш наадварот.

Даводзіш мяне да калення,
І лаеш, як чорта, хоць плач!
А потым стаіш на каленях
І стогнеш: — Каханы, прабач!

Прылачшу цябе — ты ўцякаеш,
Злуюся — дык лашчыся ты.
Такая вось — і не такая,
Праз сэрцы наводжу масты.

А тыя масты — не з бетону,
З пачуццяў, што розныя ў нас.
А сам я ўжо стаў камертонам —
Ваг анні лаўлю кожны раз.

Ніколі цябе не пакрыўджу,
Табою здаўна хворы я.
Кахаю цябе й ненавіджу,
Калючая ружа мая!



# Не той забой

Захапленні ўсіх нас клічуць,
Бо яны — як сэрца стук.
Збегліся сем паляўнічых,
З імі — егер, іх сябрук.

Хеўра хлопцаў дужых, мужных —
Паляваць з іх кожны лез.
І паехалі ўсе дружна
На калёсах прама ў лес.

Як прыехалі — прылеглі —
Весяліць бы галаву.
А каня яны распрэглі,
Ён пайшоў скубсці траву.

І праз нейкі час палююць,
Стрэліць кожны з іх гатоў.
Лось бяжыць. Забіць — як плюнуць.
Трах-бабах! Той — з капытоў.

І пабеглі ўсе з нажамі:
— Ну, падзелім: лось — як слон!
Толькі ў жаху сталі самі:
То ж — не лось, а — іхні конь.

— Чорт яго бяры, каняку,
Хай з'ядуць яго ваўкі!
Егер ледзьве не заплакаў:
— Што вы мелеце, браткі!

Конь не мой, не можа згінуць,
Трэба здаць яго, спісаць.
І калёсы нельга кінуць,
Дорага мне можа стаць...

На калёсы пагрузілі
Разняшчаснага каня

І напружылі ўсе сілы —
Воз цягнуць на схіле дня.

Запрагліся ўсе васьмёра —
Недарэчы баляваць.
Валаклі ўсе ў поце, зморы —
Больш не цягне паляваць...

Гэтым гора-паляўнічым
Трэба ведаць, як страляць.
Перш чым вам дзічыну нішчыць —
Бачыць, у каго цаляць!



# Ухвала піву

Хто з мужчын не любіць піва,
Хто з жанчын не піў яго?
Вось пітво — ну проста дзіва,
Пакаштуеш — дык — ого!

Дапякае сонца ўлетку:
Што — напітак, што — той квас?
Піва прагнеш кожнай клеткай —
Напатоліць смагу ў час.

Пасля добрай вечарыны
Уранку стогне галава.
Вельмі хочам з той прычыны
Мы чароўнага пітва.



Пасля лазні мы як вязні:
Выцек з нас ракою пот.
Тут з піўнухі не вылазім —
Надта ж моцна сохне рот.

А як піва са смятанай
Размяшаўшы, нехта п'е —
Цягне да жанчын адчайна,
Сілу мужыкам дае.

Па грашах не вельмі важка,
І не сядзем мы на мель.
Піва куфаль ці то пляшка —
Радасны, прыемны хмель.

А як ёсць даволі часу
І сябе няма дзе дзець,
Можам мы з піўком сам-насам
Цэлы вечар прасядзець
(Не па-п'янаму балдзець).

З воблай, сырам ці гарохам
Сярод дня або ўначы
Папівай сабе патроху
І, як соску, ты смакчы.

Не абыдзецца ніколі
Без яго ніводзін пір.
Піце піва ўсе — і ўволю:
То — здароўя эліксір.



## Рыдлёўка і сабака

Аднойчы я ехаў на дачу.
У транспарце выйшла задача:
З-за нейкай рыдлёўкі бяда ўся,
Навокал гармідар узняўся.

— Няёмка, нязручна, нялоўка,
Калі ў вас з сабою рыдлёўка.
Вы хоць бы яе загарнулі
У анучу, у старыя кашулі.

Бо можа параніць кагосьці,
Тады — ні на дачу, ні ў госці.
Бо вострая ваша рыдлёўка,
І нехта парэжа абноўку.

Пра гэта ўжо ёсць пастанова,
І хіба для вас гэта нова?..
Стаю і маўчу, небарака.
Заходзіць кабета з сабакам.

А той без намордніка, бачу.
Магчыма, ён вельмі кусачы.
Аднак жа ніхто не пытае,
Увагі ніхто не звяртае.

— Дык што, — я кажу пасажырам, —
Сабаку прымаеце з мірам
І не баіцеся, што ўкусіць?
Страшней за рыдлёўку ён, мусіць.

— Турботы ж у вас без прычыны, —
У адказ чую голас жанчыны, —
Сабака не брэша на волі,
І ён не кусаўся ніколі.

— Чаго ж тады ў доме ён варты,
Калі ўсё маўчыць так упарта?

Украдуць па дрэннаму знаку
Увесь скарб,
гаспадыню
й сабаку.



# Як жывецца ў шэсцьдзесят

Не жартуе век наш з намі,
І падзей мінае шмат.
Не сачыў я за гадамі,
А гляджу — ужо шэсцьдзесят.

Захаваў свае абрысы,
Не схіляю галавы.
Не зусім яшчэ я лысы,
Не зусім яшчэ сівы.

Не сумую без прычыны,
Разганю сваю нуду,
Не абыдуць і жанчыны,
Сам я іх не абыду.

Не пайду ж ужо на танцы,
Што раней рабіў не раз.
Ну а нейкім падшыванцам
Пакажу і ў танцах клас.

Працаваць гатоў з ахвотай,
Бо магу яшчэ трываць.
А як выганяць з работы,
Буду лепш адпачываць.

І ніякага начальства,
І навошта мне прыгон!
Не скачуся да гультайства.
Колькі год шчэ, колькі дзён!

Захачу — на дачу еду,
Захачу — ў лес па грыбы.
І забудуся пра беды —
Працягнуць жыццё абы.

Лес нам — не дзеля пацехі:
Прыглядайся пакрысе.
Будуць ягады, арэхі —
Пазбіраю іх я ўсе.

І куплю, нарэшце, вуду,
Накапаю чарвякоў.
І штодзень я з юшкай буду —
Самы лепшы з рыбакоў.

Гарт з'явіўся паляўнічы:
Трэба мне купіць і ствол.
І дзічыну буду нішчыць,
Каб багатым быў мой стол...

Нехта іншы быў бы ў скрусе:
Мінаваў жыцця парад.
Толькі я ўсё ж не журуся:
Жыць не сумна ў шэсцьдзесят!

## Як я кінуў піць, курыць

Піў я часта і бязбожна,
А курыў дык і ўначы.
Бачу: так загнуцца можна.
Як сябе перамагчы?

Я ад слабасці аж млею,
Апаноўвае ўжо страх.
Не дажыць да юбілею —
Гэта быў бы проста жах.

Ныюць страўнік, ныркі, печань,
Ціск высокі, кашаль б'е.
Як жа мне лячыцца нечым,
Гнаць хваробы прэч свае?

Закадзіравацца трэба,
Ампулы ў сябе зашыць,
Ёсць гіпноз — усё ганебна:
Пад прыгнётам гэтым жыць.

Досыць бэсціцца, даволі —
Да бясконцае пары.
У мяне ж ёсць сіла волі,
І нашто мне дактары!

І пакуль яшчэ не згінуў,
Не сышоў за бедака,
Звычкі згубныя я кінуў...
Першага красавіка.

Не лічыце гэта жартам,
Не падумайце — падман.
Ланцугі парваў я раптам
І з душы прагнаў дурман.

І развіўся нюх сабачы,
Чую пах «вясёлых» спраў.
Як п'янюг, курцоў убачу,
Дык я б іх пазабіваў.

На здаровых вечна — попыт,
Хутка буду сам такі.
Пераймайце ўсе мой вопыт —
І курцы, і п'янюкі.

Ад такой вось перамены
Па жыцці іду смялей.
Спадзяюся, што сустрэну
Стогадовы юбілей!

## Пазабаўляліся

З сябрам мы ішлі аднойчы.
Ён уперад паглядзеў
І пытае: — Хто там крочыць?
Га, знаёмы наш ідзе!

Вось з'явілася прапажа!
Не сустрэць яго нідзе.
Гэта ж Мазін, — сябар кажа, —
Пазнаю па барадзе.

А было ўжо цемнавата.
Я гукнуў: — Ідзі сюды!
Толькі той маўчыць зацята,
Нібы ў рот набраў вады.

Падыходжу хуткім крокам
І бяру за бараду.
Не міргнуўшы нават вокам,
Мовіць ён: — Дамоў іду.

Пачынаю я злавацца,
Злёгку тузаю яго:
— Што, пачаў ты задавацца?
Не адпусцім аднаго.

Ці адпусцім не адразу,
Бо не бачылі шмат дзён.
Дык ты — Мазін ці не Мазін?
— Не, не Мазін, — стогне ён.

Злосць мяне ўсё разбірае,
Зноў трасу за бараду.
Вельмі грозна пазіраю,
За сабой яго вяду.

Здаўся сумна ён: — Я — Мазін.
Сябар гаркнуў: — Чортаў сын!

Раз ты — Мазін, дык умажам,
І хадзем у магазін.

Толькі ў гэтым магазіне
Бачу дрэнны паварот,
Бо не Мазін — той мужчына,
Хтось старэй на дваццаць год.

Падыходзіць сябар жвава
І як лясне па спіне:
— Ну дык як у вас тут справы —
Ён узяў ужо ці не?

Вось пацеха ў нас была б там!
Толькі кожны быў не рад:
Падхапіў пад рукі раптам
Нас міліцыі нарад.

У мяне і ў сябра смутак —
Не пяём, як салаўі.
Зараз мы на многа сутак
Адарваны ад сям'і.



## «Сюрпрыз»

Нехта йдзе ў наш дом аднойчы.
Я пакрочыў наўздагон:
Ці мяне падводзяць вочы,
Ці, магчыма, гэта — сон?

Бачу — уперадзе жанчынка
Падымаецца наверх.
Гнуткі стан, як арабінка,
Не ідзе — як бы плыве.

Мне аж дыхаць стала цяжка,
Я цішком за ёй іду.
Па спіне паўзуць мурашкі:
Стрэў я радасць ці бяду?

У пад'ездзе цемнавата.
Хто такая — не відно.
Паглядаю зухавата —
Не было ўжо так даўно.

Толькі ж нейкі страх агортваў:
Ускружыла галаву.
Вось паверх ужо чацвёрты —
На чацвёртым сам жыву.

Можа, новая суседка?
Ды не бачыў я яе.
Стрэць такую можна рэдка:
Гэткі цуд — і тут жыве!

Быў я здзіўлены праз меру,
Як жа можна так магчы?
Дык ідзе ў маю кватэру,
Дастае ўжо і ключы.

Ледзь паспела азірнуцца —
Аж самлеў знянацку я.
Прыглядзеўся — гэта ж, людцы,
Жонка родная мая!



## Каханне паэта і старшыні сельсавета

Сябраваў з яе ён бацькам,
Што старэйшы многа быў.
І было чым ім заняцца,
Кожны дружбака любіў.

Той дырэктарам быў школы —
Не работа, проста рай!
А паэзія ў Міколы
Так і перла цераз край.

Выпівалі часам пляшку,
Гаманілі да пары.
А маленькая Наташка
Шнуравала па двары.

Вырасла красуняй мілай
І вучылася далей.
Бацьку ў школе замяніла —
Сэрцу стала весялей.

І жыла яна чын-чынам,
Рос яе аўтарытэт.
А пасля ёй даручылі
Узначаліць сельсавет.

Ён даўно — паэт сталічны,
Прыязджае выступаць.
Выгляд мае, голас зычны —
Ні дадаць і ні адняць.

...Стрэча праз дзесяцігоддзі,
А звініць жыцця струна.
Як здараецца ў народзе,
Ён — адзін, яна — адна.

Зарадзіліся пачуцці
У паэта й старшыні —
Так, што нельга не пачуць іх,
Хоць жыццё перавярні.

Кажа шчыра ёй Мікола:
— Едзь у горад да мяне.
А яна ў адказ: — Ніколі!
З роднай вёскі ехаць — не!

І Наталля прапануе:
— Ты сюды пераязджай.
Тут народ цябе шануе,
Тут і твой жа родны край.

— Я не з'еду ад рэдакцый, —
Ён Наталлі адказаў. —
А табе найлепш падацца
У стольны горад важных спраў.

...Хоць адзін другому любы,
Ды сям'я, відаць, міне.
Покуль дойдзе ў іх да шлюбу
Старасць подлая сагне.





## «Шчыры» пост

Еду ў госці я да дзядзькі —
Ён даўно чакаў мяне.
А такі мужчына хвацкі,
Што гасцей не праміне.

Вернік даўні і ахвочы —
У царкве нярэдка ён.
Тут жа шчыры пост падскочыў —
Той, што цягнецца шмат дзён.

Ды ж ці будзе пачастунак,
Ці дарэмна еду я?
Прыхапіў жа падарунак,
Што пахваліць іх сям'я.

Прывітала трохі цётка.
Дзядзька крочыць у гараж.
Цётка ходзіць, быццам лодка.
Кажа: — Мо прысядзь, прыляж.

Я шматзначна пагдядаю:
Дзе ж прыём? У хаце — госць.
А яна: — Усё я маю:
Чарка, шкварка ў хаце ёсць.

І пляменнічка ўчастую,
Выпі, з'еш на ўвесь свой рост.
А сама не пакаштую,
Бо мне нельга — шчыры пост.

Толькі дзядзьку не расказвай,
Бо аблае ён мяне.
— Не, — кажу я ёй адразу, —
З-за мяне не пракляне.

А пасля ў гараж на працу
Весела падаўся я.
— Ну, за што, — пытаю, — брацца?
Папрацую ж удвая.

Той па-змоўніцку міргае:
— Выпі вось і закусі.
Цётка ўсё, вядома, мае,
Ды ў яе лепш не прасі.

Бо рэлігію шануе,
Пост не рушыць на праклён.
Дзядзька чарку прапануе.
— Не расказвай! — просіць ён.

Да сястры схадзіў я потым,
Побач брат яшчэ жыве.
Частавалі й там употай:
— Хай не ведаюць свае!

Дык я гэтак напасціўся,
Што нарэшце паваліўся.
І не вылезу з гасцей —
Каб такі пост быў часцей!



## Рэстаран «Чатыры колы»

Так ірвуся я да волі,
Як прыцісне — хоць крычы.
Рэстаран «Чатыры колы»
Мне гатоў дапамагчы.

Загуляць хачу з сябрамі.
Жонка прыме? Не, наўрад.
Рэстаран заўсёды з намі
І прыняць нас вельмі рад.

Ці з пабочнаю жанчынай
Час прабавіць захачу —
Надта важная прычына,
У рэстаран, як птах, лячу.

Там сакрэтныя спатканні,
Сябрукоў спрадвечны гурт.
Галякуем аж да рання,
І ніякіх нам пакут.

Выбар ёсць, прытым — багаты:
Пляшкі, закусь — еш і пі.
Што там родная мне хата —
Тут гуляй, спявай і спі.

Як туды гурмою зойдзем —
Сёння, заўтра ці цяпер,
Дык ніхто нас і не знойдзе —
Нават міліцыянер.

І нікому невядома,
Хоць стаю на чатырох.
Хіба будзе гэтак дома,
Каб я ўсё рабіў, што мог?

Не сумую я ніколі,
Тут хоць стой, хоць сядзь, хоць ляж.
Рэстаран «Чатыры колы» —
Гэта слаўны мой гараж!

# Скупы на паляванні

Паляваць у час гарачы
Ён на возера пайшоў
І дзвюх качак там убачыў
Каля розных берагоў.

— Качкі стрэнуцца, няйначай, —
Я заб'ю адразу дзвюх! —
Ад уяўнай той удачы
Заняло ў скупога дух.

— Будзе радасць мне такая,
Зберагу й адзін зарад.
Хоць да ночы прачакаю,
Не пайду пустым назад.

Ён ляжыць і жмурыць вока,
Праляжаў ужо бакі.
Качкі ж, хоць і недалёка,
У розныя плывуць бакі.

Хутка ў горле перасохла.
Цісне стрэльбу да пляча.
— Ліха вам, каб вы падохлі! —
І часцей міргаць пачаў.

Так ляжаў скупы бясконца,
Марнаваў дарэмна час.
Пачало заходзіць сонца,
І сплыліся качкі ўраз.

Тут бабахнуў ён са стрэльбы,
Толькі сам жа быў не рад:
Сiганулі качкі ў неба,
А вось жабы ўзнялі гвалт.

Марна дзень прапаў, вядома,
Страціў качак і свой спрыт.
І зарад не сэканоміў,
І нажыў радыкуліт.



# Самакрад

У сяле цанілі працу.
Абвясцілі там даўно:
Лішкі бульбы ўсе здавайце
За гарэлку і віно.

Ураджай малы ў Мікіты,
А напіцца — смага ёсць.
Каб было ўсё шыта-крыта,
Ён цішком мяркуе штось.




Бульбы мех узяў на плечы,
І, як трэба, завязаў,
Ды папёр здаваць пад вечар,
Жонцы слова не сказаў.

Як дайшоў да магазіна,
Жонка — шась з-за вушака!
У яго ўзмакрэла спіна:
Цяжкая ў яе рука.

— Што, зладзюга, крадзеш лоўка?
Самы спрытны — ты адзін?
Пачала сцябаць вяроўкай:
— Атрымай, сабачы сын!

Дрэнь Мікітавы ўжо справы,
Пёр назад пракляты мех
Праз дарогі і канавы
Пад суседзяў дружны смех.

Жонка ззаду падганяе,
Б'е вяроўкай па гарбе
І гаворыць, як спявае:
— Мілы, я люблю цябе!

## Ахвяра інтэлекту

Як сустрэўся ён з дзяўчынай,
Дык яе зачараваў.
Сам трымаўся вельмі чынна,
Гаманіў, нібы спяваў.

Ну, адно замілаванне!
А разумнік — на ўвесь свет.
Слухала б яго да рання:
Мудры, як адвечны дзед.

Абяцаў усе выгоды:
Разам будзе любата —
І катэдж сярод прыроды,
І сабаку, і ката.

І дамогся ён даверу,
З ёй стварыў даўно сям'ю.
Ды... жыве ў яе кватэры
І не дбае пра сваю.

Ні кватэры, ні сабакі,
Ні машыны, ні ката.
І зарплата ў небаракі —
Самы мізэр, драбната!

Толькі ж голас меладычны,
Чуйна ловіш кожны гук.
Розум энцыклапедычны —
Акадэмія навук!



А вось цвік забіць у дошку
Ці схадзіць у магазін —
Цяжка дыхае патрошку:
— У сям'і ж я — не адзін!

Бульбу чысціць для абеду
Ці падлогу праціраць —
Клікаць ён гатоў суседа,
Нудна працу ў рукі браць.

А што зробіць без ахвоты,
Дык такі кругаварот!
Жонцы новыя турботы —
Выйдзе ўсё наадварот.

Век з ім клопату багата,
Ды нядаўна — быццам зман! —
У сям'і такое свята:
Выбіў першы раз дыван.

І сказала жонка з крэктам:
— Выйшла замуж я дарма.
Хто ахвяра інтэлекту?
Ці мой муж, ці я сама.

Добра, што ён не бяздумны,
Ды ў сям'і — не божы дар.
Лепей быў бы менш разумны,
А — мужык і гаспадар!

## Чужое — лепей за сваё

Калі прыйшоў дамоў з работы,
Пазбавіўся ад розных спраў.
І павячэраў ён з ахвотай,
І кніжку сцішана гартаў.



Яго кабета, маладзіца
За ім прыбрала ўсё як след.
Затым пайшла і ў ванну — мыцца,
Бо муж — далёка шчэ не дзед.

А ён тым часам да суседкі,
Тым больш — кватэра побач тут.
Такое вытвараў нярэдка,
Да роднай хаты не прыкут.

Пакуль жа жонка мыліць цела,
Пакуль памыецца — час ёсць.
І як кату яму карцела.
Быў у суседкі ён не госць.




А той няма чамусьці дома...
Куды, падумаў чорт нясе?
І замаркоціўся, вядома,
Да тэлевізара прысеў.

Вось жонка з ваннага пакоя
Выходзіць — свежанькая ўся.
І нельга ўседзець тут спакойна
Ад палымянасці жыцця.

Сказаў ён жонцы — гладкай, ёмкай —
Без пачуцця сваёй віны:
— Калі б чужой была ты жонкай,
Дык не было б табе цаны!

## Вясёлыя сустрэчы

Машыну лепшай інамаркі
Купіў мой сябар і сусед.
Падзею тую да прыпаркі
Мы з ім адзначылі як след.

Бо не машына то, а цацка,
І будзе шмат гадоў вазіць.
Яе на мытні лоўка, хвацка
Я дапамог «растармазіць».

Пад ноч ужо ў бязважкім стане
Сябрук, прыдыбаўшы са мной,
Абняў, як брата, на расстанне
І жонцы здаў «па накладной».

А тая лае на ўсю сілу —
Хоць па прычыне, без прычын.
«Палкана» на мяне спусціла:
— Што, нясцябаўся, чортаў сын?

А мне так весела і вольна,
Ну, хоць страляйце прама ў лоб.
Сябе паводзіў я спакойна:
Зваліўся ў ложак і захроп.

Назаўтра трэба пахмяліцца —
Палучку ўчора ж я прынёс.
Ды ўсе зграбла мая «царыца»,
І гэтым мне падцерла нос.

Што ж, сум я свой не павялічу
І дам рашучы жонцы бой.
Я да сябе суседа клічу:
— Ты толькі ўсё вазьмі з сабой!

Прыйшоў ён з торбаю вялікай —
Забалявалі з ім мы зноў.
Тут чаркі, песні і разлікі,
Сябрук не хоча йсці дамоў.




Жыве ён блізка, дык не гора,
Прытым на вуліцы адной.
І так, як ён мяне учора,
Яго я здаў «па накладной».

Аднак нікому мы не шкодзім:
І ён — такі, і я — такі.
Хоць папаўзём — свой дом знаходзім.
Ура!
Гуляюць мужыкі.

# Ідэальны муж

У жыцці зусім рэальным
Як быць мужам ідэальным?
З жоначкай не пазяхаць,
Мілавацца і ўздыхаць.

Пакладзе суседка вока —
Абыдзі яе далёка.
Думай: самы верны — я,
Мне важней за ўсё — сям'я.

Аддавай усю зарплату,
Уступай, не будзь упарты.
Будзь здаровенькі, не пі,
Толькі дома, дружа, спі.

Не цягні дамоў кагосьці,
Удваіх хадзіце ў госці.
Выбівай сам дываны
І прасуй сабе штаны.

Паднясі гарбату ў ложак
Ты да жоначчыных ножак.
Спіць пакуль — згатуй сняданак,
І аблегчыш ёй ты ранак.

Ну а жонка як палічыць,
Ці за ўсё цябе ўзвялічыць?
Дасць па носе, па гарбе,
Ногі вытрэ аб цябе...

Быць не варта ідэальным,
А — звычайным і нармальным.
Слова цвёрдае сказаць,
Свой характар паказаць.

Выпіваць, ды не напіцца,
Пашумець, але не біцца.

Грошы ўсе не аддаваць,
Аднаму не сумаваць.

Жонку палюбіць уранку,
А на вечар мець каханку.
Хопіць моцы на дваіх —
У пашане быць у іх.

Быць вясёлым і сур'ёзным,
А як трэба — нават грозным.
Што мужчынскае — зрабіць,
Спраў жаночых — не любіць!

Жонка ж, пэўна, не чужая,
І цябе запаважае,
Ад яе ты каб не знік,
Скажа:
— Во ў мяне мужык!




## Як экзамен я здаваў

*(Гумарэска)*

Раз прыйшоў я на экзамен,
Дык выкладчык захварэў.
Здаць другому мне сказалі,
А яго я не сустрэў.

Што ж рабіць мне? Вось задача,
Усё адно да аднаго.
— Едзь, — параілі, — на дачу,
Знойдзеш там хутчэй яго.

Выйсце ёсць. Я стаў вясёлы.
Еду. Вось экзамен здам.
Толькі дачны той пасёлак —
Нібы горад цэлы там.

Ну а як жа прыступіцца?
Дзень прашвэндаўся дарма.
Як даведацца, прабіцца?
Гардаведкі там няма.

Тут сустрэлася кабета:
— Мо шукаеце каго?
Падыдзіце да Анэты,
Тут сто метраў усяго.

Давядзе яна вас шпарка
І пакажа, пазаве.
То вядомая пляткарка,
У тым доміку жыве.

Вось прашу яе: «Ратуйце.
Дзе тут дача Шкаляра?
Ён працуе ў інстытуце,
Мне экзамен здаць пара».

— Паказаць? Ну што ж, магчыма,
Пакажу, чаму б і не?
Толькі ў чым скажы прычына,
Што пытаеш ты ў мяне?

Вочы я падняў у неба
І кажу, надцяўшы дых:
— Гаспадыня вы — што трэба,
Ваша дача лепш за ўсіх!

— Так яно, — Анэта кажа —
Я люблю, як праўду ў твар.
Бач, плот дзядзька фарбай мажа,
Гэта, брат, не твой Шкаляр.

Проста шкляр ён. А направа
Вокам кінь ты крыху ў бок:
Той Шкаляр — другая справа,
Ён — аптэкар, галубок.

Твой Шкаляр — ён сорак з лішкам,
А на выгляд — проста жрэц:
Многа есць. І ходзіць з кніжкай,
На другі шыбуй канец.

Я прыйшоў. Выходзіць жонка:
— А Барыс Пятровіч спіць.
Пабудзіць? — Аб чым гамонка,
На здароўе хай ляжыць.

Недзе гэтак праз гадзіну
Выйшаў сам дацэнт Шкаляр.
Пазяхнуў, пачухаў спіну
І зірнуў як уладар.

Падступаю я нясмела:
— Я прыйшоў латынь вам здаць.
Кажа ён: — Што, так прыспела?
Пойдзем дачу агледаць.

Вось цыбулька, бач, буяе,
Вунь таматы, агуркі.
А хто дбае, той і мае,
Прынцып мой заўжды такі.

Я кажу: — Сам з вёскі родам,
Там і маці, і сям'я.
Ды такога агароду
Як у вас, не бачыў я.

Сам жа думаю:
— Вось трасца,
Пахвалю яго ўсяляк.
Ён ад радасці мо здасца,
Адхаплю «пяцёрку» так.

Толькі не: — Пайшлі, — ён кажа, —
Я прыму латынь у вас.
Пацямнеў я, быццам сажа,
Для чаго ж прабавіў час?

Кліча жонку ён: — Дай чаю,
Пасядзім мы з хлопцам тут.
Схамянуўся я ў адчаі:
Колькі будзе шчэ пакут!

— Што ж, граматыку праверым, —
Мне Шкаляр тут загадаў.
— Я яе вучыў без меры.
І прафесару ўжо здаў!

Я схлусіў тут, выбачайце.
Ён сумеўся, спахмурнеў.
— Што ж рабіць? — А вы спытайце
Зараз прыказкі ў мяне.

Кажа ён: — Ну што ж, хай будзе,
Хоць граматыкі шкада.
Як сказаць: «О час, о людзі!»?
Я ў адказ: — То не бяда!

Толькі прыказкі, загадкі
Узапар давалі нам,
Мы ж вучылі па парадку,
Так я зараз іх і здам.

І я так іх слаўна шпарыў,
Што дацэнт палагаднеў,

Хоць як след мяне прапарыў.
Ды паставіў «добра» мне.

Пробкай вылецеў я з дачы,
А ў вушах яшчэ быў звон.
Тут адчуў я і убачыў,
Што ёсць лета і азон.



## Хто каго пашкадаваў?

*(Вось дык жартачкі)*

Жонцы муж ваўсю клянецца:
— Так цябе кахаю я!
Ты — мая душа і сэрца,
Дружная ж у нас сям'я.

І сказаць магу тут смела:
Век табою даражыў.
Не хачу, каб заўдавела, —
Я б таго не перажыў.

І цябе заўжды шкадую,
Ты — адзіная мая.
Забяру тваю бяду я:
Заўдавеў бы лепей я!

Думка пазваніць прыспела
Да суседа — аж трымцеў:

— Лепш — каб жонка заўдавела
Ці каб сам ты заўдавеў?

Той у жоначкі пытае:
— Ты адказ на гэта дай!
Адказала смешна тая:
— Заўдавее кошка хай!

— Дык а як жа наша кошка
Заўдавее так дарма?
Каб сям'я была хоць трошкі —
У яе жката няма.

Самі жыць мы будзем вечна,
Нам з табою — любата.
Хоць праблема ёсць, канешне:
Я пайду шукаць ката.

## Ах, выдатная жанчына!

*(Хулуп Настассі Тарасаўне)*

Ну, Настасся, ну, Настуся,
Гаварыць з табой баюся.
Скажаш столькі мілых слоў —
Стрэцца хочацца і зноў.

На цябе ўсе пазглядаюць,
Мужыкоў магутны збор.
Пакахаць яны жадаюць,
З-за цябе заўжды — разбор.

І такая вось увязка:
Дабрынёй бярэш і ласкай.
Падміргнеш — вядзеш у казку,
Ці то праўда, ці — падмазка?

Ты сабою ўсіх чаруеш
І стараешся, шчыруеш.
Як абдымеш моцна хлопца —
Сіла ўздымецца ў малойца.

Узбуджаюцца жаданні —
Да сустрэч і да кахання.
Дзе там сціпласць, дзе там злосць?
Так бушуе маладосць!



Як мужык цябе прыцісне,
Прыгалубіць і прысвісне —
Супрацівішся?
Чаму?
Аддасі душу яму.

Жартаўнік — ці невясёлы,
Хоць магутны сам — ці кволы.
Гэта — як на фотаздымках,
Патанаеш у абдымках.

Ці сур'ёзны, не сур'ёзны,
А як вал пачуццяў грозны!

Позна думаць: ты — яго,
Будзеш рада ад таго!

...Праўду з казкай не мяшай,
Ці кахай,
ці спакушай.
Бо каханне — то не смех,
Не заводзь мужчын у грэх.
Ай,
вой,
эх!

## Дурны клопат

*(Гумарэска)*

Тры мужыкі знайшлі каністру спірту,
Прыдбалі нейкім чынам — радасць ёсць.
А што рабіць? Прадалі вельмі спрытна —
За грошы набяруцца, будзе й госць.

І радасці ж у іх было нямала,
І кожны піў і еў, як быццам вол.
Закусвалі гурком і трошкі салам,
І ад віна, гарэлкі гнуўся стол.



І цэлы месяц шасталі па крамах,
Вясёленькімі дружна ўсе былі.
Чаму ж той спірт яны не паўжывалі,
Заняткаў непатрэбных набылі?

Круцілі б кранік, горлы падстаўлялі,
Хоць стойце, хоць ляжыце — як каму.
І клопату зусім было б ім мала,
А бегалі ж — у спіны вецер дзьмуў.

П'янюгам гэткім, як збяруцца ў статак, —
Дык знойдзецца для іх дурны занятак.

## «Пазайздросцілі»

У вёсцы Маня — адзіночка,
Ды не вялікія гады.
Як толькі прамінае ночка —
Выходзіць хлопец малады.

Суседкі пільна назіраюць,
Бо кавалер той — не адзін.
І плёткі розныя збіраюць,
Што характэрна для жанчын.

Назаўтра — тая ж зноў карціна,
І паслязаўтра — тое ж зноў:
Мужчына новы ці хлапчына
Сагнаў дурную ў Мані кроў...

Выходзіць Маня ўранку з хаты,
Пацягваецца — трэск касцей.
— Хіба ж я ў гэтым вінавата,
Што не адбіцца ад гасцей?

Ад стомы я зусім самлела,
Жывога месца ўжо няма.

Так стогне, ные, цісне цела,
Але цярпела нездарма.

— Ды ты ж загульваеш без меры, —
Суседкі кажуць. — Не гудзі.
Цябе заездзяць кавалеры,
Што ноч, то новы. Ну, глядзі!

— Во бабы, ім усё здаецца!
Балбочуць толькі дзень пры дні.
Адно здаровае ёсць месца —
Дык пазайздросцілі яны.




## Малады пенсіянер

Ну, дажыўся, дагуляўся,
Як мне жыць ужо цяпер?
Сам на веру — і сям'я ўся,
Што вось я — пенсіянер.

А сябе не адчуваю
Я на гэтыя гады,
Бо ва ўсім я паспяваю,
Патанцую, паспяваю,
Быццам хлопец малады.

Барада шчэ не сівая,
Вусы чорныя зусім.
Да ўсяго імпэт я маю
І на ўсё хапае сіл.

І жанчыны, і дзяўчаты
Дружна кажуць, вер — не вер:
— Ты такі ў нас зухаваты,
І які ж пенсіянер?
Ты — амаль што піянер.

Як хачу, дык так і выйдзе:
Працаваць, а не гуляць.
Высплюся як трэба з тыдзень,
Дык даюць мне сорак пяць.

І не ведаю аптэкі,
У бальніцы рэдка быў.
Жарт, усмешка — вось дык лекі!
Так здароўе я здабыў.

Сам сябе мацую з рання
Кожны дзень я зноў і зноў.
Фіззарадка, абціранне,
А нярэдка і любоў.
Ад таго бушуе кроў.

І ніколі я не гнуўся
Ад бяды, ад цяжкіх спраў.
І ў гарэлку не ўцягнуўся,
Хоць нярэдка каштаваў.

Не звяло мяне курэнне,
Не сагнуўся я ў дугу.
Не гуляў да адурэння
І пакуль што ўсё магу.

Думкі сумныя забудзьце,
Справы дрэнныя — далоў!
Маладымі вечна будзьце,
Як я ў шэсцьдзесят гадоў!

## Удалая пакупка

*(Гумарэска)*

Выпіваў ён вельмі часта,
Чырвань ззяла ўжо на твары.
Ды падводзіла гультайства —
Заваліў гараж шклотарай.

Не хацеў здаваць ён пляшкі,
Бо даход той невялікі
А цягацца з імі цяжка,
І памочнікаў не клікаў.

Піць лягчэй жа, як вядома:
Накаўтаецца, наесца...
Раптам бачыць: каля дома
Нейкая каза пасецца.

Выветрылася гарэлка,
І здзіўленне ахапіла.
Жонка кажа: — За бутэлькі
Я казу, глядзі, купіла.

Сам здаваць ты ленаваўся,
Ну дык я зрабіла гэта.
Ён жа радасна азваўся:
— Ты — выдатная кабета.

Будзе малако з казою —
Буду, значыцца, здаровы.
Калі б ты піла са мною,
Дык купілі б мы карову!



## Участковы на вяселлі

Не на службе я сягодня, а ў гасцях.
Набыло вяселле добры ўжо размах.
Віншавалі ўсе так шчыра маладых,
Прывітаць і я хацеў бы зараз іх.

У жыцці глядзіце вы, дзе правы бок.
Хто парушыць, той хай сцерпіць і папрок.
Непрыемнасцей каб менш у вас было,
Не ідзіце на чырвонае святло.

І машыну найхутчэй купіце вы,
Толькі здайце ўсё ж спачатку на правы...
Хай да чаркі не будзе ласы муж,
Спакайней сям'і так будзе і яму ж.

І суседзяў паважайце вы ўвесь час,
Каб не скардзіліся нам яны на вас.
Каб нязваным я па службе не прыйшоў,
Не ўжывайце ў спрэчках рук і брыдкіх слоў.

З кожным днём расце хай радасць удвая,
Мець шмат дзетак шчыра вам жадаю я.
Усе прафесіі ў нас добрыя цяпер,
Хай жа будзе ў вас і міліцыянер.

Муж кіруе, і таму я нездарма
Жэзл дару яму. Мацней яго трымай.
А каб жоначку не крыўдзіў ты, браток,
Падару ёй свой залівісты свісток!





Творчая сустрэча з работнікамі Аршанскага гаррайаддзела ўнутраных спраў у прысутнасці прадстаўнікоў Віцебскага абласнога ўпраўлення і Міністэрства ўнутраных спраў РБ

# Дыпламаваная жонка

Як яна мяне кахала! —
Быў чароўны сон...
Пажаніліся, дык стала
Не жыццё — прыгон.

Ганарылася дыпломам,
Я ж — абед варыў.
Хоць вылежвалася дома,
Кветкі ёй дарыў.

Прыгнятаць мяне ўзялася —
Скончыўся камфорт!
Дбай ужо сама тым часам,
Гэта ж — не курорт.

І калі дзіця заплача,
Вытрымку раблю.
Жонка ў лямант: — Людзі бачаць —
Маладосць гублю!

— Не, — кажу, — рашай адразу:
Ці сям'ю глядзі,
Ці інакш з дыпломам разам
Да бацькоў ідзі.

Быў і плач, былі і слёзы,
Нылі сваякі.
І папрокі, і пагрозы,
А я быў — такі...

Зараз мы ўсё робім самі —
Лепш і спакайней.
А яна між тым часамі
Дорыць кветкі мне.

## Мы, мужчыны...

Славу нам заўжды спяваюць,
І вакол нас арэол.
Нас спрадвеку называюць:
— Вы, мужчыны, моцны пол!

А як ёсць у хаце праца,
Хоць і дужы ты, як вол,
Не спяшаешся старацца:
Мы, мужчыны, слабы пол.

Не нясеш часцей рамонкі,
А ці трэба тут дазвол?
Грошы ж выцягнеш у жонкі:
Мы, мужчыны, моцны пол.

Цвік забіць, дарожку выбіць —
Паглядзець лягчэй футбол.
Цяжка дыхаем, як рыбы:
Мы, мужчыны, слабы пол.

Цельпуком каб не зрабіцца,
Паглядаеш як арол.
Цяжка гонару пазбыцца:
Мы, мужчыны, моцны пол.

А жанок сваіх трывожым,
На дзяўчат глядзім наўкол.
Дома выседзець не можам:
Мы, мужчыны, слабы пол.

А як жоначка, бывае,
Пляшку выставіць на стол,
То на дне не пакідаем:
Мы, мужчыны, моцны пол!

Ды імкнуцца ўсё ж мужчыны
У сям'і стаць на прыкол.
І на гэта ёсць прычыны:
Як падпоркі, нам жанчыны —
Мы ж, мужчыны, слабы пол.



## «Важная» праблема

Рабочы час. А мы сядзім
І аб усім гамонім.
У розных спрэчках аж гудзім
І клопат прэч мы гонім.

Вось нехта вырашыў спытаць:
— Як лічыце вы, людзі:
Ці можна жонку згвалтаваць,
І што за гэта будзе?

Пытанне рэдкае наўздзіў,
Шмат меркаванняў розных.
Свой плот тут кожны гарадзіў,
Хто жартам, хто — сур'ёзна.

— Ход гэткім справам не даюць —
То ж прыкра, непрыгожа.
Такую жонку прасмяюць,
Што з мужам жыць не можа.

Муж бедны церпіць шмат пакут,
Няма сямейнай славы.
Паверце, што ніякі суд
Такой не прыме справы.

— Бывае так, што нельга ёй
Або няма ахвоты.
Ты ж свой навязваеш настрой,
Даходзіш да брыдоты.

І як стаеннік-жарабок,
Даводзіш да знямогі.
Сукенку рвеш і б'еш пад бок —
Судзіць за гэта могуць.

— Навошта наганяць тут страх,
Ды што ты кажаш, дружа!
Бо ёй самой ўлепяць штраф
За здзек такі над мужам.

Не дапускае да сябе
У адказную хвіліну.
Яе сумленне хай шкрабе:
Кахаць штодзень павінна.

...Размова бурная шуміць,
Крычаць усе дачыста.
І парашылі пазваніць
Урэшце мы юрысту.

Тым больш — жанчына ж у гадах,
Жыццёвы вопыт мае.
Законаў ведае размах
І пэўны курс трымае.

Яна пытанне прыняла,
Тлумачыць падрабязна,
Ды, зразумеўшы жарт, дала
Адказ нам проста, ясна:

— Ці гвалціць можна, ці любіць,
Як жоначцы быць жвавай...
Вам што, няма чаго рабіць?
Займіцеся лепш справай!



## Шэльма

У сям'і ёсць хлопчык Вася.
Развіваецца сынок.
Вучыцца ўжо ў пятым класе.
Вельмі шустры Васілёк.

Ды тры дні не йшоў у школу
І бацькоў здзіўляе сын.
— Што такі ты невясёлы?
— Дык у школе каранцін.

Захварэлі нашы вучні,
Іх зваліў раптоўна грып.
Аднаму ж ісці нязручна,
У хваробу каб не ўліп.

У школе іншае пачулі:
— Што за выбрыкі твае?
— Ды памерла вось бабуля,
Пахавалі мы яе.

Завітала ў клас і маці
Да ўсіх Васіных сяброў.
Захацелася дазнацца,
Хто з іх — хворы, хто — здароў.

А настаўнікі ў старанні
Спачуваюць — нездарма...
— Вы прыміце спачуванні,
Што бабулі ўжо няма.

Здрыганулася матуля:
— Вы такое чулі дзесь?
Здаравей за нас бабуля:
Світэр вяжа, сала есць.

Ну, не сын, а проста шэльма.
Разбасячыўся хлапец.
Правучу яго я вельмі! —
І пайшла шукаць дубец!

## Аферыст

Пацыент адной бальніцы —
Вельмі жвавы, малады
Змог удала падлячыцца,
І дамоў ідзе тады.

Толькі хмуры штось без меры,
Просіць доктара свайго:
— У мяне дачка памерла.
Дайце грошай, шчэ чаго.

Дні праз тры аддам, клянуся.
Хто б мяне не зразумеў!
Доктар даў — не адзірнуўся —
З кашалька свайго, што меў.

Той прыйшоў праз тыдзень недзе,
Расказаў усім, дзе быў:
— На халтурку добра з'ездзіў,
Кучу грошай зарабіў.

Я ж — і дзелавы, і ўмелы,
Рукі ёсць і галава...
Падышоў урач нясмела:
— Дык жа доўг свой аддавай.

— Не вярнуць — мне не да твару,
Помню, што павінен вам.
У мяне ёсць сто даляраў.
Размяняю і аддам...

Ды ніхто яго не ўбачыў
Ні праз дзень і ні праз год.
Шмат хто б моцна прасабачыў
І раскрыць не даў бы рот.

Пацыенты, як умелі,
Супакойвалі ўрача:
— Не адзін вы пацярпелі,
Бо і ў нас напазычаў.

«Абуваў» нас у «галёшы».
Ён раней у нейкі час
Тут збіраў павальна грошы,
Бы дачка памерла ў вас.

Доктар страшна абурыўся:
— Ці разумны ён, ці псіх?
Прастачком вось прыдурыўся,
А дурман навёў на ўсіх.

Прайдзісвет жа адмысловы,
Не пачуе добрых слоў.
Як сустрэну выпадкова —
У бальніцу ляжа зноў!

## Хітры ёлупень

Карове Ігнат даваў есці,
А побач каза там стаяла.
Яна заскакала на месцы
І тыкацца ў рукі пачала.

Ігнат раззлаваўся: — Карову
Карміць з-за тваіх нельга скокаў!
Як хвосне ён кіем здаровым —
І выбіў казе беднай вока.

А ў хаце расказваў з імпэтам:
— Мароз дастае так далёка!
А сёння — ты бачыла гэта?
У казы нашай вымерзла вока.

Паверыла жонка Ігнату,
Пайшла да суседзяў, бядуе:
— Ну хоць ты казу стаў у хату,
Ёй вымерзла вока, — шкадуе.

Суседзі даць веры не хочуць:
— Малыя ж у нас казляняты,
І то ў іх не вымерзлі вочы.
Відаць, не мароз вінаваты.

Ігнатава жонка даводзіць:
— Яны мо ў цяпле ў вас начуюць,
А ў нас ля дзвярэй каза ходзіць,
А козы мароз вельмі чуюць.

Ад той бесталковай гамонкі
Там рогат стаяў на ўсю хату.
Калі ты разумная, жонка,
Не вер недарэку Ігнату.

## Помста

Галоўбух быў на заводзе,
З лічбамі ўсё ваяваў.
Мала з кім ён быў у згодзе,
Многа з кім варагаваў.

А вось слесара Пятрова
Ён не палюбіў наўздзіў:
Абыходзіўся сурова
І за нос яго вадзіў.

Што патрэбнае аформіць
Ці заяву падпісаць —
Абяцанкамі ўсё корміць,
І з яго — ні даць, ні ўзяць.

І як быццам без прычыны
Галоўбухаўская злосць.
Пашапталіся мужчыны:
«Правучыць вось спосаб ёсць».

Падбухторылі Пятрова:
— Ты ідзі рамантаваць.
Галоўбуху ўжо нанова
Трэба сцены прабіваць.

І вазьмі з сабой кувалду,
Прыхапі яшчэ і лом.
Замудохае там падла,
Не абыдзешся і днём.

Вось Пятроў зайшоў без стуку.
Лом, кувалда — на плячах.
Галоўбух — ён без прынукі,
У вачах — страшэнны страх.

І шары на лоб палезлі,
Падае слабенькі гук:
Куча гэтага жалеззя
Прынясе нямала мук.

Тут, вядома, не да смеху —
Як з бандыцкага кіно:
Прама з трэцяга паверху
Сігануў цераз акно.

Лепшай не знайшоў дарогі,
Каб застацца на плыву.
Паламаў свае ён ногі,
Мог зламаць і галаву.



Ды нядоўга ныў і плакаў.
Ну, сышла дурная кроў.
Зажыло як на сабаку,
Ён сядзіць на месцы зноў.

Стаў спакойным, не завальным —
Хоць за пазухай трымаць!
Ды няўжо, каб стаць нармальным,
Варта ногі паламаць?

## Спрытнюга

Ля завода я праходжу,
І людзей наўкол няма.
Бачу: вось над агароджай
Дошка лезе ўверх сама.

Лезе ціха і патрошку.
Зрок напружваю я свой.
Дык сама ж не можа дошка
Лезці — нехта ёсць за ёй.

Вось яна нарэшце ўпала.
Тут — завод, а побач — лес.
І чакаў я вельмі мала:
Нехта ў робе пералез.

На плячо ўзяў дошку лоўка,
І разгон узяў, падскок.
Праз дарогу хуткім крокам
Ён кіруецца ў лясок.

Мо складае, што накрадзе,
Ці там дачу мае ён?
Вось дык лінію наладзіў!
І сказаў я наўздагон:

— Налаўчыўся ты нядрэнна,
Не бярэ цябе туга.
Дзень пражыты недарэмна?
Адказаў ён: — Га-га-га!

## «Складчына»

Сустрэча даўніх двух сяброў
Праз шмат гадоў у нейкі час.
Адзін з іх кажа: — Ну, здароў!
Цябе прыгадваў я не раз.

Без межаў радасць у мяне,
Вазьмі душу і кашалёк.
Сустрэцца марыў я і ў сне.
Давай адзначым жа, браток!

Вось літр гарэлкі возьмеш ты
І пару палак каўбасы.
І навядзём мы зноў масты,
Як у ранейшыя часы.

А я напітку набяру
І бохан хлеба — хопіць нам.
На гэта грошы ўсе ўпру,
Іх, не шкадуючы, аддам.

Тваю гарэлачку пап'ём,
Тваёй закусім каўбасой.
Майго напітачку нальём,
З'ямо хлябок са смакам мой.

І я зраблю свой важкі ўзнос,
І цэлы дзень мы пасядзім.
Не задзіраю, бачыш, нос.
Ці рады ты, што не адзін?

Другі паслухаў, загукаў:
— Якую радасць я спаткаў!
Канешне, лепшы сябар — ты...
Калі твой кашалёк пусты.

## Забаўляльная сустрэча

Вось пайшла суседка Люда,
Каб ёй нешта прыкупіць.
Прадаўшчыца, як прыблуда,
Той — усё абы прапіць.

Люда там яе пазнала,
Стрэла Томку нездарма.
— Дай гуркоў мне, толькі мала,
Грошай шмат у нас няма.

Кажа Тома: — Будзь як дома,
Я і ўзважу, і падам.
Налічу як менш, вядома,
І выгода будзе вам.

А сама — худое цела,
Раптам знікла — ведай, дзе!
У паветра адляцела —
Не інакш як быць бядзе.

На дурняцкім гэтым рынку
Павалілася на дно:
Непрыкметна ўпала ў скрынку —
Нават носу не відно.

Узяла яе гарачка,
Перад ёй закрыўся свет.
Ну артыстка, вось цыркачка —
Быццам склалася ў канверт.

Мужыкоў збірае Люда:
— Падыміце вы яе.
То — алкашка і зануда,
Ачумела, во дае!

Выцяглі яе са скрынкі —
На нагах ледзь-ледзь стаіць.
І раскінула абдымкі:
— Хто са мною хоча піць?

Муж сказаў: — Дурная баба,
А была ж як сэрца спеў.
Ты — не жонка мне, а — жаба.
На развод — я ўжо паспеў!

## Жонка-гром

Магазін наш — месца стрэчы,
Больш убачымся мы дзе ж?
Вось сусед ідзе дарэчы.
— Што, — пытаюся, — бярэш?

— Ды куплю вось бохан хлеба.
Паабедаю, браток.
— І да хлеба ж нешта трэба, —
Я раблю яму намёк.

Да яго даходзіць мала:
— Сала ўжо я прыкупіў.
— Ну а што яшчэ да сала? —
Я на горла наступіў.

— Больш нічога не шукаю,
А паесці ўсмак хачу...
Ну а я ўсё націскаю,
Сам з ім выпіць аж трашчу.

— Дык а дзе гаручка-змазка?
Трэба ж, каб яна была.
— З гэтым, ведаеш, няўвязка:
Грошай жонка не дала.

— Так тут поспеху не будзе,
Як паслухаю, дык смех.
Жонку трасяні за грудзі —
Грошай высыплецца мех.

— Што ты, жонка баявая.
Так здаралася даўно:
Зачаплю яе, бывае, —
Сам жа вылечу ў акно.

Ёй не страшныя пагрозы,
Кулачкоў маіх размах.
Лепш пабуду я цвярозы,
Чым хадзіць у сіняках!



# Што лепш?

*(Жарт)*

Аднойчы я выходжу з хаты,
Гляджу — ля вокнаў легкавік.
То «Запарожэц» быў гарбаты.
Адкуль ён, думаю, узнік?

Сусед пытаецца з падколам:
— Напэўна, ты ўжо бізнесмен?
Прыдбаў сабе чатыры колы,
Чакаеш добрых перамен...

— А што, — адказваю, — не можа?
Мільёны зарабляю я.
Чаму ж і мне не жыць заможна?
І ёсць амбіцыя свая.

Ды толькі «Запарожэц» гэты —
Ламачча куча, і не больш.
Я дасягнуў вышэйшай мэты
І зняў з сябе душэўны боль.

І пры сваім я інтарэсе.
Мо пазайздросціць хочаш мне?
Бо езджу я на «Мерседэсе»...
Ды толькі ў сне.



## Жывучы

Лета. Дом. Паверх чацвёрты.
Невялікі там балкон.
І стаіць мужчына ў шортах,
Нападпітку добрым ён.

І рукой адтуль вітае
Усіх знаёмых, сябрукоў.
А яго ў бакі хістае —
Так бушуе моцна кроў.

І нарэшце ўсё ж зваліўся —
Наляцеў на казырок,
Ды зусім жа не разбіўся,
Толькі доўга гладзіў бок.

Злез. Падыбаў зноў у краму,
Выпіўкі яшчэ набраў.
Не пайшоў дадому прама,
А з сябрамі горла драў.

Запыталі: — Ные цела?
Рукі, ногі павярні.
А ці вельмі забалела?
Адказаў ён: — Ані-ні!

...Цуды ёсць яшчэ ў прыродзе,
Часам дзівімся мы ім.
Шэнціць, кажуць у народзе,
Ці п'янтосам, ці дурным.

## Каму — што

Познім вечарам аднойчы
Я зайшоў да сябрука.
Той спытаў: — Чаго ты хочаш?
— Дай тапор, свярбіць рука!

Ён пытаецца сур'ёзна:
— А нашто такая рэч?
Адказаў я вельмі грозна:
— Як навошта? Буду сеч!

Ён у сполаху як быццам,
Бляклы выгляд у яго.
— Ды навошта гэтак біцца,
Сеч? Але за што, каго?

Бачу: сябар асядае
І хапае за руку.
Я ж сурова паглядаю:
— Галаву я пасяку!



— А чыю? — пытанне чую, —
Варагуе хто з табой?
— Як чыю? Скажу: свіную.
Я ні з кім не йду на бой.

— Да чаго любоў сляпая?
Я ж без гэтага жыву.
Раз мазгоў мо не хапае,
Дык купляеш галаву?

— Не, мазгоў, — кажу, — аж з лішкам,
Галавізна ж — проста ў смак.
Хто каму рэцэпты піша?
Пазайздросці мне, бядак!

...Піва выпілі дзве кварты,
Даў тапор дружбак Пятрусь,
Ды сказаў: — Дурныя жарты.
Ну, ты, браце, добры гусь!

## «Кампаньёнка»

Выхадны. Хаджу. Шнурую.
І хачу я святкаваць.
Галасоў сяброў не чую.
Пэўна, любяць доўга спаць.

Не, хутчэй — галякавалі .
І зваліліся даўно.
Дозу добрую прынялі,
Бачылі ж у шклянках дно.

Што ж, і сам не засумую.
Пляшку моцнага бяру.
За сталом сваім шчырую,
Закусі наклаў гару.

Ды гляджу: ў маю гулянку —
Чарка поўненькая ўся —
Заляцела нешта ў шклянку —
Ці то муха, ці аса.

Тая муха-пацяруха —
Хіба можна з ёю піць?
Атруціць жа можа муха,
З ёй — мікробы. Лепш забіць.

А прыгледзеўся я ўважна —
То — маленькая аса.
Шанаваць яе мне важна:
Насякомае-краса.

Вось сышла кудысьці жонка,
І разбегліся сябры.
Дык аса мне — кампаньёнка —
Колькі хочаш — пі, бяры!

І сядзім мы так з асою,
То — сяброўачка мая.
І ківае галавою,
Галавой ківаю я.

Весела аса ўздыхнула
І з маіх зляцела плеч.
Толькі крылцамі махнула,
Паляцела ціха прэч.

Здзіўлены прыгодай тою,
Я за вухам чухаю.
Пагуляў як след з асою,
А пайду — «пад мухаю».

## Навагодняя сустрэча

Новы год на падыходзе,
Навaліла снег гарой.
Мы нікуды не выходзім,
Дома толькі я з сястрой.



Што ж, і так не засумуем,
Правядзём цікава час.
Ды званок вось раптам чуем:
Нехта ўжо ідзе да нас.

Адчыняю хутка дзверы —
Там Снягурка, Дзед Мароз.
Я сваім вачам не веру,
Да падлогі аж прырос.

— Вас віншуем з Новым годам,
Падарункі вам нясём.
Хай жа будуць тут заўсёды
Радасць, шчасце на ўвесь дом.

— Дзякуй! Добрых слоў багата,
На душы ад іх лягчэй.
Адзначайце з намі свята,
Распранайцеся хутчэй.

І не змог я не здзівіцца,
І разявіў нават рот:
Дзед Мароз — гадоў пад трыццаць,
А Снягурцы — дваццаць год.

Нельга ёй не захапляцца.
Хлопец — проста як арол.
Хутка ўжо праб'е дванаццаць,
Дружна селі мы за стол.

Гамана бяжыць жывая,
Бачым, хто чаго з нас варт:
Хто лепш песню праспявае
Ці смяшнейшы выдасць жарт.

Дружбы клаліся падмуркі,
Весяліў усіх настрой.
Я гляджу ўсё на Снягурку,
«Дзед» цікуе — за сястрой.



— Ты глядзі, — кажу я жартам, —
Дзед Мароз — Чырвоны нос!
Са сваім лядовым гартам
Мне сястру не замарозь.

— Не бядуй, — і ён мне кажа, —
За Снягуркай лепш глядзі,
Бо характар свой пакажа,
Пальцы ў рот ёй не кладзі.

...Вынік стрэчы ўсім быў любы,
Шмат было вясёлых спраў:
«Дзед» павёў сястру да шлюбу,
А Снягурку — я забраў.

## Дамашняя навука

Вельмі буйны па натуры
У нейкай вёсцы жыў Алесь.
Следчым у пракуратуры
Брат служыў яго Вінцэсь.

Загудзе Алесь, нап'ецца —
Чэша кулакі свае.
І, ня гледзячы, з кім б'ецца,
Дзе чужыя, дзе — свае.

У міліцыю трапляе,
Ці баіцца ён — наўрад.
Бо заўжды надзею мае,
Што яго ўратуе брат...

Пры чарговай бойцы ў кучы
Шмат каго памалаціў.
Брат сказаў: — Ну, надакучыў!
Сам за ўсе грахі плаці.

Можа суд ужо займацца.
Ледзь Алесь не ашалеў.
«Прыязджай, памерла маці», —
Тэлеграму брату шле.

Прыязджае той з сям'ёю.
Жонка, дзеці слёзы льюць.
І вянок нясуць з сабою,
Клятвы памяці даюць.

У дзверы стукаюць нясмела,
Цісне змрочны краявід.
І выходзіць маці ў белым —
Нібы здань, як бы прывід.

Бачыць жудасную сцэну —
Вось бяду прывёз сынок,
І асела ўраз, імгненна:
Хто памёр, каму вянок?

І яны ж упалі разам:
Ці мярцвяк тут уваскрэс?
Апрытомнеўшы, адразу
Дрын у рукі ўзяў Вінцэсь.

Хоць Алесь бег зухавата,
Выкруціцца ён не змог.
І ад следчага, ад брата
У бальніцу ледзь не злёг.

— Хай мае адсохнуць рукі!
Са слязьмі, браток, кажу:
Пасля гэтакай навукі
З п'янкай, бойкай — завяжу!



# Пачатак і канец

Сябра раптам сустракаю,
Што не бачыў шмат гадоў,
І кажу: — Даўно шукаю —
Не знайсці тваіх слядоў.

Пасядзім гадзінак пару
За сяброўскім мы сталом.
Ёсць выдатныя цыгары,
Чарачкі не раз нальём.

— Не, — адказвае ён сумна, —
Не куру я і не п'ю.
Стаў з гадамі больш разумны,
Форму берагу сваю.

— Дык чаму такія змены?
Ты ж далёка не стары.
— Бо пачаў пагана, дрэнна
З вельмі даўняе пары.

Выпіваць стаў — ты ж не ведаў —
Я, смаркач, у сем гадоў.
Бацька піў штодзень з суседам,
Наліваць мне быў гатоў.

Адвучыць мяне хацелі —
Дзвесце грамаў налілі.
Я і гэта выпіў смела,
Хоць і стаў чарней зямлі.

А назаўтра запыталі:
— Вып'еш ты свае сто грам?
— Мне не многа і не мала,
Пацягну — і дзякуй вам.

А курыць, скажу па праўдзе,
Я пачаў... у тры гады.

Самасад мой бацька садзіць,
Закурыць даваў заўжды.

— Ты ад усяго адбіўся,
І ў душы, напэўна, злосць.
А кахаць ці не забыўся,
Хоць на гэта сіла ёсць?

— У дзяўчат я быў не госцем,
На сваім там быў кругу.
Так гуляў — трашчалі косці,
А вось зараз — не магу.

...Свой рахунак кожны мае,
Як падказвае жыццё.
Хто зарана пачынае,
Той канчае рана ўсё.

## На чый густ

Як цвіце трыснёг цікава,
Прыгажосць ад прастаты.
«Шапкі» чорныя — праява!
Па-вясковаму — «каты».

З іх букет каб быў у хаце!
Сустракаў жа дзе-нідзе.
Ды не мог ніяк дабрацца,
Бо заўжды яны ў вадзе.

Ды ў сухім аднойчы месцы
Улез, нарэзаў — рады я.
Толькі хтось не раіць везці:
Будзе дрэнная сям'я.

Кажуць мне аж тры жанчыны:
— Дома ставіць — проста грэх.

Многіх прыкрасцей прычыны,
Будзе бедаў поўны мех.

Ды адзін мужчына сталы
Быў настойлівы наўздзіў:
— У цябе «катоў» нямала,
Дай мне штучкі тры! — прасіў.

— А чаму такі кірунак
І нашто? — пытаю я.
— Жонцы будзе падарунак,
Мо ўмацуецца сям'я.

Як з усімі быць у згодзе?
Я «катамі» тымі трос.
І да сябра, да Валодзі
«Сувеніры» я прынёс.

Паглядзеў той коса-крыва:
— Ды ты што, здурнеў, стары?
Чарку дам табе і піва —
«Падарунак» забяры.

Ну задаў ты мне задачы,
Дык нясі «катоў» тых прэч,
Бо ад іх — адны няўдачы,
То — не кветкі і не рэч.

Слухаць тыя забабоны,
Ці ад іх дурнее свет?
Венік вылецеў з балкона,
Загарэўся туалет.

...Буду імі ўсё ж займацца,
Я — не грэшнік, не святы.
І няхай стаяць у хаце —
Даспадобы мне «каты».

Ну а беды, гора, мукі —
Хоць іх зваліцца гара —
Венік як вазьму я ў рукі —
Праганю іх сам з двара!

## У кожнага — сваё лячэнне

Гэта — справа бытавая.
Вечна дужым быць не мар!
Як і з кожным з нас бывае,
Захварэў ветэрынар.

Жонка доктара ўжо кліча:
— Падлячыце найхутчэй,
І я ўдзячнасць павялічу! —
Слёзы пырскаюць з вачэй.

Гэты лекар чалавечы
Роспыт хворага вядзе:
— Што баліць у вас, дарэчы,
І што цісне, як і дзе?

Хворы кажа: — Вас вітаю.
У мяне ўсё аж смыліць.
У кароў я не пытаю,
Як і ў коней: «Што баліць?»

Балбатаць не буду з вамі,
Са здароўечкам — завал.
А хваробы ўбачце самі,
Раз вы — прафесіянал.

Доктар хворага агледзеў
І праслухаў жа як след.
Курс лячэння ўраз зацвердзіў:
— Будзе доўга бачыць свет!

І дадаў у гэтым плане:
— Я зніму з душы пажар.
У мяне ўсё без падману,
Як казаў ветэрынар.

Жонка кажа: — Вось дык трасца,
Каб мне мужа не згубіць!
А лячэнне як не ўдасца,
Дык што нам тады рабіць?

— Можа, гэта непрыгожа,
А магу адно сказаць:
Як нішто не дапаможа,
Значыць, трэба даразаць!..

Чорны гумар мне прабачце,
Нешта й светлае пабачце.
У мяне вясёлы гарт,
Зразумейце гэты жарт.

## «Пажартаваў»

Стаяў на канцавым прыпынку
Аўтобус і збіраў людзей.
Вадзіцель выйшаў на хвілінку,
Пасля сярод усіх сядзеў.

Час адпраўляцца. Дзе вадзіцель?
Яго як быццам і няма.
— Хутчэй шукайце і знайдзіце,
Нашто тут прападаць дарма?

А той сядзіць, не прызнаецца,
І ўрэшце кажа смела ім:
— Што ж, руляваць мне давядзецца,
Хоць мала вопыту зусім,

Калі згубілі мы шафёра,
Які нас везці ўмела мог,
Я вам — на радасць ці на гора.
Не разаб'ёмся мо, дай Бог!

Для смеласці я вып'ю чарку, —
Кульнуў. Заеў. — Ну, не бяда!
Я дацягну да аўтапарку
(Па праўдзе, там была вада).

А пасажыры проста ў жаху:
Каму ахвота на той свет?
Прэч сіганулі ўсе з размаху,
Растаў раптоўна іхні след.

Шафёр рулюе ў адзіноце,
І не спяваюць салаўі.
А ўслед за ім машына косіць,
У ёй — інспектары ДАІ.

І затрымалі хутка, лоўка:
— Каго ж уводзіце вы ў зман?
Ну, дзе правы і дзе пуцёўка?
Аўтобусны вы хуліган.

Вось разагналі пасажыраў,
Гарэлку да таго ж пілі.
— Вой, адпусціце, хлопцы, з мірам,
То ж — проста жарт мой, можа й злы.

— Нажартаваўся ты ў ахвоту,
Пакалупаешся ў гразі.
Аддай правы, мяняй работу.
Не хочаш ездзіць, дык грузі!

## Грушы і грошы

Я кудысьці зранку рушыў
Па алейцы міма дрэў.
Зірк — валяюцца там грушы.
Я падняў іх, бо не меў.

Мо хто кінуў выпадкова,
Ці згубілі хлапчукі.
Я ж зусім не бесталковы,
З'ем іх з лёгкае рукі.

Дома жонка дапякае:
— Падымаеш абы-што.
Я затое не такая,
Што разоў казала сто.

Мо на іх хто памачыўся,
Ты ж падняў, нясеш дамоў.
Ці даўно, скажы, лячыўся,
Захварэць імкнешся зноў?

— Што ж, не хочаш, дык як хочаш...
Я памыў іх, сам паеў.
Выйшаў і далей пакрочыў,
Па баках усё глядзеў.

Там сусед стаіць ля дрэва,
То Антось — Чырвоны нос,
І штурхае ўправа-ўлева,
Сам да дрэва як прырос.

Ну, падумаў я, дапіўся,
Хоча з коранем зваліць.
Пацяшаюцца сябры ўсе,
А ў мяне душа баліць.

Падышоў, гляджу — ну й справы!
Не п'яны ён, як заўжды.

Гэта ж грушы вось страсае.
Я пачаў збіраць плады.

Дрэва ж тое незаўважна,
Сярод іншых лезе ўверх.
Торбу груш нясу я важна —
У свой дом, на мой паверх.

З неацэнным гэтым грузам
Я да жоначкі прыйшоў.
— На, — кажу, — і еш ад пуза,
Назбіраў я грушак зноў.

— Нехта выкінуў, вядома,
Ты ж збіраў, а што прасцей?
— Не, ля сябравага дома,
Там жа грушына расце!

Паспрабуй купі на рынку —
Колькі грошыкаў упрэш
Ці то ўлетку, ці то ўзімку,
Дармавыя лепей з'еш!

І дадаў я жонцы ціха:
— Як прыдбаў што — дык то ліха.
Што даецца ад прыроды —
Не мінай, бяры заўсёды!

# ВЕРШЫ АД МАЦІ

## Як пайшла дамоў Ларыса

Ларыса — дзяўчына як знатная дама,
Хацела, каб замуж пайсці за Адама.
Сякое-такое вяселле збудавалі,
Ларысу замуж за Адама аддалі.

Жыве Ларыса — не нажывецца...
Нядобрая жонка, Адаму здаецца.

Няма карысці з Ларысінага бегу,
У Адамавы крупы навеяла снегу.

Свіння ўбегла ў хату і прэ па муцэ,
А лупіць Ларыса дзіця на руцэ:
— Маўчы, дзіцятка, ты лепш не крычы,
Бо будзе работы мне да начы.

Ларыса ў начоўках дзіця купае,
А курыца здор па хаце цягае.
Ларысе дзіця спелянаць бы трэба,
Свіння ж ухапіла ў яе бохан хлеба.

Праз час і сыны падрастаюць, і дочкі,
А самі — кладуцца ў розных куточках.
Адам на другіх жанчын пазірае,
На жонку прычыны ўвесь час падбірае.

Зрабіўся Адам — ледзь ногі валачэ,
Падабраў прычыну, што дрэнна хлеб пячэ:
— Ідзі ты, Ларыса, да роднага таткі,
Каб ён зноў забраў цябе ў сваю хатку!

З такою, як ты, я больш жыць не магу,
Дык лепш ад цябе хоць у лес пабягу.

## Гуляка

Гута-гута, гута-та!
Прастата ці дурната?
Волька Хлусава ўпілася,
Многім хлопцам паддалася.

Як астатнія празналі —
Вольку к саням прывязалі.
Здзекаваўся — хто хацеў,
Анупрэй — аж упацеў.

Вечарынкамі — прыпеўкі:
— Зганьбавала нашы дзеўкі.
На яе ўсе зазлавалі,
Валасы яе парвалі.

— Не гуляй ты, шэльма, зноў,
Хоць дурная ў жылах кроў.

## Маё імя

У мяне імя — Мікола,
І таму я вельмі рад.
Не сумую з ім ніколі
І ў пашане ж у дзяўчат.

І магу сказаць сур'ёзна,
Ганаруся нездарма,
У краінах самых розных
Носяць слаўнае імя.

Гэта перш за ўсё славяне —
Лёгка вымавіць язык.
Італьянцы, англічане —
Нікалас, Нікколо, Нік.

Як узімку, так і ўвесну
Весялюся я ўдвая.
Вершы лепшыя і песні
Пра Міколу чую я.

...Бог сядзіць сабе на небе —
Назірацьза ўсім прывык.
Дапамога, бачыць, трэба:
Трапіў у бяду мужык.

Бедалага на калёсах
Вёз дахаты дроваў воз.
Адвалілася атоса —
Дык ні з месца, як прырос.

Бог святога пасылае:
— Мужыку дапамажы.
Той зляцеў, пабегаў з краю
Па дарозе, па мяжы.

Не зрабіў зусім нічога,
Бо няздольны быў да спраў.
І падняўся зноў да Бога,
Толькі сумна паглядаў.

Пасылае Бог Міколу:
— Падвядзеш мяне — наўрад!
Ты старанны і не кволы,
Дык выконвай мой загад!

Што ж, за працу ўзяўся ўзнёсла,
Паказаў ва ўсім напор,
І рамонт зрабіў калёсам,
Ды плячом яшчэ падпёр.

Бог сказаў: — Вось той — нягоднік
І адпеты сам гультай.
Ты ж, Мікола, мой угоднік,
І падзяку ўжо прымай.

Па лайдацкай жа прычыне
Прасмяе таго народ,
Бо не будзе імянінаў,
А ў цябе — аж двойчы ў год!

...Мне ж у цяжкую гадзіну
Мой святы — як бацька, госць.
Выпадкова я не згіну,
Ад бяды — заступнік ёсць.

Вось таму я і вясёлы,
Што нашу імя Міколы.



## Мая слабасць — мая сіла

За сабою назіраю
Я праз даўнія гады.
Доўга ўражанні збіраю
І здзіўляюся заўжды.

Не бярэ мяне гарэлка,
П'ю яе, нібы ваду.
І не трэба мне пахмелка,
Кайф у гэтым не знайду.

Не бярэ мяне табака,
Цыгарэты ж вось смакчу.
Ні дурману, ані смаку,
Дык нашто за тым плачу?

Не бярэ мяне каханне,
Я таму зусім не рад,
Хоць ад вечара да рання
Пaглядаю на дзяўчат.

Не бярэ мяне бяссонне —
Ці цвярозы, ці ў хмялю.
Калі я стаміўся сёння
Ці гуляў — забойна сплю.

Не бяруць мяне хваробы,
І не ведаю бальніц.
Сэрца, печань, мозг, вантробы —
Я ад іх не падаў ніц.

Не бярэ мяне і зайздрасць,
Злосць не тлуміць галаву.
Ад чужой бяды — не радасць,
А сваю — перажыву.

Зразумець як тыя з'явы?
Падуладнае мне зло.
Што за дзіўныя праявы?
Так ні ў кога не было.

Мо такі ў мяне быў продак,
Гены я яго нашу?
Ёсць супроцьатрутны сродак,
Бо сатыру я пішу.

Маю светлыя ідэі,
А душа — як чысты ліст.
І не трачу я надзеі,
Бо — вясёлы, гумарыст.

# Любімай жонцы

Такая ты — і не такая,
А я — такі, і не такі.
І кожны кожнага прымае,
Мы — дзівакі, не прастакі.



І хоць шалееш, як рэактар,
Са злосці быццам творыш здзек,
Ты свой паказваеш характар,
І на мяне так прэш, як трактар, —

Чытач мой першы і рэдактар,
Бывала часам — і фундатар,
Зусім нядрэнны чалавек,
Цябе цярплю я ўрэшце нейк.

Я неправы —
дык ты бушуеш,
Сама віноўна —
то маўчыш.

Стук майго сэрца часта чуеш,
Тады ў сям'і — парадак, ціш.

А цішыня заўжды патрэбна,
Пачуццяў многа — на дваіх,
Бо лаянка — заўжды ганебна,
Лепш — пацалункаў лёгкі ўздых.

Бываеш часта не ў гуморы,
Хаваеш ласку неўпрыкмет.
Ты не давод зь мяне да зморы,
Каб мне не стаў нямілы свет.

Пры ўсім пры тым ты — кветка-ружа,
А я, магчыма, як асот.
Цябе ніколі я не здужаў,
А ты мяне — наадварот.

Хоць мы спрачаемся нярэдка,
У душы спяваюць салаў'і.
Не гавары мне злосна, едка,
Сябруй,
кахайся —
і жыві!

## Сучасны шлюб

Пуцёўкі ўзяўшы, адпачыць мы едзем —
Я ў бок адзін, а жонка — у другі.
— Вы, людцы, што? — жахаюцца суседзі, —
Няўжо вам родны дом не дарагі?

Раманы на курортах скрозь заводзяць,
Дом адпачынку — хітрыкі адны,
Бо несур'ёзна там сябе паводзяць,
Глядзіш — даходзіць дома да вайны.

...Што ж, дрэнны сем'янін і дома зверне.
Як жонка едзе — слова не скажу,
Бо і любоў у нас ёсць, і давер'е,
І можам ехаць мы хоць за мяжу.

Мінае водпуск. З радасцю і згодай
Жывём. Спрачацца нам няма прычын.
А жонцы йдуць паштоўкі па паўгода —
Дарэчы, і не толькі ад жанчын.

Я абыякава гляджу на гэта,
Знаёмых многа можа быць ва ўсіх.
Прытым і мне ідуць лісты нярэдка —
Не ад мужчын каля паловы з іх.

Нашто ў сям'і прыгон? Адна пакута!
Навошта прыкаваным быць заўжды?
У водпуск з жонкай зноў паедзем хутка,
Пуцёўкі ўжо купілі — хто куды.

## Мае гады, маё каханне

Ужо кахаць я развучыўся.
Мінулі даўнія гады,
Дзе кавалерам я лічыўся
І быў прыгожы, малады.

Тады мог падысці чын-чынам,
Пачуцці выказаць свае.
Мазгі туманіць мог дзяўчыне,
Калі пачуццяў нестае.

Красунямі я захапляўся,
Мог перад імі падаць ніц.
І ўдзень, і ўночы не стамляўся
Любіць дзяўчат і маладзіц.

Шукаў сваю я доўга зорку
І ўсё баяўся аднаго:
Каб не было камусьці горка, —
І не кахаў абы каго.

Вясна і лета прамінулі,
Жыцця сыходзіць зарапад.
І скроні сівізна кранула,
І валасоў не вельмі шмат.

Жыцця майго тут толькі восень,
Ды сумаваць было б дарма.
Час хутка бегчы мы не просім:
Не надышла яшчэ зіма.

Кахання шчасце хто ж ухопіць?
Пачуцці праймуць і мяне,
Калі хто лёд душы растопіць
І сэрца бурна ўскалыхне.





# Куфар, з якога усяго патроху

*Сатырычныя мініяцюры*

## Дваццаты век

Дваццаты век ужо стаў гістарычным.
Яго любілі, хоць былі і скептыкі.
Мужчыны ў захапленні: — Век касмічны!
Жанчыны ж рады: — Гэта — век касметыкі!

## Адзіная слабасць жанчын

Якія дзіўныя жанчыны!
Спрачацца рады без прычын.
Маўчаць мужчыны і трываюць.
Ім не даюць сказаць ні слова,
І толькі слухаць іх гатовы,
Калі мужчыны засяпваюць.

## Ключ да сэрца

Як жыццё ўсіх па-рознаму вучыць!
Калі стрэў ён па густу дзяўчыну,
Падабраў да яе сэрца ключык,
То быў ключ ...ад уласнай машыны.

## Работа пайшла на карысць

Рэвізорам год ці два
Па сталоўках працаваў.
І кашуль ужо цяпер
Ні адзін не йдзе памер
(Бо не сходзіцца каўнер).

## Прагнасць алкаша

Бутэльку нахілі пустую,
Каб сорак кропель нацякло...

А вось калі б бутэльку тую
Ды можна выкруціць было!

## «Касманаўт» міжволі

Вось цешча у мяне — дык проста злыдзень!
Грыміць і часта лае на ўвесь свет.
Каб без яе пражыць мне хоць бы тыдзень,
Гатоў ляцець я нават у Сусвет!

## Жонка па разліку

Не люблю жыццёвых бедаў,
Я вазьму лепш для парадку
З адукацыяй сярэдняй
Ды вышэйшага дастатку.

## Попельніца і сяброўка

— Нашто ты попельніцу ўзяў?
— Для цыгарэт.
　　　　　　　— Вось маніш лоўка!
Ты ж не курыў.
　　　　　　　Ці мо пачаў?
— Не, пачала курыць сяброўка.

## Цяперашнія норавы

Быў і шлюб, і быў развод,
Ды праз месяц, не праз год.
Пэўна, кожны з іх нялюб.
Праз паўгода — новы шлюб.

## Жаніх-рыбак

— Я чуў, нядаўна ў водпуску ты быў?
— Так, лоўляй акунькоў люблю займацца я.
— А я хады да «плотачак» рабіў...
З кватэрай і вышэйшай адукацыяй.

## «Жонкалюб»

— Ты ледзь стаіш. У чым прычына?
— Бо дзве гадзіны зуб я рваў.
— Зубнік той злосны быў мужчына?
— Калі б жанчына — я б спяваў!

## Звышпадхалімак

Даклад начальнік скончыў і пытае:
— Магчыма, думку іншую хто мае?
Вось вы скажыце шчыра пры народзе!
— Так, маю, толькі з ёю я не згодзен.

## Звышсамалюбства

Ён не дазволіў бы нікому
Хваліць яго. Злаваў якраз,
Бо быў упэўнены ўвесь час,
Што лепш хваліць сябе ... самому.

## «Звышсціпласць»

Размаўляў з задавальненнем
Толькі ў грубым тоне.
А прасіў ён прабачэння...
Па тэлефоне.

## Звышгаварлівасць

Я сябра спаткаў і ў яго запытаў,
Як справы, здароўе, дзе бачыў каго.
І ён неяк млява расказваць мне стаў —
Хацелася збегчы хутчэй ад яго.

## Звышзадзірлівасць

Мне рахманасць не пасуе,
І цярпець я не прывык.
Перш чым шпільку хто падсуне,
Я яму падсуну цвік.

## Звышпрынцыповасць

Быў шлюб, збіраліся вяселле справіць:
Нявеста — у маі, а жаніх — у чэрвені.
І так сур'ёзна падышлі да справы,
Што разышліся — не сышліся ў тэрміне.

## Звышзадавака

Яго адзначылі аднойчы —
Ён задавацца стаў на жах.
Ні з кім вітацца больш не хоча,
Бо вырас — у сваіх вачах.

## Перастрахоўшчык

Быў асцярожны, усім на дзіва,
Усюды вытрымкай хваліўся.
Заўжды па нітачцы хадзіў ён,
Але нарэшце ўсё ж ... зваліўся.

## «Работнік»

Я быць на рабоце ўвесь дзень не магу,
Не кажучы, каб затрымацца.
Ужо без пяці. Дадому бягу,
Каб не перапрацавацца.

## Суботнік бюракрата

Два вазы нагрузілі паперы,
Назбіралі яшчэ на трэці.
То начальнік сталы праверыў
У сваім кабінеце.

## Зручнае выйсце

Хлусня не ў модзе ў нашы дні,
А праўда часта вочы коле.
Дык ён нікому не маніў...
І праўды не казаў ніколі.

## «Атэіст»

Крыў Бога праз навукі прызму
Так, што чырвоны ўвесь зрабіўся.
Экзамен здаў па атэізму
І, выйшаўшы... перахрысціўся.

## Хітры гультай

Спыталі хлопца, што глядзеў з маркотай:
— Ці многа сёння ты зрабіў работы?
І вельмі неахвотна той азваўся:
— Я састарэў, а дзед — заленаваўся.

## Добры трактар і благая жонка

Вось тэхніка — дзе лепшая яшчэ?
Заводжу я секунд за пару трактар.
А ў жонкі ў маёй такі характар —
Заводзіцца за трактар той хутчэй.

## Належны фінал

Не хлебную шукаць скарынку —
Спекуляваць ішоў да рынку.
Не пойдзе больш туды цяпер:
Яго ўзялі там за каўнер.

## Сумны роздум

З людзьмі заўсёды быў у ладзе,
Але да часу, да пары.
Дзе ёсць сябры — то не ва ўладзе,
А хто ва ўладзе — не сябры.

## Скарга абібока

Не жыццё — скрозь толькі мукі,
Кідаўся на ўсе бакі:
Ад работы ныюць рукі,
А ад ленасці — бакі.

## Звычка злодзея

Балюча бачыць без нагляду рэчы,
Мне іх шкада зусім па-чалавечы.
Я ж рупны, я знайду ім прымяненне:
Ім будзе ўтульней у маёй кішэні.

## Прызнанне з перцам

Палюбіў цябе да смерці,
Дарагая мая жонка.
Ты ў мяне не толькі ў сэрцы,
Але нават і ў пячонках.

## Прынцып дармаеда

— За цябе нам непрыемна,
Прагуляў які ўжо раз.
— Лаеце мяне дарэмна:
Паабедаю за вас!

## Гультай на сенакосе

Казалі ж: — Ты працуй хоць трошкі!
Ды нічыіх парад не слухаў.
— Мне горача, кусаюць мошкі!
І бегаў з віламі... за мухай!

## Ныцік

Кволы выгляд вечна мае,
Кіслы твар у бедака,
Хоць за хвост ён утрымае
Трохгадовага быка.

## Фарцоўшчык

«Дастаць» тавар
І мець «навар» —

Вось лад жыцця ягоны.
Каб даць — не даць,
Зручней прадаць
Шмаццё і... уласны гонар.

## Сэрца лавеласа

Заўжды да аднаго хлапец імкнецца:
Кахаць усіх дзяўчат навокал рад.
І шмат каго змясціць гатоў у сэрцы,
Не сэрца, а дзявочы інтэрнат.

## Мараль злодзея

Як браў — маўчаў,
А як злавілі — плача:
— Я пазычаў...
Так, каб ніхто не бачыў.

## Скнара

Заўжды да аднаго імкнецца —
Давалі ўсе толькі яму б.
А даць другому давядзецца —
Хутчэй здаровы вырве зуб.

## «Устойлівы»

У мяне характар настойлівы:
Бочку выпіў бы, толькі б змог.
Як нап'юся — заўсёды ўстойлівы,
Бо стаю я... на чатырох.

## Злосны дачнік

Яго дом людзі нездарма
Абходзілі далей,
Хоць ён сабак і не трымаў —
Быў сам намнога злей.

## Развапотлівы начальнік

Захаваю фонд зарплаты,
Трэба грошы прытрымаць:
Скарачаюць сёння штаты —
Буду заўтра раздзімаць.

## Дапіўся

У пустыню трапіў п'яны,
Ды пайшоў, як апантаны:
— Я дамоў прыйду калі?
Ну і пляж адгрукалі!

## «Вынаходнік»

У вечным пошуку заўсёды,
Інакш ніяк не можа жыць.
Ён вынаходзіць падыходы
Туды, дзе дрэнна што ляжыць.

## «Аматар» крытыкі

Ён так казаў, калі яго хвалілі:
— Люблю, як рэжуць праўду-матку ў вочы!
Інакш казаў да крытыкі ахвочым:
— Я не люблю страшэнна падхалімаў —
Бо крытыкай дапамагчы мне хочуць.

## Падражніўся

Я, выпіўшы, піхнуў сабаку —
Збяжыць, падумаў, не кране.
Пасля ад крыўды аж заплакаў —
Ён, гад, штаны садраў з мяне.

## Спажывецкі настрой

Не мае вечна ён спакою:
Усё грабе, збірае, лепіць.
Калі ж не зможа ўзяць рукою,
Дык хоць пазногцямі зачэпіць.

## Вечны клопат

Пыталіся ў яго не раз:
— Якія клопаты, турботы?
А ён: — Змагаюся ўвесь час
Са сном, з начальнікам, з лянотай.

## П'яны — як баран

Хлопец выпіў вельмі многа,
Потым вылез на дарогу.
Бачыць слуп, ілбом ён — бах!
Слуп стаіць. Сам — у кустах.

## Абурыўся

Чытаў ён аб шкодзе курэння,
Ківаў галавой з абурэннем:
— Здароўе кладуць да пары!
Расстроіўся і... закурыў.

## Бабулька і турысты

— Нашто і ўлетку вы, і ўзімку ходзіце?
Работа толькі лішняя нагам.
Што ў гэтым вы цікавага знаходзіце
І колькі за хадзьбу заплацяць вам?

## Кошт мінуты

Хацеў рашыць з начальствам справу хутка.
Прыйшоў — а там ідзе пяцімінутка.
Са злосцю ён пайшоў не без прычыны:
Не дачакаўся нават праз гадзіну.

## Спазненне жонка не даруе

Позна дамоў іду я —
З работы, паверце, людзі.
Бедная шыя мая!
Што ёй сягоння будзе?

## Парада афіцыянткі

— Падаваць хутчэй пачніце,
Дзе рухавасць ваша, спрыт?
— Пасядзіце, адпачніце,
Падагрэйце апетыт!

## Мода падвяла

Дзяўчыну я спытаў нясмела:
— Дзе, любая, краса твая,
Чаму за ноч так пасівела?
— Была ў цырульні ўчора я.

## Фінал дэбашыра

Пайшоў аднойчы ён у госці,
Так бушаваў — трашчалі косці.
А на судзе быў смеху варты,
Імкнуўся ўсё звярнуць на жарты.

## Парадокс у навуцы

Ён лічыцца ў навуцы — Бог,
А сам яе штурхае ўбок,
Бо ўперад — здольнасцей не мае,
Назад — начальства прытрымае.

## Перамылі

Здаў з тканіны натуральнай
Мыць кашулю, а цяпер
Атрымаў нарэшце з пральні...
Рукавы два і каўнер.

## Пра службовую машыну

Начальнік той машыну меў
І карыстацца ёй умеў:
Даваў сябрам, знаёмым, дзеткам,
Па службе нават ездзіў... зрэдку.

## «Спецыяліст»

Фатограф заклікаў людзей:
— Вас так не змогуць зняць нідзе.
Я здымак вам зраблю такі,
Што не пазнаюць сваякі!

## Прыемная сустрэча

— Прабач, не заходжу, нядужы.
Забыўся я ўжо, дзе твой дом.
Давай пацалуемся, дружа!
Гамонка ішла... пад сталом.

## «Музыкант»

Да музыкі асобай здольны быў,
Яна ў яго вушах гучала часта.
Такі характар меў, што граць любіў...
На струнах самалюбства ў начальства.

## Сімулянт

У аптэку куляй мчыцца,
А здароў — хоць лес валіць!
Ад чаго лепш палячыцца,
Што мне заўтра забаліць?

## Прынцып перастрахоўшчыка

Давярацца вам не раю
І нікому, і нідзе.
Калі я не давяраю,
Дык ніхто й не падвядзе.

## Ключ да сэрца швейцара

Строгі, цвёрды ён на дзіва —
Прад кліентамі — як бос.
А дасі яму на піва —
Размякчэе, быццам воск.

## Бракароб

Быў рабоце так адданы,
Добра ўсім вядомы:
За ўвесь цэх выконваў план ён...
Па металалому.

## Розныя бакі кахання

На ёй сышоўся клінам белы свет,
Яе партрэт быў у яго пакоі.
Разлаецца — знімаў ён са сцяны партрэт,
Мірыўся — вешаў зноў на месца тое.

## Перад першым спатканнем

— Адкрый, сяброўка, таямніцу,
Як лепей з хлопцамі мне трымацца.
На колькі можна запазніцца —
На пяць хвілін, ці на пятнаццаць?

## Нарваўся

Ён зайшоў — раз'юшаны нечым,
Злосны — кожнага б знявечыў:
— Майго брата хто пабіў?
— Я! — сказаў яшчэ дужэйшы.
І дзяцюк той злосць паменшыў:
— Дзякуй! Правільна зрабіў.

## Па птушцы і палёт

Любіла Муха так хваліцца ўсім бясконца:
— За Птушкамі і я магу ляцець да сонца.

Заўважыў мудра Жук: — Я б паляцеў таксама,
Ды наш з табой палёт — увесь ля гнойнай ямы.

## Удакладняў

Некралагі ён праглядаў —
Жыццё ж бяжыць, цячэ,
Бо ўпэўніцца ўвесь час жадаў,
Што сам жывы яшчэ.

## Упершыню на футболе

Прыйшоў мужчына на футбол,
Крычыць: — Ура! Забілі гол!
Сусед штурхнуў яго пад бок:
— Забілі ж нашым, галубок.

## У тэатры юнага гледача

— Артыстку новую да нас прымаюць,
Не ўзрост, а талент на ўвазе маюць.
— А колькі год ёй?
— Дваццаць.
— Маладая!
— Ды не, да ста год столькі не хапае.

## Асцярожнасць

Курыць даволі, бо быць бядзе:
Ужо начальнік якраз ідзе.
Нашто на вочы трапляць яму?
Рабочы выгляд хутчэй прыму.

## Пастаянства і перамены

Мужчына, халасты або жанаты,
Заўсёды — леў, мяняюцца дзяўчаты.
Так хутка можа іншая змяніцца:
Спачатку — кошачка, пасля — тыгрыца.

## Не сышліся

— Ты трапіў у міліцыю — вось жах!
Ты з кодэксам, напэўна, не ў ладах?
— Не, кодэкс у мяне пашану мае,
Ды ён мяне зусім не паважае.

## Замуж захацела

— Пара жаніцца нам, гляджу я.
— Яшчэ мне не было бяды!
На карку ў бацькі сам сяджу я.
— Дык што ж, пасунешся тады!

## Вось дык дружыннікі!

— Хуліганы гуляюць па парку,
Забярыце — наробяць бяды.
— Ого-го! Мы дамо ім па карку.
Прывядзіце хутчэй іх сюды!

## Вясёлы настрой

Твой настрой вясёлы нейкі.
— Выйшла замуж — вось прычына.
— За каго?
                    — За чалавека.
— За якога?
                    — За мужчыну!

## Безгаспадарчасць

Станок купілі за мяжой,
Ён на двары пяць год ужо.
Б'е дождж, мароз кусае люты,
І плача бедная валюта.

## Жарт

— Чаму ты ўпаў, скажы, браток?
— Бо слізка, хіба не?
— А я падумаў, назнарок,
Каб пасмяшыць мяне!

## «Уюн»

У шальмаўстве заўжды меў рост —
Падманіць хоць каго,
І ні за жабры, ні за хвост
Не улавіць яго.

## Зразумеў па-свойму

— Мацуйся! — кажам мы на развітанне,
Бо лічым слабасць вельмі значным злом.
Ён зразумеў па-свойму пажаданне,
І мацаваўся... толькі за сталом.

## «Аматар» футбола

— Як скончыўся футбол учора,
Які там вынік быў і лік?
— Канец такі — гарэлкі мора,
А лік вядомы — на траіх!

## Як старому жаніцца

Кепска тым, хто аб роўні не дбае.
Ён стары быў, яна — маладая.
І хадзіў ад вяселля ўвесь дом,
А жаніх вось... заснуў пад сталом.

## Прафесар і студэнт на экзамене

— Я рад, што вас, нарэшце бачу —
Упершыню за доўгі час.
— І я ад шчасця ледзь не плачу,
Што вас сустрэў... апошні раз.

## Пацярпеў

— Ну й выгляд, хлопец, у цябе,
Аж нават глянуць страх.
Ты як ішоў, на галаве?
— Ды што ты, на руках.

## Расцягалі

Была гара на славу. Дзень за днём
Турыстаў звычка — сувенір бяры!
Турыст мільённы атрымаў дыплом,
І ўзяў... апошні камень ад гары.

## «Рашучы»

Бываюць яшчэ хуліганы.
Прыстаў да дзяўчыны там п'яны.
І тут не магу не ўступіцца я:
Пайду, пагляджу, дзе міліцыя.

## Сіла звычкі

Калі піў — з ім было адно гора,
Біў паклоны слупам без разбору.
А калі ён хацеў развітацца,
Гаварыў: — Маю гонар... хістацца.

## Твар труса

Калі сябры каля яго бываюць —
Шуміць, грыміць тады і рвецца ў бой.
Як толькі ж рукі ад яго сябры прымаюць —
Сціхае, робіцца ён зноў самім сабой.

## Паскарэнне па-старому

Так мала новых там прыкмет:
Абы хутчэй здаваць аб'ект.
Шпалеры, плінтусы і рамы —
Наперакос усё, не прама.
І лічаць, што няма бяды.
Даробяць. Толькі... праз гады.

## Кааператыўшчыкі

І кава, куры і свініна —
Усё ў кафэ тым — з магазіна.
Так абслугоўваюць народ:
Вышэй цана — вышэй даход.

## Наркаман

Галаву згубіў, бядак,
За яе важнейшы — мак.

І з-за гэтага вось маку
Ўжо скруціла небараку.

## Таксікаман

Каб жылося весялей —
Лакі нюхае і клей.
Трыццаць год — ужо стары.
Пахаваюць да пары.

## Адзінае схованішча

Спакойная была і не злавала,
Ад аднаго кідалася ў амбіцыю:
Калі муж піў, дык так яго ганяла,
Што мог схавацца толькі... у міліцыі.

## Барацьба за «раўнапраўе»

Заўжды злавалася на мужа,
Ды не таму, што п'е ён дужа,
Але таму, што часам п'е
Ён трохі болей за яе.

## Жонка вінавата

Выпіў чарку. Як на гора,
Жонка за руку схапіла:
— Болей я ўжо не змаўчу!
— А нашто ж мяне ты ўчора
Селядцамі накарміла?
Зараз, бачыш, піць хачу!

## «Чэмпіён»

Як абыходзіў рыфы ён
І кожны свой разлічваў крок!
І быў нязменны чэмпіён,
Ды толькі... па скачках убок.

## Мараль хулігана

— Ты штурхнуў мяне, браток,
Нізавошта нібы.
— А каб ведаў я, за што,
Дык яшчэ пабіў бы.

## Важныя прыкметы

Адкрыты смех — шырокая натура.
Не будзе дрэнным чалавек такі.
А кепскі чалавек і ў думках хмуры,
Ён нават і смяецца з-пад рукі.

## Хуліган у аўтобусе

Дзяцюк на бабку з крэсла пазірае.
— Мо ўступіш месца? — просіцца старая.
— Давай дамовімся, — спакойна той зазначыў, —
Мяне не бачыла ты, я цябе не бачыў.

## «Добрая» памяць

— Чуеш плач і жалобныя песні?
Быў нябожчык, відаць, любы ім.
— Так, вялікую страту панеслі:
Ён жа грошы павінен усім.

## Метад летуна

Усюды працаваў ён па паўгода,
Ды больш за ўсіх нярэдка меў выгодаў
І жыў не толькі добра, а шырока,
Бо быў настырлівым і вельмі лоўкім:
Умеў пускаць слязу ён... адным вокам.

## Гультай

— Ты, напэўна, водпуск меў?
— Што ты, браце!
— Дзе ж так добра загарэў?
— Ды на працы!

## Каму чаго не хапае

Не, латарэя — не міраж,
Купляць білеты ўсім я раю.
Мне толькі выйграць бы гараж,
А на машыну — назбіраю.

## Калі ў вачах дваіцца

Ён выпіўшы ехаў, і раптам узніклі
Наперадзе два матацыклы.
Хацеў паміж імі праехаць якраз,
А там аказаўся... МАЗ.

## «Працаўнік»

— Для гультайства дзе прычыны? —
Кожны з нас нярэдка чуе.
— Праца — лепшы адпачынак, —
Кажа той, хто не працуе.

## Прынцып бюракрата

Як да мяне папера прыйдзе,
То, што б мне ні рабілі,
Пакуль не вылежыцца з тыдзень —
Яна не мае сілы.

## Слабая памяць

Пасля палучкі колькі дзён
На працу забываўся ён.
А каб забыўся вось хоць раз
Палучку атрымаць у час!

## Зразумелі

— Ешце, госці, з чорным хлебам:
Так карысней, больш прыемна.
— Не турбуйцеся, не трэба —
Нам і з пірагом нядрэнна!

## Хапуга

Амплуа маё
Вызначыў даўно я:
Кожнаму — сваё,
А мне — і чужое.

## Баявая жонка

— Пайсці ў лазню я мяркую,
А ты не йдзеш са мной? Чаму ж?
— Ад жонкі лазню меў такую,
Што толькі б — пад халодны душ!

## Падараваў... сабе

— Ты што сваёй нявесце купіш?
— Ёй попельніцу я бяру.
— Яна ж не курыць, ты жартуеш?
— Але затое я куру!

## Пацярпеў

На руках як быццам раны,
Гэтакія мукі!
Як ішоў ён з рэстарана,
Адтапталі... рукі.

## Надзейнае сховішча

— На рыбалку, на прыроду
Едзеш ты? — Вядома!
Жонка лае, дык заўсёды
Я сыходжу з дому.

## Не праблема

Галодная Ліса залезла ў сад,
Ды не змагла дастаць там вінаград.
Ну, не бяда, бо дойдзе ўсё да ладу:
Кум Ліс дастане, ён — загадчык склада.

## Няўдача аматараў хабару

Адзін — аж есці перастаў,
Другі — увесь аж ссох,
Адзін — што хабару не ўзяў,
Другі — што даць не змог.

## Не той рост

Начальнік гонару шмат мае,
І нос высока ён трымае.
Ды толькі ўсім здаецца: нос
Яго самога перарос.

## Рабы звычкі

Мы — звычак рабы на працягу жыцця.
Курэц жа ў многім слабей за дзіця.
Яно соску кіне — на ногі дай стаць,
Ён будзе ўвесь век цыгарэту смактаць.

## «Нарабіўся»

Нарабіўся, спацеў, стаміўся,
Ледзь ідзе, ды і то з задышкай.
За жывот аберуч схапіўся,
На руках мазалі... ад лыжкі.

## Экзамен па геаграфіі

— Што Індыя вывозіць за мяжу?
Забыліся? Дык я вам падкажу:
Што раніцою любіце вы піць?
— Расол капусны!
Як я мог забыць?

## Калі брак на швейнай фабрыцы

Прадукцыю давалі там штомесяц,
План гналі, за працэнтам вельмі гналіся.
А калі б вырабы на пудзілы павесіць —
Вароны, пэўна б, распужаліся.

## Незвычайнае запрашэнне

Да мяне часцей заходзь —
Будзеш самы лепшы госць.
Зойдзеш са сваім дабром —
Станеш і гаспадаром.

## Хітрыкі абібока

На рабоце сонны будзе,
Менш зрабіць — задума ўся.
А як соннага разбудзяць,
Скажа: — Я задумаўся.

## «Прызнанне» крытыкі

Няма ад крытыкі бяды,
Аб гэтым я не забываю,
І выправіцца рад заўжды,
Ды... вінаватым не бываю.

## Бяссілле ўтаймавальніка тыграў

— Вы лёгка з тыграмі працуеце заўсёды.
— Ды гэта ж дзеці мілыя прыроды.
Вось дома ў мяне, дык там — тыгрыца,
З ёй век не справіцца і не змірыцца.

## Не сагнуўся

Ён хваліўся, што нібыта
Незгібальны чалавек...
Бо хварэў радыкулітам
Увесь свой век.

## «Рацыяналізатар»

Трэба ўвесці посуд новы
І гарэлку прадаваць
У пакетах папяровых,
Каб кішэні мне не рваць
(Не цягнуць і не здаваць).

## «Суцяшэнне»

— Я хворы быў. Чаму ж ты не наведаў?
— Памылку выпраўлю я ў іншы час.
Аб тым, што захварэў ты, я не ведаў.
Бог дасць — ляжаў ты не апошні раз.

## «Культурны»

Апранут чыста, малады,
На выгляд быццам бы культурны.
Але акуркі ён заўжды
Кідаў не ў урну — міма урны.

## Каб — здароўе і жыццё

Хоць жыццё нам — не пацешкі,
Хто ж мы будзем без усмешкі?
Трэба — гумар. Трэба — жарт.
Без таго — чаго ты варт?
Многа больш тым удаецца,
Хто жартуе і смяецца.
А пахмурным — мала ёсць:
Чарната, худоба, злосць.

## Аптымістка

— Ты скарыстала, мусіць, фарбаў пяць,
Я колер валасоў не разумею.
— Ну што ж, бландзінкай не змагла я стаць,
Але брунеткай стаць яшчэ сумею.

## Прычына памяркоўнасці

— Чаму не звольніце прагульшчыкаў і п'яніц?
Нямала клопату прыносяць вам яны.
— А ў канцы месяца — у нас ёсць шанец,
«Штурмуюць» план і ў выхадныя дні.

## Выбрыкі моды

— Табе да твару гальштук так ідзе!
Скажы, калі дастаў яго і дзе?
— Ён у мяне валяўся пяць гадоў,
А ў моду толькі зараз увайшоў.

## З планам не жартуй

— Ну што рабіць і дзе мне дзецца?
«Гару» я з планам.
— Што крычыш?
План — ён, вядома, застанецца,
Ты ж будзеш «спаць» — адзін «згарыш».

## Адзіны клопат

— Відаць, галіўся ты не часта?
— Віной таму камандзіроўка.
— Пазнаць не зможа і начальства.
— Ну што ж, абы пазнала жонка!

## Прынцып шафёра-ліхача

Вышэй хуткасць — меней ям
(Больш работы слесарам).

## «Спрынтэр»

Шлях незвычайны
Любіць адчайна:
Бегаць ад дома
Да гастранома.

## Пра сябе

Сябры пакінуць —
вось няўдача!
Ды без такіх я —
жыў-здароў.
Сябры адыдуць —
я не плачу,
Заводжу новых
зноў сяброў.

## Жыццёвы прынцып

Няхай бяда наваліцца гарою —
Не трэць ніколі добрага настрою.
Усмешка ж упрыгожыць чалавека,
А злосць нам скарачае чвэртку века.

# Памяць

Хто болей памятны
у народзе —
І праз вякі,
і праз — гады?
Цары —
прыходзяць, адыходзяць,
А вось паэты —
назаўжды.



# КАЛАМБУРЫ

## Прычыны спазнення на работу

Калі хто паспеў даўно спіцца,
Таму не працуецца — спіцца.

## Нясмелы футбаліст

Мячом ён добра пасаваў,
А вось з дзяўчынай — пасаваў.

## Беражы сябе і жонку

Каб жонка не бывала ў горы,
Не напівай бутэлек горы.

## Небяспечны госць

Калі ў гарод запусцяць барана —
Усе зраўняе ўраз, як барана.

## Заўважылі

Знялі загадчыка сталоўкі,
Бо ўрэшце надта ён стаў лоўкі.

## Лозунг у пажарным дэпо

«Калі спяшаеш на пажар ты,
Тады забудзься лепш пра жарты».

## Заспакоіўся

Як глядзеў за ёю некалі!
Ажаніўся — стала некалі.

### Парада скупому

Каб разышліся хутка госці,
Ты абдзялі крыху кагосьці.

### Душ — не лазня

І быў такі халодны душ,
Нібыта ён для мёртвых душ.

### Гультаваты дачнік

Чакаў ён вельмі шмат ад дачы,
Ды не было зусім аддачы.

### Прычына разводу

Заўжды імкнуўся лішне ён да волі,
Ды жонка запярэчыла: — Даволі!

### А на ежу не хапае

Хто часта спіртныя напоі каштуе,
Тым дорага закусь заўсёды каштуе.

### Прадаўшчыца-махлярка

Сумненне страціла дарэшты:
Рука цягнулася да рэшты.

### Папаўся

Бег Воўк за Зайцам, ды самлеў:
Насустрач выскачыў сам Леў.

### Просты рэцэпт ад паўнаты

Каб трохі меней еў і спаў,
Яго жывот адразу б спаў.

### Баязлівец

Сябе паводзіў вельмі бойка,
Ды ўцёк, як пачалася бойка.

### Хітры ход і шмат год

— Ну і задаў прараб задачу!
Пяць год за што яму?
— За дачу!

### Прычына звальнення

У тым была яго віна,
Што жыць не мог ён без віна.

### Мужчыны ёсць мужчыны

Заўжды была з суседкай на нажах,
А муж дружыў с суседам —
ёй на жах.

### Усё ўдакладняў

Яму ўвесь час было цікава:
Што здаравей —
ці спірт,
ці кава?

### Жыццёвы прынцып

Каб слава аб табе гучала век,
Важней за ўсё —
будзь добры чалавек.

### Клопат маладога пісьменніка

Раман даўно пара даваць,
Каб чытача парадаваць.

# ЭПІГРАМЫ

## Дваякі падыход

Паэт прыйшоў.
Рэдактар без затрымкі
Яго схапіў у моцныя абдымкі:
— Твой рукапіс наверсе, бач, ляжыць,
І можаш ты спакойна, браце, жыць.
Паэт пайшоў.
Той кажа: — Каб ты скіс!
І рукапіс перакладае ўніз.

## «Творчыя» парады

Аўтар верш прыносіць новы.
Кансультант —
супроць ні слова,
І адказ такі чуваць:
— Верш ваш добры,
ды мяркую,
Што ў рэдакцыю другую
Лепш яго прапанаваць.
Ён паслаў — прыходзіць допіс:
«Лепш занеслі б —
у часопіс».

## Сувязь аўтара з героямі

— Ты дзе працуеш? —
запыталіся ў паэта.
Той усміхнуўся, жартаўліва адказаў на гэта:
— Ды за сябе і за мяне мае героі самі
Да вечара штодзень грукочуць малаткамі.

### У пачаткоўцах і ў «класіках»

Спачатку дзейнасць разьіваць,
Усім спакою не даваць,
Дзе возьмуць — творы пакідаць,
Глядзіш — надрукаваны.
Пасля маўчаць, не выступаць
І выдаваць гадоў праз пяць
Даўнейшыя раманы.

### Для сябе і пра сябе

Калі яго прызналі крытыкам вядомым,
Уласных кніжак стаў паклоннікам свядомым.
Чужыя ж творы ён граміў зусім слабыя,
А вельмі добрыя —
яшчэ больш не любіў ён.

### Пра верлібры

Цяжка пра твор яго пэўна сказаць,
Хоць ён у аўтара і не першы.
Модна зараз у прозе пісаць
Пад рубрыкай... «вершы».

### Яго шлях

Напісаў даволі многа,
А талковага — нічога.
Быў вядомым дылетантам,
А цяпер стаў кансультантам.

### «Майстар» перакладу

Новы твор пераклаў адмыслова,
Перакладам быў здзіўлены свет.
Памяняўся сюжэт, а не толькі што мова,
Пра мастацкую вартасць не скажаш ні слова,
Хоць ты, аўтар, сядай і пішы ўсё нанова,
І застаўся ад аўтара... толькі след.

### Замкнёнае кола

Ён прыслаў аднойчы вершы,
І такі быў водгук першы:
«Пішаш проста, толькі штосьці
Не хапае прыгажосці».
А пасля перапрацоўкі
Быў адказ адмоўны зноўку:
— Так прыгожа пішаш ты,
Толькі...
мала прастаты.

### Вось дык занятак!

Сустрэў пісьменнік сябра неяк,
І той пытаецца ў яго:
— Ты кім працуеш?
— Я — пісьменнік.
— Ты толькі пішаш?
І ўсяго?

### Паспешлівы разлік

За тры начы паэму напісаў
І трызніў лаўрамі паэта.
У выдавецтва рукапіс паслаў,
Параілі:
— Нясі ў насценгазету.

### ...А тытунь — паасобку

Паэт развёўся з паэтэсай
Пасля ідыліі сумеснай:
— Жыццё такое хай міне!
Хоць жонкаю была нядрэннай,
Ды падсякала мне карэнне,
Бо... крала вобразы ў мяне.

## Ад здачы да выдання

Ён гонар меў, што здаў паэму,
Яна была даволі важкай.
Што ж, здаць, вядома, не праблема,
Ды часта можа быць прамашка.
Здаваў з надзеяй маладою,
А выдаў — сам быў з барадою.

## Прынцып творчасці

Пішы, як маўчаць немагчыма,
І правіла цвёрда трымайся:
Паэзія — нібы жанчына:
Не любіш, дык не займайся.

## Сон паэта

Калі натхнення светлы час міне,
Калі замучыць вечны пошук тэмы,
То часта бачацца паэту ў сне
Урыўкі з ненапісанай паэмы.

## Як вершы пішуцца

Як вершы пішуцца?
                    У тым няма парадку:
З канца, з сярэдзіны,
                    а іншы раз — з пачатку.
Прымальны з гэтых спосабаў любы,
Абы парадак добры ў думках быў.

## Спадзяванні і вынік

Лічылі, калі быў ён малады,
Што здольнасці меў не абы-якія.
Было ў ім зерне таленту тады,
Ды зерне... загубілася ў мякіне.

## Калі лепш пішацца?

— Калі лепш пішацца? —
пытаюць чытачы. —
Узімку, улетку, удзень або ўначы?
Пісаць тады няцяжка, без сумнення,
Калі не трэба пазычаць натхнення.

## «Прабіўны» аўтар

Мае голас вельмі звонкі
І заводзіць ім у зман.
Напісаў адну старонку,
А шуміць... на ўвесь раман.

## Усё наадварот

Ці варта тут многа чакаць ім удач?
Пісьменнік — чытае, а піша — чытач.
Хоць кожнаму можна зрабіць найпрасцей:
Сваёй бы работай займацца часцей.

# ПРА ТЫХ, КАГО Я ПАВАЖАЮ І ЛЮБЛЮ

*(Эпіграмы)*

**Рыгор Барадулін**

Рыгор шаноўны Барадулін —
Пакажа ворагам ён дулі.
Сяброў жа прывітае шчыра —
Ён з імі вечна ў ласцы, міры.
Не пакланяецца нікому,
Бо ён — народны, усім вядомы.

**Хведар Жычка**

Рознабаковы Хведар Жычка:
Адлюстраваць усё — ёсць звычка.
Жыццёва мудры, просты ён,
Яму пісанне — не прыгон.

**Сяргей Законнікаў**

Арыгінальны ён паэт,
Зямля ўся ў думках і Сусвет.
І па сабе пакіне след,
А піша быццам неўпрыкмет.

**Генадзь Бураўкін**

Сур'ёзны, строгі ўвесь свой век,
Паэт, выдатны чалавек!
Мудрэц — і не пацерпіць здзек,
Не апускае ўніз павейк.
Былы міністр — і дыпламат,
А ці ён схлусіць нам? Наўрад!
А сам — адчайны дэмакрат,
Не пойдзе ўбок або назад.

### Алесь Пісьмянкоў

Алесь вядомы Пісьмянкоў
Напіша ўсё без лішніх слоў,
Разважыць, — што і да чаго —
Усё атрымаецца ў яго.

### Рыгор Яўсееў

Рыгор Яўсееў жыта сеяў,
Ён ад прыроды — селянін,
Душой, вядома, — не Ясенін,
А Корбана — як быццам сын.

### Леанід Дайнека

Раманіст, паэт выдатны —
Да ўсяго на свеце здатны,
І разважлівы, разумны,
Ён зусім не лёгкадумны.

### Уладзімір Правасуд

Вядомы лірык і сатырык,
Ты не залёг яшчэ «на дно».
Пісаць не трэба панегірык —
Цябе ўсе ведаюць даўно.
І не цярпі ты шмат пакут —
Паэт,
законнік,
правасуд.

### Георгій Юрчанка

Наш вядомы парадыст —
Цуд-пісьменнік, не артыст.
А калі каго падколе —
Насмяемся ўсе мы ўволю.
На эстрадзе б быць яму.
А навошта? І чаму?

### Віктар Шніп

Хоць і галоўны ён рэдактар,
На аўтараў не прэ, як трактар.
Сам — невысокі, непрыкметны,
А вельмі шчыры — прастата!
Але паэт — ва ўсім адметны,
З ім пагамоніш —
легката!

### Анатоль Зэкаў

Рэдагаваў сталічных дзве газеты,
Адлюстраваў сучаснасці прыкметы.
«Лясной газетай» доўга кіраваў.
А зараз — «Вожык» для сябе абраў.
Што ж, вожык — ён жыве таксама ў лесе...
Застаўся Толя пры сваім жа інтарэсе.

### Міхась Губернатараў

Калісьці добра пачынаў
І нешта ў творчасці спазнаў.
Пасля — нашто, падумаў, мукі?
І стаў ён служкаю навукі.
А поспех, падкажыце, дзе?
Альбо паўсюдна,
ці нідзе.
І важная ёсць акалічнасць:
Не ўсё нам вырашыць практычнасць.

### Кастусь Жук

Жук Кастусь, скажу ўсім, здольны,
У паводзінах жа — вольны.
Піша моцна і спакойна —
Як учора,
так і сёння.
Піша ўдумліва, без мук.

Я казаў —
як бы вязаў:
— Косцік Жук —
сапраўдны жук!
Ён смяяўся, не злаваў.
У Саюзе —
шмат Жукоў,
Не горшы — ён.
З усіх бакоў.

### Уладзімір Гніламёдаў

Уладзімір Гніламёдаў
Не рабіў нікому шкоды.
Ведае літаратуру,
Сам спакойны па натуры.
І разважлівы заўжды,
Крытыкне, дык — «не бяды».

### Алег Лойка

Настаўляў паэтаў многіх,
Паказаў ён ім дарогі.
Сам ласкавы, умеру строгі,
З ім мінеш усе трывогі.

### Анатоль Жалязоўскі

Празаік — часам піша вершы,
Надзейны сябар ён, найлепшы.
Заўжды спакойны і сур'ёзны,
Разважлівы сам і не грозны.
Душэўны вельмі чалавек
І над сабой не церпіць здзек.
І ў радасці, і ў час бяды —
Руку працягне нам заўжды.

### Іван Шамякін

Наш настаўнік, слаўны мэтр,
А раманаў — кіламетр.
І аповесці, эсе —
Пра жыццё народа ўсе.
Пладавіты — слоў няма!
Быццам Аляксандр Дзюма.

### Леанід Галубовіч

Піша добрыя ён вершы —
Не апошні, будзе першы.
Журналіст — пачуццяў вал!
А падпішацца — ЛеГал.
(Добра, што не нелегал).

### Раіса Баравікова

Вясёлая, прыгожая,
Заўсёды маладая.
На ўсё на свеце гожая,
Паэзіяй страляе.

### Уладзімір Паўлаў

Зрабіў, як мог, даволі добрых спраў,
І вёску родную Замошша ўшанаваў,
Паэт, празаік, журналіст яшчэ —
Яго жыццё настойліва цячэ.

Ён ведае, як трэба доўга жыць:
Павесяліцца, ўмеру паляжыць,
Хоць у гадах — курыць з падэшраў дым,
Бяжыць — і дасць парады маладым.

Сур'ёзны і вясёлы — сам бадзёры,
Здаецца, што не будзе век ён хворы,
Бо жоначка яго — амаль лякарка,
Хваробы зніме ўсе надзейна, шпарка.

Такую з маладосці ўзяў — што мара,
За ім глядзіць усё жыццё Тамара.

### Уладзімір Глушакоў

А Валодзя Глушакоў —
Слаўны ён з усіх бакоў...
З рабочых хлопец пачынаў,
Жыццё налёгкае спазнаў.
Быў журналісцкі цяжкі лёс —
Да нам. міністра ён падрос.
Аповесці надрукаваў,
Як чалавек жа — ён не ўпаў.
Рэдакцыяй цяпер кіруе,
Яго жыццё — наўкол віруе.
За што бярэцца — там шчыруе.

### Віктар Гардзей

Паважаны наш Гардзей,
Падаеш нам шмат надзей.
Не адыдзеш ад падзей,
Ну, другі, як ты, — дык дзе?
Папулярны між людзей.
Сам спакойны — не рахманы,
І не церпіш ты падману,
Так паэзіі аддазы!

### Кастусь Цыбульскі

Глядзіць не строга ён, усмешліва,
Спакойна піша, непаспешліва.
На вершы песень шмат напісана,
Яшчэ й паэмы ёсць — і не адна.

Зямелькі слаўнай сын ён Случчыны,
Навек з паэзіяй заручаны.
А служыць зараз у міліцыі,
Ды не паказвае амбіцыі.

### Таіса Бондар

Пісьменніца і журналістка,
І грамадзянка, актывістка,
І пры высокай сёння ўладзе,
Дык будзь з усімі ў згодзе, ладзе.

Каб холдынг лепшы быў на свеце
І здольных творцаў каб прыкмеціў!
І таленты ўсе раскрывай,
Свабоду творчасці давай.

### Уладзімір Ліпскі

Арганізатар ён прыродны
І не разгубіцца нідзе.
Кіруе сам Дзіцячым фондам,
«Вясёлку» доўга ён вядзе.
Фальклор спазнаў з усіх бакоў
І «нарадзіў» жа «Аўцюкоў»!

### Уладзімір Някляеў

Сядзеў у крэслах трох ці чатырох
І вытрымаць ён гэтага не мог.
Магчыма, у гэтым і была бяда ўся,
Пасля — у апазіцыю падаўся.

У эміграцыі цяпер віруе,
За дэмакратыю адчайна ён шчыруе.
Няхай не будзе гэта — паказухай.
Ты чытачоў, народ як след падслухай.

### Леанід Дранько-Майсюк

Даволі кніжак выдаць змог,
Як быў у выдавецтве.
Па фестывалях збіўся з ног,
Бо выступаць імкнецца.

Пасля стагнаў, што не стрываць,
Калі стаў не ва ўладзе:
— Я кветкі буду вартаваць
У батанічным садзе.

## Янусь Малец

Усё жыццё сантэхнік—слесар,
Сваёй прафесіі — прафесар.
Хоць з адукацыяй вышэйшай,
А мае гонар ён найменшы.
Ён піша лірыку, пародыі
І кажа: — Просты я, з народа я.
У «Вожыку» хоць працаваў,
Ды не забыў рабочых спраў.
Круціць мне гайкі — проста звычка,
А напішу — не горш, чым Жычка.

## Анатоль Майсееў

Пісаў аповесці, раманы,
І вершы — быццам без заганы,
Дзіцячых кніжак выдаў дзве —
Аж закружыла ў галаве,

Фантастыка і часам гумар.
«Ну, талент я», — тады падумаў.
Як толькі членам стаў Саюза,
То творчасць стала цяжкім грузам.

«Нашто пісаць і друкавацца?
Мо лепш мне бізнесам заняцца?»
Ну што ж, ты — не адзін такі.
Ёсць дзівакі — не прастакі.

## Рэўнасць

Кожны з іх народным стаў —
Барацьба за п'едэстал.

Бо сатыракі і лірыкі,
І не пішуць панегірыкі —
Каб адзін ды аднаму?!
І вядома ўсім, чаму.

## Літаратура — не халтура

Не меў я званняў і чыноў,
Але пісаў — пішу і зноў.
Нашто мне званні і чыны?
Хвалююць іншых хай яны —
Тых, для каго пісаць — не свята,
Іх — кар'ерыстаў, гарлахватаў.

## Верныя мае сябры

Два СЯРГЕІ — дзень і штонач
Сумнявацца ў іх нашто?
Нам. рэдактара — МІХОВІЧ,
Менеджэр,
паэт — КІШКО.

ІГАР — вопытны канструктар,
Адгукнецца сэрцам хутка.
Хімік Леанід Шуваеў
Нашу дружбу вечна славіў.

А яшчэ — ТАІСА ДОЎНАР,
Што — прафесар БДУ.
І сястра, яна — мой гонар,
Зніме сум, бяду, нуду.

Фізік Юра — ён вучоны,
Што са славай заручоны.
І Лявон прытым Казлоў —
Лепшы з МТЗ з сяброў.

Бандарэнка шчэ Валодзя —
Радыёлаг, з намі ў згодзе.

А Ільіч — руля артыст,
Лепшы аўтамабіліст!

## Эпітафія
## *(На будучае — пра сябе)*

«Каля мяне спыніся, мой чытач,
Ды весела ўсміхніся — не заплач.
Нябожчык сам заўжды вясёлым быў,
І сумаваць ніколі не любіў».

### Макарцоў Мікалай

А Мікола Макарцоў —
Самы лепшы між хлапцоў.
Ён — вядомы рэжысёр,
Вельмі здольны і акцёр.
Да таго ж, скажу, сябрук —
Адчуваю поціск рук.





## Надзея Мікуліч

Ну, як Надзя заспявае,
Хто ж уцерпіць і стрывае?
Падымае ўсіх мужчын,
Хто ж спакойны?
Ні адзін!



## Іваноў Валеры

А Валеры Іваноў
Песняй радуе нас зноў.
І ў буйным ён жанры здатны —
Кампазітар наш выдатны.
На канцэртах ён — герой.
За яго мы ўсе — гарой!

## Алег Чыркун

Баяніст ён і спявак,
Просты, толькі не працяк.
Кампазітар папулярны —
Ліры працаўнік ударны.

### Міхась Галкоўскі

Тэнар слаўны наш Галкоўскі —
Чалавек выдатны, свойскі,
Лепшы оперны спявак,
Цягне арыі — вось так!
І разумнік —
не прастак.

### Уладзімір Буднік

У Валодзі талент ёсць,
Ён усюды — добры госць.
Сам — задзірысты, бадзёры,
Энергічны, век — не хворы.
Кампазітар — вышыня!
І працуе — ноч да дня.

### Пятрусь Радзеня

На эстрадзе шмат гадоў
І рабіць усё гатоў:
Сам — чытальнік і спявак,
І надзейны ён дружбак.
Ды магутны, быццам волат,
Да мастацтва век прыколат.

## Аўтаэпіграма

Сабе я ставіць помнік — не хачу,
І пра сябе — нікому не крычу.
І не пачуеце ніколі мой вы плач.
Ацэніць — крытык.
А найлепш — чытач!

## Паэту маладому, рыжаватаму і лысаватаму ды барадатаму

Сустракаліся раней,
Часта — і «пад газам».
І пра творчасць мы смялей
Гаманілі разам.

На пасадзе творчай стаў,
І прытым — начальнік,
Дык ужо не пазнаваў —
Закіпіш, як чайнік.

— Тое, гэта — напрасцяк,
Напісаў ты слаба.
— Я ж цябе вучыў, слабак,
Ганарысты ты, бядак,
Сам —
лепш напісаў бы!

А з пасады як зляціш —
Станеш ціхім ты, як мыш.
Дык пакуль яшчэ ва ўладзе —
Добра б з творцамі паладзіў.

## Пра парадыста

Пародыя ў радкі
Ці два, ці мо ў чатыры...
Але памер такі
Мне цесны, скажам шчыра.

У чатырох радках
Не вельмі многа скажаш,
У іх не той размах
І аўтара не спляжыш.

І думаюць дарма,
Што тут радкоў — замнога,

Калі шчэ ў іх няма
Ад аўтара нічога.

Я разлічуся з ім,
Яму ўсё ж дастанецца.
А ганарар, між тым,
Нам за радкі даецца.

## Скарацціў... сам сябе

Пісаў на дзіва доўга перш,
За што крытыкавалі.
Ён скарачаць стаў кожны верш —
Яго ўжо друкавалі.

Найкарацей! І прынцып той
Стаў рысаю натуры.
Не браўся болей ні за што,
Пісаў мініяцюры.

Пасля стаў падыход такі
Законам для паэта.
Ён піша вершы ў два радкі —
Ну што ж, няблага й гэта.

Тады пайшоў яшчэ далей:
Пісаў ён загаловак,
Ды хоць бы што яшчэ, але...
Шматкроп'е — і ні слова.

Нашто, падумаў ён затым,
Пакуты, пераробкі?
Шчэ скарацціўся. Скончыў тым,
Што піша толькі... кропкі.

## Настальгія

Паэт Іваноў выдаў зборнік даўно
І новы рыхтуе напружана.
У ім настальгіі адценне відно,
Што ў вёсцы яму жыць не суджана.

Празаік Пятроў цэлы том выдае,
Але тут свае мае беды ён:
Па вёсцы аж стогне, што з'ехаў з яе,
Дзе чэрпаць натхненне — не ведае.

Дык едзь жа ты ў вёску, каб шчасце мець зноў,
Напіцца вадзіцы крынічнае
І сілу адчуць ад таго, што дамоў
Вярнуўся да працы прывычнае.

Чакаюць там школы, палі і лугі,
Чакаюць газеты раённыя.
Чаму ж не паедзе ні той, ні другі,
Не здзейсняць жаданні законныя?

З'явіліся б добры настрой і спакой,
Забыўся б даўно, тое гора дзе.
Ды толькі баіцца: ад змены такой
Заесць настальгія... па горадзе.

## Мая творчая радня

Мой бацька —
Эдуард ВАЛАСЕВІЧ.
Мой дзед —
Кандрат КРАПІВА.
Мой пра-пра-дзед —
Іван Андрэевіч КРЫЛОЎ.

Задуменна, без пустых і лішніх слоў
Перачытваю заўжды іх зноў і зноў,
І ўсур'ёз,

а то — смяюся аж да слёз.

Хай бы я —

да іх хоць трошачкі падрос!

## Першая любоў

Было ў жыцці маім нямала прозы.

Каго і што любіць так буду я?

Паэзія —

мая любоў і слёзы,

Адзіная

каханая

мая.



# Дача, дача — вось няўдача!

*(сатырычная паэма)*

Надакучыла басцяцца,
Дарагія і харчы.
Захацеў за дачу ўзяцца —
Крызіс свой перамагчы.

Інжынер сказаў знаёмы:
— Ты, мой сябар, мне павер,
Што я ўсё павінен дома
Мецъ, калі я — інжынер.

Не хачу я дачы сёння,
Хоць інфляцыя грызе.
Ходзіць дачнік твой, як сонны,
І працуе ў баразне.

У мяне свая ёсць ноша:
Думак рой, пяро скрыпіць.
Мне хапіць павінна грошай,
Каб я мог усё купіць.

...Што ж, мой сябар думку мае,
Ён, магчыма, і правы.
Ну а я свой курс трымаю,
Раз на дачу ёсць правы.

Мне далі пятнаццаць сотак —
Не лянуйся, а працуй.
Можна цэлы мецъ маёнтак —
Засявай, збірай і жуй.

Ды нялёгкая ўсё ж справа —
Электрычкі не відаць.
Дык бяжыць аўтобус жвава
Кіламетраў сорак пяць.

Мой участак скрозь тарфяны —
Вельмі лёганька капаць.
І не трэба гной паганы
Там гадоў, напэўна, пяць.

Адшукаў, прыгнаў я трактар —
Трэба ж пырнік заараць.
А пасля і культыватар
Стаў бур'ян той выдзіраць.

Вось засеяў я паўполя —
Усё, што мог, там пасадзіў.
І зрабіць не здолеў болей,
Ураджай чакаў наўздзіў.

Мой участак ля канавы —
Быццам добра, ёсць вада.
Толькі схілы злева, справа,
Зверху шчэ — адна бяда.

Я падняў сцёк у канаву,
Нанасіў яшчэ зямлі,
Каб прыродныя праявы
Змыць зямлю там не змаглі.

Ды надзея не збылася,
Не адбыўся светлы рай,
Бо зусім стаіць вада ўся,
Вымакае і ўраджай.

І ўзяла сваё стыхія,
Бо прарваў мой сцёк паток.
Торф змывае, гліну мые,
Застаецца што? Пясок.

Падлічыў я страты груба,
Простым росчыркам пяра:
Пасадзіў мяхі два бульбы,
А сабраў жа — паўвядра.

У стручку — зярно фасолі,
А рэдыс пайшоў у ствол.
Памідор мой рос паволі,
Агурок упаў на дол.

Памідораў — дзесяць недзе
Я сабраў — што да пары.
Лепшыя ж — знялі суседзі,
«Дбайныя» гаспадары.

Мой гурок і не падняўся,
Гэтак, як і буракі.
Не дала пладоў зямля ўся,
Лёс быў дачніка такі.

Лёс няўдалы і суровы,
Зразумеў пасля я ўжо.
А капусту ўсю каровы
Пазгрызалі, як нажом.

Зарасло маё ўсё поле —
Не пасевы, а падман.
Хоць нярэдка жонка поле,
Падымаецца бур'ян.

А культурныя расліны
Мы акучвалі не раз.
Пладаносіць бы павінны,
А раслі ледзь-ледзь у нас.

Ставіць там хацеў хаціну,
Гаспадаркі дробнай штаб.
У тарфяніку б загінуў,
Бо халупа паплыла б.

Памяняць хацеў участак,
Шмат разоў аб тым прасіў —
Прапаноўвалі мне часта,
Ды не лепшае зусім.

Ці такое ж вось балота,
Ці каменную зямлю.
Вымакае, сохне потым
Ці не ўбіцца. Што зраблю?

Транспарт — цяжкасці такія,
Што падумаць нават — страх:
На вакзале нас пакіне.
Браць білет — ну проста жах.

А паездка дык падзея:
Добра, што хоць завязе.
І ніколі не сядзеў я,
На адной стаяў назе.

Бо аўтобус той маленькі,
Як найменшы гарадскі.
І людзей улезе жменька —
Дзеці, дачнікі, бацькі.

Шлях назад — і зноў не сесці,
А прыватнік не бярэ.
А як вырашыць падвезці,
То тры скуры ён здзярэ.

Тут нам не да адпачынку,
Так цярпеў не я адзін,
Прастаяўшы на прыпынку
Тры, чатыры, пяць гадзін.

Шмат было сумненняў потым,
А падумаю ўначы —
Прабівае раптам потам.
Як ад жаху ўцячы?

А кабета мне скзала:
— Так шкадую я мужчын!
Ды ўсяго ім, бачыш, мала,
Так і гінуць без прычын.

Бо на дачах паміраюць,
Там прыходзяць ім канцы.
А пасля ўсё забіраюць
Новыя мужы — удаўцы...

Можна здохнуць ад работы,
Лаемся цішком і ўслых,
Бо няма ад той турботы
Выхадных і прахадных.

Можа, дача тых мацуе,
Дзе магутная сям'я.
А ў мяне — то хто працуе?
Толькі жоначка — і я.

І расходаў вельмі многа
Не хацелася мець мне б:
Дрэўцы, пляшкі і дарога,
Хатку стаў, рабі і склеп.

І не маю я машыны,
Так прыцісне — хоць крычы.
Ураджай жа з той прычыны
Хоць на спіне валачы.

Што не вырасла нічога —
Гэта можна святкаваць.
А каб вырасла, ды многа —
Як прывезці, захаваць?

Як няма ці ёсць, ды мала —
У кватэры пакладу.
Ну а так — няма падвала,
Без яго я прападу.

...Проста вырашыў задачы:
Над сабой навошта здзек?
І адмовіўся ад дачы —
Зноў я вольны чалавек!

Не найлепшае ўсё ж выйсце,
Каб ад радасці скакаць.
Што ад голаду карысці?
Вось пачну апілкі грызці —
Дошкі буду выпускаць.




## Пакуты бывалага літаратара

*(Сатырычная паэма)*

Пісаць даўно я налаўчыўся,
Каб думкі перадаць магчы.
Заўжды ў старэйшых я вучыўся
І маладзейшых сам вучыў.

Нарэшце з друку выйшла кніжка,
І спаў з душы нялёгкі груз.
Мне раілі без перадышкі
Адразу ціснуць у Саюз.

Ды сціпласць вось была такая —
Заела, хоць не варта «спаць».
Другую кніжку прычакаю —
З дзвюма надзейней уступаць.

Рэкамендацыі ў тым часе
Хто захацеў — давалі мне.
І першую — на радасць — класік,
За што тады я гонар меў.

А чалавек — цудоўны, шчыры,
Прасіў яго я — не сакрэт,
Бо ён — мой бацька па сатыры,
У літаратуры ён — мой дзед.

А там раздумалі: — Глядзі ты,
Падскочыў вышай галавы.
Эге, ды ён занадта спрытны,
Нашто палез да Крапівы?

Другі быў парадыст вядомы,
Рэкамендацыю мне даў.
— Ты загубіў сябе свядома! —
Пасля таварыш прыгадаў.

— Сябе падсек пад корань чыста,
Запамятай на іншы раз.
А дзе хто любіць парадыстаў?
Ды ён усіх аблаяў нас!

Стары паэт славуты — трэці,
Хто падтрымаў мяне тады.
Сказалі мне: — Май на прыкмеце,
Хто варагуе з кім заўжды.

Вось гэты з тым даўно не ладзіць,
Той — у камісіі даўно.
Дык ён табе й яму падгадзіць,
Абое ляжаце на дно...

Не прабіваўся я што сілы,
А друкаваўся — вось і ўсё.
Мяне тады і «пракацілі» —
Мне не хапіла галасоў.

Пісаў і часта друкаваўся,
Ды мэта не была бліжэй.
Але чым больш я выпкскаўся,
Тым уступаць было цяжэй.

Так хоць і кінь тут па баку ўсё,
Для іншых гэта — проста здзек.
Хоць лоб разбі — пішы, друкуйся,
Але не ўступіш ты павек.

Вось так жыву па-за Саюзам
І не сумую вельмі я.
Ды, хоць служу аддана Музам,
Цяжэй бывае мне ўдвая.

Той піша гладзенька і проста,
Але яму адкрыты свет,
Бо ён вышэйшы — і не ростам,
Бо мае членскі ён білет.

Вось выступім — ён гонар мае:
Чытаў слабенькае, але
Затое болей атрымае,
Таму што — член, а я — не член.

А класік мне сказаў лагодна:
— Ісці нялёгка па жыцці.
Шмат кніжак — гэта ўжо не модна,
Без кніжак шмат лягчэй прайсці.

Пасля падборкі больш-менш ладнай
Ці калектыўны зборнік ёсць —
Глядзяць часцей за ўсё спагадна
І важкае заўважаць штось.

Лягчэй за ўсё прабіцца «шэрым»
І безаблічным лаўкачам.
Не будзь жа баявым без меры,
І не друкуйся часта сам.

А здольных часта і не любяць,
Бо шмат каму ты — канкурэнт.
Зайздроснікі цябе загубяць
І знішчаць, разаб'юць ушчэнт.

А «шэрыя» не скажуць гучна,
Яны, дзе трэба, там лізнуць.
Іх падтрымаць заўсёды зручна,
Іх вастраслоўя не пачуць.

Сатырык жа трымае марку,
Ды фокус выкіне — ого!
Мо на каго калісь ты гаўкаў
Ці, можа, гаўкнеш на каго.

Рэкамендацыі ў «вялікіх»
Ты лепш ніколі не бяры.
Прасі ў «сярэдніх» і бязлікіх,
Каб сам не грымнуўся з гары.

Ствары сабе ты лепей лобі —
Цябе ілбамі хай праб'юць.
Для іх жа гэта — проста хобі,
Для іх — што чарку каўтануць.

...Між тым хачу сказаць вам шчыра —
Даўно я ўпэўнен, балазе:
Не той конь — гумар і сатыра,
Што да Парнаса давязе.

Літаратурных бюракратаў
Ніяк не мог я абысці.
Мо буду год праз сто прыняты,
Аднак жа лепей —
пры жыцці.

*1990 год*

# Наша «Іслач» — родны дом

## *(Іранічная паэма на калялітаратурныя тэмы)*

Водпуск — радасная з'ява.
Трэба весці ўлік грашам.
Часу нашага праява —
На курорт не з'ездзіць нам.

Так сціскае рэчаіснасць —
Эканоміць праз гады.
Дык дом творчасці ёсць «Іслач» —
Нас прытуліць ён заўжды.

Гаспадар там — Жалязоўскі,
І Лысуха — гаспадар.
А працуюць па-геройску,
Каб быў дом, як божы дар.

Ціхаплынная рачулка
Агінае мудры лес.
У пакоях спаць не мулка,
А спакой знімае стрэс.

Мы — сябры, заўсёды ў згодзе,
Літаратары ў гурме.
Адпачынак свой праводзім
У нясумнай гамане.

Паўлаў — мудры і паважны,
Ды між тым у дошку свой.
Не сказаць, што вельмі важны,
Проста — хлопец з галавой.

Ён тэорыю такую
Смела так прапанаваў:
— Памяркоўна я мяркую:
Не загніцеся ад спраў.

Дні са тры — за чарку ўзяцца,
Так, каб носам не дзяўбаць.
Адпачыць затым, узняцца
І пра творчасць рупна дбаць.

Гэтак зніміце напругу,
Што было са мной не раз.
І працуйце без натугі,
Водпуск — гэта вольны час.

Сам гульбу кідае першы —
Ці праз тры, ці болей дзён.
А пасля кляпае вершы,
Карэктуры правіць ён.

Старшыня Васіль Зуёнак
Не спускае Ваську з рук.
Хоць даўно малы с з пялёнак,
Што ты зробіш — родны ўнук.

У сталоўку ходзяць разам,
Паасобку ж — не з рукі.
Як паснедаюць — адразу
У лес шыбуць грыбнікі.

Што хацелася б зазначыць,
Васька больш збярэ, чым дзед.
Бо маленькі, лепш убачыць,
Не паспее дзед услед.

І Нічыпар тут Пашкевіч
Па пуцёўцы сярод нас.
Ходзіць справа, ходзіць злева
Ды па-свойму бавіць час.

І шчыруе ён бясконца.
Не пасціць — бяжыць у лес.
Хоць яшчэ не ўстала сонца —
У гушчар ужо залез.

Кілаграмамі цягае
Найсмачнейшыя грыбы.
Ад таго здабытак мае —
Эканомія нібы.

Надыходзіць сіні ранак,
І прачнецца толькі свет —
Ён забыўся на сняданак
І забыўся на абед.

А пасля, як можа, цягне,
Тых грыбоў мяшок у Менск.
Не багацця ж, пэўна, прагне —
Гаспадарка мае сэнс.

Ды замучыла нудота
Ад напружання таго.
Неяк трапіў у балота —
Ледзьве выбраўся з яго.

Макарэвіч Вася з намі,
Ды забыўся, як назло:
— Будзьце мне, браткі, сябрамі!
Сёння дзень які, чысло?

Хто казаў, што ён працуе,
Хто сцвярджаў, што п'е каньяк.
— Не, здароўе, бач, мацуе,
Проста — піша многа так.

Як апоўнач, так апоўдзень
З рук не выпусціць пяра.
У пакой яго як зойдзеш —
На стале папер гара.

Доўга думалі і ўсе мы,
Чым заняўся ён, васпан.
Можа, узяўся за паэму
Ці шкрабе сабе раман.

Над радком упарта б'ецца,
І чыя ж у тым віна?
Мо ад працы хістанецца,
А магчыма, ад віна.

І ў абед на гэтай пашы,
Як ніколі і нідзе
Акадэмік з ім Івашын
Шчыра гутарку вядзе.

А Івашын — ён не першы,
Не апошні, як відно.
Кашу есць і піша вершы,
І ўспаміны заадно.

Хваліцца прытым, як другу,
Што пяро ў яго — не лом.
Можа, выдасць саматугам
З лепшых твораў першы том.

П'юць гарбату, цэдзяць каву —
Маладзей за маладых.
Падружыліся на славу —
Не разліць вадою іх.

А Скарынкін без дакукі
Усім пускае ў вочы дым.
На дзяўчат паклаўшы рукі,
Нешта ціха шэпча ім.

Не адмовіцца ад зелля,
Бы яму — усюды дом.
Нават трапіў на вяселле —
Стаў амаль гаспадаром.

Браніслаў Спрынчан — вясёлы,
Хоць і чарку не бярэ.
Толькі ўсё ж даволі кволы,
Кажа: — Чарка рот дзярэ!

Ён у вершах досыць хвацкі,
Лінія ў яго адна.
На вясёлыя заняткі
Не спакусім Спрынчана.

А затое любіць есці —
Налівае суп гарой.
Гушча ўверх прэ — не пранесці —
Ёсць тады ў яго настрой.

Вось Грахоўскі, ён — старэча,
Восемдзесят два гады.
Кажа ўсё, аднак, дарэчы,
І пры памяці заўжды.

Так бы нам усім трымацца,
Гнаць хваробы са двара.
Не самлеў ад доўгай працы,
Помніць Леніна, цара.

І расповяд на гадзіны
З маладзейшымі вядзе.
Слухаць мы яго павінны,
Што было, і як, і дзе.

Не па звестках і анкетах —
Сам раскажа нам ужо,
На якіх бываў банкетах
На Радзіме, за мяжой.

А нарады і паездкі
Не мінуў ніяк, нідзе.
Чалавек магутны гэткі,
Ведаў слаўных шмат людзей.

Крытык жа Іван Кудраўцаў —
Чалавек — ні даць, ні ўзяць.
Картаў ён вялікі знаўца,
Цяжка майстра абгуляць.

Не адцягнеш і за вушы:
Карты — лепей за віно.
Козыр сёння — непітушчы,
Кінуў Бахуса даўно.

Аж свярбіць гуляць у карты,
Прагне вечна аднаго.
Ды няма, бадай што, вартых
Для кампаніі яго.

Мо Нічыпару праставіць,
У гульню каб уцягнуць?
Толькі той не гне паставы,
Кажа: — Гэта — каламуць!

— Можа, скажаш, не гуляў ты?
— Я гуляў да трыццаці.
— Ты такі гультаяваты?
— Сам у карты малаці!

Да мяне ішоў, нарэшце,
Гвалціў часам на гульню.
Дурняў дваццаць даў мне дзесьці,
Дзесяць — я вярнуў яму.

У дыскусіях штодня ўсё
Карпыловіч тут Іван.
Так палітыкай заняўся:
Што ёсць праўда, што — падман.

З Паўлавым шмат мае спрэчак,
Не згаджаецца ніяк.
Хоць дарэчы, недарэчы,
Нагаворыцца ж усмак.

Сам я ставіўся з любоўю
Да грыбных ды іншых спраў.
Ды мяне ж у лес з сабою
З сябрукоў ніхто не браў.

Можа, думалі, што лесу
Там не хопіць нам на ўсіх.
На руках, на словах, неслі,
Не адпрэчваліся ўслых.

Ну а ўранку ўсе ўцякалі,
Я ж адзін у лес ішоў.
Можа, болей нахапалі?
Не, свае я ўсе знайшоў.

Павяла з сабой дзяўчына —
Думаў, поспех будзе ў нас.
Толькі збегла без прычыны,
І блудзіў я доўгі час.

Быць нядобра мяккацелым.
Як даверыўся я ёй?
Спакусіць, няйнакш, хацела,
Ды падвёў мяне спакой.

Выбягалі зранку з дому
Грыбнікі на ўсе бакі.
Браць стараліся, вядома,
Лепш за ўсё — баравікі.

Спадзяваліся дарэмна,
Што пусты мой будзе кош.
Я шукаў грыбы нядрэнна
І збіраў заўсёды больш.

Кожны з іх участкі лесу
Ведаў добра і даўно.
Без разбору лесу лез я —
Дзе грыбоў і не відно.

Ды паказвалі мне шапкі
І ўставалі на ўвесь рост,
Быццам Ванькі і Агапкі, —
Адчувае іх мой нос...

Хто з сабою ўзяў запасы —
Увечары не сумаваў.
Час не ціснуў цяжкім прасам,
Адпачнем ад важных спраў!

І сяброўскіх шмат гамонак
Там цякло, нібы рака, —
Пра паэзію і жонак —
Зразумееш дружбака.

Гаспадарчы двор прыцягваў,
Мы туды йшлі без прынук,
Бо як хто хацеў працягу —
Рэстаранчык быў «Тук-тук».

Ён усе працуе суткі,
Той маленькі магазін.
Абслугоўвае нас хутка,
Хоць работнік быў адзін.

Ды на траціл рублёвак
На пакупкі ўсе дзяды.
Ні гарэлкі, ні настоек,
Ні напояў, ні вады.

І казалі: — Грошай мала.
Дзеці, унукі смокчуць з нас.
Прапануеш, дык стагналі:
— Лясне пенсія ўся ўраз!..

Што ж, без шуму і без трэску
Я ўкладу ва ўсё душу.
Байку склаў і гумарэску,
Фельетон шчэ напішу.

...Так мы тут адпачываем,
І працуем, і жывём.
Пульс няблага адчуваем,
Здаравеем з кожным днём.

Дом наш па павевах часу
І ў арэнду аддаём.
А падумаеш сам-насам:
Як інакш мы пражывём?
***
Наша « Іслач» — родны дом!

*1995 год*



## Пра аўтара «Лысай гары»

Падпольная паэма нашумела
У свой час, нібы пранесся землятрус.
Ды аўтар — дзёрзкі, а такі нясмелы —
За псеўданім схаваўся, нібы трус.

Мастацкага там не было нічога —
Абразы, плёткі, трохі дробных з'яў.
Разварушыў бялізны бруднай многа —
Не варты тых, каго ён прасмяяў.

Не адкрываў жа баязліва твару —
Не падалі б яму калегі рук.
Адмовіўся вось і ад ганарару,
Калі пайшла паэма ўрэшце ў друк.

А колькі вечароў, начэй з бутэлькай —
Сардэчнаю сяброўкай гаманіў.
Мазгі туманіў мутнаю гарэлкай
Або «чарнілам» — і духоўна гніў.

Магчыма, што пілі ўсёй капэлай —
Ці трое, ці пяцёра тыдзень-два.
Пляткарылі пра нас усіх умела,
Што ўздумае дурная галава...

Аднак жа можна трохі здагадацца,
Хто на ўсіх памыі жорстка ліў,
Калі ў паэму ўважліва ўчытацца —
Які сябе найболей пахваліў.

Баіцца канкурэнцыі, сабака,
І прыкра напісаў, як толькі мог,
Каб хто перажываў і аж заплакаў,
Дык на сатырыкаў, як конь, налёг.

І лірыку таксама не шануе —
Абгадзіў, безумоўна, шмат каго.
А што, нарэшце, сам ён прапануе?
Каб вельмі паважалі ўсе яго.

Чаму ж не хоча аўтар той прызнацца,
Як бы кавалак мыла праглынуў?
Бо пачалі б услед усе пляваццa,
І ён бы ў гэтай сліне патануў.

Пісаў — як не дарэмна і дарэмна!
Яго і злосць тут, і адчай бярэ.
Яму самому прыкра, непрыемна —
Бясслаўна ў невядомасці памрэ.

А мог бы нейкім чынам ганарыцца:
Маўляў, глядзіце — вось я, ваш герой.
Хапіла мужнасці ў мяне раскрыцца,
І стойце за мяне цяпер гарой...

Няўжо баіцца й зараз так расправы?
Мінуў жа тэрмін даўнасці даўно.
Дурной сабе дадаў бы крыху славы,
А не прызнаецца, дык сам — . . . . .

*1990 г.*

**Калі мы былі маладымі —**
**Як бы плылі ў салодкім дыме**



**А вось калі ўжо пасталелі —**
**душой зусім не пастарэлі...**



**Рэспубліканская творчая парада**

# МЯРКУЙЦЕ САМІ — ШТО ЯК ЁСЦЬ

*Сатырычная проза*



# Як падвёў аўтарытэт

Працуе Іван Пятровіч кіраўніком установы. Праўда, не вельмі вялікай, але не такой ужо і малой. І тут на самым першым месцы павінен быць аўтарытэт. А дзе яго ўзяць? Як стварыць сабе той аўтарытэт? Хваліць самога сябе было б неразумна і нават прымітыўна. Іван Пятровіч знайшоў іншы шлях: не дазваляў нікому крытыкаваць яго. Толькі хто раскрые рот, каб выказаць незадавальненне парадкамі ва ўстанове, як Іван Пятровіч хуценька прыпомніць які-небудзь грашок у супрацоўніка ды зробіць яму належную вывалачку. Таму пасля ўжо не да крытыкі.

Але, як кажуць, да пары жбан ваду носіць. «Раскусілі» гэтую тактыку ў калектыве. Праз нейкі час выклікаюць Івана Пятровіча на пасяджэнне мясцовага камітэта прафсаюза і гэтак сурова кажуць:

— Надта вы з падначаленымі крута. Крытыка для вас як хіна для хворага. Трэба трошкі прытармазіць, успомніць часам і пра самакрытыку. Усе мы ходзім па зямлі, усе маем свае недахопы. Так што ўлічыце, калі хочаце працаваць з калектывам.

Выйшаў Іван Пятровіч як з лазні. Далі дыхту. Нічога не зробіш, патрэбна лічыцца з людзьмі. Патрабуюць самакрытыкі — што ж, калі ласка! Я так сам сябе раскрытыкую, што іншым не захочацца.

А тут неўзабаве адбыўся справаздачны сход па выніках работы за квартал. Вось дзе было шырокае поле для самакрытыкі, Іван Пятровіч скарыстаў гэты зручны выпадак і, як кажуць, выклікаў агонь на сябе.

— Шаноўныя спадары! — пачаў ён. — Усе вы ведаеце, што наша ўстанова працавала ўвогуле няблага, але да перадавых нам яшчэ далёка, як зямлі да неба. Так, мы не выканалі некаторыя вытворчыя паказчыкі, і тут толькі мая віна. Былі парушэнні працоўнай дысцыпліны, і тут вінаваты толькі я, бо хто ж павінен сачыць за парадкам, як не кіраўнік? Нізкі працэнт работнікаў ахоплены падпіскай на газеты і часопісы. І ў гэтым я не паказаў прыкладу, выпісаў толькі адну газету. Сёлета некалькі работнікаў

справілі наваселле, а я нават не пабыў у гасцях, не пацікавіўся, як яны жывуць. Так што, я лічу, ганьба мне як кіраўніку і чалавеку, мне сорамна перад вамі, такім цудоўным калектывам!

Ён крытыкаваў сябе, а сам цікаваў за прысутнымі. Уражанне было такое, якога ён і чакаў, і шмат мацнейшае. А вахцёрка цётка Мар'я нават выцерла павільгатнелыя вочы ражком насоўкі. І калі Іван Пятровіч яшчэ больш пачаў вінаваціць сябе, усе ўсталі і дружна сказалі:

— Што вы, Іван Пятровіч! Вы такі дбайны і чулы! Гэта мы недагледзелі, недапрацавалі. Нам прыемна і лёгка працаваць пад вашым чулым кіраўніцтвам. А недахопы мы ліквідуем самі.

Пасля гэтага сходу аўтарытэт Івана Пятровіча прыкметна ўзрос. Яго ўжо не баяліся крытыкаваць, толькі ён на гэта рэагаваў па-свойму. Вось аднойчы планавік Стрэмка не згадзіўся з нейкім загадам і недвухсэнсоўна выказаў гэта.

— Вы згодны з крытыкай? — запытаўся ён у начальніка. — Правільна я кажу?

Але ў Івана Пятровіча было сваё ў галаве.

— Кіньце вы гэтыя штучкі, Стрэмка, — строга сказаў ён. — Мне вядома, чаму вы мяне крытыкуеце: бо хочаце дапамагчы мне крытыкай. Але ўлічыце, што я страшэнна не люблю падхалімаў. Так што давайце не будзем!

А вось бухгалтар Лісічкіна заўжды аж млела перад начальнікам і гэтак меладычна шчабятала:

— Як добра вы гэта сказалі!.. Якое правільнае рашэнне!.. Якая правільная думка ў гэтай пастанове!.. Які ў вас цудоўны характар!..

А Стрэмка — той аднойчы не вытрымаў і са злосцю сказаў:

— Вось падхалімка! Бач, як сцелецца перад начальствам.

Пры выпадку начальнік рашуча спыніў яго:

— Вы памыляецеся, Стрэмка. Проста Лісічкіна заўсёды гаворыць праўду. А я люблю, калі праўду-матку рэжуць у вочы.

Але да чаго ж уедлівы гэты планавік Стрэмка! Як бы ад яго пазбавіцца? На шчасце, той знайшоў іншую работу,

а Іван Пятровіч і не пярэчыў: хуценька падпісаў яму заяву і пажадаў вялікіх поспехаў на новым месцы. І як у ваду глядзеў.

Недзе праз год выклікаюць Івана Пятровіча на нараду да начальніка ўпраўлення. Глядзіць ён і вачам сваім не верыць: у кабінет заходзіць яго былы планавік Стрэмка і сядае за галоўны стол. І хто б мог падумаць! Івана Пятровіча аж у пот кінула. Але выступіў. Пахваліў тых, хто бліжэй да яго, папікнуў другіх — хто іншы раз спрачаецца. А начальнік упраўлення пасля і кажа яму:

— А вы ўсё такі ж, Іван Пятровіч, любіце праўду-матку, не церпіце падхалімаў... І энергіі ў вас хоць адбаўляй, толькі выкарыстаць яе трэба з толкам. Дарэчы, і месца для вас вызвалілася адпаведнае — загадчыка гаспадаркі. Можа, карысці большай ад вас там не будзе, але і шкоды не наробіце. І на аўтарытэт ваш ніхто не замахнецца.

«Вось табе і на, — падумаў Іван Пятровіч, калі прыступаў да новай работы. — Аўтарытэт падвёў».



## Блыха

Жыў Ігнат Жабоцька ў раённым цэнтры, а працаваў загадчыкам прадуктовага магазіна. І такі ж быў шэльма гэты Жабоцька! То муку не таго сорту падсуне, то рыбу не па той цане прадасць. А калі што — ярлыкі, маўляў, пераблытаны. Да таго ж быў вельмі грубы: якую-небудзь бабульку брыдкім словам адлае, падлеткаў смаркачамі аб-

заве. Спрабавалі скардзіцца — не дапамагло: відаць, недзе ў Жабоцькі свая рука была сярод раённага гандлёвага начальства.

Аднойчы на радыё атрымалі заяўку, у якой гаварылася: «У нашым райцэнтры жыве ўсімі паважаны чалавек Ігнат Жабоцька. Ён працуе загадчыкам магазіна. Сам сціплы, чулы, уважлівы да людзей. Прыемна зайсці ў магазін не толькі каб купіць што-небудзь, але проста ўбачыць загадчыка і пагаманіць з ім па шчырасці...»

Далей аўтары пісьма (прозвішчы іх не называліся, проста — жыхары райцэнтра) прасілі перадаць для Ігаата Жабоцькі раманс «Блыха». Заяўка была выканана, хоць шмат хто быў вельмі здзіўлены:

— Гэта ж трэба, так размалёваць Жабоцьку! Скулу яму ў бок, а не песню.

Аднак ва ўсім гэтым відаць была пэўная сістэма. Заяўкі на радыё ішлі штомесяц, і іх акуратна выконвалі. Прытым заяўкі былі заўсёды аднолькавыя: выканаць для выдатнага чалавека Ігната Жабоцькі раманс «Блыха».

І вось у час чарговага канцэрта Жабоцька сядзеў дома і піў каву. І тут зноў пачалі выконваць заяўку для яго. Спявак зацягнуў:

— Для сябра дарагога
Найлепшы сшый каптан...

Жабоцьку зрабілася спачатку нядобра, потым зусім дрэнна. Неяк млосна стала. А спявак смяяўся, рагатаў, аж заходзіўся са смеху:

— Блыха-ха-ха,
Блыха-ха-ха,
Блыха-ха-ха-ха-ха!

Не даслухаўшы, Ігнат выключыў радыё і вылецеў на вуліцу. Калі праходзіў міма суседзяў, якія стаялі купкай збоку, то пачуў, як адзін з'едліва сказаў:

— Гляньце, вунь Блыха пайшоў.

— Паскакаў, — паправіў другі.

Ігнат пакрочыў шпарчэй, але тут насустрач выйшаў прыяцель:

— Здароў, Блыха! — працягнуў ён рукі для абдымкаў.

— Ідзі прэч! — агрызнуўся Ігнат, а сам стомлена асунуўся на бліжэйшую лаўку.

З яго было даволі.

У хуткім часе яго не стала ў райцэнтры. Відаць, некуды з'ехаў. Але і зараз, калі па радыё перадаюць раманс «Блыха», многія з усмешкай успамінаюць Ігната Жабоцьку.



# Эскалацыя грубасці

Майстар Іванюк з механічнага цэха пайшоў на склад забеспячэння атрымліваць метал. Загадчыцай склада была жанчына сярэдніх гадоў Ніна Званецкая. Прозвішча яе адпавядала характару: голас быў моцны, гучны, звінеў, як званы. А характар — не дай бог нікому. Ці то паклала свой адбітак спецыфіка прафесіі, ці нарадзілася яна ў зімовую віхуру. Але ведаў Іванюк, што ёй палец у рот не кладзі, бо можа адкусіць усю руку. А пры выпадку і брыдкімі словамі пакрые.

Ведаючы гэта, майстар яшчэ здалёк ветліва прывітаўся:

—Дзень добры, Ніна Язэпаўна!

— Ну, чаго прысунуўся? — не падымаючы вачэй, буркнула Званецкая.

— Патрэбен гатунковы метал.

— Усім патрэбен, не аднаму табе, — гыркнула загадчыца склада.

— Але ў мяне яшчэ не выбраны ліміт, — нясмела запярэчыў майстар.

— Сама ведаю, колькі ў каго не выбрана. Ты думаеш, што толькі ты адзін ведаеш, яшчэ вучыць будзеш. Многа вас такіх ходзіць.

Тут майстар не вытрымаў:

— Вы, бачу я, надта адукаваная. У мяне план пад пагрозай зрыву, а вы галаву тлуміце.

— Дык што, па-твойму, я ўжо не адукаваная? Можа, я зусім непісьменная? — зусім ашалела Званецкая. — Тады ідзі адкуль прыйшоў. Хай твой начальнік сам прыйдзе, я з ім пагутару...

— Дык вы такая ветлівая і культурная, — з'едліва заўважыў майстар, — век такога чалавека не бачыў, тым больш кабеты. Дзе толькі такія нараджаюцца?

— Значыцца, я — некультурная?! Як той слуп пры дарозе? І ты не рады, што я нарадзілася? Можа, маёй пагібелі хочаш? — ускіпела загадчыца. — Каб нагі тваёй тут больш не было!

— Што ж, я пайду, але вы аб гэтым яшчэ пашкадуеце, — адказаў Іванюк.

— Яшчэ невядома, хто пашкадуе, — агрызнулася Званецкая і адразу ж кудысьці пабегла.

У гэты час падышоў старшы майстар з другога цэха:

— Ну, зараз трымайся, непрыемнасцей не абярэшся.

— А што, напішу на яе дакладную, а начальства разбярэцца.

Таварыш толькі загадкава ўсміхнуўся і махнуў рукой. Не паспеў Іванюк напісаць дакладную, як яго паклікалі да начальніка цэха.

— Загадчыца склада на цябе скардзіцца за грубасць. Як жа гэта так? — спытаў начальнік.

— Гэта я — грубы? — абурыўся Іванюк. — Яна ж сама ледзь не з кулакамі кінулася на мяне!

— І ўсё ж не яна ад цябе залежыць, а ты ад яе. Прытым яна — жанчына. Ідзі, прасі прабачэння.

— Вось-вось: залежу, — прамармытаў майстар і павольна падаўся зноў на склад.

Тым часам на завод прыслалі новага дырэктара. Казалі, што ён — чалавек з характарам і ва ўсім любіць парадак.

Аднойчы глядзіць Званецкая — ідзе па складзе галоўны інжынер, а воддаль нейкі чалавек у капелюшы і пад гальштукам ходзіць і да ўсяго пільна прыглядаецца.

«Не інакш забеспячэнец з другога завода, — мільганула ў галаве Званецкай. — Будзе прасіць адпусціць яму што-небудзь. Ну я яму адпушчу!»

— Чаго сноўдаешся? — накінулася яна на яго. — Начапіў акуляры і выглядаеш праз чатыры вокі, што дрэнна дзе ляжыць. Ідзі адсюль, каб я цябе не бачыла!

Тут падышоў галоўны інжынер, і Званецкая паспешліва пайшла.

— У чым справа, таварыш дырэктар? — спытаў галоўны інжынер.

— Хто гэта такая?

— Загадчыца склада, старая работніца.

— І што, яна заўсёды такая «ветлівая»?

— Што зробіш, такі характар. Яго ўжо не пераменіш у гэтым узросце.

— Думаю, што такія кадры нам не патрэбны. Можна пакінуць хіба толькі прыбіральшчыцай, а не кіраваць участкам работы і людзьмі.

У хуткім часе Званецкая перамяніла работу. Не па ўласным, вядома, жаданні.

Зараз яна малоціць не языком, а венікам. Кажуць, што паспакайнела. Лаяцца няма з кім.



# Не зразумеў

Начальнік цэха любіў пачаставацца, толькі не на свой кошт. А тут як бы і яўная магчымасць надарылася: адзін з майстроў ішоў у адпачынак. Начальнік добра ведаў пра гэта, бо сам жа падпісаў яму заяву.

Каб не ўпусціць зручны выпадак, у канцы перададпускной змены майстра начальнік хуткім крокам падышоў да яго і ляснуў па плячы:

— Ішоў, ішоў, увесь цэх абышоў, нікога не знайшоў, цябе ўбачыў.

Майстар здзіўлена глядзеў на шэфа, а той пачаў кідаць пытанні-намёкі:

— Дык ты ўжо, лічы, у водпуску?

— У водпуску, — адказаў майстар.

— І адпускныя атрымаў?

— Атрымаў.

— І жонка не ведае, колькі? — хітравата падміргнуў начальнік, а сам падумаў: колькі ж ты адпусціш на замочку?

— Не ведае, — спакойна адказаў майстар.

Далей намякаць не было як, а проста запатрабаваць замочку было няёмка. І начальнік настойліва глядзеў на майстра, а той — на начальніка.

«Цяльпук! — у думках аблаяў шэф падначаленага. — Трэба "пракруціць пласцінку" зноў».

— Дык ты ўжо ў адпачынак сабраўся?

— Сабраўся.

— І атрымаў зарплату і грошы за водпуск?

— Вядома.

— І жонка не ведае, колькі? — у яго вачах засвяціўся агеньчык надзеі.

— Не ведае.

Працягваць было нельга, і шэф упёрся поглядам у падначаленага, а той, не міргаючы, пазіраў на шэфа.

Нарэшце начальніку надакучыла гэтая недарэчная нямая сцэна, і ён са злосцю гыркнуў:

— Ну, чаго рот разявіў? Ды ідзі ты... — і ён не дагаварыў, куды ісці.

Майстар пайшоў сабе, не азірнуўшыся. І толькі праз доўгі час да яго дайшло, чаму яму давялося звольніцца з цэха. Начальства трэба разумець.

# Як трапіць у гасцініцу

Які дзіўны ўсё ж бывае лёс! Часам хвалі бурлівага жыццёвага мора кідаюць чалавека туды-сюды, пакуль не вынясуць яго да патрэбнага берага. І не важна, што за час нялёгкіх вандраванняў наб'еш нямала гузакоў, галоўнае — ты дасягнуў сваёй мэты, знайшоў сябе.

Адшукаў нарэшцэ і я сваю жыццёвую прыстань, калі стаў інжынерам-забеспячэнцам. Прыемна адчуваць, што ад тваёй работы залежыць рытмічная работа цэхаў і нават самога галоўнага канвеера. Дый наездзішся ўволю — і родны край вывучыш, і далёкія гарады не абмінеш сваёй увагай. Бывае часцяком, што выкліча начальства і ласкава гаворыць:

— Выратоўвай, братка, зноў трэба ехаць. Больш няма каго паслаць, а ты ж — халасцяк.

Што зробіш, даводзіцца ехаць. Захопіш пару бялізны ў запас, ручнічок, брытву — ды і ў дарогу. Я ўжо нават і прыпеўку склаў пра сябе: «У дарозе я як дома, дома я — нібы ў гасцях». Еду і спяваю сам сабе. А, як вядома, песня чалавеку жыць і працаваць дапамагае. Праўда, песня не дапамагае, напрыклад, у буйным горадзе, дзе няма ні сяброў, ні сваякоў, знайсці прытулак. І тут прыезджы трушком ці нават галопам (тэмп залежыць ад узросту і вагі чалавека) кідаецца на пошукі гасцініцы. Але дарэмна спадзяваецца, што там толькі вас і чакаюць, каб схапіць у абдымкі. Не сумнявайцеся, што вас сустрэне дзяжурная таблічка, на якой нязменна напісана: «Месцаў няма». Так здарылася і са мной у час маёй нядаўняй камандзіроўкі. Аб'ехаў многія гасцініцы ў горадзе, абабіў абцасы, сабраў увесь пыл з гарадскіх вуліц, толькі прытулак не знайшоў. Урэшце мне падказалі:

— Ёсць месца ў гасцініцы рачнога порта.

Узрадаваны, я сабраў апошнія сілы і кінуўся насустрач удачы. А там мяне гэтак ветліва сустрэлі і запрашаюць:

— Калі ласка, просім да нас!

Гэта мяне насцярожыла.

— А колькі чалавек у нумары? — пытаю.

— У нас агульны пакой на дваццаць восем чалавек.

Я аж прысеў ад здзіўлення.

— Дзякуй за ласку, — кажу, — у нас у студэнцкім інтэрнаце па столькі не жыло.

У спецыялізаваных гасцініцах тыпу «Інтурыст», «Чыгуначнік», «Спорт» са мной адмовіліся нават размаўляць. Маўляў, птушка не нашага палёту. Ляці да свайго гнязда.

У адчаі пайшоў я ў агульнагарадскую гасцініцу, сеў насупраць дзяржаўнага адміністратара і трагічна прамовіў:

— Больш не ступлю ні кроку. Адсюль мяне толькі вынесуць. Нагамі наперад...

Бачу, у вачах адміністратара засвяціўся слабы, ледзь прыкметны агеньчык спагады.

— Ну добра. Дам вам месца ў нумары, але распішыцеся, што абавязуецеся выселіцца праз два дні: мы чакаем дэлегацыю.

Так і здарылася. Толькі я не зразумеў, чаму нейкія там дэлегаты канферэнцыі паляўнічых і рыбаловаў з вобласці лепшыя за мяне і чаму я з-за іх мусіў абіваць ногі.

Але з цягам часу я пачаў прывыкаць і нават набыў пэўны вопыт. Я ўжо ведаў, што прыезджыя падзяляюцца на тры катэгорыі: спартсмены і дэлегаты розных сімпозіумаў і канферэнцый, гандляры ўласным таварам (у асноўным з паўднёвых краёў), якія забяспечва-юць праз рынкі жыхароў сярэдняй паласы і паўночных раёнаў круглы год садавінай і гароднінай (вядома, не па дзяржаўных цэнах), і мы, радавыя службовыя камандзіраваныя.

Першым лягчэй за ўсё: ім месцы браніруюцца.

Прадаўцы садавіны і гародніны, у асноўным з паўднёвых краёў, уладкоўваюцца своеасабліва: яны заўсёды падносяць падарункі, якія пахнуць водарам садоў, а то і штонебудзь больш істотнае, і дзверы гасцініц расчыняюцца.

Мы ж, камандзіраваныя, спадзяёмся на сілу слова: напіраем на тое, што прыехалі вырашаць важныя дзяржаў-

ныя справы. Праўда, гэтай трэцяй катэгорыі даводзіцца сама цяжэй. І часам здзіўляешся: пастаянна з гасцініцы высяляюцца і ўсяляюцца, а таблічка «Месцаў няма» ўсё роўна як прырасла. І дзе б знайсці сілу, каб зняць яе ды прыхаваць?

Дык як усё ж трапіць у гасцініцу радавому камандзіраванаму? З уласнага вопыту магу параіць два шляхі: афіцыйны і неафіцыйны.

У першым выпадку, калі вы не здолелі ўпрасіць адміністратара, а самі заўважылі за бар'ерам ключы ад вольных нумароў, не ламіце дарэмна коп'і, усё роўна гэта бескарысна. Рашуча шыбуйце прама да дырэктара і настойліва патрабуйце месца. Калі дырэктар памкнецца адмовіць, можна нават стукнуць кулаком па стале, толькі не вельмі моцна, каб не разбіць шкло, бо кіраўнік гэтай патрэбнай вам установы можа выправіць за дзверы. І калі вы ўсё зробіце ў меру, то заўважыце, што ён пачынае вагацца. Тады вам застанецца толькі замацаваць дасягнуты поспех і патэтычна прамовіць:

— Дапамажыце, калі-ласка! Мы ж з вамі абое на дзяржаўнай службе! — і ўдача забяспечана. Праўда, адзін толькі раз. Не злоўжывайце.

Неафіцыйны шлях у гасцініцу заключаецца ў жаночай псіхалогіі (звычайна ж адміністратары гасцініц — жанчыны). Не, не спадзявайцеся, што калі ў вас знешнасць і фігура Апалона, то будзе і поспех. Я маю на ўвазе цікавасць жанчын да прадметаў шырокага ўжытку. Паабяцайце ў наступны свой прыезд захапіць з сабой дэфіцытныя рэчы, якіх у гэтым горадзе ўдзень з агнём не знойдзеш, а ў вас дома завалены магазіны. У гасцініцу вы трапіце адразу ж. А ці стрымаеце сваё слова — гэта ўжо не важна.




У вольны час я люблю памарыць. І нярэдка сярод прыемных карцін узнікае і такая: прыязджаю я ў каман-

дзіроўку ў вялікі горад, а там на кожным кроку — гасцініцы. І ў кожнай — ветлівы твар адміністратара і нязменная шыльдачка: «Вольныя месцы — у неабмежаванай колькасці».

Спадзяюся, што у хуткім часе так і будзе. А калі не — што ж... памяняю прафесію.

*1985 г.*

## Таямніцы сэрвісу

Не люблю восень. Так і чакай ад яе непрыемнасцей. Бывае, усходзіцца непагадзь, што хоць носу на вуліцу не паказвай. Вось і ўчора так задзьмуў вецер, застагнала віхура, ну, быццам паранены звер нейкі. Сяджу я, значыцца, дома і думаю: «Хоць бы шыбу не пабіла, тады клопату не абярэшся...» Толькі, браточкі, я так падумаў, як шыбане гэты звер у акно, толькі дробныя кавалачкі шкла на падлогу пасыпаліся. Мне аж млосна стала. Падцягнуў я да акна шафу, каб у акно злодзей не залез ды вецер па хаце не свістаў, панакідваў на коўдру ўсё, што было з вопраткі, каб не змерзнуць, а з самага ранку пабег у камбінат бытавых паслуг.

Мяне так прыязна сустрэлі, ветліва. Нават паспачувалі маёй бядзе. Аднак я заўважыў, што ў тым пакоі, дзе павінны рэзаць шкло, сядзяць жанкі і нешта шыюць.

— Дык мне б шкло, — няўпэўнена сказаў я.

— Няма, скончылася, — растлумачылі мне амаль радасна.

— Як няма? А што ж вы тут робіце?

— Кроім...

Я ледзь-ледзь стрымліваўся, каб не абурыцца.

— Паркаль кроім і шыем. Як кажуць, асвойваем сумежныя спецыяльнасці. І не тое бывае, калі матэрыялаў няма. Магчыма, давядзецца яшчэ і мыла вырабляць.

Ну, думаю сам сабе, жартаўнікі. Калі тут крояць, дык, можа, краўцы шкляць? Званю ў швейнае атэлье.

— Мо часам у вас шкло знойдзецца? Там нават не здзівіліся.

— Шкла няма, а вось скур можам адпусціць, колькі пажадаеце.

— Пры чым тут скуры? — здзівіўся я.

— У нас тканіны скончыліся, дык завезлі скуры. Цяпер замест касцюмаў і сукенак шыем боты.

Неяк самотна стала ў мяне на душы. Як падумаў, што дома вецер гуляе, аж дрыжыкі па целе пайшлі.

Іду я ў такім настроі па вуліцы, думаю пра свой гаротны лёс і раптам сустракаю знаёмага.

— Паспрабуй звярнуцца ў «Аўтасэрвіс», — параіў ён, калі я расказаў аб сваіх прыгодах.

Мне стала смешна. Я ж ведаў, што пасля аварыі мой сябар так і не змог паставіць шкло ў свае «Жыгулі». Аб гэтым я яму і напомніў.

— А можа, і яны перакваліфікаваліся? — засмяяўся ён.

Шанцаў у мяне амаль не заставалася. Што будзе, тое і будзе, сказаў я сам сабе. І накіраваўся ў памянёны «Аўтасэрвіс». Там мяне ледзь не схапілі ў абдымкі.

— Колькі табе, даражэнькі, трэба зашкліць вокнаў? Я падумаў, што яны жартуюць, але на ўсякі выпадак адказаў:

— Усяго адно...

— Шкада, што мала. Лепей бы дзесяць. А то, ведаеш, запчастак для аўтамашын няма, дык нам параілі ўзяцца за вокны і шклом на гэтыя мэты забяспечылі. Кепска, што кліентура малая, амаль ніхто не ведае пра нашы магчымасці.

...Што ні кажыце, браточкі, але я палюбіў восень. Шуміць за акном непагодзь, а мне весела. Ды і чаго баяцца? Таямніцы сэрвісу я зразумеў: калі патрэбны дэфіцытныя матэрыялы, лепш за ўсё шукаць іх там, дзе менш за ўсё можна чакаць.

## Шавец без ботаў

Працуем мы у заводскім канструктарскім бюро. Канструяваць даводзіцца сродкі механізацыі і аўтаматызацыі. Тут і разлікі, і чарцяжы. І не думайце, што ўсё гэта так проста — колькі захацеў, столькі і сканструяваў. Ёсць

месячны план і ў нас: штомесяц трэба распрацаваць некалькі адзінак прыстасаванняў і выдаць пэўную колькасць лістажу чарцяжоў. Так што кожная хвіліна рабочага часу на ўліку: варушы мазгамі, выдавай мазгавую прадукцыю.

У бюро дзесяць мужчын і столькі ж жанчын. У асноўным моладзь. Вось працуем мы, стараемся, як можам, націскаем на пэўныя мазгавыя цэнтры, работа ў поўным разгары. І раптам чуем бадзёры голас начальніка бюро:

— Таварышы! Механічны цэх сарваў падачу дэталяў на канвеер, план пад пагрозай зрыву. Падсобных рабочых не хапае, трэба ратаваць план. Нам неабходна паслаць на тыдзень пяць чалавек. Так што збірайцеся, Лісічкіна, Сінічкіна, Рамашкіна, Муравейкіна і Чарвякова.

— Чаму ўсё наадварот? — не вытрымаў Дубаў. — Гэта ж чыста мужчынская работа — цягаць скрынкі з дэталямі. Прытым жанчынам па тэхніцы бяспекі нельга падымаць звыш дваццаці кілаграмаў, а там скрынкі па пяцьдесят.

— Нічога, — заспакоіў начальнік бюро. — Адну скрынку будуць падымаць утрох. А за тэхніку бяспекі я адказваю тут, а там ужо будзе адказваць цэх.

— І ўсё ж лепш паслаць у цэх мужчын, — настойваў Дубаў. — Прытым, як вы самі казалі, жанчын трэба паважаць.

— А калі заўтра трэба будзе цягаць са склада рулоны ватману, каго я пашлю — жанчын? — упарта адказаў начальнік.

Як быццам бы і так, падумаў Дубаў, але ўсё ж наадварот.

Праз тыдзень — новая аб'ява: праводзіцца суботнік. Начальнік бюро выдзяляе людзей:

— Пойдуць Звераў, Дубаў, Мядзведзеў, Быкаў і Конеў. Захапіце венікі і мётлы, будзеце прыбіраць тэрыторыю.

Дубаў не вытрымаў і тут:

— Чаму зноў наадварот? На пагрузку паслалі дзяўчат, а месці двор — хлопцаў! Мы ж — крыху дужэйшыя.

— Не хвалюйся, хопіць работы і тваім мускулам, разаўём іх трохі, — заспакоіў начальнік. — Апроч прыборкі трэба будзеце збіраць металалом.

І сапраўды, давялося цягаць такія жалязякі, што падняць іх можна было толькі гуртам. Так што саплі і пацелі гэтак, што пасля суботніка ўсе дружна накіраваліся ў лазню.

А яшчэ праз пару дзён начальнік зноў аб'яўляе:

— Гэй, хлопцы, гахнем! Мужчыны, марш на склад па ватманскую паперу. Прыкацім дзесятак рулонаў.

Пакуль сабраліся, схадзілі на склад, атрымалі ватман, прыкацілі рулоны і ўсцягнулі іх па дошках аж на трэці паверх, склалі ў адпаведным месцы, усе аж узапрэлі, да таго ж паўдня як не было. Колькі карыснай работы маглі б зрабіць! Але нічога, націснем пазней. Дый трэба ж на нечым чарціць.

Але ўзрушаны Дубаў не стрымаўся:

— Таварышы! Спадары! Сябры! Хто мы такія? Канструктары. Чым мы займаемся? Механізацыяй і аўтаматызацыяй. Дык ганьба нам за тое, што самі ж цягаем на ўласных руках і спінах розныя грузы. А людзі — мноства людзей? Дык ці не сканструктаваць нам новае, зручнае прыстасаванне для пагрузачна-разгрузачных работ?

Усе ад нечаканасці разявілі раты.

Сапраўды, як кажуць, шавец без ботаў...

# Як рабіць падарункі

І хто з нас, сямейных мужчын, не рабіў падарункаў жонцы? Скажам, у Міжнародны жаночы дзень, у гадавіну вяселля і асабліва — у дзень нараджэння. Бывае, зробіш сваёй спадарожніцы жыцця падарунак, аж самому прыемна. І нібы адразу растае той лёд, які сабраўся ў адносінах з жонкай за апошнія месяцы.

І чаго я ёй толькі не дарыў! І экспартныя духі, і айчынныя сумачкі, і дарагія туфлі, і самыя танныя, але вострадэфіцытныя каробачкі парфумы.

Але, як кажуць, век жыві — век вучыся. І вось аднойчы мой сябар, загадчык гаспадарчага магазіна, вельмі спрактыкаваны чалавек, параіў мне:

— Дзівак! Чаму ты дорыш жонцы тое, што карысна толькі ёй адной... Спалучай прыемнае з карысным, купляй тое, што спатрэбілася б вам абодвум.

Як не паслухаць разумнай парады! Да наступнага свята я паднёс у падарунак жонцы настольную лямпу. Праў-

да, жонка не часта ёй карыстаецца, бо заядаюць хатнія клопаты. І вось, калі яна кладзе дзяцей спаць, або мые бялізну, ці гатуе вячэру, я ў мяккім святле настольнай лямпы павышаю свой агульнаадукацыйны ўзровень.

Другім разам я падараваў жонцы кніжную паліцу, пасля — электрычны чайнік і прас, а праз нейкі час дасягнуў вяршыні: у дзень 8 Сакавіка прывёз ёй з магазіна звычайны спінінг. Жонка толькі развяла рукамі і нічога не сказала... Я так і не зразумеў, спадабаўся ёй мой падарунак ці не... Але я вырашыў не спыняцца на дасягнутым і надалей дзейнічаць у тым жа напрамку. І чаму б заўсёды не дарыць жонцы тое, што было б карысна і патрэбна толькі мне аднаму?

Я доўга рыхтаваўся да чарговага дня нараджэння жонкі. Абабег усе магазіны горада, падняў на ногі ўсіх знаёмых у гандлёвай сетцы і ад такой беганіны скінуў кілаграмы тры вагі. Але мае пошукі прывялі да жаданага вініку: мне ўсё ж удалося набыць мужчынскую зімовую шапку. Я яе акуратна ўпакаваў, перавязаў чырвонай святочнай стужкай і ўрачыста паднёс жонцы.

Яна агледзела падарунак, пакруціла яго ў руках, вельмі здзівілася і запыталася:

— Не разумею цябе, дарагі мой, навошта мне мужчынская шапка. Ці яны зноў увашлі ў моду ў жанчын, як некалі?

— Разумееш, — тлумачу ёй, — я чамусьці так і падумаў: ты адмовішся... Што ж, урэшце, калі праз месяц на мой дзень нараджэння падорыш мне гэтую шапку — я буду вельмі рады.




Жонка зноў развяла рукамі і нічога не адказала.

...Зараз я шастаю па магазінах, шукаю сабе модны прыгожы касцюм. Хутка Новы год, і трэба аблегчыць жонцы клопаты аб добрым падарунку для мужа...

*1990 г.*

## Абмішуліўся

Мікіта Шэры збіраўся ў адпачынак. Тут жа пайшоў затрымліваць налічаныя яму грошы. Сябры праведалі пра гэта і жартаўліва папярэдзілі:

— Ты ж не надумай усё да капейкі аддаць жонцы. Трэба будзе і адзначыць як след такую прыемную падзею.

«Хваробу ў бок, — падумаў Мікіта. — На гэтае адзначэнне колькі грошай марна ўпрэш. Нашто мне лішнія траты? Ды яшчэ некаторыя захочуць і пазычыць. Не паглядзяць і на тое, што сяго-таго з іх у свой час трохі частаваў. Лепш сам, адзін адзначу, і пайду дамоў, да жонкі, і ўсе грошы аддам».

Купіў пляшку гарэлкі, прыхапіў кавалак каўбасы і падаўся ў глухі бок парку, далей ад небяспечнага вока. Зайшоў у цямнейшы куток, сеў на лаўку і прыстаканіўся. Булькатала з рыльца пякучая «Сталічная». Папіваючы, з прыемнасцю ўяўляў, як яго чакалі — не дачакаліся, каб згуртавацца па вясёлым выпадку.

— Абыдуся без сабутыльнікаў!

Калі ў бутэльцы засталося грамаў сто, Мікіта ўжо даволі насцябаўся. Але што рабіць з астачай? Дамоў не панясеш, бо жонка гвалт узніме, а кінуць шкада.

— Нічога, як-небудзь адужаю да канца, — самаахвярна вырашыў ён, прыладжваючыся да рыльца бутэлькі.

Адужаўшы, Мікіта ўпаў у забыццё. Ачуняў ад таго, што нехта трос яго за плячо. Расплюшчыў вочы і угледзеў перад сабой міліціянера. А той бачыў падпітага чалавека, які быў без касцюма, у адным споднім.

— Божухна! — залемантаваў Мікіта. — Дзе мой касцюм, дзе грошы? Я ж, можна сказаць, голы ва ўсіх адносінах!

— Відаць, на вас натрапілі хуліганы ці злодзеі, — адказаў міліцыянер. — Бачылі, што вы цёпленькі. Вось як шкодна напівацца, асабліва піць аднаму. Нічога, у аддзяленні разбярэмся.

У міліцыі пачалі высвятляць асобу затрыманага. А той бегаў па пакоі і стукаў кулаком па стале:

—Я — Мікіта Шэры. Мяне шмат хто ведае. Патрабую неадкладна выпусціць!

— А чым вы дакажаце, што вы — гэта вы? — спытаў дзяжурны.

— Можаце пазваніць маім таварышам па рабоце: Данілу Рудаму і Нічыпару Беламу. Яны пацвердзяць. Дарэчы, і жывуць на адной пляцоўцы, і ў іх паралельныя тэлефоны.

Дзяжурны пазваніў. Трубку паднялі Даніла і Нічыпар адначасова.

— У чым справа?

— Ды вось адзін п'яны амаль без адзення стукае па стале і даказвае, што ён — ваш сябар.

— Ну-ну! — адказалі ў адзін голас Даніла і Нічыпар. — Ды гэта ж — Мікіта Шэры. Выпусціце яго...

Мікіта выхапіў трубку з рук дзяжурнага і закрычаў:

— Сябры, ратуйце, век не забуду. Прыедзьце і завязіце мяне дамоў, бо жонка дасць дыхту. Скажыце маёй Тэклі, што мы разам гулялі. Можа, яна вам паверыць.

— Ну добра, — сказаў дзяжурны. —Трэба было б вас штрафануць за п'янку, але паколькі вы і так пацярпелі, што ж, выпусцім вас. Але як жа вы паедзеце без адзення?

— Дайце хоць якія рызманы накінуць на плечы, — застагнаў Мікіта.

— Так і быць, дам вам на гэты выпадак міліцэйскую форму, толькі каб заўтра ж вярнулі.

— Аб чым гаворка! — узрадаваўся Мікіта.

Тут падаспелі таварышы па рабоце — Даніла і Нічыпар, нацягнулі на Мікіту форму міліцыянера, на ногі — боты, на галаву — фуражку з какардай і павезлі дамоў.

Тэкля адчыніла дзверы і войкнула: перад ёй стаяў сержант міліцыі, якога трымалі пад рукі Даніла Руды і Нічыпар Белы.

Тэклю ледзь не хапіў паралік. Прыгледзеўшыся, яна пазнала мужа.

— Што з табой, чаму ты ў гэтай форме? — запытала яна.

— Нічога, нічога, — прагугнявіў Мікіта. — Гэта я проста ўзяў панасіць, — пры гэтым ён гэпнуўся на канапу і адразу захроп.

Тэкля схапіла венік і накінулася на Данілу і Нічыпара:

— Гэта вы напаілі яго, хаўруснікі! — і пачала сцябаць іх па спінах.

Таварышам па рабоце давялося ў хуткім тэмпе скакаць па ўсіх прыступках лесвіцы.

— Каб ты так свае грошы лічыў, як мы лічым гэтыя прыступкі, — памінала яны благім словам Мікіту. А Мікіце ў тую ноч часта ікалася.



# Халімон-маладажон

Жыў Халімон Старцаў бабылём, хоць і было яму пад пяцьдзесят гадоў. На выгляд непрыкметны мужчына, пэўна, і ў маладосці за ім не бегалі дзяўчаты, але да ўсяго быў здатны. Адзін вёў сваю гаспадарку, і ва ўсім у яго быў парадак: жывёла дагледжана, у хаце прыбрана. І не адна вясковая кабета ўздыхала па ім. А сам ён часцяком кідаў вокам на суседку Марылю, якая адна з усіх не звяртала на яго ўвагі. А была жанчына відная, не ўтрымацца ад спакусы. І так настойліва пачаў Халімон да яе заляцацца, што тая не бачыла ніякага паратунку, як ад яго пазбавіцца. Прыстаў як смала. А тут яшчэ дачка прыехала з горада і падліла масла ў агонь:

— Чаму ты, маці, упіраешся? Ці не надакучыла жыць у адзіноце? Глядзі, каб не ўхапіла яго якая-небудзь суседка.

— Што ты, дачушка! — замахала рукамі Марыля. І больш вартыя мужчыны хацелі сватацца, ды я не згадзілася. А тут гэты Халімон, худы і хваравіты.

— Нічога, — супакоіла дачка. — Худы, але цягавіты. Удваіх весялей будзе.

А Халімон усё ласачкай-ласачкай, то слоўца вясёлае кіне, то падаруначак паднясе. Так і ўлагодзіў удаву, і сышліся. Шмат было ў вёсцы гаворкі, бабы кідалі на Марылю зайздрослівыя позіркі:

— Бач, абкруціла гэткага мужыка!

А яны з Халімонам жылі ў згодзе, і цягнулася гэта доўга, датуль, пакуль не паехаў Халімон па пуцёўцы ў санаторый адпачыць і паправіць здароўе.

Пасля вяртання з санаторыя яго нібы падмянілі. Мала таго, што пасвяжэў, але пачаў падбрыкваць, як малады, і ўсё заводзіў арыю з оперы:

— У кахання, як у птахі, крылы...

Жонка слухала, слухала і нарэшце не вытрымала:

— Што з табой робіцца, Халімонка? Не па гадах скачаш.

— Нам гады — не бяды, — зноў праспяваў ён. — Што такое гады, Марылечка, калі ў сэрцы вясна? Ды хіба ж я стары ў свае пяцьдзесят тры? Я яшчэ — ого-го!

Жонка паківала галавой і праз некалькі дзён ужо не звяртала ўвагі на мужава дзівацтва. Але неўзабаве знайшла ліст ад невядомай жанчыны, якая пісала Халімону:

«Каханы мой! Ці памятаеш ты нашы сустрэчы ў санаторыі? Размовы па вечарах? Ці не забыўся ты на свае пяшчотныя словы, што шаптаў мне? А жонка твая для нас — не перашкода, бо ты з ёй не запісаны. Моцна абдымаю цябе. Твая Арына».

— Вось табе і хворы, вось табе і хілы, — прамовіла Марыля. — Паехаў лячыцца, а сам такія конікі выкідваў. Зараз разумею, што яго падмывае і кідае ў скокі і спевы.

А сама яна была жанчына з гонарам, дык і выгляду не паказала, што ведае нешта. Падумала — нічога, няхай паскача, хутка супакоіцца.

Але праз нейкі час атрымала ліст ад той самай Арыны, у якім было напісана:

«Ён быў вашым некалькі гадоў, а са мной — усяго месяц. Дык хай жа пабудзе са мной яшчэ з год. Дайце адцвісці нашаму каханню, не перашкаджайце!!»

Я вам адцвіту, падумала Марыля. А сама тым часам сабрала сямейную нараду, на якую запрасіла ўсіх сваякоў. І гуртам вырашылі: каб не даць Халімону канчаткова выйсці з сямейных рамак, трэба запісацца ў сельсавеце і... згуляць вяселле.

— Якое можа быць вяселле? — задраў хвост Халімон. — Людзі прасмяюць.

— Нічога, — дружна адказалі сваякі. — Затое будзеш трымацца роднай хаты і сям'і.

З тыдзень рыхтаваліся, і вось загуло вяселле. Праўда, госці былі ўсе больш пад пяцьдзесят гадоў і старэй, бадай, часцей, чым моладзь, крычалі «горка». Небарака Халімон аж сумеўся, але ўсё ж быў вымушаны падымацца на дыбачкі і цалавацца з Марыляй.

— Падсадзіце яго, падсадзіце! — крычалі завесялелыя госці. — Мацней цалуй, каб сям'я была больш трывалая. Каб да іншых кабет не цягнула.

— Якія там іншыя, у мяне ж свая ёмкая, — аднекваўся Халімон, а сам вінавата апускаў вочы долу.

Хоць часам кажуць, што запіс не трымае і вяселле значэння не мае, а стаў-такі Халімон добрым сем'янінам. Усё ж і ўзрост бярэ сваё. А калі Марыля аднойчы жартам спытала, ці не хоча ён яшчэ раз з'ездзіць адпачыць і палячыцца, той толькі рукой махнуў:

— Ат, для мяне праца — лепшы адпачынак і лячэнне... Прытым ты ж заўсёды побач, Марылечка.

А выпадковай знаёмай Халімона Марыліна дачка напісала пісьмо, у якім раіла павіншаваць свайго айчыма з законным шлюбам і нават запрашала ў госці. Пісьмаў ад той больш не было.

І ўсё стала на сваё месца.

Так скончылася сямейная эпапея Халімона Старцава.



# Рыбак міжволі

Калі Аўдзею споўнілася шэсцьдзесят гадоў, яго ўрачыста праводзілі на пенсію. Гучалі шчырыя словы падзякі за шматгадовую сумленную працу, а старшыня прафсаюзнага камітэта нават не вытрымаў і моцна прыціснуў да грудзей ветэрана — так шкада было развітвацца з сумленным працаўніком. Пасля ён ад імя адміністрацыі паднёс юбіляру каштоўны падарунак — спінінг і сказаў гарачую прамову:

— Дарагі сябар Аўдзей! Ты сваё адпрацаваў і ідзеш на заслужаны адпачынак. Дык жадаем жа табе з кожным годам маладзець... прабачце, я хацеў сказаць — жадаем не старэць, быць бадзёрым і здаровым. А крыніца здароўя, хачу зазначыць, — рыбалка. Тут і ўмацуеш нервы, і надыхаешся свежым паветрам удосталь, і добра закусіш... выбачайце, паясі юшкі з апетытам. Да ста гадоў можна працягнуць. Павер мне як старому члену таварыства паляўнічых і рыбаловаў...

Увечары адзначылі юбілей, а назаўтра Аўдзей задумаўся: што рабіць з гэтым спінінгам? Начальству што — падаравалі, а ты зараз думай, як лавіць тую рыбу, калі раней ніколі гэтым не займаўся. У маладосці не да таго было, за дзяўчатамі гойсаў. А калі ажаніўся, дык хутка нарадзіліся дзеці. А пад старасць унукі не злазілі з рук. І вось цяпер трэба стаць рыбаловам-навічком.

Калі Аўдзей першы раз сабраўся на рыбалку, жонка з усмешкай спытала:

— Ну што, рыбак, мо на ўсякі выпадак схадзіць у магазін па рыбу?

— Не сумнявайся, рыба будзе! — рашуча запэўніў Аўдзей і бадзёра пакрочыў са спінінгам на плячы.

І хто гэта выдумаў, што на рыбалцы і адпачнеш, і нервы ўмацуеш? Аўдзей то закіне спінінг, то выцягне, закіне — выцягне, і так паўдня. Аж рукі самлелі, і разнерваваўся, і злосць узяла: некалькі разоў бляснa чаплялася то за ціну, то за карчы, толькі не за рыбу. Але ж не зварыш юшкі з карчоў і ціны!

Каб не ісці дамоў з пустымі рукамі, стары купіў у хлапчукоў пару печкуроў і некалькі плотак — дзеля адчэпнага. А сам падумаў: не, спінінг не для мяне, няхай яго закідваюць маладзейшыя. Вось, кажуць, сеткай-таптухай лавіць рыбу — адно задавальненне. Адразу кілаграмы два-тры можна выцягнуць.

На другі дзень прыхапіў сетку і пайшоў таптацца каля берага. А тут падплывае лодка з інспектарам рыбнагляду.

— Ну, як улоў? — пытаецца інспектар.

— Ды яшчэ нічога не паспеў злавіць, — адказвае стары.

— Тады хуценька збірай сетку і шыбуй дамоў. Калі б ты быў маладзейшы, аштрафаваў бы цябе.

— А за што? — пытаецца Аўдзей з нявінным выглядам малога дзіцяці.

— Не прыкідвайся, браканьерствам займаешся.

«Вось табе і на, — падумаў Аўдзей. — Не хапала яшчэ пад старасць трапіць у злачынцы».

Давялося звярнуцца да старой як свет прылады рыбнай лоўлі — звычайнай вуды. Накупляў розных кніжак, падручнікаў, а ў іх жа пра ўсё напісана: і якія месцы рыбныя, і як падыходзіць, а іншы раз нават падпаўзаць да берага, каб не напалохаць рыбу. І пра насадкі шмат сказана. Шкада толькі, што памяць ужо слабая, усяго не ўтрымае. Але пачаў прыходзіць і першы поспех, і пачалі ўжо брацца першыя печкуры.

Зараз тэхніка аблягчае ўсе віды работ. Нават вуды ўжо выпускаюць са званочкамі. Можаш сабе закінуць вуду, а сам чытай кніжку, або, калі стаміўся, задрамаць. А як толькі рыба клюне, званочак адразу і зазвініць. І ніякай табе шматгадовай практыкі не трэба. Аўдзей паспяхова засвойвае гэтую новую тэхніку.

Навука і тэхніка ў наш час рухаюць уперад жыццё. Вучоныя-іхтыёлагі вывучаюць мову рыб. Вучоныя-электронікі мараць пра той час, калі вынайдуць падводны тэлефон. І каб рыба падплыла да кручка з чарвячком — у выглядзе чарвячка будзе тэлефонная трубка — і на сваёй рыбінай мове сказала — Аўдзей жа ўсё пачуе і зразумее:

— Дзядуля, я клюю, паспрабуй падсячы! — а сама пастараецца ўцячы.

Але Аўдзей тузане вудзільна ўверх, і рыба затрапечацца на кручку. Вось будзе жыццё!

А пакуль што Аўдзей сядзіць на беразе каля вудачкі і чакае, пакуль зазвініць званочак...



# Дасвяткаваўся

Вось дзіўны чалавек! Калі яго ні стрэнеш — заўсёды, як правіла, Міхась Налейка «пад мухай». Не вытрымаў я аднойчы і пачаў яго ўсчуваць:

— Адсталы ты чалавек, Налейка! Адзіны твой клопат — наліць і кульнуць. Мо гора якое заліваеш?

Тут Міхась страшэнна абурыўся і як стукне сабе кулаком у грудзі:

— Гэта я — адсталы чалавек? Гэта раней былі адсталыя людзі — рэлігійныя святы адзначалі. А я як сучасны чалавек выпіваю ад радасці і адзначаю толькі прафесійныя святы, бо да кожнага з іх маю прамое дачыненне.

— Ну, ведаеш, — запярэчыў я, — па тваёй прафесіі таксіста свята яшчэ не ўстаноўлена. А вось якое ты маеш дачыненне да іншых прафесійных святаў — гэта мне, ва ўсякім разе, незразумела.

— Цёмны чалавек! — пагардліва зазначыў Налейка. — А яшчэ бярэшся мяне вучыць. Усё залежыць ад тых абставін, у якія трапляеш. А гэтыя абставіны могуть сутыкнуць з людзьмі розных прафесій. І ўсіх іх палюбіш, і за кожнага вып'еш.

Вось узяць хоць бы Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі. Каго з нас не калыхала маці пад пошчак салаўя? Шмат каго не раз выкідалі з суседскага сада ў крапіву. Дый ці не прывозім мы часцяком ад цешчы ці маці паляндвічкі? І тут ужо быў бы грэх не прыхапіць заадно і пляшачку «сельгаснапітку», каб адзначыць свята нашых слаўных працаўнікоў палёў.

А Дзень работнікаў лесу? Нідзе так добра не п'ецца і не закусваецца, як на ўлонні прыроды. Там, скажу я вам, і хмялееш, і адразу ж цверазееш. Азон, адным словам. Праўду кажуць спецыялісты: чалавек з лесу выйшаў і толькі ў лесе адчувае сябе, як дома.

Прызнаюся, вельмі падабаецца мне Дзень міліцыі. Выратавалі яны мяне аднойчы — работнікі аховы парадку. Выйшаў гэта я аднойчы ад сябра нападпітку ды плюхнуўся ў лужыну. А позняя восень была. І ўявілася мне, што я ў Паўночнае мора трапіў, заграбаю рукамі ваду, крычу: «Шлюпку!»

Апрытомнеў я ў цяпле, памыты, пад белай прасцінай. А наўкол ціха-ціха, і шмат ложкаў, на якіх такія ж, як я, ляжаць. Былі, праўда, і непрыемнасці: штрафанулі, на работу паведамілі. Але як падумаю, што адубець мог, калі б не прыбралі, дык і ўся крыўда адыходзіць. Выратавалі ж, лічы, ад пагібелі.

— Ну добра, — безнадзейна махнуў я рукой. — А якое дачыненне ты можаш мець, скажам, да Дня хіміка?

— Ого-го! — узвіўся ён. — Самае прамое. У кожную палучку хімічу... як бы затаіць ад жонкі якую сотню. Бо калі ўсё аддасі, пасля не вымаліш, і без гэтай самай паўлітэркавай «хіміі» ніяк не абысціся.

І павучальна дадаў:

— А яшчэ трэба ўлічыць, што і ўсе астатнія прафесіі для мяне блізкія, бо многіх важу ў сваім таксі, многім паказваю горад і ўсіх прывожу, куды каму трэба. А калі іншы раз вазьму з каго за праезд больш, чым належыць, дык толькі дзеля таго, каб за іх жа здароўе і выпіць.

Шкада вось толькі, што гэтыя святы па прафесіях у асноўным у нядзелю, зрэдку — па суботах. А няхай бы яны былі і пасярод тыдня, і асабліва ў панядзелак, калі над-

та цяжка пасля выхаднога. Але нічога, былі б грошы, а свята знойдзецца!

Праз нейкую хвіліну Міхась задумаўся, а потым спахапіўся:

— Слухай, браце, а сёння ў каляндар ты не заглядваў? Ці няма там якога свята? Нешта ў горле перасохла...

Нядаўна я даведаўся, што Міхася Налейку за кожны прагул на рабоце аштрафавалі адным днём з яго будучага чарговага адпачынку. І атрымалася так, што з таго адпачынку не засталося ўжо ніводнага дня. Так што для майго знаёмага ў наступным годзе будуць суцэльныя будні...



## Дзень цудоўных падманаў

Напярэдадні першага красавіка настрой у Манюкіна быў цудоўны. Вось дзе будзе прастор для жартаў і кпінаў! Характар жа меў задзірысты, нікому слова не спусціць. А тут і дзень якраз такі, што ўсё дазволена: хочаце — верце, хочаце — не.

Для пачатку вырашыў спазніцца на работу на паўгадзіны. Калі ўвайшоў у кабінет, усе здзіўлена падняла вочы. А Манюкін бадзёра абвясціў:

— Аўтобус зламаўся, ліха на яго. Кіламетры са тры ўсе штурхалі, пакуль завёўся.

Адзін з супрацоўнікаў, Дзічкін, не вытрымаў і сам завёўся:

— А ці не лягчэй было перасесці ў іншы аўтобус?

— Ты, Дзічкін, мусіць, зусім здзічэў, — спакойна адказаў Манюкін. — Цябе вунь начальнік аддзела выклікае.

— Няужо? — сумеўся Дзічкін і шпаркім крокам пашыбаваў да начальніка.

Хвілін праз пяць ён вярнуўся чырвоны як рак і пагразіў кулаком:

— Ну, пачакай, Манюкін!

Тут зазваніў тэлефон. У трубцы пачуўся голас сакратаркі:

— Манюкін, вы, здаецца, спазніліся на работу.

— Што вы, я ніколі не спазняюся. Наадварот, прыходжу раней за ўсіх.

— Дык начальнік аддзела сам бачыў, як вы ішлі на паўгадзіны пазней.

— Лепш перадайце начальніку, што яго выклікае галоўны інжынер. Ён пазваніў па нашым тэлефоне і загадаў прынесці звесткі аб выкананні квартальнага плана.

Сакратарка кінула трубку і пабегла да начальніка, а Манюкін задаволена засмяяўся: вось дык жарт выкінуў. Нічога, ніхто не раззлуецца, сёння ж — першае красавіка.

Праз гадзіну зноў пазваніла сакратарка:

— Манюкін, што вы зараз робіце?

— Нічога не раблю, драмлю.

— Дык прачніцеся і зайдзіце да начальніка. Ёсць размова.

Але Манюкін быў у вясёлым настроі і працягваў жартаваць:

— Скажыце, што мяне няма. Маўляў, паўшоў піва піць.

А сам падумаў: хто ж гэта каму верыць у такі дзень? Падманьвай колькі ўлезе!

Пад канец дня сакратарка ўрачыста паведаміла Манюкіну:

— На вас рыхтуецца загад за вашы сённяшнія штучкі.

— Не жартуйце, век не паверу. З самага ранку памятаю, што сёння — першае красавіка. Дзень цудоўных падманаў. А вось у вас, даражэнькая, на поўным сур'ёзе ззаду

пакамечана сукенка і ўся ў плямах. У што вы гэта так улезлі?

— Вой, гэта ж я хадзіла ў цэх, — схамянулася дзяўчына і пабегла папраўляць свой туалет, а Манюкін услед гучна зарагатаў.

Назаўтра зранку сакратарка прынесла для азнаямлення загад, у якім Манюкіну за спазненне на работу, невыкананне загаду, падман начальства і распіццё спіртных напояў у рабочы час (нагаварыў сам на сябе) аб'яўлялася вымова, і ён пазбаўляўся прэміі.

Але Манюкін быў яшчэ пад уражаннем учарашняга дня і весела ўсміхнуўся:

— Першакрасавіцкія жартачкі!

І раптам твар яго нечакана спахмурнеў. Ён зірнуў на дату пад загадам: там стаяла «2 красавіка».

Жарты скончыліся.

## Як я спраўляў улазіны

Вось і збылася мая запаветная мара: мне далі кватэру! Супрацоўнікі моцна паціскалі руку і шчыра віншавалі. Разам з тым і намякалі:

— Не шкодзіла б гэтае самае... абмыць новае жыллё, каб сцены не патрэскаліся і падлога не рассохлася.

А тыя, хто дужэйшыя, паказвалі свае мускулы і дадавалі:

— Не забудзься, трэба ж будзе і мэблю наверх усцягнуць, прытым аж на восьмы паверх. А за кожны паверх — па пляшцы. А не ўчастуеш як след, дык і назад можам вынесці.

Перш я аднекваўся, даводзячы, што хоць кватэру вызначылі, але ордэр яшчэ не далі, дый мэблю занясуць грузчыкі з магазіна, але супрацоўнікі ад жартаў перайшлі да пагроз:

— Глядзі, не паклічаш на ўлазіны — пазбіраем прусакоў ды іншай нечысці з усяго дома і падкінем пад дзверы!

Што ж, калектыў — вялікая сіла, падумаў я, не варта ад яго адрывацца, бо і сапраўды могуць што-небудзь утварыць.

Такім чынам і пачаліся мае клопаты.

З чаго пачынаецца, па-вашаму, кватэра? Вядома, з замка. У будаўнікоў жа чамусьці прынята ва ўсе кватэры ставіць аднолькавыя замкі. Куды хочаш, туды і заходзь.

Ставіць замок я завербаваў слесара Ключнікава. На падыходзе да дома быў гастраном, і Ключнікаў не вытрымаў:

— Для пачатку не пашкодзіла б таго, — ён шматзначна шчоўкнуў па гарляку, — каб рукі не дрыжалі.

Узяў я партвейну ды памкнуўся купіць закусі, але ён рашуча запярэчыў:

— Ат, не трацься лішне. Лепш пасля возьмеш яшчэ бутэльку.

Перакуліўшы паўлітэрку, Ключнікаў старанна ўзяўся за работу. Неўзабаве ўрэзаў замок і ўрачыста абвясціў:

— Гаспадар, прымай работу!

Паглядзеў я ды аж войкнуў: замок быў урэзаны не ў дзверы, а ў бакавіну сцяны.

— Ты што, заліў вочы і не бачыш, з якога боку замок ставіць? — абурыўся я.

— Прабач, памыліўся. Вазьмі яшчэ пляшку «белага», умомант перастаўлю.

Урэшце замок падагналі, і Ключнікаў пайшоў у ванну мыць рукі. Ды раптам як заенчыць:

— Ратуйце, пячэ, хоць на сцену лезь!

Кінуўся я на дапамогу, гляджу, аж краны пераблытаны. Дзе гарачая вада — сіні, дзе халодная — чырвоны. Ну і жартаўнікі гэтыя сантэхнікі! Пасля іх жарту небараку Ключнікаву давялося з паўгадзіны трымаць рукі ў халоднай вадзе. Замест кампрэсу.

Але вось і прыемныя клопаты. Купіў я мэблю: ложак, сервант, канапу, стол, крэслы. Машыну ўзяў са сваёй работы, а грузіць падлабуніліся брыгадзір Мядзведзеў, падчэпшчык Страпілін, той жа Ключнікаў і пажарнік Сачкоў.

Перш узяліся несці сервант. Сачкоў трымаў яго ззаду і соп больш за ўсіх, але ніжні канец, які ён трымаў, ледзь не апускаўся долу. І тут не вытрымаў Мядзведзеў:

— Гэй ты, Сачкоў! Хоць ты і пажарнік, але на хаду не спі. Гэта табе не на рабоце. Хопіць сачкаваць.

Калі сервант паднялі на восьмы паверх, Мядзведзеў спытаў:

— Гаспадар, якая кватэра?

Глянуў я і аж самлеў: дзверы быццам бы тыя — і не тыя.

— Прабачце, хлопцы, пад'езд пераблытаў.

Хлопцы ад нечаканасці аж прыселі. І тут я зразумеў, што без добрага «ўлівання» іх нізавошта не падняць. Давялося бегчы ў прадуктовы магазін неадкладна.

Калі ўсю мэблю занеслі, аказалася, што сервант і канапу няма на што ставіць — забыліся ў магазіне ножкі. Каго ж паслаць па іх?

— Ого, у мяне ногі як у зайца, — вырваўся ўперад Ключнікаў. — Я зараз жа збегаю. Толькі без мяне не пачынаць!

...Вось і надышоў шчаслівы дзень наваселля. Зранку я шастаў з гаспадарчымі сумкамі па магазінах у пошуках прадуктаў, а жонка з цешчай завіхаліся на кухні. Але паколькі газ яшчэ не правялі, то гатаваць давялося на электрапліткі. Таму адны катлеты падгарэлі, іншыя не дасмажыліся.

— Нічога, — бадзёра суцяшала цешча. — Даварыцца ў жываце. Абы выпіўкі хапала, для мужчын гэта найпершая справа.

Калі папрыходзілі госці і паселі за сталы, жонка зусім нечакана схапіла самую вялікую талерку і што сілы бразнула яе аб падлогу, аж чарапкі паляцелі на ўсе бакі. Усе перапалохаліся, нічога не разумелі: няўжо ў такі святочны дзень пасварыліся?

Але тут цешча расплылася ў шырокай усмешцы і ласкава прабуркавала:

— Супакойцеся, дарагія госцейкі, гэта на шчасце!

І пачалася вясёлая гамана.

Перш нас з жонкай віншавалі сваякі, а пасля пачалі падымаць тосты таварышы па рабоце. Пачаў слесар Ключнікаў:

— Жадаю вам, дарагія навасельцы, каб у вашу кватэру ніколі не ўлезлі злодзеі, замок жа добры, сам ставіў.

На яго дружна накінуліся:

— Ты пра што завёў размову, каб на цябе ліха! Знайшоў аб чым гаварыць!

— Ды я ж дабра жадаю, — апраўдваўся той.

Далей выступаў Сачкоў:

— А я хачу пажадаць, каб у вашай кватэры ніколі не было пажару. А калі што — гукніце Сачкова: яму любы пажар — не пажар. Умомант спраўлюся.

За гэты тост Сачкова ледзь не пабілі.

Але самыя прыемныя словы сказалі брыгадзір Мядзведзеў і падчэпшчык Страпілін:

— Каб у вашу кватэру часцей куплялася мэбля. Пра грузчыкаў можаце не клапаціцца.

Так і адгуло маё наваселле. Але хоць сцены і падлога былі даволі шчодра спырснуты гарэлкай і віном, сцены ўсё роўна патрэскаліся, а падлога рассохлася. Аднак я своечасова паклікаў рамонтнікаў, і шчыліны ў сценах і падлозе замазалі і «замачылі».

Зараз я стаю на чарзе на пашырэнне жылплошчы. А сябры мае ў радасным прадчуванні паціраюць рукі: хутка зноў — улазіны!

## «Спартыўны» парсюк

Калі на будоўлі пачаўся абедзенны перапынак, уся брыгада пасела есці. Прымайставаўся і Саўка. Ён узяў свой пакунак з абедам і прапанаваў:

— Хто хоча — частуйцеся, сала ўласнай гадоўлі. Свежаніна.

Любіў Саўка пахваліцца, і гэта было ўсім вядома. Але Кузьма здзіўлена спытаў:

— Чаму гэта ў цябе сярод лета свежаніна? Усе добрыя людзі колюць свіней узімку, у маразы, а зараз гарачыня. Сапсуецца ж, да Новага года не вытрымае.

— Ат, надакучыў мне гэты парсюк, не было паратунку, — махнуў рукой Саўка. — Гэта ж трэба — загарадку пагрыз. Ростам быў з цяля, трохі ніжэй, спіна дугой. Перагрыз і дошкі, і нават ушулы, худы страшэнна. А вы каштуйце сальца. Бяры, Кузьма, даставай, Язэп.

— Дык чаму ж ты не патрымаў парсюка да маразоў? — дапытваўся Кузьма, з цяжкасцю спрабуючы пера-

жаваць Саўкава сала. А яно было таўшчынёй усяго ў адзін палец і, відаць, не паддавалася зубам.

— Дык вось я і кажу, — працягнуў Саўка. — Гэты мой парсюк шчаціннем быў падобны да дзіка, а па характары — чысты воўк. Бар'еры мог браць, заходзіць у катух было страшна. І вось аднойчы адчыняю дзверы ды толькі памкнуўся зайсці, а ён, звяруга, як схопіць мяне зубамі за нагу і давай грызці! Ледзь выкараскаўся я. Пабег, схапіў швайку і паклікаў суседзяў. Дык утраіх не маглі рады даць.

— Так, — зазначыў Язэп, — кажаш, парсюк нагу пагрыз... Дык вось, даражэнькі, каб такое не здаралася, жывёлу трэба хоць зрэдку карміць.

Саўка ад нечаканасці разявіў рот.

— Ды хіба ж я не карміў? Штодзень прыносіў.

— А які корм даваў? — дапытваўся Кузьма.

— Як які? Траву.

— А болей што?

— Болей? Нічога, хопіць і травы.

— Ну дык і сала ў цябе як трава, — не вытрымаў Язэп. — І больш тонкага я не бачыў, і такога худога. Зубы можна паламаць.

— Глядзі, — дадаў Кузьма, — не хочаш жывёлу дагледаць, дык не трэба і заводзіць. А парсюк твой быў яшчэ рахманы. Іншы па такім харчаванні зусім загрыз бы гэткага гаспадара.

Уся брыгада дружна зарагатала, а Саўка толькі лыпаў вачыма.

— Гары яно гарам, каб я болей звязваўся з гэтай падлай. Лепей куплю ў краме ці на базары.

І ён схаваў сваю свежаніну, якая была больш падобна да дзічыны.

— Відаць, скупы гэты Саўка, калі шкадаваў корму ўласнай жывёле, — заўважыў Кузьма.

— Не так скупы, як гультаяваты, — адказаў Язэп. А вядома ж, што скупы тры разы дасць, каб не даць адзін раз як след, а гультай тройчы абы-як зробіць, каб не зрабіць раз як трэба. Але тут падмануў сам сябе.

Тым часам абед скончыўся, і Саўка пасунуўся ўслед за ўсімі на работу.

# Як выйграць у «Спортлато»

Як вядома, кожны чалавек мае свае асаблівасці, свае захапленні, або, як гэта цяпер называецца, хобі. І гэтае хобі падчас так захапляе, што чалавек апрача яго нічога і ведаць, і разумець не хоча. Адзін збірае маркі, другі калекцыяніруе наклейкі ад запалкавых пачкаў. Я ж шмат гадоў запар захапляўся латарэяй. Яна мяне вабіла настолькі, што, калі адбываўся тыраж, я ў думках то рабіў падарожжа на ўласным «Масквічы», які марыў выйграць, то наведваў далёкія паўднёвыя краіны на параходзе па выйгранай пуцёўцы.

Але мне не вельмі шанцавала: з грашовых выйгрышаў зрэдку траплялiся самыя мізэрныя, пра якія нават смешна гаварыць, а з рэчавых толькі аднойчы — кішэнны ліхтарык. Ды я не бедаваў: грошы мае не прапалі марна, а пайшлі ў дзяржаўную скарбонку, а ліхтарык спатрэбіўся і нават стаў маім верным спадарожнікам і неразлучным сябрам, бо вуліца, на якой я жыву, дрэнна асветлена, і раней дарогу мне асвятлялі «фары», якія я набіваў, падаючы.

Але як імкліва бяжыць час! Каб паспець за ім, трэба з хуткасцю ракеты ці хоць бы спрынтэра раённага маштабу спяшацца і не адставаць.

І вось я быў прыемна здзіўлены і ўражаны тым, што з'явілася новая па тым часе, цікавая і захапляючая гульня «Спортлато». Я адразу нібы памаладзеў, а пасля кінуўся купляць білеты самай папулярнай тады гульні. І не дзіва: купіўшы білеты «Спортлато», адчуваеш сябе больш бадзёрым і падцягнутым. Нібы сам становішся чэмпіёнам і рэкардсменам (хоць уранку не робіш нават самай звычайнай фіззарадкі). Нават песню напісалі, якая часта гучала па радыё: «Спортлато — цудоўная гульня! Хіба можна заставацца без гульні?»

Набыўшы білет, патрэбна выкрасліць шэсць лічбаў, пад якімі напісаны розныя спартыўныя гульні. А выйграеш, калі патрапіш ад трох да шасці лічбаў.

Як кажуць, у кожнай справе важней за ўсё — сістэма. Бессістэмна можа жыць толькі самы несур'ёзны чалававек. І я надумаўся выпрацаваць у сваёй любімай гульні ўласную сістэму. Здзіўлю свет выдумкай!

Перш за ўсё мне ўздумалася выкрасліць мае нелюбімыя віды спорту. На самой справе: каму патрэбен слалам? Каб адразу пусціць ногі на злом? Або бокс. Вось кажуць: спорт мужных. А ці добра хадзіць пасля рынгу са звернутай набок сківіцай? А футбол яшчэ горш: могуць высадзіць нават рабро! Таму я выкрасліў усе гэтыя непрыемныя віды спорту і адгадаў... усяго адну лічбу.

Але я не страціў надзеі і ў наступны раз выкрасліў мае любімыя віды спартыўнай барацьбы. Што, напрыклад, лепш за лыжы? Не спяшаючыся, ідзі сабе ўслед за якім-небудзь пенсіянерам, няхай ён пракладвае лыжню, а ты спі на хаду ды атрымлівай асалоду ад хвойнага лесу. Найлепш, праўда, гульня ў шашкі. Калі зусім не ведаеш правілаў, дык можаш гуляць у паддаўкі.

Карацей кажучы, на гэты раз я выкрасліў свае любімыя віды спорту і чакаю... Ну, скажам, выйграць грошы на байдарку. А тады пайду шукаць хуткую горную раку, каб выпрабаваць сваю смеласць і спрыт. І тады... ведайце нашых!

Калі ж не выйграю, буду рабіць стаўку на такія віды спорту, да якіх я зусім абыякавы. Вось, скажам, буер, спідвей, каноэ, бадмінтон — не адразу і зразумееш, што гэта такое.

Будзе бегчы час, а я буду выдумляць усё новыя камбінацыі: пачну выкрэсліваць лічбы па вертыкалі, гарызанталі і паралелі. Калі ж не дапаможа, буду хадзіць канём з сярэдзіны і розных вуглоў. Камбінацый можа быць безліч, іх хопіць на чарговыя дзесяць гадоў. І не важна, што я пакуль што адгадаў усяго адну-дзве лічбы і нічога не выйграў: у наступным туры спадзяюся на большую ўдачу. І ўрэшце рэшт, важней за ўсё не выйгрыш, а сістэма. А пакуль сахвочуся, прыдумаюць новую гульню. Я ж буду ў вечным пошуку і заўжды буду мець сваё хобі.



Такім чынам, да новых выйгрышаў!

*1985 г.*

# Не выпадае

Сустрэліся два таварышы, якія доўга не бачыліся. Адзін прагульваўся, дыхаў свежым паветрам і радаваўся жыццю. Другі ішоў з магазіна з гаспадарчымі сумкамі і меў заклапочаны выгляд.

Першы кінуўся насустрач і шырока раскінуў рукі для абдымкаў. Другі як быццам не заўважыў гэтага і крочыў уперад. Між імі пачалася такая гаворка:

— Здароў, сябрук, няўжо не пазнаеш?

— Прабачце, я дрэнна бачу.

— Дык прыпыніся на хвілінку, пагамонім.

— Не маю часу.

— Але ж яшчэ рана. Хоць прывітацца можаш?

— Не магу, у мяне заняты рукі.

— Тады пастаў свае сумкі.

— Баюся спазніцца дадому.

— Кінь ты, дадому яшчэ ніхто ніколі не спазняўся. Ты хоць памятаеш мяне?

— У мяне слабая памяць. Старасць надыходзіць, склероз.

— Якая старасць, табе ж толькі сорак.

— Але ж ужо не дваццаць.

— Як справы на рабоце?

— Нічога, выконваем.

— Раскажы, як жонка, дзеці?

— Не ведаю, ад самай раніцы не бачыў.

— Зайшоў бы калі-небудзь да мяне ў госці, я жыву тут непадалёку.

— Не магу, баляць ногі.

— Дык я завітаю да цябе, дай свой адрас.

— Няма чым запісаць.

— Каго-небудзь з нашых сустракаў? Сяброў, з якімі разам вучыліся, працавалі?

— Ці мала каго я сустракаў? Усіх не ўпомніш.

— Э, брат! Ды ты, бачу я, нікога не хочаш ні пазнаваць, ні паважаць. Самога сябе хоць паважаеш?

— Не выпадае...

І ён безуважна патупаў далей.

# Як я стаў рабкорам

Пачалося ўсё з таго, што абралі мяне ў цэхавы камітэт прафсаюза. А пасля даверылі і пасаду старшыні цэхкома. Цэх у нас вялікі, і таму я быў вызвалены ад асноўнай работы. Хоць як быў маляром, так і застаўся лічыцца па штаце.

Работы хапала, але і вольнага часу стала больш. Часцей сустракаўся з людзьмі, больш назіраў і заўважаў. Нараджаліся новыя думкі, прапановы і меркаванні. З'явілася жаданне выказаць іх людзям. І тут мяне ўладна пацягнула да пяра...

Для пачатку напісаў у нашу заводскую газету пра перадавога рабочага. Да таго ж ён — мой сябар. Узяў потым газету са сваёй заметкай і пайшоў да яго. Ну, думаю, зараз ён схопіць мяне ў абдымкі і горача расцалуе. А той замест гэтага незадаволена працадзіў скрозь зубы:

— Чытаў ужо. Можна было б напісаць лепш і больш. Вунь пра Пятрова дык амаль цэлую старонку выдалі.

Вось табе і падзяка! Як кажуць, першы блін камяком. А стараўся ж і, здаецца, няблага напісаў. Але я не разгубіўся і пачаў шукаць новую тэму.

А тут якраз здарылася і нагода. Набліжаўся Міжнародны жаночы дзень. І я вырашыў зрабіць цёплую замалёўку пра якую-небудзь перадавую работніцу. Выбраў фрэзероўшчыцу Сітнікаву: усё ж ударніца працы, партрэт яе на Дошцы гонару. І гэтак прачулена пра яе напісаў — аж у самога сляза набегла ад глыбіні пачуццяў. А каб іншыя жанчыны не пакрыўдзіліся, што абышоў іх увагай, у канцы мімаходзь дадаў некалькі цёплых слоў і пра іх. Так сказаць, для страхоўкі.

Але выйшла не так, як я думаў. Іду ў час абедзеннага перапынку па цэху, бачу, сабраліся ў гурт жанчыны і нешта гучна абмяркоўваюць. Падышоў бліжэй і чую:

— Бач, як размаляваў Сітнікаву! А мы чым горшыя? І план перавыконваем, і ў самадзейнасці ўдзельнічаем, і ў «Чырвоны Крыж» уступілі.

А адна шматзначна заўважыла:

— Я даўно прыкмеціла, што ён да яе неабыякавы. Відаць, тут нешта ёсць!

Я даўно не хлапчук, ды тут адчуў, як чырвань пачала заліваць мой твар. Але не спрачацца ж мне з імі. Што ты зробіш: жанчыны ёсць жанчыны, любяць язычкамі памалаціць.

— Прабачце, — сказаў я, — на наступнае свята напішу пра вас, а пра Сітнікаву — ні слова!

Пасля гэтых слоў жанчыны памякчэлі.

Ішоў час, я працягваў актыўна выступаць у заводскай газеце. Потым мае заметкі пачалі з'яўляцца і ў абласным друку. І вось аднойчы мне прапанавалі напісаць крытычны артыкул. А тут знайшлася і прычына: у нашым цэху план быў пад пагрозай зрыву, бо не ўстанавілі новае абсталяванне. Аб гэтым я і напісаў фельетон.

Неўзабаве зусім нечакана мяне выклікае начальнік цэха.

— Кім ты у нас афармлены? — пытае, — фельетаністам ці маляром?

— Маляром, — адказваю я..

— У такім разе хуценька бяры пэндзаль, ідзі фарбаваць сцены, бо грамадская работа табе не на карысць, а на шкоду.

Выйшаў я і разгубіўся. Вось, думаю, да чаго дапісаўся. Сапраўды, як кажуць, не мела баба клопату...

А тут старшыня прафкама завода насустрач ідзе.

— Аб чым задумаўся, рабкор? — пытае з усмешкай.

Тут мяне і прарвала. Расказаў усё чыста, як заціскаюць крытыку.

— Што рабіць? — пытаю.

А ён адказвае:

— Што ж, кожны павінен быць на сваім месцы, інакш можна застацца зусім без месца. — А сам усё ўсміхаецца: — Дарэчы, я зараз іду ў ваш цэх. Пацікаўлюся і тваім пытаннем.

Я тым часам зайшоў да маляроў, адшукаў самы вялікі пэндзаль, узваліў яго на плячо, узяў вядро з фарбай і пашыбаваў да начальніка цэха.

— Пакажыце, — кажу, — сцяну, якую трэба мазаць.

Бачу, выгляд у начальніка нейкі кісла-салодкі:

— Добра, ідзі, працуй па-ранейшаму... рабкор.

Я вылецеў з кабінета як на крылах. Вось што значыць сіла друкаванага слова. Трымайцеся, бюракраты! Сцеражыцеся, падхалімы! Далоў п'яніц і хуліганаў! Слава добрым людзям!

А зараз я ўвесь час вастру пяро і вышукваю новыя тэмы. І хоць даўно ўжо не на выбарнай, а на сваёй асноўнай рабоце, але з рабкораўскай працай зрадніўся назаўсёды.

# Перастаралася

Макар быў спакойны мужчына, ніколі не загульваў, а чарку мог прыняць толькі па вялікіх святах ці калі бывалі госці. Але яго жонка Аўдоцця, скупаватая кабета, лічыла, што і гэта занадта. І вырашыла з мэтай эканоміі зусім адлучыць свайго гаспадара ад шкоднага зелля.

Доўга яна раілася з сяброўкамі і суседкамі. І вось нарэшце адна з іх падказала выйсце: трэба кінуць у гарэлку сабачай поўсці і на працягу сутак настаяць, а потым пачаставаць мужа.

— Ад такога пачастунку цягу да спіртнога як рукой здымае, — запэўніла суседка.

Узрадаваная Аўдоцця кінулася шукаць падыходзячага сабаку. Знайшла ў знаёмых цюцьку са светлай поўсцю (каб не было прыкметна ў бутэльцы), навыскубла ў яго валаскоў і пашыбавала дамоў.

Купіла пляшку гарэлкі, раскаркавала яе і кінула туды валаскі.

— Выпі, выпі, — прыгаворвала яна ў адрас мужа. — Пасля будзеш толькі чай піць.

Гэта ўсё бачыла і чула малая дачушка Макара і Аўдоцці.

Назаўтра, прыйшоўшы з работы, Макар, як звычайна, узяў дачку за ручкі і павёў на прагулку. Калі выйшлі на вуліцу, тая па-дзіцячаму прашапялявіла:

— Татка, не пі сёння галэлку. Мамка накідала ў яе сабачай поўсці, каб табе длэнна злабілася. Я сама бачыла.

Калі вярнуліся з прагулкі, стол быў застаўлены смачнымі стравамі. Супраць звычайнага Аўдоцця выняла і паставіла на стол пляшку.

— Якое сёння свята? — нібы не зразумеў Макар.

— Нічога, Макарка, ты прыйшоў з работы дадому — вось табе і свята. Так што не саромся, налівай.

— Што ж, можна і наліць, не часта бывае. А ты як?

— Не, я не магу, работы шмат.

Макар наліў шклянку, выпіў і добра закусіў. Пасля паўтарыў — і зноў закусіў. Затым утаропіўся вачыма ў жонку. І раптам:

— Гаў!.. Гаў-гаў!.. Гаў-гаў-гаў!..

«Звар'яцеў! — прамільгнула ў Аўдоцціна галаве. — Зусім асабачыўся».

Яна пабегла да тэлефона-аўтамата, пазваніла ў «хуткую дапамогу» і выклікала брыгаду.

Неўзабаве брыгада прыехала. У кватэру ўвайшлі доктар і двое дужых санітараў у белых халатах.

Доктар з усмешкай запытаўся ў Макара:

— Ну, як справы, як здароўе?

— Ды вось жонка накідала ў гарэлку сабачай поўсці, дык я зараз і гаўкаю на яе, — адказаў Макар і гучна зарагатаў.

Твар доктара спахмурнеў. Ён паглядзеў на Макара, потым на Аўдоццю і сказаў:

— Вы, грамадзянін, адпачывайце. А вось вам, шаноўная, каб больш не захацелася выдумляць самаробныя лекі, давядзецца заплаціць штраф пяцьсот тысяч рублёў за падманны выклік брыгады.

У Аўдоцці адняласяя мова.

Перастаралася.

## Як я стаў парашутыстам

А з чаго ўсё пачалося?..

Ага, успомніў. Прагледзеў неяк я ў кінатэатры паўторнага фільма карціну «Максім Перапяліца», і так мне спадабаўся гэты фільм, асабліва галоўны герой, Максім. Ён,

я вам скажу, увесь як я, ці, дакладней, я ўвесь як ён. І пачаў усе яго звычкі пераймаць. Для пачатку начапляў значкоў на грудзі — няхай ведаюць нашых, якія мы заслужаныя! І пайшоў на танцы. На дзяўчат спадылба цікую, нават выгляду не падаю, што мне якая з іх падабаецца.

І сустрэў я на танцах, на сваю бяду ці мо на радасць, такую дзяўчыну — захістаешся! Чарнявая, танклявая і... не ў меру насмешлівая. Стаяла з сяброўкай і з маладым мужчынам — у таго прычоска прылізаная: адразу бачна — лысіну маскіруе, не тое што ў мяне — віхор ніколі не прыгладзіць. А на спіне ў яго хоць і ладна сядзіць пінжак, але бачу, што пад пінжаком — спіна дугою... Вядома, не тое што я, малады... Не, думаю, запрашу яе на танец, а гэты, калі ён яе кавалер, няхай ваду глытае. Танцуем мы з ёй, а яна і пытаецца:

— Што гэта вы, малады чалавек, пінжак свой не шкадуеце? Столькі дзірак напракалвалі.

— А у мяне, — кажу, — гэта не адзіны пінжак.

— А астатнія пінжакі таксама папракалваны? — кпіць яна.

— А што, вы шкадуеце мае пінжакі? — здзекліва пытаюся я.

— Ды не, вас шкадую. Хіба не цяжка насіць гэтулькі значкоў на сабе? Дый што, вы ўсе іх заслужылі? Ну хоць бы гэты — «Парашутыст»?

— Вядома, заслужыў, — адказваю.

— А колькі разоў вы скакалі?

— Дваццаць.

— А з якога самалёта?

— З «Ту-124», — кажу.

— А з якой вышыні?

— З дзесяці кіламетраў.

— Малады чалавек, — кажа яна, — пачынаючыя парашутысты ніколі не скачуць з такіх хуткасных самалётаў і з такой вышыні.

— Адкуль вы ведаеце?

— Я сама надаўна скончыла аэраклуб.

Ну і справы! Пашкроб я патыліцу, адвёў дзяўчыну пасля танца на месца і пытаюся:

— Можна вас запрасіць на наступны танец? Дарэчы, як ваша імя?

А яна адказвае:

— Пагаворым тады, калі вы здымеце з сябе ўсё гэтае жалеззе, перастанеце падманваць і заслужыце сапраўды значок парашутыста...

І пайшла дахаты ў суправаджэнні таго мужчыны. У мяне аж сэрца ёкнула. Запала яна мне ў памяці з першага разу, аж усё ўсярэдзіне перавярнулася. І хоць доўно ведаў я, што народжаны поўзаць не можа лятаць, але накіраваўся ў аэраклуб, у секцыю парашутызму. Нічога не зробіш — каханне... Я ж — мужчына. І Максіму Перапяліцу нялёгка бывала, а якім чалавекам стаў!

І пачалося. Заняткі, трэніроўкі...

І вось прывезлі нас на аэрадром, пагрузілі ў самалёт «Ан-2», паднялі на вышыню тысяча метраў і сказалі падрыхтавацца скакаць.

Скочыў я — і нібы ў бездань праваліўся...

Пасля раптам нібы спыніўся: гэта нада мной парашут раскрыўся. Далей апускацца было прыемна: пазіраю навокал з вышыні, любуюся роднымі краявідамі. Прызямліўся. Упаў. А вецер, халера на яго, як падхопіць купал парашута ды як павалачэ — ледзь не ўвесь аэрадром прабаранаваў... Нічога, думаю, першы блін заўжды камечаны. Сябры не далі ў бяду, «патушылі» парашут. А інструктар павіншаваў. З першым скачком. Пасля скакаў яшчэ шмат разоў, здаў на трэці разрад.

Схаваў я ўсе значкі, пачапіў толькі «разрадніка-парашутыста», і пайшоў шпацыраваць каля дома той, што прымусіла мяне такія выпрабаванні выцерпець (дзе жыве — я прасачыў). Доўга гуляў, урэшце гляджу — выйшла яна з дому. А я, нібы незнарок, з ёй спаткаўся.

— Дзень добры, — кажу. — Вось і я. Пазнаеце? Таксама скончыў аэраклуб. Не спяшаецеся? Мне з вамі, здаецца, па дарозе...

— Калі ласка, — адказвае яна. І засмяялася: — Калі па дарозе...

І ні я, ні яна не ведалі ў той вечар, што па адной дарозе мы пойдзем разам назаўсёды.

А ёй я ўсяго адно пытанне задаў:

— А што гэта за мужчына быў, што тады праводзіў вас з танцаў?

— Брат мой старэйшы. Ён яшчэ халасты, а я адна нікуды не хаджу...

— Ну добра. І цяпер, і надалей, спадзяюся, вы не будзеце адна нікуды хадзіць. Я ж таксама — халасты. Праўда, я — не брат, але...

Яна прыемна ўсміхнулася...

Вось як. А вы кажаце — каханне...

## Знаходлівасць дапамагла

Аднойчы мы выклікалі сантэхніка, бо не працякала вада ў ракавіне на кухні. Спатрэбілася разабраць калена пад ракавінай, а потым збіраць і замазваць. Слесар запатрабаваў пасудзіну, каб развесці цэмент для замазкі. Дома была толькі жонка. Яна замест таго каб падаць штосьці непатрэбнае, па нявопытнасці і нядбайнасці дала каструлю, у якой звычайна варым суп і кашу. Сантэхнік размяшаў шмат цэменту, колькі спатрэбілася — выкарыстаў, астатні цэментавы раствор пакінуў, а жонка вынесла яго на балкон.

Я шукаў любімую каструлю і не мог знайсці. Нарэшце адшукаў. Цэмент зацвярдзеў. Я заліў яго вадой і праз пару дзён пачаў шкрэбсці. Трохі зверху сашкроб, але далей мае намаганні былі марнымі.

— Выкінь гэта ўсё, — безнадзейна сказала жонка.

— Купіш новую каструлю, — агрызнуўся я. — Чаму ж ты, варона, не знайшла чаго-небудзь прасцейшага для гэтай справы? Ці хоць выкінула б адразу раствор.

На ўсякі выпадак я параіўся з галоўным будаўніком сваей фірмы Мікалаем Еўдакімчыкам.

— Што рабіць, Мікалай Васільевіч? Як выкінуць раствор з каструлі? Не зубілам жа біць!

— А нічога не зробіш, — адказаў той. — Выкінь разам з каструляй.

Ды я не змірыўся з такім выйсцем са становішча, да таго ж і грошай было шкада на новую і дарагую кастру-

лю. Ну, думаю сам сабе, паспрабую пракіпяціць. Вада ж, як кажуць, дзірачку знойдзе. Цэмент застанецца на месцы, а метал пры награванні, як вядома, расшыраецца. Горш не будзе, а лепш можа быць. Не адступлюся ад свайго!

Наліў у каструлю вады і паставіў на пліту. Уключыў на ўсю моц газ. Праз нейкі час на кухні зашумела, застраляла. Жонка ад нечаканасці і спалоху закрычала:

— Што там бухае на кухні?

— Нічога страшнага, — адказваю. — Вайны няма. Цэмент вываўваю. Паменшыў агонь, бачу, з аднаго боку вада струмяніць уверх. Далей — болей, пайшло паціху па кругу. Праз нейкі час ткнуў палачкай — цэментавы круг захістаўся. Зліў кіпень. Перакруціў каструлю — кружок і вываліўся. Зверху шурпаты, а знізу і па баках — гладзенькі і акуратны. Нясу паказваць жонцы.

— Дык гэта ж будзе яшчэ адна падстаўка пад патэльню і гарачы чайнік! — радасна ўсклікнула яна.

— Я і сам пра гэта падумаў, — адказваю. — Не было б шчасця, дык няшчасце дапамагло.

Расказаў пра вынік маёй знаходлівасці Мікалаю Еўдакімчыку. Ветэран будаўнічай справы ад нечаканасці разявіў рот, застыў у зняменні.

— Ну ты даеш! Ніхто не дадумаўся б.

Такім чынам, я і каструлю ўратаваў, і падстаўку бясплатную атрымаў. Вось што значыць быць дбайным гаспадаром! Знаходлівасць дапамагла.

Вучыцеся, пакуль я жывы!

## Шчаслівая лічба

Нездарма гавораць у народзе, што лічба «трынаццаць» — нешчаслівая. Я асабіста пераканаўся ў гэтым неаднаразова.

Калі мне было трынаццаць гадоў, я палез на дрэва даставаць грачыныя яйкі. І зваліўся. А бацька, замест таго каб пашкадаваць, пачаставаў мяне раменьчыкам трынаццаць разоў. Каб не разбураў птушыныя гнёзды.

А калі праз некалькі гадоў мы перабраліся ў горад і атрымалі кватэру, то нам давялося пасяліцца на трынаццатым паверсе. Яно не вельмі і дрэнна: з вокнаў відаць амаль паўгорада, але бывае і нязручнасць, калі ліфт сапсуецца або яго адключаць нанач — даводзіцца лічыць мноства прыступак. Тут і ногі разамнеш, і вагу скінеш. На нашым паверсе тоўстых даўно няма.

А вось быў у мяне прыяцель, Хвядос Грошаў. Сустракае ён мяне аднойчы і просіць:

— Пазыч грошай да авансу.

Даў яму, колькі меў. Мінуў аванс, далі і палучку, толькі доўг ён мне нешта не вяртае. І зусім выпадкова сустракаю яго ў магазіне.

— Прывітанне, дружа! — са шчаслівай усмешкай вітае ён мяне. — Пазыч да палучкі, колькі можаш.

— Ты б перш доўг аддаў, — нясмела запярэчыў я, — а пасля прасіў бы зноў.

— Нічога, аддам усе разам!

І, выхапіўшы ў мяне з рук колькі там было, Хвядос падзякаваў і кінуўся ў суседні штучны аддзел.

Праз нейкі час я зразумеў, што мае сто трыццаць тысяч рублёў (дзесяць разоў па трынаццаць) безнадзейна прапалі. Мой прыяцель пачаў далёка мяне абыходзіць і пазбягаў сустрэч. Калі ж я ненарокам падлавіў яго і напомніў пра грошы, ён страшэнна абурыўся:

— Як табе не сорамна ўспамінаць пра такую дробязь? Людзі жыцця не шкадавалі дзеля сябра, а ты — пра нейкія там сто трыццаць тысяч рублёў!

Вось дык папаўся я! Зноў падвяла праклятая лічба. Хвядос пачаў бэсціць мяне за вочы: што я, маўляў, скнара і ўвогуле бяздушны чалавек. «Ліха з імі, з гэтымі грашыма, — падумаў я, — пакінуў бы ён свой абгавор. Што людзі падумаюць?»

Сваімі думкамі я падзяліўся з сябрам, журналістам.

— Дык ён жа нахабнік, трэба напісаць пра яго фельетон! Пэўна, не толькі з табой у яго такія справы. Я чуў, што і чарку любіць, і дэбашыр. Трэба яшчэ паглядзець, дзе і як ён працуе.

— Але я ніколі не пісаў фельетонаў, — засумняваўся я. — Баюся, што не атрымаецца.

— Нічога, ты пішы, а я падпраўлю, адшліфую, дадам перцу.

— Ну, перцу я і сам дам, — кажу.

І што вы думаеце? Такі фельетон атрымаўся — захістаешся! Ну, думаю, трымайся, Хвядос Грошаў! Зараз табе ікнецца не меньш чым трынаццаць разоў!

А тыдні праз тры мне прыйшоў з рэдакцыі ганарар... роўна сто трыццаць тысяч рублёў. Вось і вярнуў я свой доўг, і ашуканца пакараў. Выходзіць — зусім не благая гэтая лічба — «трынаццаць».

Далей — болей. Пайшоў я ў тэатр, а білет далі... на трынаццаты рад і трынаццатае месца. Вось дык шанцуе! Хоць ты не ідзі на спектакль. Але пайшоў, сеў, гляджу — побач дзяўчына, нібы з карціны сышла. Такая прывабная, ветлівая, сціплая. Як углядзеўся я ў яе — нічога не бачыў, што на сцэне рабілася. Нібы ружовым туманам вочы завалакло. Мала-памалу пазнаёміліся. Спытаў, дзе жыве, сказаў, што нібыта я — яе сусед. Потым сябравалі з ёй — год і адзін месяц (зноў — 13), а зараз — муж і жонка.

Пажадайце ж мне трынаццаць дзетак, гэткіх пестуночкаў. Можа, я стану першым бацькам-героем.

І не бойцеся, калі ласка, лічбы «трынаццаць». Магчыма, і вам яна калі-небудзь дапаможа.




## Даная і Напалеон

З некаторага часу я адчуў, што мяне ўладна пацягнула да мастацтва. У людзей вунь кватэры абвешаны карцінамі, і мне захацелася. Бегма кінуўся ў фірменны ма-

газін і пацікавіўся, якую карціну было б найлепш купіць, каб упрыгожыць сваю кватэру. Каб было і хораша, і арыгінальна, і не дужа дарага. Рэпрадукцыю, вядома.

— Вазьміце «Данаю» Рэмбрандта, — параілі мне. — Гэтай жанчынай, увасабленнем прыгажосці, захапляліся ва ўсе часы пасля стварэння карціны.

— Няўжо? — здзівіўся я. — Тады дайце на ўсякі выпадак два экзэмпляры. А колькі каштуе?

— Дробязь, — адказала прадаўшчыца. — Сама рэпрадукцыя на паперы лічаныя тысячы, а пад шклом і ў рамцы — трохі даражэй.

«Сапраўды, дробязь, — падумаў я. — Вазьму дзве карціны. Спатрэбяцца».

Прынёс шэдэўры мастацтва дамоў і з замілаваннем глядзеў на іх. Пасля паставіў адну карціну за шафу, а другую пачаў вешаць на сцяну. Думаў, жонка ад радасці аж падскочыць. А яна падскочыла да мяне ледзь не з кулакамі і бурна выказала сваю незадаволенасць:

— На чорта ты прыцягнуў гэтае сарамацішча? Толькі гэтага яшчэ не хапала ў маёй хаце! Што, апранутых жанчын ужо не малююць? — з'едліва спытала яна.

— Што ты разумееш? — не менш з'едліва і ў той жа час павучальна адказаў я. — Трэба выбівацца з непралазнай цемры. Далучайся да высокага мастацтва.

— А дзеці? — не супакойвалася жонка.

— А што дзеці? Няхай прывыкаюць. Не маленькія ўжо, раманы ў школе вывучаюць. Хутка і самі пачнуць раманы круціць.

Не ўсё было проста. Я павешу карціну — жонка здыме. Я зноў павешу — яна зноў за сваё. Але ўрэшце рэшт змірылася і махнула рукой, таму што здымаць замарылася.

Аднойчы зайшоў да мяне даўні сябар. Як утаропіўся ў карціну — не адарве вачэй.

— Хто такая? — пытае.

— «Даная», — адказваю. — Класіка. Шэдэўр.

— Прадай, — просіць. А ў самога вочы загарэліся, бачу, не адступіцца.

— Бяры задарма, — узрадавалася жонка.

— Не, — глыбокадумна прамоўвіў я.—Такую рэдкую рэч так проста не ўступлю.

— Добра, я ў цябе яе выкуплю, — запэўніў сябар. — І выкуп будзе ўсім на зайздрасць!

Праз нейкі час прыходзіць і нешта прыносіць. З парога ўрачыста абвяшчае:

— Я табе за тваю гуляшчую імператара прынёс!

— Якога імператара? — не зразумеў я.

— Напалеона!

— Каньяк? — узрадаваўся я.

— Не, кніжку пра палкаводца. Трэба павышаць культурны ўзровень, а не піць.

«Што ж, — падумаў я, — кніжку дык кніжку. Не вялікі прыбытак, але не важная і страта. Тым больш — у мяне яшчэ адна такая карціна ёсць».

Сябар пайшоў, а я выняў з-за шафы другую «Данаю» і павесіў на месца. Як нічога і не здарылася.

А неўзабаве завітаў яшчэ адзін госць. Зірнуў на сцяну і радасна гукнуў:

— Га, «Даная»! Колькі гадоў шукаю. Дзе дастаў?

— З цяжкасцю, прытым вялікай. Яшчэ і прыплаціў, — загадкава заўважыў я. — Класіка зараз у цане.

— Даю што хочаш, — настойваў госць. — А можа, «Напалеона» прынясу?

— Якога «Напалеона»? — нібы не зразумеў я.

— Як якога? Кніжку. У аматараў чытання даражэй за золата.

— Нясі каньяк! — Рашуча запатрабаваў я. — Кніжка ў мяне ўжо ёсць.

На гэтым і дамовіліся.

«Добры гандаль, — падумаў я. — Трэба будзе пашукаць яшчэ».

Так і шукаю па сённяшні дзень. Ужо для сябе. Настолькі звыкся з гэтай «Данаяй», што калі не стала яе на сцяне, то і ў кватэры, і ў душы зрабілася неяк сумна і пуста. Але, на жаль, ніяк не магу знайсці.

Не абменьваць жа мне назад у сяброў «Напалеона» на «Данаю».

# Няўдача Яўмена Здабыцкага

Усё жыццё марыў Яўмен Здабыцкі аб сваёй гаспадарцы. Хай сабе маленькай, але ўласнай. І вось праз шмат гадоў, сабраўшы грошай, ён набыў дачу. А жыў у адзіноце, дык і занятак дарэчы.

Увесну сяк-так апрацаваў і засеяў грады. А паколькі практыкі не меў, то за кансультантаў былі суседзі па дачным пасёлку. А неўзабаве завёў і пчол. Пару вулляў. Хай будуць, падумаў. Хутка мёд буду вёдрамі чэрпаць.

Неяк на рабоце пачалася падпіска на перыядычныя выданні. Яўмен падпісаўся на часопіс па раслінаводстве, а пасля запатрабаваў яшчэ часопіс «Пчалаводства».

— На гэтае выданне ліміт вельмі малы, — сказала адказная за падпіску.

— Выпісвайце! — са злосцю запатрабаваў Яўмен, — інакш ад «Раслінаводства» адмоўлюся, — і дамогся-такі свайго.

А тут супрацоўнікі пачалі пад'ялдыкваць Здабыцкага:

— Выпішы яшчэ часопіс «Каняводства».

— А гэта навошта мне? — здзівіўся Яўмен.

— Як навошта? Будзеш араць і баранаваць участак. А потым пачнеш абрабляць і суседнія ўчасткі. Будзе здабытак — свежая капейка.

А другі супрацоўнік падхапіў:

— Раз купіш каня — патрэбен і хлеў. Значыцца, трэба выпісаць што-небудзь і па будаўніцтве.

Карацей кажучы, навыпісваў Яўмен столькі спецыяльных выданняў, што чытанне і вывучэнне іх «з'ядала» амаль увесь вольны час. Не стала калі займацца дачай, паступова пустазелле забіла на градах культурныя расліны. Гуркоў і памідораў не стала відаць, бур'янам і палыном забіла. Нават мёд, які працавіта цягалі пчолкі, пачаў аддаваць горыччу. А прапалку рабіць не было калі, бо Здабыцкі ўсё павышае свае веды па раслінаводстве, пчалаводстве, каняводстве, будаўніцтве і шмат яшчэ па чым.

Калі бур'ян парос вышэй за вуллі, Яўмен вырашыў перавезці іх у горад і паставіць на балконе. Пчолкі ж могуць лётаць за некалькі кіламетраў і насіць мядок прама да кватэры.

Тут і пачалося. Справа ў тым, што паміж пчоламі і суседзямі атрымаўся разлад. Пчолы пачалі адчайна джагаць суседзяў, і тым не стала ніякага жыцця. Ні выйсці з пад'езду, ні зайсці. Нават акно ці фортачку нельга расчыніць.

Праз некаторы час суседзі хадзілі хто з носам, тоўстым, як бульба, ад пухліны, хто з перавязанай шчакой ці шыяй. А дзеці баяліся вяртацца з садзікаў дамоў.

Нарэшце цярпенню суседзяў надышоў канец. Яны паскардзіліся ўчастковаму, а пасля звярнуліся ў таварыскі суд і дамавы камітэт. Тут бы Здабыцкаму апамятацца і завезці пчол зноў на дачу, але ён заўпарціўся:

— Чым вы незадаволены? Я хачу, каб вы былі бліжэй да прыроды. А пчаліны яд нават карысны для здароўя...

Толькі суседзі не пажадалі працягваць сваё жыццё падобным чынам і паставілі пытанне рубам: выселіць з дому або пчол, або Здабыцкага...

— Выселіць пчолак? — абурыўся Яўмен. — Толькі разам са мной!

...Зараз былыя суседзі Здабыцкага жывуць спакойна, а Яўмен загарае на дачы сярод бур'яну і пад прыемны акампанемент пчалінага гуду вывучае спецыяльныя часопісы. А на работу ездзіць. Назад у горад вяртання няма.

## Небяспечная хвароба

Трамвай павольна грукаў коламі па рэйках і быў поўны людзей. На задняй пляцоўцы стаяў дзед і прыкметна хістаўся.

— Прайдзі, стары, уперад, там табе ўступяць месца, — параіў адзін з пасажыраў.

— Не хачу, не да таго мне, — адказаў той.

— Дзіва што, — заўважыў другі мужчына. — На нагах ледзь трымаецца, а на душы, відаць, весела. Куды ўжо там маладых папракаць, калі нават стары зранку п'яны. Пэўна, добра прыклаўся да пляшкі.

— А ты бачыў? — агрызнуўся дзед. — Ты са мной сядзеў за адным сталом?

— Няма чаго і бачыць, і так усім відаць. Смурод за кіламетр чуваць.

— Эхе-хе, — завохкаў дзед. — Сапраўды, узяў на зуб трохі гарэлачкі, каб на яе ліха. Дык кажу ж: на зуб. А што рабіць, калі ные і баліць, хоць на сцяну лезь. І якія лекі ні спрабаваў ужываць, нічога не дапамагае. Іншы раз так тузане, аж кароткае замыканне ўваччу. Вось тады і даводзіцца ўжываць выпрабаваны продкамі сродак.

Неўзабаве стары выйшаў на прыпынку і памалу падыбаў няпэўнай хадой. Але тут нечакана з'явіўся міліцыянер і ўзяў яго пад руку.

— Грамадзянін, пройдзем са мной!

— Не магу я, у мяне зуб, пусціце, — прасіўся стары.

— Ва ўсіх зубы, а ў мяне што, няма зубоў? — няўмольна адказаў міліцыянер. — Такіх толькі адпускай, век не навядзеш парадку.

Але раптам старога так кальнула, што аж іскры з вачэй пасыпаліся. Ён схапіўся за шчаку і пахіснуўся.

— Сынок, дарагі, прашу цябе, пакажы, дзе зубная клініка, а пасля хоць у выцвярэзнік.

І тут вочы ў міліцыянера засвяціліся спагадай. Ён паказаў дзеду на прыгожы будынак, што стаяў насупраць, і сказаў:



— Добра, дзед, ідзі сабе, лячыся. Я сам нядаўна зуб ірваў. Бачу, што парадак парушаць ты не збіраўся.

— Дзякуй за ласку, сынок. Дай табе Бог добрую жонку. Зубастую.

І ён паспешліва патупаў да клінікі.

# Як стаць вядомым

Калі вы дасягнулі сярэдніх гадоў, і вам хочацца зрабіць нешта значнае — напрыклад, пакінуць свой прыкметны след у літаратуры, — не сумнявайцеся і ідзіце працаваць літкансультантам. Не важна, што за ўвесь час вы напісалі не больш як тры напалову крытычныя, напалову літаратуразнаўчыя артыкулы. Справіцеся. Работа, праўда, не вельмі прыбытковая, але ж і не пыльная.

А як жа справіцца, калі вас ніколі не вабіў чароўны свет паэзіі, дый проза не захапляла? Наконт гэтага ў нас ёсць некалькі выпрабаваных, жыццём правераных парад.

Калі пачнецца абмеркаванне твораў членаў літаб'яднання, не спяшайцеся, як кажуць, раней бацькі ў пекла. Дайце выказаць свае думкі іншым. Літгурткоўцы самі зубастыя. Пішуць хто як, але абмяркоўваюць — ого-го! Яны пачнуць так скубсці адзін аднаго, што толькі пер'е будзе ляцець. Вам застанецца толькі выслухаць усіх, выбраць агульную думку і выказаць яе. Будуць і козы цэлыя, і ваўкі сытыя, а вы — на вышыні.

Калі ж які-небудзь жаўтароты пачатковец наіўна запытаецца ў вас пра ямбы, харэі і амфібрахіі, а вы і самі ніколі не абцяжарвалі сваю памяць такімі складанымі рэчамі, трэба не траціць самавалодання, а павучальна сказаць:

— Літаб'яднанне, малады чалавек, не літаратурны лікбез і не школьны гурток. Тут трэба гаварыць па сур'ёзным рахунку пра творы, якія заслугоўваюць увагі.

Калі ж малады аўтар будзе дапытвацца, чаму не друкуюцца яго верш ці апавяданне, якія вы раней ухвалілі (а яго, скажам, «зарэзаў» рэдактар), то зусім бадзёра адкажыце яму:

— Нічога, хай вылежыцца. Твор, як і добрае віно, ад гэтага робіцца яшчэ мацнейшым. Вы ж пішыце, працуйце над сабой.

Іншы раз хто-небудзь з маладых захоча «падкузьміць» вас. Скажам, аднойчы ў вас хопіць мужнасці раскрытыкаваць яго верш. А ён хуценька тыцне вам у твар выразку з газеты ці часопіса і з'едліва прамовіць:

— А я ўжо даўно надрукаваў гэты верш!

Можа, і сапраўды вы памыліліся? Але не падводзіць жа, не крытыкаваць паважанае выданне, з якім паспеў пасябраваць пачынаючы паэт. І разам з тым вы павінны трымаць сваю марку.

— Ну што ж, — адкажыце вы з пачуццем уласнай годнасці, — ад таго, што ваш верш друкаваўся, ён не зрабіўся лепшым.

А то зойдзе гаворка пра літаратурныя аўтарытэты: у каго вучыцца майстэрству, на каго раўняцца? Могуць задаць і такое пытанне:

— Каго вы можаце назваць сёння лепшым пісьменнікам?

Вось тут у вас і з'явіцца цудоўная магчымасць вызначыцца і паказаць адразу некалькі сваіх станоўчых якасцей.

Вы павінны трохі збянтэжыцца, нават злёгку пачырванець, зрабіць невялікую паўзу і толькі тады адказаць:

— Назваць лепшага не дазваляе заўжды ўласцівая мне сціпласць...

Усе зразумеюць і ацэняць вас.

Вось і ўся нямудрая навука. Засвойце гэтыя нескладаныя правілы, і поспех забяспечаны.

І не так ужо важна, што вы не створыце ўласных літаратурных шэдэўраў. Затое будзеце ўвесь час сярод маладых, і на ваш юбілей пра вас напішуць ці скажуць :

— Ён клапатліва выхоўваў маладую творчую змену!

І, можа, гэта будзе ваша галоўная або нават адзіная заслуга.

## Незвычайнае здарэнне

Дзед Іван любіў хадзіць у грыбы. Як кажуць, хлебам не кармі, а дай у лес схадзіць. Часцяком дыбаў з кошыкам па баравікі і чырвонагалоўкі. Вось і ў гэты дзень не ўседзеў дома і падаўся ў лес.

Дзед Іван хадзіў-хадзіў па лесе і памалу адышоў далёка, залез у самы гушчар. Кошык амаль напоўніўся грыбамі. Былі тут і падасінавікі, і падбярозавікі, і рыжыкі, але хацелася сабраць больш баравікоў. А тут хутка звечарэла, і раптам непадалёк заблішчэлі зялёныя агеньчыкі. «Ваўкі!» — прамільгнула ў дзедавай галаве. Тут ужо было не да грыбоў. Дзед хуценька шпурнуў кошык вобземлю і кінуўся наўцёкі. Але не так проста было ўцячы. Шэрыя драпежнікі трушком даганялі старога, і яму ўжо здавалася, што зараз яны ўчэпяцца ў яго штаны. У роспачы ён абшчапіў бліжэйшае дрэва і палез уверх хутчэй за маладога, адкуль толькі спрыт узяўся!

Толькі дзед узрадаваўся, што пазбегнуў небяспекі, аж зірнуў уверх і ледзь не самлеў: вышэй за яго на дрэве сядзеў... мядзведзь. Відаць, спадзяваўся адшукаць калоду з мёдам і паласавацца. Валасы ў старога сталі дыбам, трапіў, як гаворыцца, з агню ды ў полымя...

Ваўкі спыніліся ля дрэва і цягуча завылі. Страх гнаў дзеда ўсё вышэй. Але дзіва: мядзведзь, які часта небяспечны пры сустрэчы, пачаў... ўцякаць ад чалавека: мішка караскаўся ўверх.

Мядзведзь узлез на самую вяршаліну, і тут яна не вытрымала, пачала трашчаць і... мядзведзь мяшком грымнуўся вобземлю і дзіка зароў ад болю. Ваўкоў нібы ветрам садзьмула, за імі кінуўся мядзведзь, каб хоць на кім сарваць злосць. А стары яшчэ з гадзіну сядзеў на дрэве, пакуль апрытомнеў ад перажытага. А пасля так даў цягу, што толькі пяты мільгалі.

...Зараз дзед Іван рэдка ходзіць у лес. Адбіла ахвоту. Вечарамі выйдзе ён з хаты, сядзе на прызбу і ўспамінае пра сваё здарэнне. Гаворкі хапае на ўвесь вечар.



# Як пісаць рэцэнзіі

Калі вы хочаце ўвесь час быць у цэнтры літаратурнага жыцця, то проста неабходна не прапускаць ніводнай кніжнай навінкі. А прачытаўшы, трэба не прамінуць сказаць сваё важкае слова пра той ці іншы твор. Не прыпадабляйцеся да тых літаратурных «кітоў», якія на пытанне: «Чые кніжкі вы чытаеце і найбольш любіце?» — адказваюць:

— У асноўным — свае!

Трэба быць прасцей, не грэбаваць знаёмствам з чужой літаратурнай «кухняй», нават маладых таварышаў. І кожны раз імкніцеся актыўна і рашуча выказаць сваю пэўную думку пра новы літаратурны твор — ці на старонках друкаваных выданняў, ці ў цесным коле братоў па пяру. Не бойцеся, калі вашы думкі будуць спрэчныя: галоўнае, каб яны былі свае... або падобныя да думкі сталага і ўплывовага пісьменніка-класіка. Такім чынам вы зможаце дасягнуць значных поспехаў і набыць пэўны аўтарытэт. І калі вы пройдзеце каля групы пісьменнікаў або чытачоў, пра вас скажуць:

— Вунь пайшоў вядомы крытык Сымон Назіральнікаў.

Вось вы прачыталі кніжку і селі пісаць рэцэнзію. Якую ж заняць пазіцыю — гэта найпершае пытанне. Далей пойдзе лягчэй. І тут асабліва асцярожным трэба быць з першай кніжкай аўтара. Захвальваць нельга ні ў якім разе, каб пачатковец не адчуў сябе на вяршыні Парнаса. Трэба даць адчуць дэбютанту, што асядлаць Пегаса не вельмі проста: ён можа не раз балюча ўбрыкнуць, а то і скінуць з сябе.

Але нельга перагнуць палку і ў другі бок — «разбіць» кніжку, і зноў жа таму, што яна — першая. А раптам на літаратурнай ніве неўзабаве расквітнее буйны талент! А каму не прыемна, калі гэты вундэр-пісьменнік або паэт праз колькі гадоў здыме капялюш пры сустрэчы і скажа:

— Вялікі дзякуй за падтрымку і дапамогу!

І вы трапіце нават у духоўныя настаўнікі. Так што пісаць на гэты раз трэба акуратна і асцярожна, ва ўсякім разе, добразычліва.

Зусім іншая справа, калі да вас трапіла кніжка сталага пісьменніка. Тут ужо ўсё залежыць ад вашай пазіцыі, ад вашых адносін да аўтара.

Калі аўтар зусім невядомы вам асабіста, тут ёсць прастор для ўласных разважанняў, філасофскіх абагульненняў. Да самой кніжкі можна дакрануцца толькі лёгкім дотыкам, галоўнае ж — паказаць сябе, сваю творчую індывідуальнасць. Дый што тыя прыватныя канкрэтныя заўвагі, не ў іх справа, трэба браць шырэй! Важна асэнсаваць подых часу, крыху папалемізаваць з кім-небудзь або нават самому з сабой. І якое атрымаецца шырокае крытычнае палатно! Ваша вага як крытыка значна ўзрасце.

Але вось выйшла з друку кніжка вашага лепшага сябра, з якім вы яшчэ ў студэнцкім інтэрнаце сёрбалі суп з адной міскі. Памятаеце, ён часта ездзіў у вёску да бацькоў ды прывозіў харчы, а пасля гасцінна клікаў да стала:

— Засцілай, Сымон, абрус-самабранку, зараз зробім сяброўскую вячэру!

І вы не мелі ні сілы, ні жадання адмовіцца.

Ну хіба ж можна абмінуць увагай кніжку такога чалавека? Але калі сядзеце пісаць рэцэнзію, то будзеце глядзець на кніжку праз ружовыя акуляры прыемных успамінаў. Рэцэнзія атрымаецца станоўчая, з падрабязным разглядам творчых дасягненняў аўтара за апошнія гады. А як жа, такая метафарычнасць і вобразнасць, такая глыбіня пачуццяў! Захапіўшыся, вы забудзецеся нават пра традыцыйную канцоўку рэцэнзіі, у якой звычайна падкрэсліваюцца недахопы зборніка. Ды ў каго іх няма, гэтых недахопаў? Затое ў аглядзе крытыкі пра вас зазначаць:

— Сымон Назіральнікаў ніколі не быў крытыканам!

Але што гэта за новая кніжка з'явілася на паліцах кнігарняў? Ды гэта ж зборнік вершаў Рыгора Асота, які не так даўно надрукаваў калючую пародыю на вас. Тут ужо быў бы грэх не прачытаць ды першаму не напісаць рэцэнзію.

Пазнаёміліся вы з кніжкай ды прайшліся чырвоным алоўкам па кожным вершы, а часам — і па кожным радку. І ўбачылі, што зборнік, шчыра кажучы, далёка не геніяльны. Бач, які парадыст! Іншых умее высмейваць, а ў самога колькі недаробак! І рыфмы недакладныя, і вобразы нейкія

звышновыя, не адразу і зразумееш, і падтэкст занадта глыбокі. Нават крытыку цяжка разабрацца. А месцамі можна пры жаданні знайсці нават і драбнатэмнасць. Вось і гатова разгромная рэцэнзія. Трымайся, парадыст! А пра вас на гэты раз скажуць:



— Вось які прынцыповы Сымон Назіральнікаў! Гэта ж трэба — так падрабязна разабраць недахопы!

З цягам часу вы зможаце набіць руку на рэцэнзіях, і з вамі пачнуць лічыцца. І як бы вы ні выказваліся адносна таго ці іншага твора або аўтара, вашы словы падхопяць і скажуць:

— Так сказаў Сымон Назіральнікаў!

А ці будуць з вамі згодны, ці не — гэта ўжо іншая справа.

## Літаратурная энцыклапедыя

*Аўтар* — чалавек, які працуе з дапамогай аўтаручкі.

*Аўтограф* — самы прыемны момант у пісьменніка.

*Байка* — калі абяцаюць выдаць кніжку, але адкладваюць на шмат гадоў.

*Балада* — верш, у якім часам паэт натхняе ў асноўным самога сябе.

*Белы верш* — калі паэт не знаходзіць часу рыфмаваць і лічыць, што ашчаслівіць чытачоў толькі думкай.

*Выдавецтва* — выдае сябе за прыхільніка творчасці. Часам так і бывае.

*Вобраз* — калі пачатковец уяўляе сябе вядомым пісьменнікам.

*Ганарар* — не заўсёды адпавядае гонару.

*Гіпербала* — захвальванне не вельмі здольнага аўтара.

*Гумар* — уменне быць вясёлым, калі нават нявесела. Няўдачнік той, хто няздольны да гумару. Але зусім няшчасны той, хто не разумее нават чужога гумару.

*Драма* — калі драму забракавалі.
*Дыфірамбы* — самы шкодны спосаб ухвалення.
*Дыялог* — размова аўтара з рэдактарам. Не заўсёды прыемная.
*Жанр* — выбар яго асабліва важны тады, калі пісьменнік стаіць на раздарожжы і ніякі жанр яго асабліва не вабіць.
*Зборнік* — той, хто збірае малыя творы на кніжку.
*Іронія* — звычайны спосаб размовы некаторых старэйшых з маладымі. Ужываць у адваротным выпадку небяспечна.
*Каламбур* — міні-твор, дзе ўсё так заблытана, што не разумеюць ні чытачы, ні аўтар.
*Карэктар* — чалавек, які не заўжды размаўляе карэктна.
*Крытык* — крые часам твор, які няма за што крыць. Крытыка — найменш ужывальны сродак ад захвальвання.
*Легенда* — калі аўтару сказалі сябры ці сваякі, што ён таленавіты.
*Лірыка* — лічыцца любімым заняткам літаратара. Ужываецца як лекі для хворай душы.
*Літработнік* — выпісвае за дзень не менш як літр чарніла.
*Маналог* — калі аўтар з запалам крытыкуе рэдактара, а той адсутнічае.
*Мараль* — абавязковая канцоўка рэцэнзіі. Аднак калі прапануюць скараціць рэцэнзію, то здымаецца звычайна канцоўка.
*Машыністка* — работніца рэдакцыі, якая любіць ездзіць на службовай машыне.
*Мініяцюра* — малы твор, у якім аб'ём работы ў адваротнай прапорцыі з ганарарам.
*Надпіс* — звычайна прысвячаецца будучаму рэцэнзенту.
*Ода* — безумоўны прызнак таго, што паэт закахаўся.
*Памер радка* — найлепш самы кароткі, каб сэканоміць энергію.
*Пародыя* — распаўсюджаны сярод сатырыкаў спосаб набыць шмат ворагаў.
*Пісьменнік* — на стараславянскай мове «спісвацель». Часам гэты сэнс захоўваецца і на іншых мовах.
*Перавыданне* — калі больш няма чаго выдаваць.
*Раман* — калі пісьменніку сустрэлася тая адзіная, якая натхніла на вялікі твор.

*Рукапіс* — рэкамендуецца пісаць правай рукой, а не левай нагой.

*Рытм* — калі вершы пішуцца штодзень, нягледзячы на якасць.

*Рыфма* — калі абыдзеш усе рыфы сціпласці і скажаш слова ў слова з класікам.

*Рэдактар* — жывы бог перад аўтарамі.

*Рэдакцыя* — гэта не дырэкцыя: яна, напрыклад, не прымае на пасаду пісьменніка і не звальняе з яе.

*Сакратар* — работнік рэдакцыі, які ведае ўсе сакрэты.

*Сатыра* — магутны сродак лячэння людзей.

*Стыліст* — стыляга слова, які, аднак, прытрымліваецца стылю аўтара.

*Трагедыя* — не тады, калі не выйдзе добрая кніжка, а калі выйдзе дрэнная.

*Трыумф* — калі заключаеш дагавор з выдавецтвам.

*Уводзіны* — спроба аўтара адвесці чытача ад пошукаў галоўнай думкі ў творы.

*Фраза* — мае мэтай выказацца коратка і зразумела. Часта атрымліваецца наадварот.

*Харэй* — станоўчы водгук рэдактара.

*Цытата* — замаскіраваны плагіят.

*Чытанне* — карысны занятак не толькі для чытача, але і для пісьменніка.

*Шарада* — калі сюжэт твора закруглены, як шар: ні пачатку, ні канца.

*Эпапея* — калі аўтар доўга ходзіць у рэдакцыю ў чаканні, што яго надрукуюць.

*Эпіграма* — спосаб няроўнай барацьбы аднаго супраць многіх.

*Эпітафія* — яе можна пісаць, калі аўтар прызнаў, што першая яго кніжка — апошняя.

*Эрудыт* — чалавек, які не толькі піша, але і ведае, як выдавацца.

*Юбілей* — пахаванне літаратара пад бярэмем кветак.

*Ямб* — скарочаная форма ад слоў «я мог бы» (калі б хапіла таленту).

# МЕМУАРЫ

*Пісьменніцкія жартачкі*



# ВЕСЯЛІМСЯ, БРАТКІ, ВЕСЯЛІМСЯ!

*Пісьменнікаў па творчасці ведаюць усе. А вось па жыцці, па побыту мала хто ведае. Між тым пісьменнікі — вельмі цікавыя, арыгінальныя людзі. І ў адносінах да сур'ёзных спраў, і павесяліцца ўмеюць, і трапна, дасціпна пажартаваць. Іншы раз такое адколюць, што захістаешся. Ад смеху, ад рогату, ад роздуму. Хочацца расказаць пра падобнага роду выпадкі, сведкамі якіх быў сам і некаторыя іншыя людзі, у асноўным — таварышы па пяру.*

## МАГУТНАЯ ТРЫЯДА

Аднойчы, ужо даўно, я пад'ехаў на суседні завод, зрабіў свае інжынерныя справы, паабедаў у сталоўцы і пайшоў на выхад. Дайшоў да рогу вуліц, гэта прыкладна ў раёне кінатэатра «Сучаснік», гляджу — на процілеглым баку стаяць трое, як дубы, — Міхась Стральцоў, Яўген Крупенька ды Іван Курбека. Стаяць і цікуюць, хто ім сустрэнецца. У Стральцова адно вока ўжо закрывалася ад пастаяннага «недапіцця».

Убачыўшы мяне, таварышы па пяру запатрабавалі:

— Мікола, пастаў пляшку. Паміраем ад смагі.

Я — мац, мац па кішэнях — няма ні рубля. Але тут жа прыгадаў, што ў сталоўцы забыўся ўзяць рэшту.

— Пачакайце, хлопцы, — кажу, — вярнуся на завод, вазьму грошы.

Схадзіў, забраў, купіў вялікую пляшку віна, завёў хлопцаў у бліжэйшую сталоўку, узяў па кавалку хлеба. На гэтым мае грашовыя рэсурсы скончыліся. Наліў па поўнай шклянцы віна. Выпілі. Крупенька адным пальцам грэбліва адкінуў кавалак хлеба і з'едліва прамовіў:

— Вось дык закусь!

Але я знайшоў адказ:

— Нічога, усе абедалі, — і хуценька пайшоў.

А сам падумаў: нічога сабе, напаі іх, ды яшчэ накармі — такую хеўру. Гэта ўжо занадта.

Аднак гэтыя невялікія слабасці не перашкодзілі маім таварышам пісаць добрыя мастацкія творы.

## АНТОН БЯЛЕВІЧ, АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

У ранейшы час іду па плошчы Перамогі (тады яна называлася Круглай плошчай) і сустракаю старога паэта Антона Бялевіча. Ён быў энергічны, рухавы, часам нават скандальны, але да мяне, маладога паэта-сатырыка, ставіўся прыхільна. Я ж звяртаўся да яго ласкава і з павагай: дзядзька Антось.

— Здароў, Мікола! — кажа ён. — У мяне ёсць два рублі. Дакладзі яшчэ два з капейкамі — возьмем дзве «чакушкі» ў «круглым» гастраноме і пойдзем да Анатоля Астрэйкі, ён жыве тут блізка, на праспекце, у яго — мора закусі.

Насустрач нам ідзе Пятро Прыходзька — дужы, шыракаплечы, шыракатвары.

— Здароў, парася! — кажа Бялевіч. — Ёсць грошы, то пойдзеш з намі, а як няма, дык ідзі сваёй дарогай.

— Няма, — сумна адказвае Прыходзька.

— Ну й ідзі!

Схадзілі ў краму, узялі, што трэба, прыходзім да Астрэйкі, а там ужо сядзіць Рыгор Няхай. Адзначаюць сустрэчу, весела гамоняць. А на стале — «мора закусі» — кілька, капуста і хлеб. Па калідоры сноўдаецца жонка, дэманстратыўна грыміць посудам. Пры нашым прыходзе Анатоль Пятровіч схадзіў на кухню і прынёс яшчэ капусты — палоску ад выцягнутай уверх рукі да самай падлогі — рэдкі цуд.

Пасядзеўшы, пагаманіўшы, Бялевіч прапанаваў:

— Мікола, пачытай свае вершы.

Я прачытаў тое, што лічыў лепшым і найноўшым. Старэйшыя — ці то дзеля ветлівасці, ці зусім сур'ёзна — пахвалілі іх. А пасля Антон Бялевіч пытаецца:

— А скажы, Мікола, як табе падабаюцца мае вершы?

Я трапіў у няёмкае становішча. Як чытач і як сатырык я не мог сказаць, што мне ўсё падабаецца, бо ў Бялевіча побач з добрымі творамі было нямала і «барабанных», дзяжурных, прахадных вершаў, прытым зацягнутых. Але ж і крытыкаваць вядомага паэта я, малады, не мог. І я выбраў аптымальны варыянт:

— Ведаеце, дзядзька Антось, пішаце вы добра, але пішыце карацей.

А сам сцяўся ўвесь: раптам ён пачне лаяцца або нават біцца? Характар жа меў выбуховы, і не з такімі, як я, былі сутычкі. Аднак усё абышлося.

— Правільна кажаш.

І мы працягнулі нашу сяброўскую і творчую сустрэчу.

## УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

З ім я здаўна жыў і цяпер жыву непадалёку. З майго балкона відаць ягоны, а з ягонага — мой. Сустракаліся і дома, і ў выдавецтве, і ў Саюзе пісьменнікаў. Неаднаразова разам адпачывалі ў Доме творчасці.

Я пісаў яму прывітальныя вершы і на пяцьдзесят, і на шэсцьдзесят гадоў, хоць на яго юбілеях ні разу не быў. Напрыклад, на 60 гадоў ён не захацеў ніякіх урачыстасцей і знік у сваёй роднай вёсцы Замошша. Я ж напісаў прывітанне і кінуў у яго паштовую скрынку. Заканчваўся верш так:

Гронкі вершаў, як зярняты,
У людскую сей раллю.
А за гэтае вось свята
Не нальеш, дык сам налью.

Праз нейкі час прыходжу да Паўлава дамоў. Ён прыгадаў гэты верш і сказаў жонцы:

— Тамара Мікалаеўна, налі нам з Міколам па сто пяцьдзесят грамаў.

Тая наліла. Але роўна па сто пяцьдзесят і толькі раз. І ўсё ж мой верш, маё старанне не прапалі марна.

У Доме творчасці вечарамі нярэдка сядзелі мы пасяброўску, гаманілі пра творчасць, жыццё, пра ўсё на свеце, і па ўсіх пытаннях разумелі адзін аднаго, сыходзіліся ў думках. Аднойчы заходжу ў яго пакой — ён вымае кашалёк і пачынае ў ім калупацца. Потым, паказваючы на мяне, кажа:

— Як толькі ён заходзіць, я адразу хапаюся за кашалёк і пачынаю лічыць грошы. А ён так і цікуе, ці шмат у мяне грошай. Это — нехорошо!

І засмяяўся, а я — за ім. Потым доўга рагаталі.

Аднойчы прагульваемся. Я вырашыў пажартаваць і як бы праверыць яго.

— Уладзімір Андрэевіч, — пытаюся я, — вось слова «мох». А калі ляжаць у ім, то як гэта сказаць?

— У моху, у мосе, у мху... э! — і ён махнуў рукой і пабег.

— Андрэевіч, — крыкнуў я ўслед, — іду па ільду, дам па ілбе, кашуля з ільну, змагацца з ільвом, ляжу ў імху...

## УЛАДЗІМІР ДЗЮБА

Аднойчы ў газеце «Знамя юности» была надрукавана нізка лірычных вершаў у перакладзе з беларускай мовы. Зверху быў падпісаны аўтар: «Владимир Клюв». Пасля аказалася, што гэта вершы Уладзіміра Дзюбы, а перакладчык перастараўся, пераклаў не толькі вершы, але і імя, прозвішча паэта. Валодзя быў у роспачы, бо не толькі аўтарства прапала, але і ганарар не мог атрымаць — прозвішча не сыходзілася. Чым гэта скончылася — цяжка сказаць, але жарт атрымаўся няўдалы.

## ЮРАСЬ СВІРКА

Прыходжу да яго ў рэдакцыю «Літаратуры і мастацтва». Ён радасна мяне сустракае:

— Вось твае рукапісы, я кладу іх зверху стала, радуйся.

— Дзякуй, — кажу, — а як пайду, перакладзеш іх на ніжнюю полку?

Праз колькі дзён я напісаў на гэтую тэму эпіграму, канцоўка яе такая: *Паэт пайшоў. Той кажа: — Каб ты скіс! — І рукапіс перакладае ўніз.*

Эпіграма была надрукавана ў тым жа «ЛІМе».

Іншым разам, пагаварыўшы са Свіркам і здаўшы яму новыя вершы, выйшлі ў калідор, і тут бачу Міколу Зыля. Ён працаваў і ў абкаме камсамола, і намеснікам дырэктара тэатра імя Янкі Купалы, а пасля — рабочым трактарнага завода. Пісаў апавяданні, часам друкаваўся. Па-сяброўску рэкамендую яго Свірку:

— Юрась Мікалаевіч, вось малады, але здольны празаік Мікола Зыль. Свірка чамусьці набычыўся і ўтаропіўся ў Зыля. Той таксама набычыўся і ўтаропіўся ў Свірку. Стаяць напаўсагнутыя і абое маўчаць. Прама нямая сцэна, як па Гогалю. Потым Свірка кажа:

— Нясіце творы ў «Чырвоную змену».

І пайшоў у свой кабінет.

Зыль незадаволенна прамовіў:

— Ну вось, толькі ты сказаў «малады, але здольны», як ён адразу: ідзі ў «Чырвоную змену»!

Неяк мне расказалі, што Свірка выдаў аднатомнік і на ганарар пабудаваў сабе дачу. Я тут жа скеміў і напісаў верш:

*Свірка выдаў аднатомнік*
*І зрабіўся як надомнік.*
*Збудаваў сабе ён дачу.*
*Мусіць, цісне там і чачу.*
*А смалістае бярвенне*
*Надае яму натхнення.*
*Як асвоіць гэты домік,*
*Выдасць новы аднатомнік.*

Чытаў Юрасю Мікалаевічу гэты верш. Разам пасмяяліся. Праўда, у друк ён гэты твор не прапанаваў. Нічога, возьмуць іншыя...

## СЦЯПАН КУХАРАЎ

Выступаем з ім у творчай камандзіроўцы. Позна вечарам заходжу да яго ў гасцінічны нумар. Ён п'е гарбату. Прапануе і мне. Я сыплю цукар у шклянку, не шкадуючы. А ён назірае за мной.

— Чаму так многа сыплеш? — пытаецца.

— Люблю салодка. А цукар купіцца, — невызначальна кажу я.

— Кім купіцца? — падазрона пытае Сцяпан Іванавіч.

— Кім-небудзь, — весела адказваю я.

## АВАР'ЯН ДЗЕРУЖЫНСКІ

Авар'ян Сафонавіч — яго называлі ў жарт Сафоклавічам — вельмі любіў выступаць, і падоўгу. Стане перад публікай, шырока расставіць ногі, патрэ падбародак, тройчы кашляне:

— Кхе, кхе, кхе!

І пачынае. Чытае, чытае, а потым кажа:

— На мае вершы напісана трыста песень. — (Мяне гэта вельмі здзіўляла: мусіць, перабольшвае разоў у дзесяць, бо нават у славутага Адама Русака наўрад ці ёсць столькі). — Мае песні спяваюць усюды, у тым ліку ў Англіі,

Японіі. Асабліва вядомая песня «Ой, мяцеліца». Адну з песень я вам праспяваю.

*Вой ты, мая журавіначка,*
*Вой ты, мая журавіначка,*
*Вой ты, мая жураві...*

На гэтым месцы ён заклікае слухачоў:

— А далей спяваем разам!

Публіка маўчыць, затое аўтар аж заліваецца. Скончыўшы песню, Сафонавіч зрываецца з месца, падбягае да аднаго чытача і пытаецца:

— Ну як, добра?

Той маўчыць.

Авар'ян хапае яго за руку, моцна цісне і трасе:

— Дзякуй, дзякуй!

Пахваліўшы самога сябе, ён урачыста абвяшчае:

— А зараз я буду чытаць вам свой гумар!

Чытае і сам смяецца, аж заходзіцца. А публіка маўчыць.

Ну што ж, абы самому было смешна і прыемна...

## ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

Неяк у Доме творчасці праводзіўся семінар кіраўнікоў літаратурных аб'яднанняў. Лекцыі, абмеркаванні, выступленні. На адну з лекцый быў запрошаны Іван Шамякін. Са сталых пісьменнікаў прысутнічаў таксама Іван Чыгрынаў. Напачатку лекцыі ён папрасіў у аднаго семінарыста цыгарэту, сеў у нішу, каб яго не было відаць, і закурыў. Затым ён заснуў і спаў да канца лекцыі. Але своечасова прачнуўся. Пасля апошніх слоў Шамякіна падышоў, звысоку паляпаў яго па плячы і прамовіў:

— Шаноўны Іван Пятровіч! Калі вы выступаеце, я гатовы слухаць вас бясконца!

Бывае, не важна, што спіш, важна своечасова прачнуцца.

## МІКОЛА ГАМОЛКА

Мікалай Іванавіч усё жыццё меў маленькі дзіцячы тварык. Пасля вайсковай службы доўга насіў форму і боты. Не любіў ніякіх скругленняў: дарогу пераходзіў і паварочваўся не авальна, але пад прамым вуглом.

Аднойчы зайшоў у цэнтральную кнігарню, стаў у канцы доўгага стала і разглядае кніжкі. Прадаўшчыца з другога боку ўбачыла яго і кажа:

— Хлопчык, злезь са стала.

Ідзе Мікалай Іванавіч па Круглай плошчы (цяпер плошча Перамогі), а насустрач Антон Бялевіч — як часцяком бывала, нападпітку. Убачыў Гамолку дый кажа яму:

— Вось ты, Прыходзька — добры паэт, а Гамолка — абы-што.

Мікалай Іванавіч пачырванеў (ён і так быў заўжды ружовенькі), шчоўкнуў абцасамі і адказаў па-вайсковаму:

— Ніяк не, таварыш Бялевіч!

## СЕРАФІМ АНДРАЮК

Заходжу ў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сустракаю рэдактара Рыгора Яўсеева. Гаманілі аб справах, пра мой рукапіс кнігі. Потым абое пайшлі па патрэбе. Каля дзвярэй туалета сустракаем дырэктара выдавецтва Серафіма Андраюка. Той падазрона на нас паглядзеў. Відаць, падумаў: вось аўтар і рэдактар ідуць піць, каб ніхто не бачыў. Знайшлі месца!

Скончыўшы справы, ідзем з Рыгорам на выхад. Да нас далучыўся Іван Міська — навуковец, былы работнік выдавецтва. Вырашылі пайсці ў бар, што на вуліцы Няміга, адзначыць сустрэчу.

Ідзём па праспекце Машэрава. На прыпынку бачым Івана Шамякіна і... Серафіма Андраюка. Ён утаропіўся ў нас вачыма і пільна сочыць. І тут Іван Міська робіць дэмарш. Сказаўшы нам ісці, шыбуе да Шамякіна і Андраюка і гамоніць з імі, каб адцягнуць ад нас увагу. Потым даганяе нас. Гамонім пра рознае. І пра Ніла Гілевіча, і пра Анатоля Вярцінскага. Гаворым і добрае, і не зусім добрае. Калі б Серафім ішоў за намі, то ўсё чуў бы.

Пераходзім вуліцу Нямігу і на другім баку, на прыпынку, бачым... Серафіма. Ён зноў утаропіўся на нас. Трэцяя сустрэча! Пэўна, зразумеў, што ідзем піць.

І тут свой дэмарш робіць Яўсееў. Працягвае нам руку і кажа:

— Ну, я паехаў дамоў.

І хуценька сеў у аўтобус. Так сказаць, рэабілітаваўся перад начальствам.

А мы з Іванам Міськo пакрочылі ў бар. Азірнуўшыся, бачым, што Серафім глядзіць нам услед. Ну што ж, няхай сабе глядзіць. Мы ж — не работнікі выдавецтва, а аўтары.

Толькі вось доўга не маглі мы даўмецца, як гэта Андраюк не йшоў за намі, але апынуўся ўперадзе нас. Потым да мяне дайшло, што ён сеў у аўтобус № 63, праехаў адзін прыпынак і апынуўся ўперадзе нас.

## ІВАН КУРБЕКА

Іду аднойчы ў Дом друку, а Іван Курбека выходзіць адтуль.

— Здароў, Іване, — кажу. — Ну, як справы?

— Нічога, вітаюцца, — сумна адказаў ён.

Што ж, дзякуй Богу, што хоць вітаюцца...

## ВЯСЁЛЫЯ СУСТРЭЧЫ

Ідзём з таварышам па алейцы каля Дома творчасці. Насустрач — двое: стары пісьменнік і старая яго жонка — ну, як божы дзьмухавец. У мяне нечакана нарадзілася дурная рыфма, і я, сораму не пазнаўшы, адразу зачытаў ім гэтую страфу:

*Ветэраны, ветэранкі,*
*Я гатоў вас бачыць зранку,*
*І ўвечары, і ўдзень,*
*І ўсюды, і нідзе.*

Таварыш штурхнуў мяне ў бок:

— Ты што гаворыш, хуліган? Ты ж хочаш, каб яны памерлі!

— Э, нічога, я жартую так, — бадзёра адказаў я.

А старыя не пакрыўдзіліся, а засмяяліся.

Назаўтра зранку зноў іду па той жа алейцы і сустракаю тых жа старых. Не стрымаўся і зноў няўдала жартую:

*Ветэраны, ветэранкі...*

Бабулька не дала мне дагаварыць і сама дагаварыла маю канцоўку:

— *І ўсюды, і нідзе!*

І мы разам дружна, утраіх зарагаталі.

Добра, калі людзі бяскрыўдныя... і разумеюць гумар.

## АНАТОЛЬ БЯЛЕВІЧ — СУР'ЁЗНЫ І ЖАРТАЎНІК

Ён любіў называць сябе генералам. І вось сядзіць аднойчы з сябрамі ў рэстаране, гамоняць на роднай мове. А за суседнім столікам — афіцэры, у асноўным — палкоўнікі. Яны чуюць размову і абразліва выказваюцца на адрас беларускай мовы. Бялевіч улавіў гэта, раззлаваўся, падышоў і раз'юшана гаркнуў:

— Як вы можаце абражаць беларусаў на іх зямлі?

Тыя паспрабавалі агрызнуцца, але Антон Пятровіч як раўкне:

— Устаць, калі з вамі гаворыць генерал! Я — генерал Бялевіч. Смірна!

Афіцэры ўскочылі — рукі па швах.

Бялевіч адышоў і, задаволены, сеў за свой столік.

А то быў у творчай камандзіроўцы, выступаў у Гомелі. Прыехаў у аэрапорт, каб вылецець у Мінск. У руцэ трымаў торбачку з яблыкамі. Сам малы, непрыкметны, апрануты так сабе. Пазнаёміўся з іншым мужчынам-спадарожнікам. Разгаварыліся, хто ёсць хто.

— Я — генерал Бялевіч, — безапеляцыйна заявіў Антон Пятровіч.

— Ты што, жартуеш? — не паверыў мужчына.

— Б'емся аб заклад!

— А чым дакажаш?

— А вось зараз сакратар абкама на сваёй машыне падвязе мяне да самога самалёта.

Пабіліся аб заклад. Мужчына ж палічыў Бялевіча за калгасніка.

Бялевіч звоніць у абкам. Неўзабаве падкатвае чорная «Волга» і падкідвае Бялевіча, а заадно і яго спадарожніка на пасадку ў самалёт.

Заклад быў выйграны, але Бялевіч нічога не ўзяў. Такі быў яго жарт.

## АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ

— Галоўнае наша пытанне на сённяшні дзень і надалей — гэта пытанне аб беларускай мове. Бо калі вырашыцца гэтае пытанне, то і каўбасы будзе больш. Бо

эканоміка ў немалой ступені залежыць ад стану культуры. Так што гэта ў нас самае актуальнае пытанне.

## КАНДРАТ КРАПІВА

Я двойчы быў у яго на прыёме, калі ён працаваў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук, а я прасіў у яго рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў. Ішоў і баяўся, такі ён быў на выгляд суровы і непрыступны. Аднак пасля ўпэўніўся, што ў яго, па сутнасці, адкрытая дзіцячая душа. У час майго другога прыходу ён сказаў:

— Мікола, я прачытаў вашы кніжачкі і дам вам рэкамендацыю. Але старайцеся, каб кожная ваша кніжачка была мацнейшай за папярэднюю.

Я так і стараўся.

Расказваюць, што сын Кандрата Кандратавіча быў шкадлівы і хуліганісты. Суседзі ўрэшце рэшт паскардзіліся на яго класіку.

— А я і сам ведаю, што ён дурны, — спакойна і проста адказаў Крапіва.

Людзі яму былі важнейшымі за бесталковага сына.

## ЭДУАРД ВАЛАСЕВІЧ

Наш мудры байкар быў даволі рослы, разважлівы. Яго можна было слухаць бясконца, і ён ніколі не паўтараўся. Жонка яго, цёця Цыля, была маленькая і хударлявая. Калі ёй што-небудзь не падабалася ў размовах ці паводзінах мужа, яна падскоквала і малаціла яго па грудзях ці спіне сваімі маленькімі кулачкамі:

— Эдзік, што ты робіш, нягоднік!

Ён адмахваўся ад яе, як ад надакучлівай мухі, і адказваў:

— Цыля, мне ідзе восьмы дзесятак, і я ведаю, што раблю.

Званю яму аднойчы і кажу:

— Эдуард Станіслававіч, у мяне выходзіць новая кніжка, але не тоўстая.

— Мікола, — адказвае ён, — у цябе як у сатырыка-гумарыста кніжка павінна быць не тоўстая, а моцная.

Я называў яго бацькам. І ён таксама даваў мне рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў.

Славуты сатырык напісаў і надрукаваў аднойчы вянок лірычных санетаў. Адзін з іх заканчваўся прыкладна так:

*Цаню той час, люблю я тую хвілю,*
*Што Бог паслаў мне залатую Цылю.*

Розныя пісьменнікі па-рознаму паставіліся да гэтага верша: хто — жартам, хто — усур'ёз.

## АЛЕСЬ ПІСАРЫК

У маладосці ён быў вельмі пладавітым паэтам. І вось прыходзіць да мяне аднойчы і радасна паведамляе:

— Мікалай Пятровіч, я за гэтую ноч напісаў дванаццаць вершаў!

Сам я больш за адзін верш за вечар не пісаў і ведаў, што колькасць не заўсёды пераходзіць у якасць.

— Дзесяць выкінь, — рашуча адказаў я.

Праз нейкі час ён зноў прыходзіць і кажа:

— Мікалай Пятровіч, я паслухаў тваю крытыку і за гэту ноч напісаў усяго шэсць вершаў.

— Пяць выкінь, — катэгарычна адказаў я.

## МІХАІЛ ГЕЛЕР

Ён працаваў у дзіцячай рэдакцыі і пісаў вершы на рускай мове для дзяцей.

Уступаў у Саюз пісьменнікаў. Другая стадыя — камісія з 21 чалавека, закрытае галасаванне. Міхась вырашыў зрабіць ход канём: уведаў прозвішчы ўсіх членаў камісіі, падыходзіў да кожнага і прасіў-жаліўся:

— Я ведаю, што ўсе будуць супраць мяне, дык хоць вы прагаласуйце «за».

І кожны прагаласаваў «за», думаючы, што толькі ён адзін. У выніку — сто працэнтаў.

І вось трэцяя стадыя — абмеркаванне на прэзідыуме. Усе глядзяць — нейкі цуд: ніхто ніколі не набіраў на камісіі сто працэнтаў галасоў. Пімен Панчанка кажа:

— Малады чалавек, нешта я слаба ведаю вашу творчасць, дык прачытайце які-небудзь свой верш.

Міша чытае. Панчанка зноў просіць:

— Нешта я не разабраўся. Ну, яшчэ адзін.

Міша зноў чытае. Панчанка патрабуе:

— Ну, і апошні верш!

Міша ўзапрэў, але дэкламуе.

— Таварышы, — кажа народны паэт Пімен Емяльянавіч, — каго мы прымаем? Паэта ж няма!

Вось так. Хітрасць падвяла.

## АЛЕСЬ ПІСАРЫК І КАСТУСЬ ЖУК

Завіталі да мяне маладыя на той час хлопцы-паэты. Час ёсць, настрой — таксама. Можна культурна пасядзець, пагаманіць пра жыццё і творчасць. Купілі гарэлкі. У мяне былі тры пачкі цыгарэт «Арбіта», тры кілаграмы памідораў, цэлая каструля варанай бульбы і яшчэ тое-сёе з закусі.

Сядзім, гамонім пра ўсё. Папіваем, закусваем. Хлопцы маладыя, апетыт зверскі.

Бачу, мае запасы на вачах знікаюць у беспамерных жыватах маладых. Трэба было б, думаю, частку памідораў, бульбы ды іншай закусі адкласці, бо жонка, Ніна Тарасаўна, як прыйдзе, будзе галодная. Затое хлопцы не саромеліся. Гляджу, і вялізная міска з памідорамі, і каструля з бульбай, і іншая закусь, і цыгарэты, і выпіўка бясследна знікаюць. Праз тры гадзіны ўсё было пуста. Якая потым была размова з жонкай — можна ўявіць.

— Га-га-га! — рагаталі на адыход хлопцы. — Аб'елі, абпілі, абкурылі Міколу!

Ну, што ж, мне не шкада, абы на здароўе пайшло.

Да таго ж мы між гаманой перацісkаліся на руках — мераліся сілай. Я, хоць старэйшы і слабейшы, паклаў руку Пісарыка дзесяць разоў, а Жука — пяць. Праўда, пасля цэлы тыдзень рука балела і ныла.

— Гэта мы былі п'яныя, — апраўдваліся затым сябры.

І ўсё ж з Алеся Пісарыка атрымаўся неблагі літаратар, а з Кастуся Жука — добры паэт.

## АНАТОЛЬ СЫС

Гэта цікавы паэт і чалавек. Рослы, здаровы, энергічны. Ва ўчынках — непрадказальны.

У Доме літаратара ідзе канцэрт. Анатоль падымаецца на сцэну і становіцца сярод спевакоў. Пастаяўшы, паімкнуўся зняць з пінжака аднаго з іх значок. Той нясмела адвёў яго

руку. Калі надакучыла стаяць сярод артыстаў, Сыс лёг на падлогу каля іх ног і такім чынам доўга адпачываў.

Іншым разам Анатоль прыходзіць у Дом літаратара ў старых, зношаных шортах, як нейкі падлетак. Заходзіць у кабінет намесніка старшыні Саюза пісьменнікаў Анатоля Жалязоўскага і сядае ў яго крэсла (а таго не было на месцы). Пасядзеўшы, пагаварыўшы са мной, ён паклаў ногі на стол. Зайшоў Анатоль Пятровіч, страшна абурыўся і выправіў Сыса за дзверы.

У Доме літаратара праходзіць творчая вечарына паэткі Валянціны Аколавай. Я стаю на сцене і рыхтуюся чытаць прывітальны верш. Побач дзяўчына трымае мікрафон. І раптам яе ўсю затрэсла — пачало біць токам. Мы ледзь адарвалі яе ад мікрафона.

Па зале ў той час соваўся Сыс на падпітку. Казалі, што гэта ён — ці сам надумаўся, ці хто падвучыў — падстроіў гэта. Каб сарваць вечарыну В. Аколавай.

А недзе ў душы ён чалавек і добры, і просты, і сяброўскі. З цягам часу ён пасталее, паразумнее, супакоіцца. І ўсё прыйдзе да нормы.

## СКРАЧЭННІ

Стаю з сябрамі-літаратарамі. Гаворым пра рознае. Між іншым я пытаюся ў іх пра тонкасці мовы:

— А ці можаце вы скласці кароткі сказ, у якім былі б пяць скарочаных слоў?

— Як гэта? — пытаюць сябры.

— А так.

Яны маўчаць у задуменні.

— Кажы, Мікола, сам.

— Калі вам чагосьці не хапіла, а хочацца, — кажу я, — то можна скарочана сказаць так:

— Мо нат шчэ трэ як ё.

— Ну ты даеш! — прамовілі сябры, пачухаўшы патыліцы.

## І ЯШЧЭ ПРА ІВАНА КУРБЕКУ

Калісьці я праводзіў у Доме літаратара сваю творчую вечарыну. Пасля яе, па традыцыі, наладзіў банкет. На яго прыдыбаў і Іван Курбека. Без запрашэння, але нос чуе. Ну, няхай будзе і ён: пабалабоніць жа любіць і ўмее.

Ужо ўначы вяртаемся з жонкай дадому. За намі ўвязаўся і Курбека. Па дарозе мовіць:

— Я сёння буду начаваць у вас.

— Што ты, Янка! — рашуча запярэчыў я. — У нас жа аднапакаёўка-шаснаццацімятроўка. Дзе ж цябе пакласці? Прытым ты жывеш зусім побач: я — на вуліцы Куйбышава, а ты — на Якуба Коласа.

— Што вы кажаце, нікуды ад вас не адыду, цяпер людзі прападаюць, — заўпарціўся Курбека.

— Няхай заначуе, — згадзілася жонка.

— Ад яго ж не адчэпішся, ты яго яшчэ не ведаеш, — заўважыў я.

Пакалалі яго на раскладушку, а ўранку былі вымушаны зноў пачаставаць.

Праз нейкі час Курбеку прымалі ў Саюз пісьменнікаў — у шэсцьдзесят гадоў. Пасля прыёму падыходжу да яго і пытаю:

— Ну, Янка, віншую. А добры бэнц будзе? Традыцыя ж, трэба адзначыць як след слаўную падзею ў жыцці.

— Што ты, Мікола! — заенчыў-застагнаў Янка. — У мяне няма грошай.

І ў момант шаснуў-схаваўся ў бакавы пакой. Можа, з адным-двума больш важнымі чалавекамі ўпотай ад іншых і расціснуў пляшку-другую, але наўрад.

Так, Курбеку не раскруціш. Быццам вечна грошай няма. Затое нашы святы наведаць не праміне.

## І ЗНОЎ УЛАДЗІМІР ПАЎЛАЎ

Пасля ягонага шасцідзесяцігоддзя я пытаюся ў яго:

— Ну што, Уладзімір Андрэевіч, як жывецца на сёмым дзесятку гадоў?

— Гэтаксама, як жылося і на шостым дзесятку, — бадзёра адказаў ён.

## ХВЕДАР ЖЫЧКА

На працягу чатырох гадоў за пенсіённым узростам ён яшчэ працаваў старшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У прыватнай размове пра выхад на пенсію ён сказаў:

— Пакуль працую, ды яшчэ ў выдавецтве, — усё, што напішу, — будзе лічыцца добра. А як кіну работу, усё напісанае будзе дрэнным.

Сапраўды, каму ж хочацца на пенсію, ды з добрай пасады?

## ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

Ён быў у свой час галоўным рэдактарам часопісаў «Вожык» і «Полымя». Стары празаік гадоў пад семдзесят пяць. Некалі сустракаю яго і пытаюся:

— Ну, як справы, як здароўе, Павел Нічыпаравіч?

— Здароўе? Горш, чым было, але лепш, чым будзе, — мудра адказаў ён.

## АЛЕСЬ СТАВЕР

Ён вельмі любіў выступаць. І рабіў гэта даволі цікава. Чытаў і лірыку, і гумар.

І вось аднойчы выступае: чытае, чытае, і раптам... забыўся тэкст. Стараецца ўспомніць, а публіка чакае. Не ўспомніў, але весела кажа:

— Прабачце, забыўся. Але нічога, далей таксама добра.

У зале — агульны смех.

## ЯК ШКОДЗІЦЬ ЗАЛІШНЯЕ ЗАХВАЛЕННЕ

У канцы шасцідзесятых — пачатку сямідзесятых гадоў я кіраваў літаратурным аб'яднаннем пры рэдакцыі абласной газеты «Мінская праўда». Загадчыкам аддзела культуры пэўны час быў Уладзімір Антуськоў — даволі малады, гаварун, вастраслоў, да таго ж пісаў вершы, прытым без ніякіх амбіцый і прэтэнзій у гэтым сэнсе. Друкаваў у газеце свае вершаваныя тэкстоўкі.

Вядома, мы нярэдка гаманілі на розныя жыццёвыя і творчыя тэмы. І ён неяк прызнаўся:

— Аднойчы я напісаў байку, паслаў яе ў рэдакцыю часопіса «Вожык». У адказ атрымаў ліст ад галоўнага рэдактара Уладзіміра Корбана.

(Уладзімір Корбан быў чалавекам своеасаблівым: сам высокі, твар каструбаваты, нос — ці то бульбінай, ці то слівай, а гаварыў неразборліва, накшталт:

— Хру, хру, хру...

Усё як бы хрукаў).

— Ну, і што, Валодзя, — пытаюся, — было напісана ў тым лісце?

— Адказ быў такі: «Вы — першая ластаўка ў беларускай сатыры».

— І што пасля?

— Пасля я зусім кінуў пісаць байкі.

...Вось так. Лепш бы пакрытыкаваць маладога паэта — карысць была б сатырыку-пачаткоўцу. А так увогуле адбіў ахвоту.

## НЕ НА КОЖНЫ ЮБІЛЕЙ...

Справы даўнія.

Заходзіць у выдавецтва, у рэдакцыю паэзіі, мужычок непрыкметнай знешнасці. Зайшоў, шырока расставіў ногі, рукі вісяць, як плёткі, дый кажа:

— Дзень добры!

Хлопцы-рэдактары маўчаць, уткнуўшыся ў паперы.

— Мамонька, паэт, — адрэкамендаваўся прышэлец. — Можа чулі?

— Не, не чулі, — адказалі хлопцы, не падымаючы галоў ад папер.

— У мяне хутка юбілей, — кажа Мамонька. — Дык не пашкодзіла б кніжку выдаць.

— Дзіва што, але ж не на кожны юбілей кніжкі выдаюцца, — быў адказ рэдактараў.

— Ну, добра, дык я пайшоў, — сказаў малады па творчасці, але не малады па гадах паэт.

І пайшоў.

## ДРАЖНІЛКА

Іван Курбека адмыслова падрабляе галасы многіх пісьменнікаў. Ну проста артыст. Яму б у філармоніі працаваць. Або ў цырку. Канечне, апісаць гэта — вельмі мала. Гэта трэба чуць. Аднак прывядзём некаторыя фрагменты яго ных выступленняў.

Падрабляе Сяргея Грахоўскага. Словы як высечаныя з каменя.

— Я часта бываю на Гомельшчыне і сустракаюся з сям'ёй лесніка Яўхіма. Найбольш таму, што ў яго ёсць тры дачушкі. Асабліва малодшая, Марыся. Гэткая пульхмяная, гэткая сакавітая. Як убачу яе — адразу ўзбуджаюцца вясёлыя жаданні.

— Іду, — кажа Курбека, — па мосціку цераз Свіслач. Насустрач мне насоўваецца магутным целам Грахоўскі. Я — бокам, бокам, каб ён не скуліў мяне ў раку. А ён і пытаецца:

— Ну, што ты там пра мяне плявузгаеш, Іване? Ды хіба ж я калі-небудзь так казаў?

— Ведаеце, Сяргей Іванавіч, — адказваю, як казаў Горкі пра Чэхава ці Чэхаў пра Горкага, не важна, што чалавек казаў, важна, што мог сказаць.

— О, то праўда, — сказаў Грахоўскі, — і мірна пайшоў далей.

Падрабляе Міхася Калачынскага. Той доўгі час быў галоўным рэдактарам часопіса «Беларусь». А пры размове вельмі шапялявіў.

— Заходжу я ў рэдакцыю і сустракаю Калачынскага. Ён пытаецца:

— Ну, чаго ты тут сноўдаешся, хлёпча?

— Як чаго? Я здаваў Барадуліну свае нататкі.

— Нятяткі? Якія нятяткі?

— Пра цёцю Уладзю. (Курбека піша вельмі мала, а каб заняць сябе, шматгадова займаецца жыццяпісам жонкі Янкі Купалы).

— Пра цёцю Улядзю? — перапытаў Калачынскі. — Ну, і што?

— Ды вось каторы раз не знайду ні нататкаў, ні Барадуліна. — (Рыгор Іванавіч быў вельмі непаседлівы). — Што ж рабіць?

— Напішы зноў гэтыя нятяткі, толькі не здавай Банадуліну. Яго ці ў яго што знайсці — як іголку ў стозе сена. Э... Банадулін, Банадулін! — ён махнуў рукой і адышоў.

Калісьці заходзіць Курбека ў бар Дома літаратара, а там за столікам весела адпачывае славуты паэт Анатоль Вялюгін з кампаніяй. Угледзеўшы Курбеку, Анатоль Сцяпанавіч паклікаў яго дый кажа:

— Ну, што ты там усіх падрабляеш?
— Стараюся як магу, — адказвае Курбека.
— А вось мяне ты век не падробіш.
— Чаму ж?
— Таму што я — Вялюгін.
— Дык што ж? Можна прыглядзецца, прыслухацца, заўважыць усё ваша вялюгінскае і спарадыраваць.
— Ну, добра, добра, — мірна сказаў Вялбгін. — Налівай!
Гэта была яго вышэйшая ўхвала.

## БРАНІСЛАЎ СПРЫНЧАН

У Доме творчасці Саюза пісьменнікаў на Іслачы, калі хадзілі ў сталоўку, за адным сталом сядзелі Сяргей Грахоўскі, Нічыпар Пашкевіч, Браніслаў Спрынчын і я. Калі Грахоўскі рабіў ці казаў не тое, што трэба, Пашкевіч пад'ялдыкваў яго:

— Кінь ты, Сяргей, свае лагерныя замашкі!

(Грахоўскі ў даўнія часы быў рэпрэсіраваны на многа гадоў.)

Браніслаў Спрынчын, хоць і жыве апошнія дзесяцігоддзі на таблетках, меў зверсткі апетыт і еў як не ў сябе. Калі трэба было наліваць суп ці боршч, то замест таго каб размяшаць у каструлі і наліваць, што патрапіць, — аж уставаў і гладзеў, з якога боку там больш гушчы і мяса. І наліваў сабе з верхам, каб гушча перла з міскі ўверх. Аднойчы я яго за гэта пакрытыкаваў, і ён сцярпеў. Іншым разам, калі Нічыпар Пашкевіч спазніўся на абед і ўзяўся за каструлю, я не вытрымаў і сказаў:

— Еўдакімавіч, не спазняйцеся, бо пасля Спрынчана ад супу застанецца адна вада.

Тут ужо Спрынчан не сцярпеў і справіў мне маленькі скандал.

Дзяды — старэйшыя пісьменнікі ў Доме творчасці не трацілі ні рубля. Ніяк не падмацоўвалі сваё харчаванне, хоць кармілі там у апошні час не лепшым чынам: катлеты, макароны. Нават на мяжы лета і восені не давалі агуркоў і памідораў, хоць яны каштавалі вельмі танна. Салаты гатавалі ў асноўным з капусты ці салянкі.

Іду познім вечарам па калідоры і сустракаю Спрынчана. Мяне мучыць смага.

— Браніслаў Пятровіч, — прашу, — мо ў вас ёсць напітак ці мінералка, дык дайце папіць.

— Что ты, что ты, Николай, у меня нет денег.

Аднак, калі мы вярнуліся ў Мінск, Спрынчан на першай жа гандлёвай кропцы купіў ладную гронку бананаў. І грошы знайшліся.

Што ж, прыемнага апетыту вам, Браніслаў Пятровіч!

(Між тым шмат каму незразумелая такая з'ява: прозвішча ў чалавека малдаўскае, на нацыянальнасці — украінец, жыве ў Беларусі, а піша па-руску. Што за «вінегрэт»?)

## НІЧЫПАР ПАШКЕВІЧ І Я

Нічыпар Еўдакімавіч у Доме творчасці займаецца не пісанінай, а зборам грыбоў. Актыўна падмацоўвае сваю гаспадарку, стол. У гэтай справе ён апантаны. Устае на золку — і пайшоў. Грыб яшчэ не выскачыў з зямлі, а ўжо ў кошыку ў Нічыпара... Грыбнік можа за гэтым заняткам забыцца і на сняданак, і на абед. Пашкевіч набірае больш за ўсіх. Рэгулярна робіць «чаўночныя» рэйсы на Мінск — завозіць багаты ўраджай. Я стараюся не адстаць ад яго, але за ім не паспяваю, трохі адстаю. У яго заўсёды больш. Нехта з таварышаў пажартаваў:

— Калі б яшчэ адзін такі, як Пашкевіч і Вяршынін, у лесе грыбоў не засталося б.

Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, у мяне з Пашкевічам склаліся прыяцельскія адносіны. Нярэдка вечарамі я запрашаў яго ў свой пакой і частаваў. А ён, прыехаўшы чарговы раз з Мінску, казаў мне:

— Мікола, зайдзіце.

Заходжу, а ён, як звычайна, выстаўляе паўпляшкі брэндзі «Імперыял», ашчадна наразае вэнджаную каўбасу і робіць бутэрброды. Сядзім, гамонім. Я ўважліва слухаю яго мудрыя словы, а ён — маю вясёлую гаману.

Аднойчы ён, па традыцыі, кажа:

— Мікола, зайдзіце.

Я кажу яму:

— Там у сваім пакоі сумна сядзіць Уладзімір Паўлаў. Відаць, у яго нічога няма.

Нічыпар Еўдакімавіч падумаў і сказаў:

— Ну што ж, паклічце і яго.

Утраіх нам было весялей і цікавей.

## ВЯЧАСЛАЎ СТОМА

Ён — у асноўным журналіст і даследчык. Піша пра звяроў, рыбін, птушак, траўкі і кветкі. Адным словам, фенолаг. Аднак з'яўляецца і членам Саюза пісьменнікаў. Пад артыкуламі падпісваецца і так, і гэтак.

Чалавек вельмі беражлівы. Калі каго запрашае зайсці да сябе — прымушае складвацца, скідвацца, хоць халадзільнік, падлога і сцены завалены, закіданы, абвешаны прадуктамі харчавання і рознымі прахаладжальнымі і моцнымі напоямі.

Вялікая ўпэўненасць у сябе. Дакладней кажучы, самаўпэўненасць. Не церпіць ніякіх пярэчанняў, аж становіцца на дыбкі. Да таго ж нярэдка казаў:

— Я — багацей. Я — мільёншчык.

І ў той жа час:

— Я прымаю і частую толькі тых, ад каго магу мець вялікую карысць.

Што ж, нямала ў каго найважней — свая выгода.

Затым ён пахвальваўся:

— Чаму ў мяне так шмат грошай? Я друкуюся за месяц трыста разоў. (Фантастыка!)

Пры чарговай сустрэчы, калі я прыпомніў гэта, ён паправіўся:

— Не, гэта я за год друкуюся трыста разоў.

(Зноў фантастыка).

Іншым разам ён казаў:

— З вылучэннем на Дзяржаўную прэмію рэспублікі я спазніўся, але на Нобелеўскую я выстаўлю сам сябе.

(Звычайна выстаўляюць арганізацыі).

Пры наступнай сустрэчы ён казаў:

— Не, на Нобелеўскую не пайду, але звання народнага ці ордэн — гэта пастараюся дамагчыся.

Што ж, сціпласць — рэч рэдкая.

Але поспехаў табе, Вячаслаў, у тваіх высокіх памкненнях!

## ІВАН КУДРАЎЦАЎ

Ён не пісаў аб'ёмных высокамастацкіх твораў, а займаўся літаратурнай крытыкай. Што ж, таксама жанр. Праўда, прызнаўся мне, што на старасці гадоў напісаў раман у трох тамах. Я бачыў у выдавецтве тры папкі машынапісу яго рамана. Але ці дачакаецца аўтар на восьмым дзесятку гадоў жыцця выхаду ў свет свайго шматпакутнага твора — гэта праблематычна.

У Доме творчасці ён адзін быў заядлым карцёжнікам і ўцягнуў мяне ў гэтую гульню. Яму больш не было чым займацца, бо нічога не пісаў. А я — ну не буду ж цэлы дзень чытаць і пісаць, а ніякіх культмасавых мерапрыемстваў у нашым Доме не праводзіцца. Ён мяне абгульваў удвая больш, чым я яго.

Іду па калідоры Дома творчасці, а насустрач мне Сяргей Грахоўскі.

— Чым займаўся сёння, Мікола? — пытае ён.

— Трохі чытаў, крыху пісаў, — адказваю. — А пасля гуляў у карты з Кудраўцавым.

— Што ж, гуляць у карты — лепш, чым пісаць бяздарныя раманы.

Расказаў пра гэтую размову таварышам. Адзін з іх сказаў:

— А чаму Грахоўскі думае, што раман Івана Фёдаравіча Кудраўцава будзе горшым, чым вершы Грахоўскага?

## ВАЛЯНЦІН БАРЫСЕВІЧ

Ёсць у мяне сябар, вучань, паэт Валянцін Барысевіч. Цудоўнай душы чалавек! Сябрую з ім ужо не адзін дзесятак гадоў.

І вось аднойчы ён чытае мне свой новы верш. Я заўважыў два радкі:

— Прачнуўся — адразу ўключаю я маг,
І хлеба скарынку кусаю...

Пытаюся ў яго:

— А чаму, устаўшы, ты ўключаеш магнітафон, замест таго каб спяшацца на працу? І чаму толькі скарынку хлеба кусаеш? А дзе ж сала, мяса, каўбаса? Ты ж трымаеш цесную сувязь з вёскай — бацькі там.

— Ну, відаць, гэта быў выхадны дзень, — адказаў сябар, — і на працу не трэба было ісці. А напярэдадні да мяне завалілі таварышы, як саранча, і вынішчылі ўсе мае харчовыя запасы. Вось я і кукаваў, чакаючы, калі адчынецца гастраном. Жыву ж у інтэрнаце.

— У такім выпадку, — кажу я, — падскоквай да мяне — накармлю ад пуза.

## МІХАСЬ ПАРАХНЕВІЧ

Ён працаваў намеснікам рэдактара газеты «Вячэрні Мінск», а яшчэ раней быў інструктарам ЦК КПБ, чым вельмі ганарыўся і пра што часта ўспамінаў. Пажылы мудры чалавек. Яго кабінет быў цэнтрам прыцягнення і заўжды поўны людзей. Міхась Прохаравіч дапамагаў людзям словам і справай. Так цікава распавядаў пра ўсё, што слухаць яго і гаманіць з ім можна было бясконца. Шкада, што я з ім пазнаёміўся даволі позна. Да мяне Парахневіч ставіўся па-бацькоўску і нярэдка казаў:

— А вой, мой слаўны дзетдомавец, маё дарагое дзіця! Напішы аповесць пра сваё няшчаснае дзяцінства.

Я ж аповесць не пісаў, а пісаў сатыру і гумар.

Міхась Прохаравіч не баяўся ў рабочы час прыняць чарку. Так сказаць, для ўстанаўленя кантактаў. І вось аднойчы нас сабралася многа ў яго кабінеце, і ўсе прынеслі разнастайныя напоі рознай моцнасці, а на стале ляжала гара зялёнага гароху.

Выкладчык універсітэта Валеры Грыцэвіч закусвае гарохам і ўсяляк пахвальвае:

— Вось дык закусь! Міравая закусь!

Парахневіч паглядзеў на стол і сумна прамовіў:

— Мора выпіўкі, а на закусь — адзін гарох. Разыходзьцеся па дамах!

Але мы не разыходзімся, не хочацца. Вельмі ж цікавая і вясёлая кампанія. Валеры Грыцэвіч убачыў у кутку зняты са сцяны партрэт Леніна і кажа:

— Міхась Прохаравіч, аддай мне гэты партрэт, я вынесу яго і выкіну на сметнік.

Парахневіч маўчыць. Грыцэвіч трындзіць адно і тое шмат разоў. Нарэшце Міхасю Прохаравічу гэта надакучыла, і ён са злосцю агрызнуўся:

— Чаго ты да мяне прычапіўся? Ідзі да Дома ўрада, там вісіць шасцімятровы партрэт. Здымі яго і валачы куды хочаш.

## ЛЁС ПІСЬМЕННІКА

Стаім учатырох: я і яшчэ тры пісьменнікі. Размова віецца вакол мяне, а я стаю моўчкі.

— Скажы, Мікола, — пытаецца адзін, — чаму цябе так позна прынялі ў Саюз пісьменнікаў?

Я не паспеў паварушыць мазгамі, як за мяне адказаў другі:

— Бо пісаў вельмі востра.

А трэці дадаў:

— А калі б пісаў яшчэ вастрэй, то і зусім не прынялі б.

Такі вось лёс сатырыка. Усіх нашых сатырыкаў.

## І ЯШЧЭ РАЗ ПРА УЛАДЗІМІРА ПАЎЛАВА

І ўсё-такі я пабываў аднойчы ў яго на свяце. У Доме літаратара праводзілася творчая вечарына з нагоды выхаду яго новай кніжкі «Сляза на вейцы». Яна была тонкая, аднак у цвёрдай вокладцы (зразумела, аўтар жа сам быў выдаўцом). Урачыстая частка прайшла на вышыні. Затым паэт раздаваў аўтографы. Падышоў і я (кніжку я купіў) і кажу:

— Уладзімір Андрэевіч, цябе не абцяжарыць даць мне аўтограф?

— Не, — весела адказаў ён.

Падпісаў, а пасля пытаецца:

— А цябе, Мікола, не абцяжарыць пабыць на неафіцыйнай частцы?

— Дзіва што! — бадзёра адказаў я.

Неафіцыйная частка таксама прайшла на належным узроўні.

Раз'язджаліся разам, у адзін бок — я, Паўлаў і яшчэ адзін паэт — Сяргей Законнікаў. На вуліцы Сурганава пачалі развітвацца, каб ісці па дамах. Паўлаў спяшаўся, а я — не. І кажу Сяргею:

— Ну, Валодзя няхай ідзе на спачын, а мы з табой яшчэ пагамонім.

Валодзя зніякавеў і падаўся у свой бок, а Сяргей накінуўся на мяне:

— Што ты сказаў — ідзі на спачын? Ты што хочаш, каб ён памёр?

— Ат, я не ведаў такіх тонкасцей мовы, — адказаў я. Пры наступнай сустрэчы я прапанаваў: — Уладзімір Андрэівіч, я — без роду, без племені, былы дзетдомавец, ні блізкай радні, ні моцнай сям'і. Так што калі памру, дык ты паклапаціся, каб мяне пахаваў Саюз пісьменнікаў.

— Што ты кажаш, Мікола, — здзіўлена запярэчыў ён, — як я магу пахаваць цябе, калі я на пяць гадоў старэйшы? Гэта ты павінен мяне хаваць.

— Не, ты мяне. Я не хачу, каб ты памёр раней за мяне, — настойваў я.

— Не, ты мяне! — не згаджаўся ён. — Я таксама не хачу перажыць цябе.

Тады я знайшоў найлепшае, на маю думку, выйсце:

— У такім выпадку давай памрэм разам, у адзін дзень, і ніхто з нас нікога не будзе хаваць. Няхай пра нас паклапоцяцца іншыя!

Ад сумнай размовы мы перайшлі да смешнага.

А найлепей — жыць і жыць. І нам, і ўсім.

## МІКОЛА ФЕДЗЮКОВІЧ

З Міколам мне тройчы давялося быць у творчых камандзіроўках. Выступалі на прадпрыемствах, ва ўстановах, у гаспадарках. Нас шмат што яднала: аднолькавыя імёны, рост і вага, нават аднолькавы шэры колер касцюмаў.

Прыйшлі выступаць у прафтэхвучылішча. Зала поўная юнакоў і дзяўчат. Мы за сталом прэзідыума перакінуліся некалькімі словамі пра нешта вясёлае — нягучна, а яны пачулі і раптам чамусьці паехалі са смеху. Рагаталі і яны, і мы — хвілін мо дзесяць, і ніхто не ведаў, чаму. Відаць, у зале насіліся бацылы смеху. Потым мы дадалі гумару яшчэ і ў вершах, і ўсе парвалі жываты.

Выступаем перад дарослымі. Мікола нечакана пачынае:

*Верабей чырык-чырык,*
*Заляцеў у хатку.*

Я штурхаю яго пад бок:

— Ты што, тут жа не дзеці.

А ён:

— Нічога, усе мы былі дзецьмі, весялей будзе.

І сапраўды, усталяваўся вясёлы настрой.

У іншым месцы чытае верш:

Як мы рэзалі, ці не рэзалі,
Як калолі мы вепрука.

Я з падколам пытаюся:

— Дык што ўсё ж — рэзалі ці не рэзалі? Ці калолі? Парсюка ж не рэжуць, а колюць. А вяпрук — дзікі парсюк, яго ўвогуле страляюць.

— Ат, гэта не важна, — бясклопатна адказаў Мікола.

Ездзім на выступленні, ходзім па Пінску, гляджу — у майго Міколы хада як у слана. Чаму, пытаюся. А ён кажа, што жонка купіла і падаравала яму чаравікі, а ў іх (я сам бачу) падэшва таўшчэзная, абцасы ж утрая таўсцей. Але такая новая модная мадэль. А вось мне чаравікі спадабаліся.

— Прадай, — кажу, — мне. За паўцаны. А сабе купіш лёгенькія.

Ён з гатоўнасцю згадзіўся. На тым і парашылі. Я аблегчыў яму жыццё, дакладней, ногі. Мікола купіў танныя красоўкі і шыкаваў у іх, як малады.

Пасля ён звоніць жонцы. Пагаварылі пра ўсё. Яна, між іншым, паведаміла, што трагічна загінула дачка паэта Анатоля Вялюгіна Іра. Потым Мікола расказвае ёй, што прадаў мне чаравікі. У трубцы чуецца лямант.

— Не крычы, бо і ты пamрэш, — з гумарам адказаў Мікола.

Праўда, гэтыя чаравікі не пайшлі на карысць мне, бо пасля вяртання дамоў мне цяжка было іх насіць — ужо я хадзіў як слон. Мог абуць хіба што на паўгадзінную прагулку. Ступні ног не гнуліся, можна было зарабіць плоскаступнёвасць. Урэшце я іх камусьці падараваў. Так сказаць, збыў з рук, дакладней — з ног.

У час выступленняў я пастаянна пахвальваў Міколу:

— Ён актыўна ўмешваецца ў жыццё, калі піша хоць пра новабудоўлі, хоць пра гранітаздабытчыкаў у Мікашэвічах. Ён — слаўны камсамольскі паэт.

Мікола ўрэшце не вытрымаў і сказаў мне:

— Ты кінь расхвальваць мяне. Камсамольскі паэт — дрэнны паэт. Ты яшчэ назаві мяне партыйным паэтам! Я — проста паэт.

## МІКОЛА ТАТУР І МІКОЛА ГАМОЛКА

Мне даводзілася выступаць з імі абодвума. І я ведаў, што Цім не здзівіць публіку нічым звышарыгінальным, бо першы нешта трохі перакладаў, другі імкнуўся напісаць штосьці сваё, наколькі яму ўдавалася. І я вырашыў падкузьміць Татура:

— Вы, Мікалай Ігнатавіч, неаднойчы выступалі з Гамолкам. Дык як вы ставіцеся да яго выступленняў?

Той грэбліва паглядзеў і адказаў:

— Тарабаршчына!

«Так, магчыма, і тарабаршчына, — падумаў я, — але ж свая. А ў цябе ж — і таго няма».

## НАСТАЎНІКІ-ПАЭТЫ

Зайшлі да мяне два паэты, пагаманілі і, між іншым, расказалі даўнюю гісторыю.

Трое студэнтаў філфака БДУ, яны ж і вершы пісалі, зрасходавалі свае стыпендыі і засталіся, як кажуць, на бабах. Ну, калі б быў боб, то жыць яшчэ можна было б, але і таго няма. А есці ж хацелася, і не толькі — вядома ж, маладыя. Дзе ж дастаць грошы? Вырашылі схадзіць дамоў да выкладчыка, да таго ж вядомага паэта. Пазванілі ў дзверы, а самі з асцярожнасці сталі адзін за адным на выступках лесвіцы.

Ён выйшаў і з вышыні свайго немалога росту спытаў:

— Што трэба?

Хлопцы занылі-застагналі:

— Ды вось стыпендыі скончыліся. Дык пазычце ці дайце нам трохі грошай.

Выкладчык разгневаўся і рыкнуў:

— Ідзіце, не наглейце!

Ды як «пагладзіў» па ілбе першага сваёй магутнай лапай, аж той паваліўся на другога, другі — на трэцяга, і ўсе трое пакаціліся па прыступках лесвіцы.

А голад не цётка. Пайшлі да другога выкладчыка, балазе, той таксама быў паэт, да таго ж шэфстваваў над маладымі літаратарамі. І заўсёды быў ласкавы, з усмешкай.

Пазванілі. Адчыніў. Хлопцы зноў просяцца:

— Няма чаго есці. Пазычце ці дайце нам грошай.

Выкладчык пляснуў у далоні і заскугатаў:

— Вой, хлопчыкі, мае даражэнькія! Ды ў мяне ж няма грошыкаў, усе яны на кніжачцы. Я ж думаю купіць машыначку. Лепш я вам кавалачак сальца дам.

Студэнты выйшлі з дому ды як ляснуць гэтым салам аб сцяну! Ім жа найперш хацелася выпіць, а пасля ўжо — закусіць.

## ВІКТАР ДАЙЛІДА

Таварышы часам кпілі з яго:

— Скажы, Віктар, чаму ў цябе такое дзіўніе прозвішча — Дайліда? Пэўна, тваю маці клікалі Лідай, і яна была гулящчая? А ўсе мужыкі пра гэта ведалі і часта прасілі: «Дай, Ліда!»

Віктар сарамліва аднекваўся:

— Што вы, што вы! Гэта мае продкі займаліся дойлідствам.

## АЛЕСЬ РЫБАК

Калі адзін час жыў і працаваў у Маскве, то з гонарам заяўляў:

— Пахаваюць у Маскве! Пахаваюць у Маскве!

Калі ж быў вымушаны вярнуцца ў Мінск, змяніў гаворку:

— Настальгія заела! Настальгія заела!

## ПЯТРО СТЭФАНОВІЧ

Неяк перад адным са з'ездаў быў масавы прыём у члены Саюза пісьменнікаў. Сярод прэтэндэнтаў быў і Пятро Стэфановіч, які крыху перакладаў, зрэдку пісаў які-небудзь скетч. Трэцяя, самая высокая і галоўная камісія — прэзідыум (цяпер гэта — Рада) складаўся з паўсотні чалавек, у асноўным дзядоў.

Надышла чарга Стэфановіча. У канцы абмеркавання яны спыталі яго:

— Над чым зараз працуеш, Пятро, што пішаш?

— Ні над чым не працую, — адказаў той, — фазэнду будую.

Дзяды засмяяліся і сказалі:

— Трэба прымаць.

## ВАСІЛЬ ВІТКА

Ён быў сур'ёзны, строгі, нават суровы. Пісаў вершы для дарослых і дзяцей. Доўгі час рэдагаваў часопіс «Вясёлка». Даводзілася бачыцца з ім, трохі перамаўляцца, але да вялікага сяброўства не даходзіла з-за даволі значнай розніцы ва ўзросце і характарах.

Я не быў удзельнікам ці сведкам тых выпадкаў, пра якія пойдзе гаворка, але прывяду з прыватных размоў з некаторымі старэйшымі пісьменнікамі. Як кажуць, за што купіў, за тое й прадаю.

Распавядаў адзін з таварышаў па пяру.

Правінцыйная журналістка, яна ж — трохі і літаратарка, перабралася жыць у сталіцу. Уладкавалася на работу ў рэдакцыю вядомага магутнага выдання. Добра зарэкамендавала сябе ў працы.

Праз нейкі час яе сустракаюць уплывовыя знаёмыя. І кажуць-раяць: напішы кніжку пра Васіля Вітку.

Падтрымаем.

Надрукуем.

Прымем у Саюз пісьменнікаў.

Інакш памрэш у невядомасці.

Напружылася.

Напісала.

Падтрымалі.

Надрукавалі.

Прынялі ў Саюз.

Усе задаволены.

У творчых людзей, у прыватнасці ў пісьменнікаў, бывае саперніцтва. У лірыкаў — з лірыкамі, у сатырыкаў — з сатырыкамі, у лірыкаў-сатырыкаў — з лірыкамі-сатырыкамі, у драматургаў — з драматургамі, у дзіцячых пісьменнікаў — з дзіцячымі.

Расказваў старэйшы пісьменнік — здаецца, Язэп Семяжон, і літаратар, і славуты перакладчык. На старасці гадоў адрасціў сівыя вусы і бараду — ну як акадэмік, ну як Эрнест Хэмінгуэй.

— Праходзіў прыём у члены Саюза пісьменнікаў. Сярод іншых кандыдатаў была і Ніна Галіноўская, якая пісала і цяпер піша ў асноўным для дзяцей. Яе, як і яе былога мужа Яўгена Крупеньку, доўга мучылі з гэтымі прыёмамі. І ўсё тармазілі. А тут — Васіль Вітка выступае, расхвальвае, аж са скуры вылузваецца:

— Вох, вох, вох, якая яна выдатная жанчына, які цудоўны чалавек, якая адмысловая паэтка! Усе на свеце дзеткі ў захапленні ад яе вершаняткаў! Абавязкова трэба прымаць гэтую дзіцячую паэтку.

Ідзе прыём. Галасуем. Стаім побач. У нас у руках — бюлетэні. Я стаю побач, збоку. Скасавурыўся і пазіраю. Вітка бярэ ручку — і... рашуча выкрэслівае са спісу Галіноўскую.

Вось так. А як пахвальваў! І нашто? Пыл у вочы...

Еўдакія Лось, наша выдатная ў мінулым жанчына і паэтка, і для дзяцей пісала — наколькі памятаю, пасля Віткі нейкі час сама ўзначальвала «Вясёлку» — скардзілася, што ў час свайго рэдактарства Вітка не вельмі ветла і добразычліва прымаў яе. І адказваў ён прыкладна так:

*Прывітанне табе, мая любачка.*
*Друкавацца ў нас цяжка, галубачка.*

А яна ўжо была тады шырока вядомай літаратаркай.

Вось такія былі «жартачкі» нашага шаноўнага Мэтра.

Не самыя лепшыя жартачкі.

Ну што ж...

Высокім — не вельмі, а хоць бы трошкі —
больш дазволена.
Ва ўсялякім разе —
так яны лічаць.
Самі.

## ВІКТАР ШНІП

Паэт Віктар Шніп — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». Там жа працуе яго жонка Людміла Рублеўская, паэтка. Разгаварыўся з ім аднойчы па-сяброўску:

— Ці не напісаць мне вялізны крытычны артыкул пра дзяржаўнае выдавецтва? Маю багатую фактуру. Друкаваць будзеце ці баіцеся?

— Ат, не варта звязвацца, ці будзе толк? — адказаў ён.

— Ды ўжо гадоў дзевяць там ляжыць мая не тоўстая кніжка — двойчы гублялася, двойчы была ў плане, але не здаюць, кажуць — сам шукай заказы і заказчыкаў, няхай пераводзяць нам грошы.

— А ў мяне, — адказаў ён, — кніжка здадзена ў тую ж «Мастацкую літаратуру» яшчэ ў 1991 годзе, і таксама не выходзіць. Там кажуць:

— Затое нядаўна выйшла кніжка тваёй жонкі.

— Дык што ж, — сумна працягваў ён, — дзеля выхаду кніжкі мне цяпер трэба разводзіцца з жонкай? — ён безнадзейна махнуў рукой і адышоў. І я таксама адышоў. А потым падумаў: трэба было даць прыяцелю і калегу слушную параду:

— Віця, а ты вазьмі ды часова развядзіся, а як выдадуць кніжку — тады сыдзецеся зноў.

І ўсё стане на свае месцы.

А захочаш некалі выдаць яшчэ кніжку — зноў развядзешся-сыдзешся. І так увесь час.

Вось такі гумар. Сумнаваты гумар. Але ж — такое жыццё.

***

Карацей кажучы, з пісьменнікамі здараюцца розныя кур'ёзы, як і з усімі людзьмі, і жартуюць яны па-рознаму — то больш, то менш удала — як усе...

***

Запісана з падслуханага, падгледжанага, пабачанага, пачутага, распавяданага іншымі пісьменнікамі і не пісьменнікамі ў розныя гады і ў розных месцах.

# З НАМІ — ТЫ,
# А МЫ — З ТАБОЮ

## *Век павязаны любоўю*
## *(вершы, прысвечаныя аўтару)*



# Першы сярод сатырыкаў

Міколу ведаюць усе. Яго байкі, фельетоны, гумарэскі не толькі чытаюць, іх дэкламуюць нават немаўляткі. Таму што лепшы наш паэт-сатырык піша свае дасціпныя радкі вельмі пранікнёна, чыста. Яны ўражваюць, нібы водблеск маланкі, доўга хвалююць.

Мабыць, у літаратурных выданнях з нагоды юбілею вельмі падрабязна адлюструюць творчы шлях Міколы. Ён гэтага заслугоўвае. Мы ж скажам так: Мікола ВЯРШЫНІН — паэт з народа. Чэрвеньскі хлопец рос без бацькоў, якія загінулі ў пачатку вайны. Аднак сіроцкім яго жыццё не назавеш: у школе, тэхнікуме, універсітэце, на падшыпнікавым, трактарным ды іншых заводах, дзе працаваў, і ўвогуле ў Міколы заўсёды было і застаецца шмат сяброў, добрых людзей. Народ паважае і любіць паэта. Бо паэт не грэбуе яго парадамі, думкамі, звычаямі. Ён і цяпер у жыццёвай і творчай віхуры — працуе вядучым інжынерам аддзела маркетынгу навукова-вытворчага прадпрыемства «ПРАГРЭС» у Мінску і адначасова многа піша.

Мы, твае прыхільнікі, Мікола, падымаем сёння кілішкі за тваё здароўе, сяброўскую вернасць, творчы ўзлёт! Хочацца, каб твой літаратурны скарб — 11 кніжак сатыры і гумару — значна папоўніўся.

*Мікола ДЫМ,*

*загадчык аддзела рэдакцыі «Народнай Газеты»,*

*20 мая 2000 г.*

# Сатыра з торбы

*Міколу Вяршыніну*

Штодзень кручуся,
Як вавёрка ў коле,
Усюды я —
Ні гаспадар,
Ні госць.
Ды слухаю.
Дзе хто каго падколе,
Глядзіш —
Радок для эпіграмы ёсць.
Усіх люблю,
Усім я шчасця зычу,
А праўду потым —
Вершамі скажу.
Трымаю тэмы
У торбе сатырычнай,
Каб не згубіць —
Аборкай завяжу.

*Алесь Шурпаты,*
*журналіст і літаратар,*
*сатыры, гумару — аматар.*

# Лёс сатырыка

Яны мне не рабілі зла,
І я прыдбаў па звычцы й сёння
Там — трошкі поўсці ад казла,
Тут — скібку сала ад хаўронні.

Хацеў прабіцца я ў Саюз,
Ды кажуць — там адны зазнайкі.
Сатыра — падчарка ў муз.
Вось так.
А ты мне кажаш —
байкі.

*Сымон Цвік,*
*што да праўды прывык.*



## Русско-белорусское поздравление Міколу Вяршыніну к его 30-летию

По утрам я иду на завод,
Всем знакомым кричу: — Прывітанне!
И все видят: Мікола идет —
Председатель літаб'яднання.

Я красив и няблага одет,
И диплом получил этим летом.
И Амур — мастер шлюбных дел
Свил гнездо на груди поэта.

Но скрипит одиноко кровать,
Я ж молчу, хотя мне уже тридцать...
Нужно низку стихов написать,
А потом,
        может быть,
                ажаніцца.

Поздравленья ж прими, наш поэт!
Бо табе год пайшоў трыццаць першы.
Пусть поможет тебе лунный свет,
И нястомна пишы свае вершы.

*Олег Венгеренко,*
*журналист и друг поэта.*
*1970 г.*

## Любимому Миколке

К черту сказки и стихи,
Я хочу побыть с тобою.
Надоело жить мечтою —
Я хочу вершить грехи.

Я хочу колдуньей быть —
В жизни, а не только в сказке,
И такие строить глазки...
Проще — я хочу любить.

Да, любить и наслаждаться —
И во сне, и наяву,
Всей душой тебя зову —
Чтоб могла тебе отдаться.

Мне ведь некого бояться,
Ну а чувства все — со мной.
Ты ведь мне теперь — родной,
Так что нечего стесняться.

*Твой Светлячок — Светлана Коробкина*
*(в пору юности туманной),*
*работница книжной торговли,*
*молодая поэтесса.*
*1970-е годы*

## Натхнёная душа

Праглядваю свежы «Трактар» —
І зноўку... Мікола Вяршынін
Пацешыў нас байкаю трапнай,
А побач з ім, бачыш, другія.

Вяршыніна меткае слова
Навучыць пісаць нас нанова,
Здараецца, ёсць і вымова,
Ды з ёю згаджаюся зноў я.

Раптоўна апынішся ў лесе,
Узляціш аж да ясных блакітаў...
З Міколам цудоўная песня
Звінець будзе ў сэрцы ўрачыста.

*Эмілія Пасынкава,*
*інжынер Мінскага маторнага завода.*

## Посвящение

Шалун, Гораций наших дней,
О чудный баловень досуга!
Не обессудь меня, подругу,
И не утаивай секрет.

Вершинин Коля, ты — поэт,
И я — поэт, мы все — поэты.
Добыл перо такое где ты,
Из-под которого куплеты

Бьют рифмой, словно кастаньеты?
Открой секркт, поэт — атлет.
Но есть вопрос.
                    Ответа — нет.
Я буду ждать.
                    Хоть много лет.

*Твоя почитательница.*

## Бясплатны дадатак

Да навагодняга віншавання
і пажаданняў устаноўленага ўзору
Хачу я,
        каб быў ты,
                    Мікола,
У кожнай рабоце не кволы,
У каханні ж — наогул як волат,
Святло выпраменьваў наўкола,

Са мной быў заўсёды вясёлым,
Не гнуўся ад старасці долу,
Ды памятаў ты, што не молад,
І прэч гнаў чужы (і свой) холад.

Спакусы больш справу мець з толам,
Чым з добрым, «нязмазаным» колам.
Магутна хай стукае сэрца,
І ўсё абсалютна ўдаецца,
І страшным нішто не здаецца.

Вастры ж сатырычны твой голас!
Рыхтуй паслядоўнікаў школу,

Ды толькі не выпусці «сола»,
Не бойся ты кпінаў, падколаў,

Сцябай абармотаў па голых...
Дзе ж нельга — не трэ' сунуць голаў.
Хоць трэба любіць сваю волю,
А Ліну — кахаць трэба болей!

*Ангеліна Цудня,*
*выкладчыца БДУ.*
*31 снежня 1976 года*

## Душевное посвящение

Жив-здоров?
Не глядишь на другую?
Вот и все.
Остальное — стерплю.
Не грустишь?
Но и я не тоскую.
Разлюбил?
Но и я не люблю.
Просто мне,
чтоб по белому свету
Подниматься
дорогой крутой,
Нужно верить,
что дышишь ты где-то:
Жив-здоров? И...
Не любишь другой.

*От Шенец Нины Тарасовны,*
*бухгалтера ЭВМ.*
*Минск, 1970-е годы*

## Мікрапрысвячэнне

Няхай жыве і не хварэе —
І маладзее, не старэе,
Душою добры — шчэ дабрэе,
І не ліе ніколі слёз.
Яго і так прымусіў лёс —
Цягнуць сатыры цяжкі воз.

*Стась Федчанка, архітэктар*
*даўні і верны сябар Міколы па творчасці,*
*літаратар, мастак.*

## Жаніце хлопца

Ёсць мора ў нас дзяўчат наўкола,
А ходзіць халастым Мікола...
— Жаніся, хлопча, — кажуць людзі, —
Табе ўжо сорак хутка будзе!

Штораз ён абяцае маці:
— Нявестка заўтра будзе ў хаце!
Ды не вядзе.
Перабірае.
Адна — задужа маладая,

Пад фарбамі — цярпець не можа,
А ў джынсах для яго — крый божа!
...Чакаў вось Ганку ён ля пляжа
З бліскучым новым саквояжам.

Прыйшла, ды — фырк бландзінка тая
І да трамвая ўцякае.
Ці ж тут жаніх наш вінаваты,
Што больш у модзе «дыпламаты»?

Бывала, мчыць Мікола з рання
Зноў на чарговае спатканне,

Гадзіннік. І пад ім вунь Света,
А ў тонкіх пальцах...
цыгарэта...

Скажу: тытунь тут вінаваты,
Што ходзіць Коля нежанаты.
Не п'е, не курыць. Ёсць кватэра,
Дыплом —
Не жэняць кавалера.

Памры хоць — не вязе ў каханні,
Радзей з гадамі ўсе спатканні...
Нарэшце стрэў. Багіня неба!
З усіх бакоў дзяўчо — што трэба!

А хто? Ды кладаўшчыца Ядзя.
Смяецца:
— Колькі ўнукаў, дзядзя?
Жартуе, але ў ЗАГС ідзе,
Бо знае: з ім не прападзе.

Міколаў дом у новым гудзе —
Напэўна, і вяселле будзе...

*Васіль Рамашка,*
*рабочы Мінскага трактарнага завода.*
*1978 год*

## Старшынёва парада

Уважлівая ў зале цішыня.
Гаворыць нам Мікола-старшыня:
— Таварышы! Пара асэнсаваць,
Пра што паэту трэба больш пісаць.

Пазбегнуць каб нашчадкаў забыццё,
Пішыце пра сучаснае жыццё!

Пра наш выдатны, непаўторны час...
Што можа быць прывабней для ўсіх вас?

Скажу накшталт агульна-вечных тэм:
У класіцы ёсць вершаў і паэм
Такая колькасць з якасцю такой,
Што вам цягацца з імі — о-ёй-ёй!

Аднак імкнецеся вы ўсіх пераўзысці,
А важна — тэмы новыя знайсці
І адшукаць найлепей вырашенне.
А трэба што?
Энергія, натхненне!

***

Мяркую я, што ясна ўсім цяпер,
Што пра сучаснасць лепш пісаць нам, вер — не вер,
Каб дасягнуць нас вартай вышыні,
І будзе радасна Міколу-старшыні.

І, можа, у якімсьці вершаняці
Хто-небудзь будзе і мяне
ўспамінаці.

*Сямён Оркін,*
*канструктар маторнага завода.*
*1980-я гады*

## Міколу Вяршыніну ў дзень 40-годдзя

Пражыў на свеце саракоўку
І можаш выпіць ты літроўку.

А як надыдзе шэсцьдзесят —
І паўлітэрцы будзеш рад.

Калі ж наступіць сотня год —
Кефірам запаскудзіш рот.

Дык покуль, браце, малады —
І пі, і еш, не знай бяды!

Пішы і гумар, і сатыру,
Штогод па кніжцы выдавай.

Яшчэ дадам на вуха шчыра:
Малодак хвацкіх не мінай!

*Эдуард Валасевіч.*
*Мінск, 20.05.1980 г.*

## У сціплы вянок нашаму Міколу Вяршыніну з нагоды яго 40-годдзя

Жадаем табе, наш Мікола,
Каб быў у жыцці ты вясёлы,

І каб друкаваўся ты болей,
І каб вывучалі ў школе,

Яшчэ — каб шчаслівая доля
Цябе не мінала ніколі,

І каб з паэтычнага поля
Збіраў ураджай ты ўволю.

А што ж пажадаць табе болей?
Калі прынясе ў прыполе

Сяброўка, то будзь на вяршыні,
Наш дружа, Мікола Вяршынін!!!

*Ад калег па пяру і ўсіх прысутных —*
*Хведар Чэрня*
*20 мая 1980 год*

# Міколу Вяршыніну з нагоды светлага Дня нараджэння ад сябра — да 40-годдзя

Гумар, сатыру
Не зробіць праныра,
І прахіндзей
Не ідзе між людзей.
Коля Вяршынін
Мне адгукнецца
Рэхам, душою
І водгуллем сэрца.
Хлопец магутны,
Разумны, няхітры.
З ім разам выпіць
Магу два паўлітры.
Мала ў нас гэткіх
Сяброў на зямлі.
Болей каб рэдкіх
Міколаў жылі.

*Рыгор Яўсееў*

# В творческой твоей судьбе

С 40-летьем поздравляем,
Всего, что и себе, желаем.
Пиши, живи без всяких бед,
Имей бутылку на обед,
Вниманье женщин —
в жизни свет,
А в общем —
счастья на 100 лет.
Ты заслужил:
ведь ты — поэт!
По жизни всем даешь совет.

*Саша и Жанна — семья Коваленок.*
*Наш голос не громок, однако же звонок.*
*Поэты немножко, конечно — не ты.*
*Но тоже имеем свои мы мечты.*

*Александр Коваленок,*
*работник вневедомственной охраны*

## Надзённае — творчае

Няхай ляцяць за юбілеем юбілей,
А ты, галоўнае, душою не старэй.
І, паглядаючы з Парнаскае вяршыні,
Вастры штодзённа ты пяро сваё, Вяршынін!
І не сумуй ніколі без прычыны:
Ты — інжынер,
паэт,
і ты — мужчына!
І па жыццю ўсяму ты — малайчына.

*Іван Малец, слесар-сантэхнік, літаратар*
*20 мая 1980 года*

## Шчыраму сябру — на юбілей

Віншуем сёння чалавека,
Што маладога, скажам, веку.

Пішы, паэт, далей ты вершы —
Асобным — каб у горле першыць.

Астатнім людзям — тым, што ў зале, —
Каб ад душы парагаталі.

А гумар вельмі любяць людзі —
Народ паэта не забудзе.

Мікола любы, брат Вяршынін,
Скачы з Пегасам — да вяршыні!

*Ліля Матусевіч, настаўніца*
*20.05.1980 г.*

## Лірычна-сатырычныя радкі на тэму: «Чаму сабраўся тут забеспячэнскі люд?»

Збор сягоння ў нас вясёлы,
Тут — не месца для нягод.
Паважаны наш Мікола
Адзначае сорак год.
***
Прымі ж ты, Мікола,
Ад нас віншаванні:
Дзвюх Валяў, дзвюх Таняў,
Трох Вольгаў і Ганны.

Табе пажаданні
Найлепшыя нашы:
Барысаўны, Лёні,
Андрэя і Сашы.
***
А на сталах тут страў багата,
Прысмакі розныя ў нас ёсць.
Мікола — хлопец зухаваты,
Ды не стае яму чагось.

Ці варта пра гэта
Тут весці гамонку?
І так зразумела:
Прыгожае жонкі.

Такое кабеты —
Ні многа, ні мала,
Каб моцна паэта
У лейцах трымала.

Нам хочацца вельмі
У Міколавай хаце
Аддзелам аж цэлым
Вяселле згуляці.

Жыві і красуйся,
Мікола Вяршынін,
Дамчы да высокай
Парнаскай вяршыні!

*Калектыў аддзела НВА «Прагрэс»*
*20 мая 1980 год*

## Сяброўскае — юбіляру

Жадаем мы табе, Мікола,
У 40-годдзя юбілей:
Аптымістычным і вясёлым
Будзь у жыцці і надалей.

Каб не садзіўся на дыету,
Не будзе хай такіх прычын.
Каб меў заўсёды шкварку гэту,
Што моц захоўвае ў мужчын.

Цудоўны гумарыст, сатырык,
Не страціш ты пачуццяў жар,
Бо сэрцам ты — таксама лірык
З палётам лёгкакрылых мар.

І будзеш ты заўжды кумірам
Тваіх сяброўак і сяброў.
Мы зноў табе жадаем шчыра:
Шчаслівы будзь — і будзь здароў!

*Оркін Сямён Якаўлевіч*
*20 мая 1980 года*

# Дружеское, производственное, творческое

Миколу знаем мы в глаза,
Всегда его разумно слово.
И если солнце, хоць гроза,
И через день, и сквозь года —
Пусть он приходит к нам всегда —
Его мы любим и такого.
Вот он — поэт и инженер,
И подает нам всем пример.
Не гонит в творчестве он план,
И знаем: жизнь ведь — не обман.
И наш весь дружный коллектив
Его запишет в свой актив.

*СКПО «Оргтехстром»*

# Мікалаю Вяршыніну — на яго вершы на Нарачы

Праслухаўшы Вяршыніна ў зале,
Усе ўпокат разам рагаталі.

Ад рогату таго, нібыта ў глебе,
Сатыра ўрадзілася шчэ лепей.

З крыніцы той салёнай каб напіцца,
Маглі б лайдак і бюракрат — аж утапіцца.

Удасца — зацікавіць нас сатыра,
Калі паэт напіша вельмі шчыра.

Хай будзе поспех у цябе, паэце,
Няхай святлее ўсё на гэтым свеце!

*Эдуард, турыст*
*7 верасня 1988 г.*

## Паэту — і ўсім песнярам

### (М. Вяршыніну прысвячаецца)

Адчуванне павагі прыйшло да мяне
Да выдатнай асобы паэта.
Хай жа гора і ліха яго абміне,
Дасягаецца кожная мэта.

Хай жыве ў шчасці ён, без турбот і тугі
Той адрэзак, што Бог адмярае.
Шлях жыццёвы паэта хай будзе даўгі,
І ў пашане ў свой час памірае.

І не трэба яму ўслед салюты паліць,
Сам зрабіў сабе вечны ён помнік.
Ганаровым цяжарам грунтоўна ляжыць
На плячах яго твораў шматтомнік.

Пажаданне маё — каб дайшоў да другіх
Жар душы, што яе апаляе,
Сэнс пісання крануў нават самых глухіх,
І для гэтага Муза спрыяе.

Дык жыві і ствараў, як бывае спрадвек,
І свяціся ты кожнаю рыскай.
Для высокага сэнсу паэт — чалавек,
Смут жыцця раскачаўшы калыску.

*Уладзімір Вярхоўскі*
*Пастаяннадзеючае віншаванне*

# Миколу Вяршынину — от друзей и передрузков

*(Русско-белорусское приветствие)*

Дорогому юбиляру
Посвещаем шуток пару,
И серьезны слова,
Не поймет ли кто? Едва.

Тут есть разный поворот,
Разберет его народ.
Это — грамота простая,
Но как будто золотая.

Паважаюць Колю хлопцы,
Як і ўсе аўтазаводцы.
Прывітаць яго я рад.
Піша — Рома Айзенштат.

Наш Микола — он не старый,
Хоть «полтинник» разменял.
Щеки пышут ярким жаром,
Губы — тоже как коралл.

А когда возьмет гитару —
Ну-ка, братцы, разойдись!
Лучшим бардам он под пару,
Только песенка катись.

Мы молчим пока про вершы,
(Переводим: про стихи).
В этом деле — тоже першы!
Байки Коли — неплохи.

А такие нам — по нраву,
Юмор их и их задор.
Нечисть, мол, давай в канаву,
Перед подлостью — забор!

Ну их всех, долой, в корыто,
Как ни бьем — им нет конца.
Скажам лепш — хто не забыты —
Юбілейнага хлапца.

Для друзей там дверь открыта,
Открываем без конца.
Мы — друг к другу, и бутылки,
И могучие сердца.

Ты — талант наш, именинник,
Твой корабль минует мель.
Разменял ты свой «полтинник» —
Размяняеш и рубель!

*Роман Айзенштат,*
*нам. рэдактара газеты «Аўтазаводзец»*
*20 мая 1990 года*

## Нашаму славутаму юбіляру Міколу Вяршыніну

***прысвячаецца — даўняму сябру і пастаяннаму аўтару народнага тэатра эстрадных мініяцюр «Карусель» Палаца культуры МТЗ***

Сягоння дзень у нас цудоўны,
Мы адзначаем юбілей.
Нам адкрывае свет чароўны
Паэт Мікола — наш чарадзей.

Мінула часу ўжо нямала
З тае далёкае пары,
Калі сышліся ў час удалы
Яго ўсе аднадумцы і сябры.

У вершах ён прыродны, свойскі,
Работу ведае як след.
А чалавек — ва ўсім геройскі,
Сам — і сатырык, і паэт.

Наводзіць крытыку заўсёды
І моцна б'е з усіх бакоў.
Хай будзе бюракрат, нягоднік,
Бічуе п'яніц, лайдакоў.

Рыхтуе зноў мініяцюры,
У вечным пошуку заўжды.
Сябры яго ўсе без халтуры
Мы праз падзеі і гады.

Вядомы ўсім і самы родны —
Ён паўстагоддзя ўжо пражыў.
Паэт не прсты, а народны —
Вяршынін гэта заслужыў.




**На здымках: юбілейны канцэрт тэатра па творах Міколы Вяршыніна, прысвечаны 50-годдзю сатырыка-гумарыста**

Мы пра Міколу ўсюды чуем,
Яму шмат дадзена сумець...
Наш любы, мы цябе віншуем,
Жадаем поспехаў шмат мець!

*Ад імя ўсяго калектыву тэатра —*
*Анатоль Каракоўскі, галоўны рэжысёр*

## Да слаўнага юбілею нашага літкансультанта — да 50-годдзя паэта-сатырыка (ён жа і гумарыст) — Вяршыніна Мікалая Пятровіча —

## ПРЫСВЯЧЭННЕ

Як у маі на прыволлі
Нарадзіўся наш Мікола,
І зязюля накувала —
Здзейсніць зможа ён нямала.

Ён і працаваў старанна,
І не сыпаў соль на раны,
І, каб лепей нам жылося,
Усё высмейваў, ды без злосці.

Пажадаць хачу я сёння
Юбіляру шчасця тону,
Крыху клопату, натхнення
І, канечне, захаплення.

Каб у нашага Міколы
Не было хвароб ніколі,
Каб шчэ год дзесяткаў пяць
Мог ён байкі выдумляць.

І ў наступным хай стагоддзі
Яго талент не зыходзіць

І сваім пяром пякучым
Недахопы б'е балюча.

Каб спартыўны быў і здатны,
Выглядаў заўжды выдатна.
Каб спрыяў яшчэ Міколу
Поспех у слабога полу.

Хай ён помніць аб'яднанне,
Нашы творчыя спатканні
І празаікаў, паэтаў
Вучыць, як раней, пры гэтым.

*Ад імя членаў літаратурнага аб'яднання «Поиск»*
*пры рэдакцыі газеты «На страже Октября» —*
*Соф'я Макарэвіч, доктар, лекар чалавечых целаў і душ*
*20 мая — 2 чэрвеня 1990 г.*

## Пожелания членов литературного объединения при газете «Аўтазаводзец»,

**написал Арнольд Потапьев**

У нас, Микола,
судьбы схожи
Пропиской детства
в детдомах.
Хоть ты годами
и моложе,
Но старше зрелостью
в стихах.
Прими сегодня,
в юбилей,
В свое
пятидесятилетье
Сто пожеланий
от друзей

Белавтомазовской
газеты.
Давно редакционный
зал
Стал нашим поэтичным
домом.
Мы с юмором твоим
знакомы,
Где ты не все
еще сказал.
И пусть сатиры
веский груз
Кладет пороки
на лопатки.
Тебе желает
крепкой хватки
Литературный наш
союз!

*Майор запаса, потомственный казак,*
*член Правления Белорусского казачества*

## Юбилейное

Помню я Тресковщину поныне:
Детский дом... Разливы спелой ржи...
У тебя фамилия — Вершинин,
Ей, Микола, очень дорожи!

У нее пророчество большое:
Пробираться через терн и глушь.
Ведь не каждому положено такое —
Виршем просветлять стремленье душ.

А еще понятие «вершина»
Слишком высоко в поэзии для нас.
Не измеришь высь ее аршином,
Не всегда достанет даже глаз.

Ты в себе почаще сомневайся,
Мысли со строкой сверяя каждый раз.
Век трудись, царапайся, кусайся,
Смело забирайся на Парнас!

Но не бойся, не спеши — не мальчик.
В творчестве взрослеет человек.
Он не так живет, как одуванчик:
Трое суток — и промчался век!

Ты, когда своей достигнеш цели,
Чтобы не упасть на землю с облаков,
Обопрись на нас, на самом деле,
На своих друзей из «Ручейков»!

*Анатолий САС,*
*ветеран труда,*
*земляк подростковых лет поэта*

## У дзень юбілею Паэту, сатырыку-гумарысту, літаратурнаму кансультанту Вяршыніну Мікалаю Пятровічу — да слаўнага 50-годдзя

Ён не смяецца па загаду,
Лісою ў вочы не глядзіць,
І ўсім нягоднікам і гадам
Умее праўду гаварыць.

Быў не аднойчы біты лёсам,
Але не поўзаў на каленях.
Ён лепей будзе голым, босым,
Ды з незапэцканым сумленнем.

Калі ты з гонарам у згодзе,
То для яго — найлепшы госць.

Заходзь, гасцюй, не скажа: — Годзе!
Вось ён такі,
                    які ён ёсць!

*Ад імя маладых паэтаў і празаікаў —*
*членаў літаб'яднання «Поиск» пры рэдакцыі газеты*
*«На страже Октября» — Іван Пыка, рабочы,*
*сябар і вучань Міколы Вяршыніна*
*20 мая 1990 года*

## Усім вядомаму, усім знаёмаму, не так суроваму, заўжды вясёламу паэту-сатырыку, яшчэ і гуманісту — Мікалаю Вяршыніну — сябру па пяру

Паэтаў шмат у Мінску родным —
Вялікіх, вострых на язык.
Сярод іх розум ёсць прыродны —
Паэт той з роду гарамык.

Ён сірата, дзіця прыюту,
Што сярод простых жыў людзей, —
І вось жа лёс яго пагнуты
Яму даў талент, шмат надзей.

Яшчэ даў дух яму магутны
І працаздольнасць, добры спрыт.
Яго далёка голас чутны,
Падпёр сабой нябёс блакіт!

Вось жартаўнік той з паднябесся
Нас так сатырай аблажыў,
Што дома мы дрыжым, і ў лесе,
І нат у полі на мяжы.

А ён, гарэзнік, так смяецца
Над недахопамі жыцця!..
І нават часам нам здаецца —
Падобны ён на мудраца.

Мяркуе дні і нават ночы —
Кляпае словам, як каваль.
На нашых душах зубы точыць,
Вастрэй зубоў язык — як сталь!

Ён, як хірург, знаходзіць траўмы,
У глыбіні сардэчны боль —
Такі вось хлопец ёсць забаўны,
Ён нам патрэбны, нібы соль!

Ён напладзіў шмат добрых вершаў —
Яны яму замест дзяцей...
А хлопец сам — гатунак першы!
А чалавек — няма прасцей!

Я пад канец сказаць павінен,
Аб кім свой лепшы верш злажыў —
Мікола з прозвішчам Вяршынін...
Хачу, каб вельмі доўга жыў!

Каб волат той дарыў нам вечна
Сатыру, гумар, тонкі жарт,
Для ліхадзеяў небяспечны,
Каб быў па-добраму упарт!

Не нам яго вучыць, здаецца, —
Ён многім шэльмам даўся ў знак!..
Хай не шкадуе ў вершах перцу,
На радасць нам смяецца ў смак!

*Станіслаў Федчанка, архітэктар-сатырык.*
*Мінск, 20 мая 1990 года*

# ПРЫВІТАЛЬНЫ АДРАС
## Паэту, сатырыку-гумарысту Вяршыніну Міколу Пятровічу ў гонар яго 50-гадовага юбілею

Наш неўтамонны, шчыры наш Мікола,
Няўжо табе сягоння пяцьдзесят?!
Што ні кажы, Вяршынін, а наўкола
Тваіх сяброў сярод паэтаў шмат.

У абласных і іншых выдавецтвах
Табе ўсе рады, хочуць прывітаць.
Твой верш заўсёды ў душах адзавецца
І весела прымусіць рагатаць.

Ты ўзяў пачатак з «Ручайкоў» маленькіх
І ў акіян паэзіі пабег.
І поўна паэтычная сявенька
Выдатных вершаў (пахваліць не грэх).

Табе мы зычым шчасця і удачы,
Хай ходзяць музы за табою ўслед,
Як майскі дзень — вясёлы і гарачы,
Наш строгі крытык, слаўны наш паэт!

*Па даручэнні і ад імя літаратурнага аб'яднання «Ручайкі» пры рэдакцыі Мінскай раённай газеты «Шлях камунізму» склала і запісала Эльвіра Ярчак, завуч Бараўлянскай школы Мінскага раёна*
*20 мая 1990 года*

# Сатырык без аховы

*Кожнаму сатырыку, як і Прэзідэнту,*
*патрэбна персанальная ахова.*
*(З размовы літаратараў)*

Даўно Пегаса асядлаў
Вяршынін наш Мікола.
Руку ён першым падае
Рэдактарам наўкола.

Б'е бюракратаў і застой
Ён смелым трапным словам.
Сатыра з гумарам яго —
І крэда, і аснова.

Ён — нібы цвік — не гнуць гады,
З усіх бакоў сам хвацкі,
Душой заўсёды малады,
Сябры ж — у Мінску, Шацку.

На выгляд — быццам трыццаць пяць,
А талент — дай нам божа!
Яшчэ глядзіць і ў бок дзяўчат,
Жаніцца шчэ раз можа.

Яму, як кажуць, жыць і жыць,
Ламаць жыцця аковы.
Ды коса мафія глядзіць:
Сатырык — без аховы.

*Васіль Рамашка,*
*прысвячаю Міколу Вяршыніну*
*з нагоды яго 55-годдзя*

# Нашаму слыннаму сатырыку Міколу Вяршыніну
## (з нагоды яго 55-годдзя)

Штодня над нашаю зямлёй
Усходзіць сонца і садзіцца,
Зрабіўшы круг жыццёвы свой
На векавечнай калясніцы.

А вось гады бягуць не так,
І з нашым сонцам не радняцца.
То, можа, іх каб наўскасяк
Агрэць рыдлёўкаю па пляцу?

Ну што такое пяцьдзесят,
І нейкі хвосцік пятачковы?
Ды гэта проста майскі сад
І для рыдлёўкі той аснова.

Тады хапай іх за парткі
І, між каленяў зашчаміўшы,
Лупі рыдлёўкай напраскі,
Каб не было спакусы іншым.

І будзеш вечна маладым,
Бадзёрым, радасным, вясёлым...
І той рыдлёўцы злепіш гімн
Ці верш напішаш адмысловы.

*Аляксей Капцюг,*
*артыст народнага тэатра*
*эстрадных сатырычных мініяцюр*

# Вершынину Н.П. — в день рождения — учителю, собрату по перу

**1. ВСТУПЛЕНИЕ**
Верный сябр МІКОЛА,
Милый мой собрат!
С днем рожденья
Я поздравить рад.

С поэтом, инженером, другом —
Посидеть бы тесным кругом...

**2. О ТЕБЕ**
Тебя не измерить общим аршином,
Мікола ВЯРШЫНІН, Мікола ВЯРШЫНІН!

Ты — слова владыка и судеб вершитель,
Мікола ВЯРШЫНІН, Мікола ВЯРШЫНІН —
наш славный учитель.

**3. К ТЕБЕ (пожелания...)**
Быть на верху блаженства,
Мастерства и совершенства,
Над возрастом брать верх,
Иметь всегда во всем успех!

Пусть крепнет твой талант.
Гонораров и наград!

Едва ль найдется в мире
Такой, как ты, сатирик,
Певец и гитарист,
Маталл-специалист.

Сатиры смелой властелин,
Блистай, ВЯРШЫНІН-исполин!

*Николай Подмогильный, зам. начальника пожарной охраны Фрунзенского района г. Минска, подполковник, литератор*
*20 мая 1996 года*

# Музейный экспонат

## (Памятник при жизни)

Отдавать себя другим —
Это так прекрасно!
Главное — не быть одним,
Жить не понапрасну.

И работать, труд любя,
Ради всех людей,
Не жалея, что тебя
Отдадут в музей.

Мастер вылепит фигуру —
Выйдешь весь в отца,
Привнесет в нее натуру —
Облики лица.

И поставит посмотреть
Экспонат в музей,
Чтобы дать не умереть
В памяти людей.

И ты будешь там стоять
На века в углу.
Будут люди вспоминать,
Углубясь в молву.

О тебе писать начнут
Люди всех времен,
И не даст тебе уснуть
Мудрый фараон.

Он ведь издревле стоит
Между двух окон.
На него народ глядит —
Всем он так знаком.

Не в стихах его искать
И не в прозе слыть.
Главное — его понять,
Чтобы снова быть.

Люди мы одной земли
И на ней живем.
Из истории пришли —
И в нее войдем.

*С уважением — Кишко Сергей Владимирович,*
*зав. отделом райисполкома*
*15 ноября 1996 года*

## Творческая наследственность

Крылов и Салтыков-Щедрин —
Тут каждый в творчестве один
(по жанру критики — един).

Потом уж был Козьма Прутков,
За ним в строй стали Ильф, Петров.

Затем, стремясь к своей вершине,
На смену им пришел Вершинин.

Летит он в творчестве вперед,
Читателей —
не подведет!

*Валентин Панкевич, служащий*

## Дружба и служба

Говорит Микола тост,
Он — и мягок, он — и прост.

Но когда стих критикует —
Против кто, тот всем рискует:
Напечатан он не будет
И о славе позабудет.
Если ж критику поймет,
То в печать всегда пройдет.

## На гулянье

Не хочу я уходить,
По углам чтоб не бродить.
Много женщин чудных есть —
Покажу мужскую честь.
А Миколовы стихи
Меня тянут на грехи.

*Валентин Лазарев, учитель*
*(деревня Щомыслица, Минский район)*

## Бодрость века

### (Нашему земляку Николаю Вершинину)

Они уходят безвозвратно —
Неповторимые года...
А мы ведь думали когда-то,
Что будем молоды всегда.

А нам казалось год от года,
Когда врывалась в мир весна,
Что нас помилует природа,
И не затронет седина.

И не боимся мы пороши...
Поверьте, в возрасте любом
Не сдастся человек хороший:
Есть в сердце чувства, страсть, любовь.

И нам не надо огорчаться —
И ни на день, и ни на час.
Вперед идти, лететь и мчаться —
И старость не находит нас.

А если человек искусства,
С душою юною поэт,
Его несут на крыльях чувства,
И в шестьдесят — износа нет!

*Депутаты Шацкого сельсовета*
*Пуховического района Минской области*
*2000 год*

## Нашаму настаўніку Міколу Вяршыніну ў юбілейны год

Ветразем імчыцца час няўмольны,
Скроні забялілі нам гады.
Ды ў вачах іскрыцца смех свавольны,
З жартамі заўсёды малады.

Промнямі чароўнымі святлее
Мараў і жаданняў далягляд.
І душа заўсёды маладзее
Ад сустрэч і юбілейных свят.

І мацнеюць крылы за плячыма,
Хоць нясеш гадоў тых поўны мех,
Ды нічога, усё ў нас магчыма —
Белы май і пераможны смех.

І струменіцца цяплом вясновым
Небасхіл расквечаных гадоў.
Мікалай Пятровіч, як вынова,
Зорны час ваш толькі надышоў.

Не прайшоў яшчэ, рыхтуе сілы
Да наступнага свайго вітка.
Пахнуць мятай вашы небасхілы,
І да сонца цягнецца рука.

Поспехаў яшчэ шмат будзе з часам
І шчаслівых велічных дарог,
Што вядуць да мары і Парнаса,
Да вяршынь і новых перамог.

*Ад Стаўбцоўскіх паэтаў і паэтак —*
*Ала Бандаровіч*
*20 мая 2000 года*

## Поэту — и инженеру, сатирику-юмористу, другу автомобильного, тракторного, подшипникового и других заводов, славному труженику, ветерану нашей организации



Как зайдешь ты на «Прогресс»,
В наш столь важный кабинет,
То возьмет тебя там стресс:
Другу — шесть десятков лет.

Как поэт — он знаменит.
А фамилия — Вершинин.
Нам о многом говорит:
Новые возьмет вершины.

Правда, пишет он и прозой
По газетам там и сям.
Трудные задаст вопросы:
Как жить дальше? Чтоб — не срам!

За Республику радеет,
За родную Беларусь.
Слово так сказать умеет —
Говорить я не берусь.

Так что все мы поздравляем
Вас, Вяршынин Микалай,
И от всей души желаем:
Ты за нас борись, валяй!

Не берет тебя испуг,
Ты нам — брат, и ты нам — друг.
Наш сатирик-юморист
Оттого, что сердцем чист.

Он — ведущий инженер,
И берем с него пример.
Сорок пять аж с лишним лет
Стаж его — упреков нет!

Ведь совсем еще не дед,
И тебе износа нет.
Славно справил юбилей,
Сил и дальше не жалей!

Хоть спеши —
и не спеши,
А пока —
стихи пиши!

*Отдел маркетинга научно-производственного*
*предприятия «Прогресс» г. Минска*



*Поэты не рождаются случайно,*
*Они летят на землю с высоты.*
*Их жизнь покрытая глубокой тайной,*
*Хотя они открыты и просты.*

Игорь Тальков

# Дружеское — юбилейное Николаю Вершинину

За 60 прожитых лет
Добился многих ты побед.
Страну Сатиру покорил,
Хоть путь не легким к славе был.

Вершинин шел к своей вершине.
Смотрите, братцы, кто он ныне:
Одиннадцать отличных книг!
Он — капитан среди своих!

А в 60 — расцвет творений.
Возможно, будет он и гений —
Не в шутку все желаем мы,
Ученики, твои сыны!

*Валентин Панкевич*
*20 мая 2000 года*

# Живи, поэт — будь ярким, свет!

*(Моему редактору Н. Вершинину)*

Расцвели уже ветки сирени,
Дождь омыл молодую листву...
Ты для всех молодой и весенний,
И горжусь я, что рядом живу.

Друг Микола, давно тебя знаю,
Был еще молодой ты поэт,

И, когда твои вирши читаю, —
В них добро и души твоей свет.

Вновь запахло весной и сиренью,
И пришла озорная пора.
Я желаю тебе вдохновенья,
И любви, и земного тепла.

Пусть от строк твоих веет весною,
Колосятся родные поля,
Как сатира и юмор с тобою,
Так душа твоя солнцем полна!

***

Не зарастет тропа поэта,
К далекой вечности спеша.
И все мы знаем: лучик света —
Твоя широкая душа!

*Алла Кондрусева, журналистка*
*20 мая 2001 года*

## Николаю Вершинину с уважением

Лишь только проснулся город,
Из окон полился свет —
Нетвердой походкой, но гордый —
К пивнухе идет поэт.

Вчера, видно, сильно выпил,
Коль вылез в такую рань.
И просит он пива куфель,
С презрением глядя на рвань.

И высосал все вместе с пеной,
В окно подмигнул озорно:
— Ну что ж, мне пора на смену,
И темы искать заодно.

*Владимир Верховский, заведующий пивбаром*

## Сапраўдны сатырык

Газеты, радыё нярэдка
Чытаю, слухаю — усё едка.
Я ад яго — як наркаман:
Усё, што скажа — не дурман.

Няхай такім Мікола будзе,
Не патанае ў блудзе, брудзе,
Паказвае, у душы што ёсць,
Сатырык — гаспадар,
не госць.

Не злуйце, як каго падколе —
Ну, ён — такі,
Мікола,
Коля:
Не церпіць вось хлусні, падману,
Любую высветліць загану.

*Сяргей Арканаў, інжынер,*
*Я — праўдалюб, быў — і цяпер*
*Снежань, 2002 год*

## Посвящение

Изобретай, твори —
и ты умрешь.
Забудут,
словно гниду иль как вошь.
Везде гонимый был,
как бы преступник —
Всех бедняков, униженных —
заступник.
А подражай —
и будешь счастлив, как дурак!
Примерно так
писал Оноре дэ Бальзак.

***
Ты — не Бальзак,
тебе того не надо.
А благодарность от читателя —
награда!

***
Тебя читать —
всегда непрочь,
Хоть светлый день,
хоть темна ночь.

***
Услышь горячий
сердца стук...
Читатель вечный твой —
и друг.

*Минск, 2002 год*

## Нашему учителю, в творчестве — мучителю

Кто Вершинина не знает!
Мастер слова и пера.
Всем поможет и подскажет,
Мысль его всегда остра.

В нашем литобъединенье
Мастерству он учит нас.
Его слушать — наслажденье,
Басни, вирши — высший класс.

Он не ходит без улыбки,
Но вполне серьезный вид.
Не прощает нам ошибки,
И себя сам не щадит.

Знает, видимо, полмира
Белоруса-песняра:

Тонкий юмор и сатира —
Ничего не скажет зря.

Он уже один остался
Средь сатириков-друзей.
С ним, который не зазнался —
И мудрей,
и веселей.

*Надежда Савушинская, ученый-зоотехник,*
*(Минский район, поселок «Большевик»)*
*Январь, 2003 год*

## От почитателей — читателей

Живи,
поэт,
Хоть сотню
лет!
Какой
ответ?
Износа —
нет!
Седьмой десяток лет
идет —
Шагаешь бодро
ты вперед!
Сатира, юмор —
не беда,
Очистят общество
всегда.
Нас всех —
учи
И не молчи.
Давай
совет,

Открой

нам свет.

Мы вместе —

крепкая семья.

Твои читатели —

друзья.

## За шчырасць — шчырасць

Былы дзетдомавец-бядотнік
І паўжыцця — амаль бяздомнік.
Пара ўжо выдаць бы шматтомнік,
Ды сам сабе стварыў ён помнік —

Сваёю творчасцю багаты,
Сяброў запросіць сам дахаты.
Чытаем буднямі і ў святы,
Бо чалавек, паэт — заўзяты.

Не задавайся ты ніколі,
Будзь просты, мудры, наш Мікола.
Не задзірай даверху нос,
Дай Бог, каб ты яшчэ падрос!

Твае прыхільнікі — іх шмат,
Ці пералічыш нас — наўрад!
Мы пішам шчыра, без халтуры,
Твае ўсе вучні — па літаратуры.

## Торжественное — от МПЗ

Падшипниковый наш завод —
Он никогда не подведет.
Прими привет от ветерана —
Тебя мы защищаем рьяно.

Пацан пришел ты на завод,
А память о тебе живет,
И самопервые стихи —
Мы помним — были неплохи.

Трудились мы тогда в цехах,
И жили дружно — ох и ах!
Я был механик, энергетик,
Ты — мастер, инженер — вот этак!

Писал ты дальше. Не устал,
Писателем известным стал.
Я — стар. Но — молодой поэт.
Тебе ж еще износа нет.

Тебе давал нередко темы —
Стихи писал ты — не поэмы.
Писал поэмы без меня,
Творил, судьбу свою кляня.

Но в сатирическом все плане —
И очень мудро, без обмана.
Пиши, как раньше, — прямо, резко.
Твой друг я —
Леонид Железко.

Не только я, но весь завод
Твоими мыслями живет.
Шагай, Микола наш, вперед!
Тебя читает пусть народ.

## Вядомаму — выдатнаму, На ўсё на свеце — здатнаму

Адукацыяй багаты,
Да таго ж — паэт заўзяты.
Тры дыпломы — у каго?
Паважаем мы яго.

Ты — пачуццяў нашых гук —
Акадэмія Навук.
Мы чытаем, што нам скажаш,
А як скажаш — словы звяжаш
(І як жыць — ты нам падкажаш).

Ты скончыў родны наш гістфак,
Быў інжынерам — вось дык так!
Ты — сацыёлаг і паэт,
Нам адкрываеш цэлы свет.
Твае студэнцкія аднакурснікі-
хаўруснікі.
Пісалі ў даўнія гады —
Як ты яшчэ быў малады.

## Нашаму паэту — слаўнаму хлопцу Ад многіх прыхільнікаў - трактаразаводцаў

Прыгажун
яскравы ты,
Розуму шмат,
прастаты.
Ты бічуеш
так адчайна!
Мы — сябры ўсе,
завадчане.
Ты стварай,
а не гуляй,
Поспехаў шмат творчых —
май!
І ранейшы курс трымай.

Ты валодаеш
пяром,
І яно —
не йдзе на злом.

*Былыя твае вучні па літаб'яднанні «Полымя»*
*пры рэдакцыі газеты «Трактор»*
*ад 1968 па 1999 год, і надалей,*

І інжынеры, і рабочыя —
Мы да сатыры ўсе ахвочыя.
***
Прамінула шмат гадоў,
Ды... сустрэліся мы зноў.
***
Ты хоць сатырык, а лірыкі мы,
Пабачымся ўлетку —
і ў час зімы.

## В труде и творчестве всегда

Инженер на производстве —
Он всегда к работе рвется.
Острый словом, меткий глаз —
Популярен среди нас.

Летописец нашей фирмы,
Любит всех — и мы взаимны.
Труд — желанье, не приказ,
Помогал и нам не раз.

Коль сатирою уколет —
Негодяй любой застонет.
Скажет правду, а не ложь,
Рассмешит — так упадешь!

Он — товарищ, друг отличный,
В жизни ко всему привычный.
К нам относится любя,
Не жалеет сам себя.

Заводной всегда оратор
И отменный литератор.
Мысли высказать умеет,
Много книг давно имеет.

Ищет острые он темы:
Экономики проблемы,
И политики, и жизнь —
Так покажет — что держись!

Вот что значит — есть талант,
Он отдать его нам рад.
Наш Вершинин — вот такой,
Целит острою строкой



Каждый день и каждый час —
И не в бровь, а прямо в глаз.
От его идей — светлей,
Больше бы — таких друзей!

*Андрей Волчек, бизнесмен, директор фирмы*
*ООО «Воландэ-электро»*

## Светлыя думкі — табе!

Прамяністымі далонямі кахання
Сонца долю нашу светлую прадзе...
А Вяршынінскае новае выданне
Светлай думкай уваходзіць у наш дзень.

Мы Міколаву прадбачлівасць адчуем,
Нас яна заўжды ўпэўнена вядзе.
Зноў паэт жыццёвай мудрасцю шчыруе,
Быццам поруч з намі ён штодзень ідзе.



Паэтычных мараў, планаў і жаданняў
У Вяршыніна ніколі не адняць,
Дзе ад слоў тых абуджаецца світанне,
Капяжамі рыфмы светлыя звіняць.

Так заўжды ключом чароўным адчыняе
Наш Мікола дзверы ў паэтычны свет.
А чытач хай творы ўважліва чытае,
Каб заўважыць, як пралёг паэтаў след.

*Яўген Карпуць, мастак, музыкант,*
*артыст, літаратар*
*(г. Стоўбцы)*

## Спадару Вяршыніну Міколу

Яшчэ зусім зялёнаю школяркай
Мне давялося вершы прачытаць.
Пісаў Вяршынін Мікалай іх шпарка,
І многіх змог пяром паказытаць.

У тых пякучых вершаваных байках,
Што трапна прыпякалі лайдакоў,
Знаходзіла знаёмага мне дзядзьку з чаркай,
Суседку-модніцу, студэнтаў-гультаёў.

І салаўя я з груганамі знала,
Ды і зязюлю, што была з драздом,
(Нат не адну пароюустракала),
Была знаёма з сельскім знатаком.

Быў і ў нас дзядуля, што ў турыстах,
Заўсёды бачыў толькі дзівакоў
І тросся так, што аж ляцелі пыркі,
Над кожным тым рублём і пятаком.

Мінула з той пары гадоў за дваццаць,
Натрапіла на тую кніжку зноў,

І, як ні дзіўна ў гэтым прызнавацца,
Знайшла й сягоння тых жа лайдакоў.

Ды і сусед наш новы з той жа чаркай,
Нібы з сяброўкай лепшаю заўжды.
Чытаю й халасцяцкія я жарты,
Здзіўляюся, смяюся, як тады.

Не дзіва сёння, што сядзіць на карку
Шмат маладых яшчэ ў сваіх бацькоў.
І тое, што знаёмую пляткарку —
Штодзённа сустракаю зноў і зноў.

Прабачце мне, шаноўны наш Вяршынін,
Мо Вы празірлівец і чараўнік?
Як атрымалася, што вершы вы стварылі
Даўно, а я сучаснае чытаю ў іх?

*Лідзія Мазуркевіч, інжынер*
*(г. Стоўбцы)*
*2003 год*

## Змаганнем жыве паэтычны радок

Чытач сваю думку пацвердзіць павінен
Аб творах, якія выходзяць у свет —
Што піша, напрыклад, Мікола Вяршынін,
Вядомы ўсім нам, як сатырык-паэт.

Мастацкая трапнасць у выбары слова —
Я гэта зазначыў не раз і не два.
Здаецца, што гумару выбраць аснову
Табе дапамог наш Кандрат Крапіва.

Сатыра здаўна падабаецца людзям:
Яна ачышчэнне грамадству нясе —
Заганы рубцуе, сумленне прабудзіць,
І лечыць распусту ў наш час пакрысе.

Жыццёвы багаж. Сакавітая мова.
Змаганнем жыве паэтычны радок.
Калі ж назаву беларускім Крыловым,
Я праўдзе не здраджу: народны выток.

Упэўнены — жанр мастака не астыне,
Бо трэба адолець шмат доўгіх дарог.
Наперад, Маэстра, да новых вышыняў!
Няхай тваю Музу ахоўвае Бог.

*Адам Грынкевіч, настаўнік,*
*літаб'яднанне «Аўтограф»*
*(Стаўбцоўскі раён)*
*2003 год*

# Ад розных аўтараў

Кто Вершинина не знает,
Тот себя не уважает.
***
Кто Вершинина обидит,
Тот себя возненавидит.
***
Кто с Вершининым не пьет,
Тот и год не проживет.
***
Кто Миколу не любил —
Тот себя совсем забыл.
***
Футболист, боксер, борец — все стали в ряд.
Мы приветствуем — Валерий, Анатолий, Эдуард!
***
Шаржаваў Мікола — сам не быў у брудзе!
Чарку браў з сябрамі — весяліцца й будзе!
***
Всегда веселый он и бодрый,
Он — как Позняк. Но только — добрый.

***

— Яшчэ жывеш?

— Пакуль жывы.

— Пішы,

нашчадак Крапівы!

## Не народнаму паэту, а паэту з народа

Са здольнасцямі —

ды тваімі —

Хай збудуцца

ўсе пажаданні.

І ў «Мінскай праўдзе»,

ды і ў ЛІМе

Казалі:

— Класік, прывітанне!



# ...Ад самога аўтара

Пра славу гучную —
маўчу,
Што ёсць —
найлепш бы скарыстаць.
Быць класікам —
я не хачу,
Важней —
паэтам добрым стаць.

# Хто мяне не любіць

Плеткары, угоднікі і шкоднікі,
Бездары,
зайздроснікі,
нягоднікі.

# І хто любіць

— Гатоў чытаць я кожны нумар,
Дзе змешчаны Міколаў гумар!

# Аўтарскае — удзячнае

Я шчыра дзякую за многа добрых слоў.
Тут славіў не сябе я,
а — сяброў.
Яны мне прасвятлялі змрочны дзень.
Я — думак іх выразнік,
Я — іх цень.



# Маё жыццё

Адны жывуць — спяваюць песні,
Удача іншых абміне.
А я вось нарадзіўся ўвесну,
Нялёгкі лёс сустрэў мяне.

І хіба хто калі прыкмеціў,
І ці пачуў хто сэрца ўздых,
Што я зусім адзін на свеце,
Але жыву —
                    і не прыціх.

І ўсё ж знайшоў я пуцявіну,
Адну-адзіную, сваю.
Другі б даўно ўпаў і згінуў,
А я — стаю,
                    а я — стаю.

Быў шлях цяжкі і невядомы,
Я зведаў радасць і бяду.
Сустрэчы вецер гне і ломіць,
А я — іду,
                    а я — іду.

Інакш я жыць і не пачаў бы,
Усё кажу, як сам лічу.
Хто-небудзь іншы і змаўчаў бы,
А я — крычу,
                    а я — крычу.

Дзе поспех ёсць, а дзе прамашка,
За праўду дорага плачу.
Тут і хадзіць бывае цяжка,
А я — лячу,
                    а я — лячу.

Шукаць паэзію і ў прозе
Усё жыццё імкнуся я.

Хай стома век мяне не возьме,
Не згасне зорачка мая!



## Жыццё і мары

Дзе лепшага ўсяго вытокі,
Што сэрца бурна ўскалыхне?
Да светлых мар, ідэй высокіх
Цягнула ўсё жыццё мяне.

І музыку, і песні, вершы
Хацеў прафесіяй зрабіць.
Аднак рабочым месцам першым
Завод стаў — як яго забыць?

І выйшла так па той прычыне,
Што я — заводскі інжынер,
Хоць мары светлыя не кінуў,
Нямала кніжак ёсць цяпер.

А летуценнік я прыродны,
Але праз доўгія гады
Завод зрабіўся мне, як родны,
І гэта, пэўна, назаўжды.

Усё свой сэнс па-свойму мае,
Што лепш — не пойдзе ў забыццё.
Паэзія — мяне натхняе,
Завод — паказвае жыццё.

Я вершаў напісаў нямала,
Заўжды ў душы — пачуццяў вал.
Люблю — паэзію метала,
Люблю ў паэзіі — метал.

## Мы

### (Двуязычное — патрыятычнае)

Я толстых не пишу томов.
Живу я средь больших домов.
Писать же много-не спешу,
А напишу — так напишу!

Хотел бы я, чтоб каждый том —
Он перерос в огромный дом.
И чтоб росли мои тома,
Как в нашем городе дома.

Но все же я скажу вам снова:
Жыцця аснова — наша мова.
И среди лета, средь зимы,
Международной кутерьмы
Мы — беларусы, слаўны мы!

Каб нацыяй вялікай стаць —
Не трэба іншых прыгнятаць!
И нас никто не угнетет —
Познал свободу наш народ.

Народ — давно уже не тот,
Что унижения снесет.
И пусть не скажут нам: — Молчи! —
И ни цари, ни палачи.

Простите русский мне язык,
Но я к нему давно привык,
І блізка кожнае ў ім слова,
Ды... беларуская — лепш мова!



# ЗМЕСТ

## ЖЫЦЦЯ КРУТЫЯ ПАВАРОТЫ

Мыш пад венікам ........ 4
Бык ва ўладзе ........ 5
«Прынцыповы» вартаўнік ........ 7
Размова з-за куста ........ 8
Кіраўнічы Казёл ........ 9
Незвычайны юбілей ........ 11
Асёл і навука ........ 12
Вучоны Кіт ........ 13
Аб зручнасцях жыцця ........ 13
Без віны вінаватыя ........ 15
Вераб'іны ўклад ........ 16
Дакрытыкаваўся ........ 17
Даклад і лад ........ 18
Зязюля і Дрозд ........ 19
Салавей і Груганы ........ 20
Пра Мух і пра Зуброў ........ 21
Ліса і Кураня ........ 22
Бык і Месяц ........ 23
Мураш і Слон ........ 23
Ахвяры гультайства ........ 24
Лес і прагрэс ........ 25
Ганарысты Мухамор ........ 27
Сваё — свайму ........ 28
Мядзведзь у камандзіроўцы ........ 29
Каза — Карова ........ 30
Конкурс ........ 32

Пралічылася ........ 32
Сваё месца ........ 33
Ахвяра характару ........ 34
«Вераб'інае каханне ........ 35
Канцэрт ........ 37
Таўстаскурая Свіння ........ 38
Сабака і Казёл ........ 39
Зайцава натура ........ 40
Ліса і Певень ........ 40
Пра сваё і за сваё ........ 41
Наша жыццё ........ 42
Незалежнасць ........ 44
Сённяшні дзень ........ 46
Што рабіць ........ 48
Кааператывы ........ 49
Цэны ........ 50
Маладыя камерсанты ........ 52
Пра выдаткі на падаткі ........ 53
Як вучыцца і лячыцца ........ 55
Як мільёншчыкам я стаў ........ 56
Горш не будзе ........ 58
Пра рэлігію ........ 60
Мінімалка, мінімалка ........ 62
Пенсіі ........ 63
Пакаранне за старанне ........ 65
Сучасны партрэт ........ 66
Маланка і гром ........ 68
Лёс ананімшчыка ........ 69
Сустрэча з бомжам ........ 70

........................................ 72
Дыягназ ........................................ 72
Майстры развалу ........................................ 74
Брат па разліку ........................................ 75
Ва ўладзе Смаўжа ........................................ 77
Перастаноўка ........................................ 78
Ханыга ........................................ 79
Як лячыцца я хадзіў ........................................ 82
Прыгоды камандзіраванага ........................................ 84
Споведзь дармаеда ........................................ 86
Няўдалая будоўля ........................................ 87
Валакіта ........................................ 89
Пра прэміі ........................................ 90
Што скажаш ........................................ 92
План і падман ........................................ 93
Скарга жыльца ........................................ 94
Як падрад пайшоў назад ........................................ 96
«Зарабіў» ........................................ 97
Няўдалая біяграфія ........................................ 98
Бракаробы ........................................ 99
Несуны ........................................ 100
На сваю галаву ........................................ 101
Заводскія метамарфозы ........................................ 102
Бытавыя каляіны ........................................ 104
Жыцця крутыя павароты ........................................ 106
Крытыка ........................................ 107
«Вясёлыя» дзяўчаты ........................................ 109
Навука іншым ........................................ 110
Крыўда ........................................ 111
Свой чалавек ........................................ 111

Дабро бывае небяспечным ........................................ 113
Дзялок ........................................................................ 114
Кемлівасць .................................................................. 116
«Святая» грэшніца ....................................................... 117
Курортныя прыгоды ..................................................... 119
Аб прафесійных звычках і характарах ......................... 121
Грані сяброўства .......................................................... 122
Маналог бюракрата ...................................................... 124
З'явы бытавыя .............................................................. 125
Аб наклейках і слупах .................................................. 126
Няўдалы кветкалюб ...................................................... 128
Забабоны ..................................................................... 129
Нечаканая сустрэча ...................................................... 131
Добры сродак ............................................................... 132
Доля гультая ................................................................ 133
Скарга пацыента .......................................................... 135
Дык ці варта гасцяваць ................................................ 135
Пра машыну ................................................................. 137
Спатканне і кошка ........................................................ 138
Пра суседак .................................................................. 140
Закаханы сатырык-гумарыст ....................................... 142
Дачныя прыгоды .......................................................... 143
Лысы, лысы, валасаты .................................................. 145
Вылечыла ..................................................................... 147
Пагулялі ....................................................................... 148
Я — і барада мая .......................................................... 149
Змікіціў ......................................................................... 151
Трыццацігадовы халасцяк ........................................... 154
Як я аднойчы быў жанатым ......................................... 155

Мне б такога жаніха ........ 157
Як паклёпнік пацярпеў ........ 158
Пахваліў ........ 159
«Вытворчае» каханне ........ 160
Закаханы шахматыст ........ 162
Любоўныя прыгоды ........ 163
Святлафоры ........ 165
Ажаніўся — замуж выйшаў ........ 167
Замуж выйшла — вось марока ........ 168
Як хадзіў я па грыбы ........ 170
Мой метад ........ 170
Прагнасць падвяла ........ 172
«Пасватаў» ........ 173
«Вясёлыя» эцюды ........ 174
Прыгоды дачніка ........ 176
Памыліўся ........ 177
Адпачынак на турбазе ........ 178
Пацярпеў ........ 180
Выпівакі-дружбакі ........ 182
Вясёлая трагедыя ........ 184
«Алфавітнае» каханне ........ 187
Што бывае ў сорак год ........ 188
Дзелавы доктар ........ 190
Нашто мне рай ........ 191
Гультайскі лёс ........ 193
Каварнасць ........ 194
Прыгоды купальшчыка ........ 195
Прыгоды маладога бацькі ........ 196
Немужчынскія турботы ........ 198

Што бывае ў пяцьдзесят ........ 200
А прычым прычоска тут ........ 201
Зарок ........ 203
Браканьеры ........ 205
Жыццё забеспячэнца ........ 208
Калючая ружа ........ 210
Не той забой ........ 212
Ухвала піву ........ 214
Рыдлёўка і сабака ........ 216
Як жывецца ў шэсцьдзесят ........ 218
Як я кінуў піць, курыць ........ 219
Пазабаўляліся ........ 221
«Сюрпрыз» ........ 223
Каханне паэта і старшыні сельсавета ........ 224
«Шчыры» пост ........ 226
Рэстаран «Чатыры колы» ........ 228
Скупы на паляванні ........ 230
Самакрад ........ 232
Ахвяра інтэлекту ........ 233
Чужое — лепей за сваё ........ 235
Вясёлыя сустрэчы ........ 237
Ідэальны муж ........ 239
Як экзамен я здаваў ........ 240
Хто каго пашкадаваў ........ 244
Ах, выдатная жанчына ........ 245
Дурныя клопаты ........ 247
«Пазайздросцілі» ........ 248
Малады пенсіянер ........ 249
Удалая пакупка ........ 251

Участковы на вяселлі ........ 252
Дыпламаваная жонка ........ 254
Мы, мужчыны ........ 255
«Важная» праблема ........ 256
Шэльма ........ 258
Аферыст ........ 259
Хітры ёлупень ........ 261
Помста ........ 262
Спрытнюга ........ 264
«Складчына» ........ 265
Забаўляльная сустрэча ........ 266
Жонка — гром ........ 267
Што лепш ........ 269
Жывучы ........ 270
Каму — што ........ 270
«Кампаньёнка» ........ 272
Навагодняя сустрэча ........ 273
Дамашняя навука ........ 276
Пачатак і канец ........ 278
На чый густ ........ 279
У кожнага — сваё лячэнне ........ 281
«Пажартаваў» ........ 282
Грушы і грошы ........ 284
Як пайшла дамоў Ларыса ........ 285
Гуляка ........ 286
Маё імя ........ 287
Мая слабасць — мая сіла ........ 289
Любімай жонцы ........ 291
Сучасны шлюб ........ 292

Мае гады — маё каханне ........ 293
САТЫРЫЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ ........ 296
КАЛАМБУРЫ ........ 326
ЭПІГРАМЫ ........ 329
Дача, дача — вось няўдача ........ 351
Пакуты бывалага літаратара ........ 355
Наша «ІСЛАЧ» — родны дом ........ 359
Пра аўтара «ЛЫСАЙ ГАРЫ» ........ 367

## МЯРКУЙЦЕ САМІ, ШТО ЯК ЁСЦЬ

Як падвёў аўтарытэт ........ 371
Блыха ........ 373
Эскалацыя грубасці ........ 375
Не зразумеў ........ 378
Як трапіць у гасцініцу ........ 379
Таямніцы сервісу ........ 382
Шавец без ботаў ........ 383
Як рабіць падарункі ........ 385
Абмішуліўся ........ 387
Халімон — маладажон ........ 389
Рыбак міжволі ........ 392
Дасвяткаваўся ........ 394
Дзень цудоўных падманаў ........ 396
Як я спраўляў улазіны ........ 398
«Спартыўны» парсюк ........ 401
Як выйграць у «Спортлато» ........ 403
Не выпадае ........ 405
Як я стаў рабкорам ........ 406
Перастаралася ........ 408

Як я стаў парашутыстам ........................................ 409
Знаходлівасць дапамагла ........................................ 412
Шчаслівая лічба ........................................ 413
Даная і Напалеон ........................................ 415
Няўдача Яўмена Здабыцкага ........................................ 418
Небяспечная хвароба ........................................ 419
Як стаць вядомым ........................................ 421
Незвычайнае здарэнне ........................................ 422
Як пісаць рэцэнзіі ........................................ 424
Літаратурная энцыклапедыя ........................................ 426

**МЕМУАРЫ**

**З НАМІ — ТЫ, А МЫ — З ТАБОЮ**

Маё жыццё ........................................ 513
Жыццё і мары ........................................ 514
Мы ........................................ 515

Літаратурна-мастацкае выданне

ВЯРШЫНІН Мікалай Пятровіч

# ДАКРЫТЫКАВАЎСЯ (САТЫРА І ГУМАР) ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

Адказны за выпуск А.П. Аношка
Рэдактар Ул. А. Паўлаў
Тэхнічны рэдактар К.М. Дрозд
Фундатар выдання ТАА «ТЫ І Я — МАЯ СЯМ'Я»

Падпісана ў друк 03.11.03. Фармат 84×108/32. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 27,6. Ул.-выд. арк. 30,9.
Тыраж 600. Зак. 297.
Выдавецтва УП «Тэхнапрынт», ЛВ № 380 от 28.04.99
Друк УП «Тэхнапрынт», ЛП № 203 от 26.01.03
220027, Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 65, корп. 14, оф. 317,
тел./факс 231-86-93